Аляксей Дудараў

# Князь Вітаўт





*Аляксей Дудараў*

# Князь Вітаўт

П'есы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2006

УДК 821.161.3-2
ББК 84(4Беи)-6
Д81

**На форзацы**
партрэт Аляксея Дударава
работы фотамастака *Ірэны Гудзіеўскай*
(касцюм *Ганны Балаш*)

ISBN 985-02-0871-6

© Дудараў А. А., 2006
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2006

# Парог

**Драма ў дзвюх дзеях**

**ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ**

Андрэй Буслай.
Маці.
Бацька.
Аліна.
Драгун.
Мікола.
Ніна.
Рыгорка.
Шаргаёў.
Красоўскі.
Міліцыянер.

# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Невялікі пакой у гарадской кватэры. Простыя, васільковага колеру шпалеры. Мэбля вельмі старая, якая ўжо даўно выйшла з моды. Усё самае неабходнае: стол, два крэслы, канапа. На сцяне ў драўлянай рамцы сямейныя фотаздымкі. Побач на цвіку вісіць вышываны ручнік. Увесь пакой нечым нагадвае вясковую хату. У куце тэлевізар старой маркі, над ім гадзіннік з зязюляй.

Раніца. На канапе спіць Б у с л а й. Звоніць тэлефон. Раз, другі, трэці... Буслай ляжыць нерухома. Тэлефон супакойваецца на хвіліну і зноўку звоніць. Буслай паварушыўся, з неймаверным намаганнем падняў галаву з заплюшчанымі вачыма і зноўку чмякнуўся на падушку. Зноў тэлефон.

Б у с л а й *(хрыпата)*. Бэра! Выключы будзільнік, я ўсё адно не падымуся...

Тэлефон.

Выключы будзільнік, паразіт!

Тэлефон.

Ну й паскуда ж ты, Бэра... *(Падымаецца з ложка і ўрэшце расплюшчвае вочы. Азіраецца, не разумеючы, дзе ён.)*

Цяпер яго можна разгледзець. Гадоў пад пяцьдзесят з першага погляду, але толькі з першага. На самай справе і сарака няма. Няголены апухлы твар, брудная кашуля, ускудлачаныя валасы.

*(Уважліва-ўважліва аглядае ложак, стол, падлогу. Мабыць, думае, што прачнуўся ў вёсцы.)* Мама!

Цішыня.

*(Ідзе да акна, адхінуў фіранку, зірнуў на вуліцу. Раптам спалохана адскоквае ўбок. Цяжка дыхаючы, зноў падыходзіць, з перасцярогай пазірае некуды ўніз.)*

Зразумела, што кватэра знаходзіцца ў высотным доме.

*(Трэ рукамі твар, трасе галавой.)* Нічога сабе жартачкі... Ашалець можна. *(Уважліва аглядае кватэру. Нічога не разумее. Падыходзіць да фотаздымкаў, мацае рукой ручнік.)* Ды што ж гэта такое, ёлкіна маць?! Сплю я, ці што?

Звоніць тэлефон.

*(Доўга яго шукае, знаходзіць на падаконніку, падымае трубку.)* Алё... Не ведаю... Нічога не ведаю... *(Кладзе трубку, здымае, набірае два нумары.)* Алё... Якая сорак восьмая?.. Я ў справачную званю... А-а-а, справачная! Скажыце, калі ласка, які гэта горад?.. Ды не ганяю я вальтоў, я сапраўды...

Зразумела, што на другім канцы кінулі трубку.

Цьфу! *(Зноў набірае два нумары.)* Алё!! А-а-а, ты ўжо дзевятая?.. А дзе ваша сорак восьмая?.. Я ёй у каханні прызнаюся! Ага, Гарык я, Гарык... Давай сорак восьмую!

Паўза.

Сорак восьмая? Слухай, ты, лічба, табе што, цяжка сказаць, які гэта горад?.. З Марса зваліўся, мяне туды запускалі... А спусціць забыліся... Ды ведаю я, які год! І месяц ведаю! Што-а-а?! А чаго гэта я ў Дубровенску?.. Не ведаеш? І я не ведаю... А колькі цяпер часу?.. Колькі? А-а-а, ужо даюць... Ну, дзякуй, лічба! Прывітанне Гарыку... *(Паклаў трубку, хвіліну сядзеў з тупым выглядам, потым махнуў рукой.)* А-а-а, адзін чорт! Павінен жа хто-небудзь сюды прыйсці калі-небудзь... *(Ідзе па пакоі.)* Ты глянь! Не ведаю гаспадара, але што ў яго клёпак не хапае — гэта факт... Ручнік, ходзікі з птушачкай... Ку-ку, ку-ку... А дзе ж тут гэта самае месца?.. Вой, божухна! Калі як у вёсцы — будзе дзялоў! *(Бегае па кватэры, зазіраючы ў пакоі, знаходзіць тое, што шукаў, знікае.)*

Нейкі час кватэра пустая. Потым ляпнулі дзверы, у пакой уваходзіць А л і н а. Ёй гадоў дваццаць восем. Стройная, прыгожая, усміхаецца рэдка. Апранута модна і сучасна, але з густам. Аліна праходзіць, сядае на зэдлік, дастае з сумачкі цыгарэту, закурвае. З'яўляецца Б у с л а й. Вочы заплюшчаныя, стогне. Аліна азірнулася.

А л і н а *(спалохана)*. А-а-а!

Б у с л а й *(таксама спалохана)*. Чаго ты?!

А л і н а. Адкуль вы?

Б у с л а й. З туалета...

А л і н а. Вельмі падобна... Стойце і не варушыцеся... Іначай я буду крычаць!

Б у с л а й. Не трэба. У мяне галава баліць... Я толькі прылягу ціхусенька, і ўсё...

А л і н а. Не падыходзьце!

Б у с л а й. Я табе сказаў — не крычы!

А л і н а. Вы дарэмна... дарэмна залезлі сюды... Тут няма чаго браць... Ён грошы дома не трымае... Дарэмна...

Б у с л а й. Во завялася, во завялася... Што мне да тваіх грошай? У мяне чэрці ў галаве мак таўкуць... Не магу разабрацца, дзе я і хто я...

А л і н а. Зараз разбяромся разам... *(Падыходзіць да тэлефона.)*

Б у с л а й *(кінуўся да яе)*. Ну, дарагуша, званіць у міліцыю ты не будзеш!

А л і н а. Не падыходзьце!

Б у с л а й. Ды я не злодзей, я прoсты алкаголік... Жыву ў пасёлку Светлым без прапіскі, так што з міліцыяй у мяне адносіны сапсаваныя... Пакладзі трубку, я табе сказаў!

А л і н а. Добра... Тады кажыце, што вы тут рабілі?

Б у с л а й. На унітазе сядзеў. А да гэтага спаў... А да гэтага не ведаю. Я ледзь з глузду не з’ехаў у гэтай кватэрцы! Прачнуўся — хата вясковая, ходзікі на сцяне... У нас уся вёска такімі шпалерамі абклеена... З акна зірнуў — ёлкіна маць! Зямля ўнізе! Людзі, як мурашкі, бегаюць... Ад страху ледзь сэрца ў жывот не заскочыла... Ну, думаю, дапіўся — хата ў паветра паднялася... І які гэта псіх тут жыве?

А л і н а *(рэзка)*. Як вы сюды трапілі?

Б у с л а й. Чаго ты вішчыш як недарэзаная? Ты гаспадыня, ці што? Сама, мабыць, зацягнула мяне ў ложак, а цяпер крычыць...

А л і н а. Што-о? Цябе ў ложак? Зірні ў люстэрка, лапаць... Цябе ў труну час класці, а не ў ложак...

Б у с л а й. Чаму гэта?

А л і н а. Ты ж сіні...

Б у с л а й. Гэта сіндром...

А л і н а. Які сіндром?

Б у с л а й. Пахмельны, цемната...

А л і н а. Та-ак... Алкаголік, значыцца?

Б у с л а й. Прафесіянальны алкаголік. З чатырохгадовым стажам лячэння...

А л і н а. Вельмі прыемна...

Б у с л а й. А мне не вельмі... На душы як у грэшніка ў пекле... Дай што-небудзь глынуць...

А л і н а. Хто цябе прывёў сюды? Гарухін? Дык вось, вымятайся і скажы яму, што за гэты мілы жарт я наб’ю яму морду!

Б у с л а й. А хоць горла перагрызі, што мне да таго! Я табе, авечка джынсавая, казаў, што нічога не памятаю. Ні бум-бум! Я ўжо другі год толькі да абеду сваё жыццё бачу і пра яго думаю, а пасля як у торбе сяджу паўдня і ноч... Правал... Сплюшчылася маё жыццё. Я нават не ведаў, што ў вашым Дубровенску апынуўся, а ты мяне дапытваеш пра гэту кватэру, хто прывёў, як апынуўся...

А л і н а. Адкуль жа ты зараз ведаеш, што гэта Дубровенск?

Б у с л а й. Званіў у справачную.

А л і н а. Вобмацкам? Не, герой... Дык ты, можа, сам і прыпоўз сюды?

Б у с л а й. Які гэта паверх?

А л і н а. Дзевяты.

Б у с л а й. Наўрад. Чаго б гэта я шкробся аж да дзевятага... І хто б мяне сюды пусціў?

А л і н а. Гэта не праблема. Кватэра не замыкаецца...

Б у с л а й. Як гэта? Без замка гарадская кватэра?

А л і н а. Любы можа зайсці... І ў любы час...

Б у с л а й. Ну я ж казаў, што гаспадар чокнуты...

А л і н а. Замаўчы! Ты хоць ведаеш, чыя гэта кватэра?

Б у с л а й. Ну?

А л і н а. Максіма Пакутовіча...

Б у с л а й. А чаго ты шэптам пра гэта сказала? Ён што, пракурор? Ці мо начальнік міліцыі?

А л і н а. Ты не ведаеш Пакутовіча?

Б у с л а й. А ты Бэру ведаеш?

А л і н а. Якую яшчэ Бэру?

Б у с л а й. Не якую, а якога... А, не ведаеш... У кожнага свая кампанія.

А л і н а. Гэта вядомы пісьменнік... Яго ўжо ў школе вывучаюць. Няўжо не чытаў ніколі?

Б у с л а й. Ага, мне толькі яшчэ чытаць кніжкі засталося, і ўсё ў парадку... Што ты кажаш? Самы сапраўдны пісьменнік? А дзе крышталь? У пісьменніка павінен быць крышталь.

А л і н а. Вось што, даражэнькі, адпачыў, выспаўся, схадзіў куды трэба, а цяпер збірай манаткі і шуруй адсюль...

Б у с л а й. Куды ж я пайду? Мне крыху ачуняць трэба пасля ўчарашняга...

А л і н а. Не хочаш ісці, дык паедзеш...

Б у с л а й. На чым гэта?

А л і н а. На машыне з палосачкай...

Б у с л а й. Ёлкіна маць! А чаго гэта ты тут раскамандавалася? Ты што, жонка гэтага пісьменніка?

А л і н а. Не...

Б у с л а й. Сваячніца?

А л і н а. Не твая справа!

Б у с л а й. А-а-а...

А л і н а. І не «а-а-а»! Я яго пацыентка...

Б у с л а й. Хто-о? Пацыентка? А чым жа ён цябе лечыць? Аўтаручкай?

А л і н а. Уяві сабе! Менавіта аўтаручкай...

Б у с л а й. Ну дык вось што, пацыентка... Станавіся ў чаргу і чакай доктара... Псіхбальніца, а не дом! Кватэры як пры прыгонным праве, дзверы не замыкаюцца, лечацца ў пісьменнікаў... Што вы за людзі?

А л і н а. Я — звычайная, а ён святы...

Б у с л а й. Ну, канечне... Пісьменнік! Грошы куры не клююць, хочаш не хочаш, а ў святыя запішуць... Я аднойчы па лата-

рэі матацыкл выйграў. Таксама ўся вёска святым лічыла, пакуль не прапіў...

А л і н а. Дурань! Гэта незвычайны, дзівосны чалавек... Самы сапраўдны інжынер чалавечых душ...

Б у с л а й. Для маёй душы не інжынер, а сантэхнік трэба... Слухай, авечка...

А л і н а. Якая я табе авечка?

Б у с л а й. Джынсавая. Ты не крыўдуй. Ты ўся такая мяккая, далікатная, як... каўнер у кажуха...

А л і н а. Прыдурак!

Б у с л а й. Ну дык скажы, як цябе завуць, калі не хочаш у авечках хадзіць...

А л і н а. Аліна..

Б у с л а й. Імя ж нейкае... французскае...

А л і н а. Я яго не выбірала... У дзетдоме далі...

Б у с л а й. Ты сіротка?

А л і н а. Падкідыш я. Усё жыццё як падкідыш жыву.

Б у с л а й. А я выкідыш... Жыццё мяне выкінула некуды, і лётаю, лётаю, лётаю... І прызямліцца не магу... Слухай, авечка...

А л і н а. Яшчэ раз так мяне назавеш — па фізіяноміі атрымаеш!

Б у с л а й. У-ю-юй, як страшна! Ладна, ладна, не пыхці... А гэта не ён сюды мяне зацягнуў? У пацыенты, на даследаванне, як падвопытнага кроліка...

А л і н а. Не падобна. Нічога цікавага, апроч сіняга носа, у цябе няма.

Б у с л а й. А што, яму толькі цікавае падавай? А я, можа, цікавы тым, што зусім-зусім нецікавы. Ува мне нічога няма, і мне нічога не трэба. А кажуць, чым чалавеку меней трэба — тым ён лепшы і цікавейшы...

А л і н а. Філосаф...

Б у с л а й. Дай мне апахмяліцца, я яшчэ не такое загну... Я іншым разам такім разумным бываю, аж страх бярэ... Твой пісьменнік, мабыць, з-за гэтага і прыцягнуў мяне да сябе на хату... Як жывы персанаж. З мяне нашарашыць раман — раз плюнуць... Паднясі толькі чарку ды салёненькі гурочак, я такое магу ўляляшчыць — ніводзін вучоны не разбярэ. Во ўчора, мабыць, калі з ім паддавалі...

А л і н а. Ды не мог ён з табой піць...

Б у с л а й. Адкуль ты ведаеш?

А л і н а. Ён не п’е...

Б у с л а й. Саўсім?

А л і н а. Зусім. Гарэлка супраць прыроды.

Б у с л а й. Не зразумеў...

А л і н а. Гэта зелле вынайшла чалавецтва... У натуральным стане спірт не сустракаецца... Гэта вынік распаду, гніення... Ніводная жывёліна спірт ужываць не будзе.

Б у с л а й. Чалавек не жывёла, дарагуша... У яго ў гэтым кацялку *(паляпаў па галаве)* думкі розныя. Калі сабаку навучыць думаць, і сабака піць пачне... І не курыць?

А л і н а. Не. Гэта таксама супраць прыроды...

Б у с л а й. Ну, а астатняе па прыродзе... Добра ён цябе тут лечыць?

Аліна падыходзіць і з усяго размаху б'е Буслая па шчацэ.

А л і н а *(вельмі спакойна)*. Я табе сказала, хамула, ён святы чалавек! А калі ты яшчэ раз якую-небудзь пашляціну ляпнеш пра яго, я магу цябе забіць. Ты чуеш?

Б у с л а й. Дзе там чую?! У мяне ад тваёй аплявухі ў вушах звініць. Ну й ручка! Адбойны малаток... Дай што-небудзь выпіць! Мне жыць не хочацца.

А л і н а. Ідзі ў ванну і пі з-пад крана...

Б у с л а й. Ваду не выпіваюць, а п'юць... А мне выпіць трэба...

А л і н а. Прыйдзе гаспадар, у яго і папросіш...

Б у с л а й. Ну, пашкадуй ты мяне! Чарачку, маленькую... Га?

А л і н а. Адчапіся!

Б у с л а й. Ты не жанчына, ты баба-яга...

А л і н а. Яна таксама жанчына...

Б у с л а й. Жанчына, але ведзьма... Тады так... Я ніцма кладуся на ложак і не варушуся, а ты сядзі і маўчы як рыба. У мяне сіндром. Колькі цяпер?

А л і н а. Палова дванаццатай...

Б у с л а й. У дванаццаць буду скрыгатаць зубамі... Не палохайся...

А л і н а. Зараз кавы звару, вып'еш, палягчэе...

Б у с л а й. Што мне твая кава? Знайдзі хоць адэкалону глыток... Мяне ж ужо ліхаманка біць пачынае... Ты што, думаеш, я дурня строю? Я ж кончаны... Гэта ж хвароба...

А л і н а. Жудасць! *(Знікае на кухні.)*

Б у с л а й *(корчыцца на ложку)*. Божухна, як цяжка... Душа пад каменнем... І страшна... І дзіка... *(У роспачы б'е кулаком па сцяне...)*

І раптам невялікі чатырохкутнік сцяны паварочваецца, і адчыняецца адмыслова зроблены бар з цёмнымі бутэлькамі і зіхоткімі чарачкамі. Буслай як у сне падымаецца, дрыжачымі рукамі хапае бутэльку, з неймаверным намаганнем спрабуе рукой выцягнуць корак. Нічога не атрымліваецца. Выцягнуў корак зубамі, прыліп ротам да рыльца. Зубы стукаюць аб шкло. Жудаснае відовішча! Уваходзіць А л і н а.

А л і н а. Што? Што ты робіш?

Буслай, не адрываючыся ад бутэлькі, мычыць нешта ў адказ.

*(Падбягае і вырывае з яго рук бутэльку.)* Ты ведаеш, што ты выжлукціў?

Б у с л а й. Адзін чорт! Гарэлкай пахне, і добра... Я перапіў ужо ўсё на свеце: дэнатурат, бээфы, ласьёны, зубныя пасты... *(З палёгкай.)* Фу-у, Бог у тапачках па душы прайшоўся... Што гэта такое?

А л і н а. «Напалеон»...

Б у с л а й. Які? Банапарт?

А л і н а. Ён самы.

Б у с л а й. Што, сродак супраць молі?

А л і н а. Каньяк. З гэтай бутэлькі пазаўчора італьянская дэлегацыя піла...

Б у с л а й. Глядзі ты! А на смак як палітура... *(Смяецца.)* Ніколі не думаў, што буду з праклятымі капіталістамі з адной бутэлькі піць... Во лёс! Дай сюды, я не разабраўся як след...

А л і н а *(хавае бутэльку ў бар)*. Пераб'ешся... Пі каву!

Б у с л а й. Ладна! Я ўжо ў норме... Заскакалі чорцікі па жылах... *(Падымаецца з ложка, робіць некалькі гімнастычных практыкаванняў. Твар пасвятлеў, ажывіўся, набыў натуральны для здаровага чалавека выраз і колер.)* Ведаеш, Аліна, гарэлка — вялікае дзела! Мне Бэра казаў, што Ісус Хрыстос як толькі навучыўся цуды рабіць — першае, што ўчудзіў, — ператварыў ваду ў віно... Во! Хто-хто, а ўжо Хрыстос ведаў, што чалавеку патрэбна... Чаго ты вылупілася? Гэта па Бібліі так... Ух, каб я гэтыя цуды мог рабіць! Я б яе, родненькую, у водаправод пусціў бы... Піце, людцы!

А л і н а. Ты нават і Біблію чытаў? Бэра такі, як і ты, канечне?

Б у с л а й. Ты што-о? Ён на службе... Кацельную ў райспажыўсаюзе паліць... На сваім хлебе.

А л і н а. А ты?

Б у с л а й. А я ў яго прыжывала... З восені ўжо. Не бяруць нікуды. Ды і самому не надта хочацца... Я ўжо канчаны.

А л і н а. Ты з вёскі?

Б у с л а й. Ага...

А л і н а. Сям'я ёсць?

Б у с л а й. Ёсць. І жонка ёсць. Замуж нядаўна выйшла... Усё ёсць, аднаго мяне няма...

А л і н а. Як цябе горад сапсаваў, беднага...

Б у с л а й. Я, Аліна, у горад прыехаў ужо сапсаваны ўшчэнт. Пры чым тут горад? Як што якое, дык адразу на горад валяць:

ах, такі-разгэтакі, жыццё мне загубіў! А на які чорт ехаў тады? Ну, чаго ты так глядзіш на мяне?

А л і н а. А ў нас у дзетдоме на двары калодзеж быў... Зазірнеш у яго, і страшна робіцца... Вось я зараз зірнула на твае вочы і гэты калодзеж успомніла...

Б у с л а й. Што, пустыя?

А л і н а. У калодзежы была вада... Блішчыць, але далёка-далёка... Глыбокія ў цябе вочы...

Б у с л а й. Глядзі, не закахайся.

А л і н а. І мёртвыя...

Б у с л а й. У цябе жывыя?

А л і н а. І ў мяне мёртвыя... Вось ён хутка прыйдзе — убачым жывыя... Глядзіць, а табе хочацца сэрца сваё адкрыць...

Б у с л а й. І кофтачку расшпіліць...

А л і н а. Я цябе папярэджвала, падонак... *(Моўчкі ідзе на Буслая.)*

Б у с л а й. Ну-ну-ну! Ты што, ненармальная?!

А л і н а. Я цябе папярэджвала.

Б у с л а й. Я пажартаваў... Выпі вады, на цябе ж глядзець страшна...

Адчыняюцца дзверы. На парозе Д р а г у н. Танклявы юнак гадоў дваццаці. У яго абліччы ёсць нейкая зацятасць і сканцэнтраваны спакой. Апрануты проста, што не адпавядае яго ўзросту.

Д р а г у н. Добры дзень...

Б у с л а й. Здароў, братка! Ты гаспадар ці таксама пацыент? Калі гаспадар, сунімі ты гэту кошку, яна мне вочы збіраецца выдраць...

Д р а г у н *(да Аліны)*. Супакойся, Аліна...

А л і н а *(да Буслая)*. Пайшоў вон адсюль!

Д р а г у н. Аліна! Ён прыйшоў не да цябе... *(Падае часопіс.)* Вось пачытай і супакойся... Гэта пра цябе... Толькі што купіў у кіёску...

Аліна бярэ часопіс, адыходзіць убок, чытае.

Б у с л а й *(з нахабнай усмешкай да Драгуна)*. Значыць, так... завуць мяне Андрэй Буслай...

Д р а г у н. Ну, што ж, зараз будзем снедаць, Андрэй... Як спалася на новым месцы?

Б у с л а й. Як у Бога за пазухай... Дзякую. Калі ты з гэтай *(кіўнуў на Аліну)* нешта напісаў — з мяне пяць камедый накрэмзаеш. Увесь свет смяяцца будзе... Ты малайчына, так і трэба... З жыцця чэрпаць, з народу! А народ дзе? У забягалаўках...

Д р а г у н. Прабач, я нешта нічога не разумею...

Б у с л а й. Як я зразумеў, нешта такое ты пра яе напісаў... Пра яе можна напісаць, яна з выгляду трохі чокнутая, а я яшчэ

лепей... Я ўжо да донца дакаціўся. Не падвяду! Усё, усю душу табе выверну, як памыйнае вядро... Пішы! Праслаўляйся! А мне за гэта толькі зранку і вечарам па кроплі «Банапарта». Згода?

Драгун. Не.

Буслай. Няўжо табе не цікава пачуць, як я дажыўся да такога?

Драгун. Не.

Буслай. Вы ж, пісакі, толькі пра ненармальных і пішаце, а я ненармальны са знакам якасці... Я ўжо і не чалавек, лічы што...

Драгун. Я не пісьменнік, я тут толькі жыву...

Буслай. А-а, таксама пацыент... Тады я гаспадара пачакаю... Будзе ён пра мяне пісаць, я ведаю...

Драгун. Не будзе.

Буслай. Чаму?

Драгун. Ён піша казкі... І потым, ты ж сябе за чалавека не лічыш, а ён піша пра людзей.

Буслай. Дык на які ж чорт ён мяне зацягнуў сюды?

Драгун. Ніхто цябе нікуды не цягаў... Ён вяртаўся ўчора са Светлага і знайшоў цябе за горадам. Ты ляжаў у гурбе снегу, накрыўшыся «Советским спортом».

Буслай. А дзе ён цяпер?

Драгун. У паліклініцы. Калі ён цябе грузіў у сваю машыну, ты разбіў яму акуляры і шклом парэзаў твар...

Буслай *(паспешліва)*. А-а, дык я гэта... пайду тады... Раз пісаць пра мяне ён не будзе, я магу зараз пайсці?

Драгун. Канечне...

Буслай. Толькі дай руб, раз вы тут такія добрыя... Я ж са Светлага. Даехаць мне трэба?

Драгун. Аліна, колькі каштуе білет да Светлага на электрычцы?

Аліна. Дваццаць капеек...

Драгун. Дай, калі ласка...

Аліна *(дастае з сумачкі манетку)*. Бярыце...

Драгун. Бяры...

Буслай. Ты што? На піва нават не хопіць.

Драгун. Табе на білет ці на піва?

Буслай. На «чарніла».

Драгун. Гуляй...

Буслай. Ну й скнары ж вы! Жывуць, разумееш, як паны, каньяк французскі глушаць, хату пад селяніна згаблявалі, а простаму селяніну рубля шкада... Перадайце вашаму пісьменніку, што я на яго плюю. Вось так, вось: цьфу, і ўсё! Развесіў ручнікі!

Хай у вёску едзе, а тут камедыю не ламае... Селянін на дзевятым паверсе, ёлкіна маць!

А л і н а. Замаўчы ты!

Б у с л а й. Сама маўчы, авечка джынсавая. *(Выходзіць.)*

А л і н а. Хамула няўдзячны!

Д р а г у н. Аліна! Ён жа цябе прасіў: ніколі і ні пра кога, апроч сябе, не думаць і не гаварыць блага...

А л і н а. Але ж ты чуў, што ён тут...

Д р а г у н. Яму можна. Табе — не.

А л і н а. Прабач...

Адчыняюцца дзверы. Гэта вярнуўся Б у с л а й.

Б у с л а й. Я на хвілінку... Навошта ён мяне падабраў учора за горадам п'янага?

Д р а г у н. А хіба ты не падабраў бы яго? Калі б ён ляжаў у снезе.

Б у с л а й. Я — іншая справа... У мяне машыны няма. А яму навошта гэта было?

Д р а г у н. Не ведаю... Мабыць, не хацеў, каб ты акалеў там да раніцы ў адной кашулі... У цябе што, паліто няма?

Б у с л а й. Сябру даў панасіць... А чаму ён не здаў мяне ў міліцыю? Завёз бы, выгрузіў, і ніякіх клопатаў...

Д р а г у н. Не па дарозе было...

Б у с л а й. Дай руб.

Д р а г у н. Паліто магу даць...

Б у с л а й. Давай паліто!

Драгун падыходзіць да шафы, дастае паліто.

Д р а г у н. Апранай.

Б у с л а й. Стараватае, канечне.

Д р а г у н. Можа, дублёнку даць?

Б у с л а й. Жартую. Ну і выпіць на дарожку, а то мяне блажыць пачынае.

Д р а г у н. Той, хто п'е ці дае піць іншаму, робіць злачынства супраць прыроды...

Б у с л а й. Ну-у, тады ўсе чатыры мільярды трэба ў каталажку заканапаціць... *(Шэптам.)* Слухайце, а можа, вы якіянебудзь сектанты? Га? Дык я магу і памаліцца за кампанію, толькі дайце кроплю...

Д р а г у н. Так, дружа, дажыўся ты... У сне такога не ўбачыш... Бывай здароў...

Б у с л а й. Дык вы б хоць паагітавалі мяне, ці што? Усе ж агітуюць...

Д р а г у н. Ідзі...

Б у с л а й. Во, чудзікі... *(Выходзіць.)*

Паўза. Аліна паклала часопіс на калені, уздыхнула.

Д р а г у н. Прачытала?

А л і н а. Казка... Добрая казка...

*З а ц я м н е н н е*

Дэкарацыі амаль тыя ж, толькі гэта ўжо самая сапраўдная вясковая хата. Тэлевізар, радыё, канапа. Над ёй дыван з мядзведзькамі. Печ. На печы старая М а ц і Андрэя Буслая. На канапе спіць Б а ц ь к а. Ціха шчоўкаюць ходзікі. Ноч.

М а ц і *(трызнячы)*. Андрэй... Андрэйка... Дзе ж твае валёнкі, сукін сын? Чаму ж ты кашулю скінуў, халадзіна гэткая...

Б а ц ь к а *(падымае галаву)*. Маруся! Чаго й та ты?

М а ц і. Міцік... гэта ты?

Б а ц ь к а. Хто ж яшчэ? Чаго ты маркочаш сярод ночы?

М а ц і. Вой, саснілася мне нешта нядобрае пра Андрэя... Як быццам поле снегавое як вокам кінуць... Ані дрэўца, ані кусціка... І ён стаіць сярод гэтага поля босы, без кашулі, у адныхісподніках... Бягу да яго, а ён стаіць, не варухнецца, і толькі слёзы па шчоках, па шчоках ды на снег... Капнуць ды чырвонай плямай разыходзяцца, кроў — як слова... Сэрца як з грудзей не выскачыць... Вой, нядобра нешта з ім.

Б а ц ь к а. Гэта ад хваробы ўсялякая лухта прымроіцца... Спі.

М а ц і. Гэтулькі год анізвання. Хоць бы пісьмо даслаў, сукін сын... І чым жа гэта мы так саграшылі, Міцік, што Бог нас так неўзлюбіў? Дзетак нарадзілі, збераглі ад бяды-ліха, і во... Памятаю, у партызанах, калі вёскі ўсе ў акрузе папалілі, галадуха была, Божухна ты мой мілы! Настулька маленькая грудзей насмокчацца дый спіць, ёй і гора мала. А Андрэйку ўжо шосты гадок ішоў... Кару бярозавую грызлі... Я гэтай кары нажву, нажву ў кансерку нямецкую, потым употай ад яго ў ельніку ў гэту кару малака з грудзей націсну колькі змагу дый даю яму есці... Есць дый пытаецца: матулечка, а чаму гэта кара такая салодкая, белая ды смачная? Праўду скажы, дык есці не будзе, вялікі ж ужо... Так, кажу, дзетухна, гатаваць я яе ўмею... Колькі выцерпелі ўсяго, і во... Настульку зямля забрала, і Андрэйка па свеце, як па цёмным лесе, бадзяецца... А нам паміраць, бы пустазеллю якому, трэба будзе...

Б а ц ь к а. Ну во, завялася сярод ночы...

М а ц і. Гэта ж я чую, што памру неўзабаве...

Б а ц ь к а. От бабы... Колькі разоў хварэюць — столькі паміраюць.

М а ц і. Грэх сказаць, паплакаць на хаўтурах не будзе каму...

Б а ц ь к а. За гэта не перажывай. Суседкі пагалосяць... Хаця нашто?

М а ц і. Яно-то праўда. А ўсё ж неяк бы там весялей было, каб свой, родны, слязой на магілку капнуў...

Б а ц ь к а. До табе ўжо! Вось пеўні закукарэкаюць, тады і пра смерць можна...

Паўза.

М а ц і. Слухай, Міцік, учора да мяне Васіліна заходзіла. Вы, кажа, яго, Андрэя, значыцца, праз міліцыю знайдзіце...

Б а ц ь к а. Што-о?

М а ц і. Скажыце, кажа, там, што ён Канстытуцыю парушае, самы галоўны закон. А там, як слова, запісана, што дзеці пра сваіх бацькоў клапаціцца павінны... Га, Міцік? Мо яго па Канстытуцыі дадому прыцягнуць?

Б а ц ь к а. Старая дурніца твая Васіліна! Клапаціцца — значыць грашыма дапамагаць... Карміць, як раней казалі. А што, нам есці няма чаго? Дзве пенсіі, гарод, малако сваё, сала, паўтары тысячы на кніжцы. Смяяцца ж будуць...

М а ц і. А калі б нічога не было?

Б а ц ь к а. Тады б яго знайшлі, аліменты прысудзілі.

М а ц і. Ты што? Аліменты — гэта ж на бязбацькавічаў...

Б а ц ь к а. На ўсіх. Хто, значыцца, здзяцініцца — таму і аліменты. Ай! Лепш ужо, як ты кажаш, бярозавую кару грызці, чым з роднага сына па Канстытуцыі аліменты драць... Забыўся — Бог яму суддзя! Ён пра сына свайго забыўся, а што ўжо мы...

М а ц і. Ды не забыўся, Міцік! Не мог ён пра нас забыцца... У яго ж сэрца жаласлівае... З гора, з сораму ён сюды вачэй не кажа... Каб гэта цытра вучоная не кінула яго тады, не збегла да Міколы, жыў бы ён тут...

Б а ц ь к а. А піць з якога гора-сораму ён пачаў?

М а ц і. Кажуць, што Мікола Рыгорку на сваё прозвішча хоча запісаць... Мо нам бы, Міцік, высудзіць свайго ўнучка як? Га?

Б а ц ь к а. Ды што гэта ты пад старасць судзіцца з усімі задумала? Век не судзілася, а цяпер...

М а ц і. У яго ж ёсць бацька родны, і прозвішча яго павінна быць — Буслай... Рыгор Буслай... Наша сям'я, наш род, наша кроў... Хіба ж можна яго сціраць з жыцця?

Б а ц ь к а. З кім судзіцца? З роднай маці? З чалавекам, які корміць яго? З Міколам? Сам ён, сынок наш, сцёр з жыцця і сябе і сям'ю сваю. Колькі жыву, ніводнага разу не бачыў, каб чалавек піў так заўзята... Як хвароба нейкая на яго навалілася,

як насланнё... Гарэлкай, нібы паводкай, усё і затапіў: і хату сваю, і сябе, і жонку, і сына...

М а ц і. Не кажы пра яго так! Ён жа сын табе. Ну, што ж рабіць, калі на яго такое няшчасце звалілася...

Б а ц ь к а. Якое няшчасце? Ён што, аднарукі, сляпы, кульгавы? Няшчасце... Мо яго няшчасце ў тым, што ты малаком са сваіх грудзей усё жыццё яго карміла! Мо няшчасце ў тым, што шчасця занадта тоўстую лусту лёс адмераў...

М а ц і. Кроў дурная гэта ў яго. Спадчына трухлявая. Кажуць жа, што ад бацькоў усё чыста да дзяцей пераходзіць... А Андрэй увесь па табе.

Б а ц ь к а. Дык калі ж гэта я піў? Ты што?

М а ц і. Не ты... Дзед твой, кажуць, жлукціў яе, брыдоту гэту, як конь з цэбра... Во яна, кроў гэта п'яная, і вылезла ў ім...

Б а ц ь к а *(трохі зазлаваў)*. Ёрш тваю ў лапці! Чаго ж ты яго нарадзіла гэткім? Трэба было сваёй крыві больш дабаўляць!

М а ц і. Дык твая ж гарачая, упартая... Яна заўсёды верх возьме...

Маўчаць.

Не сярдуй, Міцік... Я ж не за сябе перажываю... Мне ўжо што? Я дасмылела на гэтым свеце, а табе яшчэ аднаму жыць дый жыць...

Б а ц ь к а. Ага! У сваты яшчэ збегаю...

М а ц і. А што ты думаеш? І жаніся.

Б а ц ь к а. Цьфу!

М а ц і. Трэба ж, каб нехта каля печы тупаў. Во Васіліну і бяры. Яна баба добрая, руплівая... Разам і дажывяце.

Б а ц ь к а. З глузду з'ехала? Спі ты ўжо! *(Паўза.)* Я, Маруся, калі з табой што якое і здарыцца, таксама тут не затрымаюся. Зрасліся мы з табой адно з адным за ўсё жыццё... Як лісце з каранямі. Карані памруць — лісце пажухне. Як жа мне без цябе жыць, валёнка ты мая старая? У нас жа, лічы, і сэрца ўжо адно: палавіна твая, а палавіна мая... А з палавінкай ці многа нажывеш?

Маўчаць.

М а ц і. Ты, Міцік, глядзі! Даганяць мяне там і не думай... Гэта нягожа туды за сабой цягнуць... Жыві, колькі Бог адважыў, а то я не прыму цябе там...

Б а ц ь к а. Дзе ты дзенешся?

М а ц і. Адвярнуся ў труне да цябе гэтым самым месцам ды так і буду ляжаць...

Б а ц ь к а. Ёрш тваю ў лапці! А чаго гэта ўжо ты са мной як нябожчыца размаўляеш? Бач ты яе! Навастрыла лыжы! Сабралася! Хто табе сказаў, што ты першая туды застрыгікаеш?

М а ц і. Чую я. Сны дрэнныя сняцца. Не на дабро... І сэрца ные...

Б а ц ь к а. Давай спаць класціся... Што б там ні было, да світанку трэба дажыць...

Паўза. Потым нехта трывожна пастукаў у акно.

І каго ж гэта нясе ў такую рань? *(Падышоў да акна, узіраецца ў цемру.)* Хто там?

Г о л а с *(трывожна)*. Я, дзядзька Міцік, я... Мікола... Не пужайся...

Б а ц ь к а. Чаго ж мне пужацца? Зараз адчыню, ідзі на ганак... *(Старой.)* Мікола нечага прыпёрся...

М а ц і. Што яму трэба?

Б а ц ь к а. А ці ж я ведаю? *(Падымаецца з ложка, уключае святло, ідзе ў сенцы. Вяртаецца ў хату разам з Міколам.)*

Гэта каржакаваты, моцны мужчына. Светлавалосы, з цяжкімі рукамі. М і к о л а нечым узрушаны.

М і к о л а. Добры дзень...

Б а ц ь к а. Здароў...

М а ц і. Які ж дзень? Пеўні яшчэ не галасілі. Чаго ты белы як палатно? Ці не з Рыгоркам што?!

М і к о л а. Спіць Рыгорка, спіць... Як здароўе, цётка Маруся?

М а ц і. Ці ты на ноч гледзячы пра маё здароўе прыйшоў пытацца? Кажы!

М і к о л а *(няшчыра ўсміхнуўся)*. Я да дзядзькі... Мужчынская размова... Хадзі сюды, дзядзька... Грошай мне трэба... Калі ёсць... трохі...

Б а ц ь к а. Ці ў цябе сваіх нямашака?

Мікола не адказвае, адводзіць старога ўбок.

М і к о л а *(шэптам)*. З Цыбулек мне толькі-толькі званілі... Участковы...

Б а ц ь к а. Ну...

М і к о л а. Тэлефон у вёсцы толькі ў мяне і ў дырэктара школы... Кантора зачынена, заўтра выхадны...

Б а ц ь к а. Ды кажы ты нарэшце!

М і к о л а. Ну мне, значыцца, і званілі... Прасілі, каб перадаў...

Б а ц ь к а. Што?..

М і к о л а. У Дубровенск трэба з’ездзіць вам... Нешта там з Андрэем...

Б а ц ь к а. Што з ім?

М і к о л а. Не ведаю... Не сказаў участковы...

Б а ц ь к а. Брэшаш! Па вачах бачу! Кажы...

М і к о л а. Ну... здаецца, знайшлі яго... у Дубровенску...

Б а ц ь к а. Хто знайшоў? Міліцыя?

М і к о л а. Як быццам...

Б а ц ь к а. А што ён такое адмачыў, што яго міліцыя загрыбчыла?..

М і к о л а. Не тое, дзядзька, не тое... Пад снегам яго знайшлі...

Б а ц ь к а. А чаго ён пад снегам? Пад якім снегам?..

М і к о л а. Вясна... Сонца прыгрэла, адтаяў...

Б а ц ь к а. Дык як гэта? Забіў яго хто, ці як?..

М і к о л а. Не ведаю... Адным словам, участковы сказаў: трэба ехаць на апазнанне... Можа, і не ён гэта яшчэ... Трэба ехаць вам ці каму з родных... Я да Цыбулек давязу на матацыкле... Да першага рэйса паспеем... А там на вакзале ў міліцыю зойдзеце, скажуць. Ну я пайду... Дайце мне пяцёрку якую, я на вуліцы аддам...

Б а ц ь к а. Якую пяцёрку?

М і к о л а. Грошы...

Б а ц ь к а. Нашто?

М і к о л а. Ну, каб цётка падумала, што я сапраўды па грошы прыходзіў. Яна ж і так чуць ліпіць, а тут гэткае гора... Мо не казаць пакуль?

Б а ц ь к а. А дзе ты дзенешся? Не скажаш сёння — заўтра трэба будзе...

М і к о л а. Ну, як ведаеце... Пайду па матацыкл... *(Выходзіць.)*

Стары нейкі момант стаіць сярод хаты. Потым ідзе да печы, шукае анучы, сядае на зэдлік, пачынае абувацца.

М а ц і. Куды гэта ты?

Б а ц ь к а. У Дубровенск...

М а ц і. Чаго?

Стары абуваецца.

*(Ужо з трывогай.)* Што ён табе тут нашаптаў? Якія грошы?

Б а ц ь к а *(абуваецца)*. Во як яно выходзіць, Маруся... Мы з табой тут спрачаемся, каму ў зямлю раней легчы, а паміраць нам акурат і нявыкрутка... *(Усхліпнуў.)* Сына... апошняга... на магілкі... адвезці... трэба... Так што хопіць хварэць, потым ужо як-небудзь памрэш, падымайся, прыбірай хату да хаўтур...

М а ц і. Што ты пляцеш, пустабрэх стары!

Б а ц ь к а. Званілі Міколу... У Дубровенску знайшлі яго мёртвага пад снегам...

М а ц і *(з жахам)*. Каго?

Б а ц ь к а. Андрэя... Адпіўся, сынок... Сам адмучыўся і ўсіх адмучыў...

М а ц і *(спачатку ціха, а потым усё грамчэй і грамчэй)*. Ай-а-а-ай! А мой жа ты маленькі Андрэйка... А чула ж маё сэрцайка! А няшчаснае ж ты маё дзіцятка! За што ж табе такі злы лёс?! Сыно-о-очак!

*З а ц я м н е н н е*

Кватэра Пакутовіча. Вечар. А л і н а прыбірае. Больш нікога няма. Званок у дзверы.

А л і н а. Урывайцеся, не зачынена...

Дзверы асцярожна адчыняюцца, зазірае Б у с л а й. Без паліто. Спыняецца каля парога.

З'явіўся, філосаф...

Б у с л а й *(ніякавата)*. А ты яшчэ не пайшла? Так увесь месяц і сядзіш тут?

А л і н а. Дзе паліто? Прапіў?..

Б у с л а й. Дык думаў, што цёпла будзе... Скінуў, а тут такая халадзіна, хоць сам да сябе ў кішэню залезь. Падла, а не вясна! Спадарожнікамі ўсё перамяшалі: зіму, лета, восень... Вінегрэт з надвор'я зрабілі... І што гэта такое? Чым далей жывём, тым усё халадней і халадней...

А л і н а. Чаго прыйшоў? Ні чаркі, ні грошай ты тут не атрымаеш...

Б у с л а й. Мне б хлебца кавалачак... Я ўжо забыўся, калі еў... Бэра вудачкі зматаў некуды. Я трэці месяц за яго кацельную палю, а грошы гэтай сектантцы пасылаюць... Некалькі разоў бегаў на вакзал, цэмент разгружаў, а апошні тыдзень хварэў, дык кішкі падцягнула, да хрыбта прыраслі... Дай што-небудзь пакусаць, я і пайду...

А л і н а. Зараз... *(Выходзіць на кухню.)*

Б у с л а й. А дзе гаспадар?

А л і н а. Навошта ён табе?

Б у с л а й. Я яго кніжку чытаў...

А л і н а. Што ты кажаш? Няўжо ў бібліятэку хадзіў?

Б у с л а й. Купіў, у кіёску...

А л і н а. Подзвіг...

Б у с л а й. Для мяне — подзвіг... На адну бутэльку «чарніла» меней узяў, а кніжку купіў.

А л і н а. Па аўтограф прыйшоў?

Б у с л а й. Паесці... Пайшоў на заробкі... На вакзале пад мехам мукі ўпаў, алкашы прагналі з брыгады... У галаве туман, калені дрыжаць... Думаў ужо ў міліцыю ісці здавацца, а тут успомніў, зайшоў...

З кухні выходзіць А л і н а. У руках талерка з супам.

А л і н а. Бяры крэсла і сядай да стала...

Б у с л а й. Я і без крэсла магу...

А л і н а. Еш...

Б у с л а й. А хлеба?

А л і н а. Колькі ты не еўшы?

Б у с л а й. Ну, адразу як захварэў... На падаконніку знайшоў скарынку, згрыз, а болей, здаецца, нічога не еў. Тыдзень... Дай хлеба.

А л і н а. Дурань! З галадухі скруціць абаранкам. З'еш супу спачатку... Потым хлеба дам.

Буслай сядае да стала, прагна сёрбае суп.

*(З жалем і пагардай назірае за ім)*. Госпадзі, Божа мой! Дваццаты век, людзі ў космас лётаюць, а ты як жабрак ходзіш, пабіраешся... І не сорамна?

Б у с л а й. Не! Каб жа сорамна, Аліна! Каб жа сорамна было... Ці я б тут сядзеў... Спіць мая душа. Закалыхаў я яе... Закалыхаў, каб не мучылася, бедная... *(Есць.)*

А л і н а. А чаму ты дадому не едзеш?

Б у с л а й. Каб мець дом, трэба чалавекам быць... Мяне там не чакаюць... Мне не патрэбны ніхто, і я нікому... *(Есць.)*

А л і н а. Слухай, а чаму цябе не забяруць?

Б у с л а й. Куды?

А л і н а. Ну, у спецлячэбніцу, ці што? Лечаць жа вас такіх пад прымусам.

Б у с л а й. А ў мяне калектыву няма... Туды калектыў пуцёўку дае. Я ж не працую нідзе і без прапіскі жыву ў Бэры... Цішком туняядца ганяю... А так ніхто не здае. Во ён жа не завёз мяне ў міліцыю. А калі б завёз, я ўжо за жалезнай брамай сядзеў бы... Ды я і сам чатыры разы лячыўся... Добраахвотна... Бывала, што паху гэтай брыдоты не пераносіў...

А л і н а. Якой брыдоты?

Б у с л а й. Гарэлкі...

А л і н а. Гм...

Б у с л а й. Вось табе і «гм»... Ад аднаго паху ўсяго навыварат перакручвала... А ўсё адно пачынаў піць. Гвалтаваў сябе, давіўся, вочы ад агіды на лоб лезлі, а піў... На сэрцы, калі доўга не п'ю, такая пустэча, такі страх, боль нейкі... Не, не боль, а

нуда цягучая, якая смокча, смокча яе, душу маю расхрыстаную...

А л і н а. А сёння ты цвярозы?

Б у с л а й. Калі б я быў пад мухай, хіба мне б хацелася есці? Калі вып'еш — нічога не хочацца... Гэта я з-за хваробы так доўга не прыкладваўся да рыльца... А здаровы я б не вытрымаў... У мяне нерваў не хапае цвярозым доўга быць. Вельмі шмат пра што думаць пачынаю. Ты ведаеш, прыйшоў я аднойчы да гэтага... ну, што дурняў лечыць... Як іх называюць?

А л і н а. Псіхіятр.

Б у с л а й. Ага! Ён самы. Прыйшоў і кажу: прабіце вы мне чэрап і якую-небудзь жылку перацісніце, каб я меней думаў, каб дурнейшым трохі стаў, тады я піць кіну, не трэба ўжо будзе... Ты ж бачыла: вып'е чалавек чарачку, дурнее адразу, сядзіць, усміхаецца, вачаняткі блішчаць, жыццём задаволены, усіх любіць, усіх перацалаваць гатовы... Добры, спагадлівы... У яго душа спявае ад радасці... Чаму ж мы цвярозыя не такія?

А л і н а. Гэта самападман. Так толькі здаецца...

Б у с л а й. Калі верыш у тое, што здаецца,— гэта ўжо не здаецца, гэта ўжо ёсць. Ну й думаю... зрабіць бы што-небудзь у галаве, каб усяго, што ёсць, не бачыў, каб усяго, што лішняе, не разумеў. Каб менш думаў і больш адчуваў...

А л і н а. Ну, і што псіхіятр?

Б у с л а й. Выгнаў. Дэгенератам абазваў і выгнаў. Кажа, людзі з сябе жылы цягнуць, маладосць сваю за кніжкамі слепнуць, каб болей ведаць, каб болей пазнаць, каб хоць крышачку наблізіцца да ісціны, а ты добраахвотна прыйшоў у дурні запісвацца. А нашто мне гэта ісціна? Людзі за той час, які яны топчуць гэту зямлю, ужо столькі навыдумлялі, ужо столькі панавыходзілі — у самай разумнай галаве не змесціцца... А хіба яны сталі шчаслівейшыя, лепшыя, чысцейшыя? Ісціна...

А л і н а. Ты ж вясковы... Адкуль у цябе гэта ў галаве?

Б у с л а й. Не ведаю. Я з вывіхам нейкім нарадзіўся. Усе мае аднагодкі жывуць сабе спакойненька, а я не жыву, а думаю... А ад думак моташна робіцца. Вып'ю, усё робіцца зразумелым, радасным і ўсе праблемы прыемнымі робяцца, прасплюся — усё спачатку.

А л і н а. Няўжо ва ўсіх, хто п'е, галава забіта гэткім тлумам?

Б у с л а й. Ды не, мабыць, не ва ўсіх... Але ўсе адчуваюць, што дрэнна, не так жывуць, таму і...

А л і н а. Зараз катлет прынясу...

Б у с л а й. І хлеба! Ты за мой жывот не перажывай. Ён у мяне цвікі пераціраць можа. Прывучаны! А мо і кроплю дасі?

А л і н а. У гэтым доме не п'юць.

Б у с л а й. А каньячок?

А л і н а. Для замежнай дэлегацыі. Італьянскія пісьменнікі прыходзілі. Давялося частаваць... А так ніхто ніколі не п'е...

Б у с л а й. Музей, а не хата... Што ён хворы, твой пісьменнік?

А л і н а. Чаму хворы?

Б у с л а й. Таму што ўсе здаровыя глушаць яе дай божа...

А л і н а. На катлеты, філосаф.... Еш....

Буслай есць катлеты.

Б у с л а й *(прагна жуючы)*. Дык дзе ж гаспадар?

А л і н а. Ён хутка прыйдзе...

Б у с л а й. Хачу яму сюжэцік загнаць... Рублі за тры... Было гэта ў Светлым. Ёсць у нас у новым мікрараёне прыпынак... «Безыменны» называецца... Дажылі! Ужо нечым прыпынак назваць... Ну, і насупраць гэтага прыпынку жыў кандыдат навук, лаўрэат нават... Па медыцыне... Сам вучоны, сам лаўрэат, сам доктар і сам жа хворы на гэту хваробу... Ну, калі цукру ўсюды поўна, і ў крыві, і ў унітазе... Хоць ты ім чай саладзі...

А л і н а. Цукровы дыябет?

Б у с л а й. Ага! І вось аднойчы мінулай восенню рабіў лаўрэат у сваёй кватэры рамонт... Апрануў нейкі задрыпаны пінжачок, чаравікі стаптаныя, старэнькія штаны... Твар у яго быў праставаты, выхадзец, як цяпер кажуць, і ў гэтым абліччы ханыга ханыгам... І не пераапрануўшыся выбег за нечым у магазін са сваім цукровым дыябетам... Толькі да прыпынку дайшоў — тут яго і схапіла: затрасло, ледзьве да лавачкі дабраўся... Прысеў, потым прылёг, і ку-ку! Паднялі яго з лавачкі праз сем гадзін ужо задубелага... За сем гадзін ніводзін чалавек не падышоў... Кажуць, потым у труну не маглі запіхнуць... Сам вінаваты, лаўрэат... Ідзеш у магазін — апрані гальштук, а то ці мала хто валяецца... Няўжо гэта гісторыя трох рублёў не каштуе?

А л і н а. Даражэй, намнога даражэй...

Б у с л а й. Я хадзіў на гэты «Безыменны»... Пасядзеў на лавачцы, дзе кандыдат медыцынскіх навук Богу душу аддаў... Сяджу, аўтобусы пад'язджаюць, ад'язджаюць, а я людзей лічу... Дзвесце чалавек налічыў! За адну гадзіну! Без старых, дзяцей, цяжарных жанчын... Дзвесце на сем... Падумаць страшна! І ўсе яго бачылі! Ну дай хоць рубель за расказ, а ён хай паспрабуе казку напісаць...

А л і н а. Я ведаю, куды пойдзе гэты рубель...

Б у с л а й. А табе якая справа?

А л і н а. Я цябе шкадую...

Б у с л а й. Ух ты! Месяц назад вочы хацела выдраць, а цяпер ужо шкадуе.

А л і н а. Я за гэты месяц як у чыстай крыніцы памылася... Дзякуючы гэтаму чалавеку...

Б у с л а й. Ды ёлкіна маць! Што ж ён ужо за чалавек такі, ваш казачнік?

А л і н а. Хутка прыйдзе. Убачыш... Ад яго нібы промні цеплыні ідуць. Ты вось яго не бачыў, толькі пераначаваў у яго і ўжо не такі, які быў раней...

Б у с л а й. Не-е, я такі...

А л і н а. У тваіх вачах боль з'явіўся...

Б у с л а й. А што ты хочаш?.. Цэлы тыдзень хварэў, не мог зарабіць... Не зарабіўшы — не вып'еш... Таму і боль... А твайму пісьменніку я не веру!

А л і н а. Твая справа.

Б у с л а й. Злосць мяне разбірае. Маеш ты машыну, жывеш утульна, ведаюць цябе ўсе... Едзеш і едзь! Ляжыць чалавек — не твая справа! Ёсць каму падымаць... Падымуць! Дык не... Спыняецца, цягне ў машыну, дадому вязе... Зірніце, які я добры! Ніхто не падняў п'янтоса няшчаснага, а я паспачуваў... Я ў ім чалавека бачу...

А л і н а. Так і ёсць. Апошняе ты сказаў правільна...

Б у с л а й. Паказуха ўсё гэта. Маральны капітал, які заўсёды можна абмяняць на звычайныя рублі і капеечкі...

А л і н а. А навошта ты расказваў пра гэтага беднага лаўрэата на прыпынку? Навошта ездзіў туды, лічыў людзей...

Б у с л а й. Каб ведаць, колькі чалавек і да мяне могуць не падысці...

А л і н а. А ты сам бы падышоў да яго?

Б у с л а й. Шчыра?

А л і н а. Шчыра...

Б у с л а й. Не! Цвярозы б не падышоў, а выпіўшы... Калі п'яны, мне ўсіх шкада, я ўсіх люблю... У мяне ў п'янага — слёзы з вачэй ад замілавання людзьмі, дрэвамі, зямлёй... Усімусім! *(Нечакана засмяяўся.)* А ведаеш, ён бы сам... каб можна яго было жывой вадой паліць, падняць і прывесці на гэты прыпынак... Ён сам да сябе не падышоў бы... Лаўрэат гэты... Галаву даю адсекчы — не падышоў бы!

А л і н а. Да самога сябе падышоў бы...

Б у с л а й. Ну, а да іншага? Да мяне, напрыклад?..

А л і н а. Калі ў чалавека баляць чужыя раны, ён падыдзе, спытае, дапаможа... Калі ён у іншых, як у люстэрку, сябе бачыць...

Б у с л а й. Тысяча чалавек прайшлі, і ніводзін не ўбачыў... Аслеплі, аглухлі... Душу сваю закармілі так, што ўсе нармальныя чалавечыя пачуцці толькі ў п'яным выглядзе вонкі вырыва-

юцца... А яшчэ галдзяць: чаму п'яце, чаму п'яце? Таму што вельмі ўжо цвярозыя сталі. Вельмі цвярозыя! А чалавеку хоць хвіліначку жаласлівым, добразычлівым пабыць хочацца...

А л і н а. А ці не занадта ў цябе шмат прэтэнзій да людзей?

Б у с л а й. Гэта і да сябе таксама... І ў мяне душа тлушчам заплыла... Во і п'ю з-за гэтага, і п'ю... Была ў мяне сястрычка, малодшая, Настулька... Купацца пайшла — утапілася, бедалага малая. Маці валасы на галаве рве, у бацькі скроні як снегам абсыпала за адзін дзень, а я стаю, хачу заплакаць, сястра ж родная, хачу і не магу! Здранцвенне нейкае найшло... Ды не, не! Не ад гора... Не шкада мне яе было! Разумееш? Ляжыць сястрычка, дзевяты клас скончыла, у труне, а ў мяне такія думкі: ну, яна шаснаццаць аджыла, мне ўжо дваццаць адзін, а ў шэсцьдзесят ці трохі пазней і я лягу ў гэты пенал... Ну якая розніца? Дык яна пражыла сваё кароценькае жыццё ўсхвалявана, толькі чысціню бачыла ва ўсім, а я ў брудзе вунь купаюся... Я ўжо і тады піў... І гэты самы бруд на той свет пацягну... Хто ж з нас болей выгадаў? Цвярозы быў, праўда... А на памінках выпіў, у галаву гарачы туман ударыў, заплакаў... Зірнуў на акно — сонейка чырвонае на лес садзіцца, а Настулька не ўбача ўжо гэтага... І плакаць праз сваё каханне не будзе! І першага пякучага пацалунка не будзе! І вяселля не будзе! І дзіцяці не будзе!.. Холад! Цішыня! Небыццё... Ёлкіна маць! Такі жаль сціснуў сэрца — спасу няма, ледзь адкачалі... Але гэта я п'яны быў... Прачнуўся — сорамна! Зноў тлустая душа пачуцці за горла схапіла... Сорамна... Чаму? Перад кім? Не ведаю... Бяда наша, Аліна, што мы слёз сваіх, шчырых слоў, чысціні сваёй саромецца сталі... І з чаго гэта пачалося? Калі?..

А л і н а. Я забылася, як цябе завуць... Прабач.

Б у с л а й. Буслай... Светлае ў мяне прозвішча. Ад буслоў... Птушак зямлі нашай... Птушак шчасця...

А л і н а. Як завуць?

Б у с л а й. Андрэем...

А л і н а. Ты хворы, Андрэйка...

Б у с л а й. А то як жа... Алкаш...

А л і н а. У цябе душа хворая...

Б у с л а й. Няма ў мяне душы... Мне яе гарэлка замяняе...

А л і н а. Ён хутка прыйдзе... Раскажы яму ўсё... Усё ад пачатку да канца... Не саромся, не думай ні пра што... Раскажы! Ён здольны прывесці тваю душу ў раўнавагу...

Б у с л а й. Яна ў мяне ў раўнавазе... Як вада ў балоце... Ды і што ён можа зрабіць? Кніжку фельетонаў напіша хіба?

Асцярожны стук у дзверы.

А л і н а. Калі ласка...

З'яўляецца К р а с о ў с к і. Гадоў сорак пяць, лысаваты, спартыўнага тыпу мужчына, які сочыць за сваім здароўем і знешнім выглядам. Трымаецца трошкі нахабна, але толькі трошкі. Пра такіх кажуць: упэўнены ў сабе, але не самаўпэўнены.Вельмі часта і абаяльна ўсміхаецца.

К р а с о ў с к і *(з усмешкай, Аліне)*. Вітаю вас...

А л і н а *(трохі разгублена)*. Добры дзень...

Б у с л а й. Здароў...

К р а с о ў с к і *(да Аліны)*. Вось так стой і не варушыся... Я павінен запомніць цябе з анучай у руках у кватэры чужога мужчыны... *(Аглядае з усіх бакоў.)* Непараўнальна! Я ў захапленні! Карціна, вартая вялікага Пікаса... Колькі самабытнасці, першароднасці, пратэсту... Якое гарманічнае спалучэнне! Фірменная джынсавая спадніца і брудная ануча! Якая замілаваная поза! Плакаць хочацца! *(Зірнуў на Буслая.)* Та-ак... А гэта, мабыць, новы круг сяброў... *(Падае руку.)* Красоўскі. Кандыдат навук...

Б у с л а й. Буслай... Алкаголік.

К р а с о ў с к і. Вельмі прыемна. Вы сябар гэтага дома?

Б у с л а й. Не. Пад'есці зайшоў. Галодны я...

К р а с о ў с к і. А-а, так сказаць, пажалавалі на званы абед?

Б у с л а й. А чаго ты?

К р а с о ў с к і. Што?

Б у с л а й. Прыдурка з сябе строіш?

К р а с о ў с к і. Я адчуваю, што ў вас было цяжкае дзяцінства...

Б у с л а й. У мяне ўсё жыццё цяжкае.

А л і н а *(ужо зусім спакойна)*. Хопіць блазнаваць, Красоўскі. Істэрыкі не будзе.

К р а с о ў с к і. Ба! Ты падлячыла нервы?

А л і н а. Душу. Душу я падлячыла...

К р а с о ў с к і. Ну, гэта амаль адно і тое ж...

А л і н а. Чаго табе трэба?

К р а с о ў с к і. Не па тэорыі, дзяўчынка. Спачатку пытаюцца, як ты мяне знайшоў, а ўжо потым...

А л і н а. Не блазнуй... Мне сумна і брыдка. Чаго прыйшоў?

К р а с о ў с к і. Пры нашых з табою юрыдычных і фактычных адносінах гэтае пытанне гучыць дзіўна...

А л і н а. У нас ніякіх адносін ужо няма. Ды і не было. Калі не лічыць пасцелі.

К р а с о ў с к і *(да Буслая)*. Будзьце так ласкавы, шаноўны... Я муж гэтай легкадумнай жанчыны і хацеў бы пагутарыць з ёй канфідэнцыяльна...

Б у с л а й. Што?

А л і н а. Ён нікуды не пойдзе. Не забывайся — гэта чужая кватэра, і ён прыйшоў не да мяне...

К р а с о ў с к і. Але, мяркуючы па анучы, ты ў нейкай ступені таксама гаспадыня... Ці толькі прыбіральшчыца?

А л і н а. Ты здагадаўся. Толькі прыбіральшчыца. Бруд знішчаю.

Б у с л а й *(да Аліны)*. Калі трэба, дык я...

А л і н а. Не трэба...

К р а с о ў с к і *(падыходзіць да Буслая, дастае з кішэні пяцёрку)*. Вось, калі ласка, схадзіце ў кіно і пакаштуйце марожанага...

А л і н а *(нервова)*. Красоўскі, не будзь быдлам!

К р а с о ў с к і *(усміхнуўшыся)*. Пазнаю ранейшую экспрэсію...

А л і н а *(нечакана)*. Прабач...

К р а с о ў с к і *(здзіўлена)*. Што?

А л і н а. Прабач...

Б у с л а й *(глядзіць на пяцёрку, глытае сліну)*. Ад кіно ўдзень спаць хочацца... А марожанае... Гланды ў мяне! Зразумеў? Гланды!

К р а с о ў с к і. Значыць, шкодна крычаць... *(Хавае пяцёрку.)* Ну, добра... Пры сведках наша размова не набудзе экстрэмальнага характару...

А л і н а *(мые падлогу)*. Слухаю...

К р а с о ў с к і. Я спадзяюся, ты не думаеш, што я з'явіўся сюды з-за бяссільнай рэўнасці ці духоўнай раны, якую ты нанесла мне сваім нечаканым знікненнем...

А л і н а *(працягваючы прыбіраць)*. Я так не думаю... Далей...

К р а с о ў с к і. У мяне шмат сяброў, даражэнькая... І мне абрыдла для кожнага выдумляць легенду, дзе ты і што з табой. Драздоўскім я, к прыкладу, сказаў, што ты ў Саратаве, ля ложка паміраючай цёткі... Нібы той поп з «Дванаццаці крэслаў», Антону Кірылавічу тлумачыў, што ты паехала ў Ялту лячыць нервы... Але ты ў горадзе, я чуў, што нават ужо працуеш...

А л і н а. Так, працую...

К р а с о ў с к і. Цікава ж, на якой ніве?

А л і н а. У дзіцячым садку...

К р а с о ў с к і. Выхавацелькай?

А л і н а. Нянькай...

К р а с о ў с к і. З глузду з'ехаць! Гэта ў цябе, мабыць, генная спадчына... Тут ануча, там гаршкі... Цікава, кім быў твой бацька?

А л і н а. Гэткай жа сволаччу, як і ты...

Б у с л а й. У нас у вёсцы адна цётка кожны дзень вокны мыла...

К р а с о ў с к і. А маўчаць у вашай вёсцы могуць?

Б у с л а й. Могуць. Каровы, калі іх за цыцкі цягаюць...

К р а с о ў с к і. А быкі?

Б у с л а й. Быкі рогі аб зямлю чэшуць...

К р а с о ў с к і *(да Аліны)*. Дык вось, цябе ў любы момант могуць сустрэць, і мне шмат чаго давядзецца тлумачыць. Я не хачу апынуцца ў цікавым становішчы. Улічы, я ніводнага разу за жыццё не трапляў у недарэчнае становішча.

Б у с л а й. Пражыў, як у бубен адбарабаніў...

К р а с о ў с к і. Адным словам, вось што: досыць шызаваць, сядай у машыну, паедзем дадому. Вечарам паедзем на дачу да Гарухіна. Ён абараніў доктарскую...

А л і н а. Я з ім спала...

К р а с о ў с к і *(не адразу)*. З кім канкрэтна? З гэтым (*кіўнуў на Буслая*) расстрыгам ці з дзеячам літаратуры, што прыгрэў цябе?

А л і н а. З Гарухіным. З тваім сябрам. Толькі не трэба, не трэба рабіць выгляд, што цябе гэта хвалюе ці табе гэта не было вядома...

К р а с о ў с к і. Я ад цябе споведзі ніколі не патрабаваў...

А л і н а. Дрэнна! Вельмі дрэнна. Кожнаму чалавеку патрэбна споведзь. Як святло, як вада, як хлеб...

К р а с о ў с к і. Ба! Які натхнёны выгляд. Сара Бернар! Плакаць хочацца!

А л і н а. Паплач.

К р а с о ў с к і. Саромеюся староніх...

Б у с л а й. А хто такая Бернар?

К р а с о ў с к і. Вялікая актрыса.

Б у с л а й. А чаму Сара?

К р а с о ў с к і. Таму што не Фрося. Ну, досыць, Аліна. Я дарую табе гэты літаратурна-драматычны ваяж, збірайся. Нам яшчэ трэба расстарацца мяса на шашлыкі. Ну? Прыгоды заўсёды тым і цікавыя, што яны калі-нікалі канчаюцца...

А л і н а. Скажы, Красоўскі, у цябе калі-небудзь балела душа?

Б у с л а й. Навошта яму душа, у яго гемарой ёсць...

К р а с о ў с к і. Як ты здагадаўся?

Б у с л а й. Па вачах. Яны ў цябе задуменныя...

К р а с о ў с к і *(дастаў ключы ад машыны)*. Усё! Паехалі... Ты ў гэтага казачніка грошы брала? Колькі? Мы пакінем іх тут на стале...

А л і н а. Я нікуды не паеду...

К р а с о ў с к і. Тады адкажы, псіхапатка, чаго табе не хапала?

А л і н а. Цяпла. Чалавечнасці. Веры.

К р а с о ў с к і *(іранічна)*. Надзеі і любві...

А л і н а *(сур'ёзна)*. Надзеі і любві... Ты, Красоўскі, злачынца...

К р а с о ў с к і. Цікава-цікава...

А л і н а. Ты з мяне, жывога чалавека, зрабіў рэч. Прыгожую, зручную рэч, якая зрэдку была табе патрэбна. Зрэдку. А калі надакучвала, ты яе не змігнуўшы вокам сплаўляў сваім сябрам... Госпадзі! Як я вытрымала ўсе гэтыя гады сярод бруду, шчырага, бессаромнага цынізму... Вы ведаеце... Вы — нежывыя людзі... Вы — мерцвякі...

К р а с о ў с к і. Што-што?

А л і н а. Так... Мерцвякі... І ты, і Гарухін, і Драздоўскі... Дзеячы навукі! Вы ж нічога не робіце і ці рабілі калі-небудзь? Пляваць вам на навуку, на людзей, на саміх сябе... Зразумелі, што сэнс жыцця ў асалодзе! Вышэйшая мэта — асалода! Заплылі сэрцы, азызлі душы... Небыццё! Жывяце, як статак жывёл! Прынцыпы, прыстойнасць толькі знешне, на словах, а ўнутры...

К р а с о ў с к і. Досыць! Калі Гарухін здолеў зацягнуць цябе ў ложак, не трэба свой грэх перакладаць на іншых...

А л і н а. Ён гэта зрабіў з тваёй маўклівай згоды, мой мілы... Гэтак жа, як і ты з яго Лялькай...

К р а с о ў с к і. Адкуль ты пра гэта ведаеш?

А л і н а. А ён падзяліўся... Сказаў, што свабода — прыкмета нашага часу.

Б у с л а й. Ну, браткі, вы і жывяце... Ёлкіна маць!

К р а с о ў с к і. Заткніся ты!

Б у с л а й. А ты мне шпунт дай!

К р а с о ў с к і. Зараз...

А л і н а. Пакінь яго ў спакоі. Ён не горшы за цябе і мяне... Можа, нават лепей. Проста няшчасны чалавек...

К р а с о ў с к і *(не адразу)*. Ну, добра... Мы благія, амаральныя, цынічныя... А ты сама? Калі ж ты чыстая такая, як жа гэта ў цябе атрымалася з Гарухіным?

А л і н а. Проста... Хацела стаць такой, як і вы... Замуж жа я за цябе здолела выйсці, гэтулькі гадоў здолела жыць, як пакаёвая балонка з блакітным банцікам на шыі... Захацела эмансіпавацца да канца! Цьфу! Слова ж якое паганае! Ну, а Гарухін заўсёды быў гатовы дапамагчы... Я думала, што доўга пакутаваць не буду. Душа прымае бруд гэтак жа, як і святасць... Анямее, і ўсё. Памрэ, іначай кажучы... Я і старалася ўсё зрабіць для гэтага. Вельмі ўжо цяжка жыць з жывой душой...

К р а с о ў с к і. Паслухай, ці не замнога? Раскажаш іншым разам... Пойдзем, прашу цябе...

А л і н а. Я піла гарэлку, старалася напівацца, не звяртаць ні на што ўвагі, з Гарухіным звязалася... Але... Нічога не атрымлі-

валася... I вось месяц назад ехала я ад гэтага тлустага вепра, сябра сям'і, ад Гарухіна... З любоўнага спаткання ехала... Цьфу! Ехала ў электрычцы і плакала... Пусты вагон... Ліхтары мільгаюць і слёзы... I тут падыхозіць ён... Зірнуў на мяне, нават не сказаў нічога, толькі зірнуў, а мяне нібы гарачай хваляй дабрыні, спагады, жаласці абдало... Дзетдом успомніўся... Была ў нас выхавацелька Лізавета Андрэеўна... Кожную нядзелю па чарзе вадзіла нас да сябе на кватэру... Малочным супам карміла... Тых, хто дрэнна вучыўся, часцей вадзіла... Я з-за гэтага двойкі старалася атрымліваць... Толькі яна так глядзела... Я ад гэтага позірку паднялася і ўсё расказала яму. Усё! I пра цябе, Красоўскі, і пра Гарухіна, пра сябе... Доўга расказвала, да самага горада... Ён выслухаў і кажа: ты ж прастытутка! Проста так, як быццам сказаў, што ў мяне прыгожыя валасы... Сказаў — і ў вочы глядзіць... Мне адразу лягчэй стала... Менавіта гэта слова мне павінен быў нехта сказаць... Ён сышоў... Я пайшла ўслед.

К р а с о ў с к і. Бяздомныя сучкі заўсёды гаспадара шукаюць...

А л і н а. Красоўскі! Так, як ты мяне абражаў раней, мяне ўжо ніхто ніколі не зможа абразіць...

К р а с о ў с к і. Ну, далей, далей...

А л і н а. Далей нічога не было... Ён прывёў мяне дадому, напаіў чаем, супакоіў, паклаў спаць...

К р а с о ў с к і. Побач?

А л і н а. Тут не тыя меркі, Красоўскі. Для гэтага чалавека жыццё і ўсё лепшае, што павінна ў ім быць,— святасць...

К р а с о ў с к і. Чытаў я прымітыўныя казачкі гэтага святога пісакі. Бяздарнасць! Усе кнігарні забітыя яго шэранькімі шэдэўрамі... Ніхто не купляе, і ніхто не чытае...

Адчыняюцца дзверы, уваходзіць Д р а г у н.

Д р а г у н. А вы, здаецца, прачыталі?

К р а с о ў с к і *(не разгубіўся)*. Давялося. Павінен жа я ведаць, што крэмзае чалавек, які спіць з маёй жонкай.

Д р а г у н. Раней, наколькі мне вядома, гэта вас не цікавіла...

К р а с о ў с к і. I раней і цяпер я ніколі не дараваў абразы. Нікому. *(Б'е Драгуна па шчацэ.)*

Драгун збялеў, увесь напружыўся. Аліна падбегла, схапіла яго за рукі.

А л і н а. Саша, мілы, я прашу цябе, не трэба... Не чапай яго! Чуеш? Не чапай... Даруй яму... Табе нельга яму адказаць тут. Нельга! Хочаш... Хочаш, я стану перад табой на калені? Даруй яму...

Б у с л а й. Яму, можа, і нельга, а я паспрабую...

К р а с о ў с к і. Ну, ну... Паспрабуй, лішэнец...

Б у с л а й. Зараз як гваздану па разумнай лысіне — вушы адклеюцца.

А л і н а. Супакойся! Ідзі, Красоўскі. Чуеш? Прэч адсюль!

Д р а г у н *(ужо спакойна)*. Ідзіце... Я не кажу «вон», таму што гэта не мая кватэра... Ідзіце. Тое, што вы згубілі, немагчыма вярнуць ні аплявухай, ні прыгожымі словамі, ні пагрозамі... Ідзіце.

К р а с о ў с к і. Та-а-ак... Значыць, ты не пісьменнік? Памылачка атрымалася... Прыношу свае прабачэнні...

Д р а г у н. Прабачце спачатку самому сабе. Астатнія вам даруюць...

К р а с о ў с к і *(раптам закрычаў)*. Што гэта ў вас тут?! Што?! Чаму вы так гледзіце?! Я гэту вашу секту разганю! Я вам пакажу споведзі, душэўныя размовы! *(Да Аліны.)* Ану, збірайся зараз жа і паедзем! Папярэджваю: калі ты тут застанешся, у твайго казачніка будуць зямныя непрыемнасці... Не сумнявайся, я ведаю, куды звярнуцца...

Д р а г у н. Ніхто не сумняваецца...

Б у с л а й. Ананімку нашрайбай... Пракурору. Маўляў, так і так... Людзі хочуць быць людзьмі. Непарадак.

К р а с о ў с к і *(да Аліны)*. Паедзеш?

Аліна разгублена маўчыць.

Д р а г у н. Не смей, Аліна... Чуеш, не смей!

К р а с о ў с к і. Апошні раз пытаюся... Паедзеш?

А л і н а. Не!

К р а с о ў с к і. Ну, добра, хрыстосікі прыпадачныя... Я вас завалаку на галгофу! *(Выходзіць.)*

Паўза.

Б у с л а й. Дык дзе ж ваш гаспадар?..

Д р а г у н. Ён хутка прыйдзе...

*З а ц я м н е н н е*

Хата старых Буслаёў. М а ц і стаіць на каленях перад пустым кутом.

М а ц і. Ды каб цябе чэрві не елі на тым свеце, ды каб на тваёй магілцы трава не расла, каб цябе ні неба, ні зямля не прынялі ніколі... Даруй, Божухна... Ніколі нікога не праклінала... Не магу... Як жа гэта ты дазволіў, каб нейкі ірад, нячысцік паганы прыдумаў гэту поскудзь, гэта зелле праклятае на згубу, на здзек

людзям?.. Усё ж на зямлі на радасць створана... Сонца свеціць — радуйцеся, дожджык зямельку мые — радуйцеся, людцы! Хто ж гэта пітво прыдумаў, каб яму сваёй крывёй апрэгчыся... Сыночак мой! Ці ж дзеля таго я цябе радзіла, малаком са сваіх грудзей выкарміла, ад бяды-ліха зберагла, каб ты такую нялюдскую смерць прыняў праз гэту атруту пякучую...

Уваходзіць Н і н а. Ёй гадоў трыццаць пяць. Прыгожая. Вясковае жыццё не паклала адбітак на яе знешнасць. Стройная, добра апранутая, прычэсаная. Гаворыць знешне спакойна, аднак бачна, колькі душэўных намаганняў каштуе гэты спакой.

Н і н а *(не адразу)*. Добры дзень, цётка Маруся...

М а ц і. Для цябе, можа, і добры... Чаго прыперлася? Што табе трэба?

Н і н а. Дзядзька не прыехаў яшчэ?

М а ц і. Ну што, дачакалася? Вольная, як птушка, цяпер... Радуйся.

Н і н а. Так, мне толькі радавацца... Прыдумаць не магу, дзе, у чым і перад кім так саграшыла, што пяты год гэткі цяжар, гэткую пакуту нясу на сваіх плячах...

М а ц і. Гэта ў цябе цяжар? Гэта ў цябе пакута? Як толькі твой язык паварочваецца такія словы гаварыць, сучка ты... Ты ж яго на той свет папіхнула! Ты! Адраклася ад яго, да Міколы збегла... Яго сам-насам з бядой пакінула, сына, крывінку яго, адабрала...

Н і н а. Вы ўсё што заўгодна кажыце, мне цяжэй не будзе... Хоць у твар плюньце... Я ледзьве не памерла гэтай ноччу, калі пазваніў участковы з Цыбулек... Здранцвенне нейкае найшло, холад па ўсім целе... Бы замерзла там, у Дубровенску, разам з ім... А можа, гэта і не ён там?

М а ц і. Каб жа... каб жа не ён...

Н і н а. Цётачка, мілая, я ж кахаю яго...

М а ц і. Мёртвых заўсёды любяць... А яму жывому твая любоў патрэбна была... Ды што там любоў! Хоць бы дапамога! А ты...

Н і н а. А што? Што я магла зрабіць? Чым дапамагчы?

М а ц і. Не кідаць аднаго! Волі вам багата далі. Я б вас, кру-цёлак гэткіх, што ад жывых мужыкоў бегаюць, пад суд бы, пад суд... Спакон веку такога бязладдзя не было. Чацвёра сходзяцца, васьмёра разыходзяцца! А каб і мы так! А каб і дзяды вашы так?! Што тады? Перавёўся б род людскі...

Н і н а. Я з ім пяць гадоў мучылася...

М а ц і. А я са сваім пяцьдзесят мучаюся! Ты што ж думаеш, у нас толькі купальскія кветкі ў жыцці былі? Усё было. Цярпела! Я цярпела, і ён цярпеў... Жыццё — гэта не цукерчына...

Гэта жыццё! А вы ад яго толькі салодкага хочаце! А хто горкае есці будзе?

Н і н а. І я б цярпела. Калі б яго гора якое напаткала. Цярпела б... Я яго з лыжачкі карміла б, як дзіця малое, сваімі слязьмі кожную раніцу яго абмывала, гаршкі з-пад яго выносіла і была б шчаслівай... А такога... Ён жа і на чалавека стаў не падобны! Азызлы, вочы пустыя, начамі зубамі скрыгатаў, а днём хадзіў, як пабіты сабака... І я ж вінаватая? І мяне ж праклінаць трэба?! Эх, цётухна...

М а ц і. Біцца за яго трэба было! Біцца!

Н і н а. З кім?

М а ц і. Хоць з д'яблам, хоць з Богам...

Н і н а. Усё я рабіла... Усё, што толькі можна было... Ласкі жаночай пазбаўляла...

М а ц і. Знайшла выйсце...

Н і н а. Апошні год не спалі разам. А яму на ўсё гэта напляваць! Піў, піў, піў! Гэта пахучая поскудзь усё можа замяніць: жонку, сына, маці, радасць, сэнс жыцця, будучыню... Усё! І з цвярозым размаўляла. І ўпрошвала, і пагражала, і зразумець стаeалася... А ён толькі адно: страшна мне, Ніна... Не ведаю, ад чаго, але страшна... Не разумела! Ну як жа было жыць далей? Цярпець, пакутаваць, як вы раіце? У мяне адно жыццё, цётка, адно! Мне хочацца жыць, радавацца, абдымаць цвярозага здаровага мужчыну... А за мае пакуты і слёзы мне ніхто не заплоціць...

М а ц і. Во! Вам плата за ўсё трэба... Вы за кожнае добрае слоўца хочаце па ведамасці атрымаць. Як пенсію... А вось я сваё жыццё бясплатна пражыла... І гэтулькі працавала бясплатна... І ў вайну з голаду і холаду ў партызанах бясплатна гібела... Хто ведае, ці не заплоціць мне хто-небузь дзе-небудзь за ўсё... Ці не аддасі гэтую самую плату, якую я не чакаю і на якую не спадзяюся...

Н і н а. Мы маладыя, нам пра гэта думаць нельга...

М а ц і. Пра ўсё трэба думаць, дзеўка, пра ўсё...

Уваходзіць Ф я д о с Ш а р г а ё ў. Аднагодак Андрэя. Высокі, сухі, заўсёды нейкі ўрачыста-ўсхваляваны. Стан яго зразумець цяжка: нешта сярэдняе паміж лёгкай апахмелкай і хранічным пахмеллем.

Ш а р г а ё ў *(з парога)*. Вось... прыйшоў. Сэрца прывяло, такскаць... Прыйшоў, значыцца, засведчыць... І паспачуваць. Мы з Андрэем сябры былі неразлучныя, мы з ім у лапту рэзаліся... і з урокаў разам уцякалі... Мне цяпер цяжка. Гора маё сэрца грызе, як свіння рэпу... Калі б галава не балела — заплакаў бы...

М а ц і. Што ты пляцеш тут, боўдзіла драўлянае?

Ш а р г а ё ў. Спачуваю. Мне ля магазіна ўсё расказалі... Так што, калі трэба магілку выкапаць,— я тут... Дзела, праўда, не-

вясёлае, але для Андрэя Шаргай што хочаш зробіць! Я для Андрэя сам у труну залезу, таму што чалавек ён быў з шарыкамі ў галаве і з болем у сэрцы...

М а ц і. Глядзі ты! Прыляцеў крумкач на здабычу... Магілку ўжо сыну майму капаць сабраўся, каб цябе ў мурашнік закапалі! А мо гэта і не Андрэй там саўсім? А ты яму магілку?

Ш а р г а ё ў. Калі не Андрэй, я яе зноўку закапаю... А выкапаць, цётка, трэба... Прымха такая... Выкапаеш, як быццам смерці кукіш пакажаш... А не трэба, дай Бог здароўя, я яе закапаю з радасцю... Для Андрэя я што хочаш зраблю...

М а ц і. На памінкі захацелася, паганая твая душа! Сябру свайму магілку гатоў выкапаць, абы толькі бельмы заліць свае...

Ш а р г а ё ў. Не з-за гэтага, цётка... Ты мне ў сэрца стрэмку не заганяй. Шаргай, можа, розум свой прапіў, здароўе прапіў, але сумленне... Я навогул на памінкі магу не прыйсці, а магілку выкапаю... Скажы толькі дзе: побач з Настулькай ці каля дзеда з бабай?

М а ц і. Пайшоў вон, ірад! А то во вазьму чапялу ды па мазгаўні тваёй дурной! Я табе выкапаю!

Ш а р г а ё ў. Не крыўдую. Таму што разумею — гора. Зямля цяперака мёрзлая, работы шмат, ломам дзяўбці трэба, а ў мяне рукі трасуцца... Адну толькі грамульку трэба... Ці рублік. І ўсё зраблю як мае быць... Ямачку акуратна і снег ад яе адкіну, каб, такскаць, утульна было і вада не замачыла...

М а ц і. Во-он!

Ш а р г а ё ў. Я не за грошы, вядома, а засведчыць... І таму, што рукі трасуцца... А там ломам трэба...

Н і н а *(не вытрымала, дастала з кішэні грошы)*. На, нягоднік, на табе траячку, толькі ідзі адсюль... Марадзёр!

Ш а р г а ё ў. Я мо і марадзёр, але за Андрэевага сябра замуж не выходзіў... *(Грошы бярэ.)* Толькі рублік, на чырвонае... Рэшту прынясу.

М а ц і *(ускочыла)*. Ну, ідзі, капай! Ты ж яму ўжо пры жыцці магілку выкапаў, калі спайваў яго ў сталоўцы штодня...

Ш а р г а ё ў. Памылачка! Частаваў ён мяне, не я... З маімі заробкамі і вераб'я не пачастуеш...

М а ц і. Ты ж яму яшчэ два гады таму і труну падрыхтаваў, і кашулю на смерць, і магілку... Ідзі, каб ты з галавы выйшаў, дарабляй сваё чорнае дзела! І вось яе забяры... Яна дапаможа! А прыйдзе яе кабель, я і яго выпраўлю на кладзішча сябруку яміну капаць... Ідзіце! Пахавайце чалавека, які ад сваёй маці адарваўся, а сярод вас прытулку не знайшоў... Ідзіце!

Ш а р г а ё ў. Не крыўдую. Таму што — гора. *(Выходзіць.)*

Н і н а *(праз слёзы)*. За што вы мяне гэтак? Вой, як цяжка... *(Хапаецца рукой за сэрца.)* Вой, што гэта? Я ж за ім услед магу пайсці... А Рыгорка, сыночак наш?.. Не трэба са мной так... Нават калі я і вінаватая... Усё адно не трэба... Мне не лягчэй, чым вам, цётка... Я за гэтыя гады такое пеpажыла — ворагу грэх пажадаць... Думала, з Міколам мне добра будзе, са школы ж кахае мяне... А мне яго каханне горай за пакаранне... Я і цяпер Андрэя вашага люблю... І Мікола гэта бачыць... Ён за гэтыя гады нацярпеўся са мной... Усё бачыць, усё разумее. Ніколі не кахала я яго, не кахаю і пакахаць не змагу... Да Андрэя маё сэрца прывязана... Не трэба так са мной...

Старая кідаецца да Ніны.

М а ц і. Заплач, чуеш, заплач... А то ў тваё сэрца зараз слёзы ўліваюцца, а гэтага не дай Бог... Заплач...

Н і н а. Нельга мне плакаць. Зараз Мікола вярнуцца павінен... Не хачу, каб на яго сэрца слёзы капалі... Хай ужо на маё...

Гул матацыкла. Маці скамянела.

М а ц і. Прыехалі... Госпадзі, твая воля, пранясі... Зрабі так, каб гэта не ён быў... Каб толькі не ён... Забяры ж ты ўжо лепей мяне, а яго пакінь жыць... Дзеля чаго ж я тады жыла, за жыццё чаплялася, аддавала ўсё, што толькі магла аддаць? Мне ж цяжка паміраць будзе... Коласам пустым у зямлю лажыцца...

Н і н а. Толькі б не ён, толькі б не ён...

Уваходзяць Б а ц ь к а і М і к о л а. Бацька моўчкі пачынае распранацца.

М а ц і. Ну?

Б а ц ь к а. Што?

М а ц і. Ён ці не? Ну не маўчы ж ты, пень стары! Рэж ужо адразу...

Б а ц ь к а. Ён...

М а ц і. Ты яго сам бачыў?

Б а ц ь к а. Бачыў. У трупярню міліцыя вадзіла. Ляжыць голы, зморшчаны, счарнелы, правае вока не закрыта... Сказалі, што з Новага года пад сугробам каля дарогі... Маразы тады былі лютыя, ды яшчэ з завірухай... Адпачыць лёг... Во і адпачывае... І бутэлька ў кішэні нявыпітая размерзлася... Не папіў усю... *(Дастае струхлелы пашпарт.)* А во і пашпарт... У сельсавет трэба занесці...

М а ц і *(раптам вельмі спакойна)*. Не-е, Божухна, няма цябе на свеце... Што хочаш са мной рабі, але няма цябе... *(Да Бацькі.)* Ці дужа ж страшны?

Б а ц ь к а. Гэтулькі ляжаць пад снегам... Толькі па вопратцы і пазнаў... Тут жа, у сельмагу, паліто куплялі... Ніна во яшчэ

купляла... Дый пашпарт у кішэні... Па пашпарту і нас знайшлі... Пайду да старшыні машыну прасіць... Дай грошай якіх-небудзь... Труну ў горадзе абяцалі дастаць па дзяшоўцы... Ай, сынок, сынок... Грэх які раней за бацькоў смерць прымаць...

М і к о л а *(да Ніны)*. Ідзі дадому, Ніна...

Н і н а. Я тут пабуду... Мо дапамагчы што трэба будзе...

М і к о л а. Як хочаш. А дзе Рыгорка?

Н і н а. Да маці занесла...

Б а ц ь к а. З'ездзіш са мной, Мікола?

М і к о л а. Навошта?

Б а ц ь к а. Дапаможаш... Не з міліцыяй жа мне яго грузіць...

М і к о л а. Добра...

Б а ц ь к а *(да Маці)*. Маруся, схадзі да каго, каб магілку выкапалі... Злева ад Настачкі... А ўжо з дзядамі мы ляжам... Ай, сынок...

М а ц і. Шаргай ужо наняўся... І аванс узяў.

Б а ц ь к а. Ну, Шаргай дык Шаргай... Дзела такое... Пойдзем, Мікола...

Выходзяць. Старая ўздыхнула, выцерла слёзы, спакойна і ўрачыста пачала рыхтаваць хату да хаўтур. Ніна як анямелая стаіць пасярэдзіне і не зварухнецца. Маці выключае радыё, якое недарэчна гучна гаворыць у хаце, падышла да ходзікаў, спыніла маятнік, пакорпалася ў куфры, дастала дзве чорныя хусцінкі, завесіла люстэрка, тэлевізар. Ніна здранцвела назірае за ёй. І раптам крычыць, апускаецца на падлогу, плача. Старая робіць сваё.

*З а с л о н а*

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Хата Буслаеў. Усё па-ранейшаму. Радыё маўчыць, ходзікі стаяць, на люстэрку і тэлевізары чорныя хусцінкі. На сцяне з чорнай стужкай партрэт Андрэя Буслая. Пасярэдзіне стол, на ім хлеб, салёныя агуркі, сала, малако, шклянкі. З могілак вяртаюцца М а ц і і Б а ц ь к а, Н і н а і М і к о л а. Марудна-марудна распранаюцца, маўчаць. А пра што гаварыць?

Б а ц ь к а. Ну што, будзем сядаць, га?

М а ц і. Пачакаем крыху... Бульбу пастаўлю, пакуль зварыцца — Шаргай магілку закапае... Божухна ты мой літасцівы, за што ж ты на нас так угнявіўся?

Б а ц ь к а. Ціха! На кладзішчы адплакала-адгаласіла, а тут нечага... Тут памінаць трэба... *(Да Ніны.)* А Рыгорка дзе?

Н і н а. Да маці завяла... Змёрз на кладзішчы... «Мама, мароз за вушкі кусае, апрані шапачку...» Што яму тут рабіць?

М а ц і. Як гэта што? Як гэта што? Гэта ж яго бацька!

Б а ц ь к а. Ціха, я сказаў!

М а ц і. І каб на чужое прозвішча яго і не думалі запісваць! Чуеце? А то ў суд завалачэм...

М і к о л а. Не запішам. Толькі яму ўсё адно: Андрэевічам расці ці Мікалаевічам...

М а ц і. Нам не ўсё адно.

М і к о л а. Ён не запомніць нічога... Запамінаць не было чаго... Хіба што кладзішча... Калі мароз за вушкі кусаў...

Н і н а *(да Маці)*. Можа, вам дапамагчы што, цётка Маруся?

М а ц і. Ты ўжо дапамагла... Сядзі.

Н і н а *(ледзь не плачучы)*. Цётачка...

Б а ц ь к а. Сціхніце! Каб ні гу-гу! Ніхто! Моўчкі памінаць будзем. Без слоў.

М і к о л а. Сапраўды. Што гаварыць?

Б а ц ь к а. І ты маўчы.

М і к о л а. Буду. Што ж мне яшчэ рабіць?

Н і н а. Коля...

М і к о л а. Што, Ніна...

Маўчаць. Толькі капёж чуваць на вуліцы. Там вясна.
Уваходзіць Ш а р г а ё ў.

Ш а р г а ё ў *(узрушана)*. Усё! Няхай ён нам і дзіцятку сваймy сніцца... Сябар наш, такскаць, муж і бацька... Чэсць, такскаць, ад усіх добрых людзей і ад бацькоўскіх... Не, не! Ад дзядоўскіх касцей... Я ў аборку вербалозіну ссек, каля ног пасадзіў... Сонейка прыгрэе, коцікі пойдуць... Хай у цяньку ляжыць Андрэйка наш дарагі...

Б а ц ь к а. Сядаем...

М а ц і. Бульба ж не зварылася.

Б а ц ь к а. Потым падасі... Ніна, Мікола... Чаго вы адно на аднаго надзьмуліся, як мышы на крупы?

М і к о л а. У гонар памяці...

Н і н а. Коля...

Б а ц ь к а. Сядайце... Ды не, побач сядайце... Нічога. Ён не пакрыўдзіцца... Няма за што... Нясі, Маруся...

М а ц і. Не зварылася яшчэ...

Б а ц ь к а. Гарэлку нясі...

М а ц і. А яе няма!

Б а ц ь к а. Я ж купляў...

М а ц і. А я за хлеў выліла! Не дазволю! Атрута гэта яго ў зямлю звяла і яе ж на памінках піць? З таго свету душу ягоную заклікаць да чаркі? Не дазволю!

Б а ц ь к а. Ладна, до табе галаву дурыць... Нясі!

М а ц і. Няма! Выліла! І бутэлькі пабіла аб вугал...

Ш а р г а ё ў. Ёлкі-маталкі! Ужо ж магазін зачынілі! Што ж гэта будзе? Памінкі без гарэлкі... Грэх...

М а ц і. Перад д'яблам грэх! Перад д'яблам! Гэта ён прычапіў да роду чалавечага гэта зелле... Ён зрабіў так, што яно ідзе за ім ад першага крыку да апошняга стогну... Вось малачко, малачком памінайце! Яно з маіх грудзей, яго ў партызанах ад смерці ўратавала... Малачко святое... Яно пасля вайны галадаць яму не давала... Налівайце! *(Падышла да стала, наліла з банкі малака ў шклянку.)* Хадзі, сыночак мой, малачко піці, кашу есці... Хадзі, дзетка... *(П'е.)*

Усе глядзяць.

Ш а р г а ё ў. Што ж гэта атрымліваецца? Магілку капаў, на холадзе адубеў, вярбу пасадзіў — і на табе...

М а ц і. А-а-а, нячыстая твая душа! Прызнаўся! З-за гэтай поскудзі прыйшоў сюды... Не памянуць сябрука, не слязой па ім капнуць, а назюзюкацца да ікаўкі!

Ш а р г а ё ў. І не з-за гэтага! Я магу саўсім не... Зусім. Калі захачу! Але я не кітаец, ёлкі-маталкі, не ёг індыйскі, каб сябра, з якім на адной парце сядзеў, сырадоем памінаць... *(Да Бацькі.)* Дзядзька Міцік, пазыч пяцёрку... Я ў Цыбулькі злётаю, пляшку куплю...

М а ц і. Я яе табе на галаве разаб'ю, п'янтос няшчасны! Ты ж ужо сам з чортам пад ручкі ходзіш, табе ж самому смерць у вочы глядзіць! Дапіўся...

Ш а р г а ё ў. Не крыўдую — таму што гора. *(Рашуча падымаецца.)* Пайду ў маці траячку выпрашу... І на магілцы яго памяну... Пад крыжам.

Б а ц ь к а. Сядзь...

Ш а р г а ё ў. Калі так — няхай так...

Б а ц ь к а. Сядзь, я табе сказаў! *(Да жонкі.)* І ты сядай, Маруся... Сядай... Не ў гэтым справа... Не ў гэтым...

Маці сядае.

*(Выходзіць у сенцы, прыносіць дзве бутэлькі гарэлкі. Ставіць на стол.)* Налівай, Мікола... Нічога, налівай... Не ў гэтым справа... Вяроўка не вінаватая, калі чалавек з яе пятлю для свае шыі зробіць... І гарэлка не вінаватая... Па мне, яна хоць рэчкай цячэ, хоць з неба дажджом льецца — нічога не прап'ю... Не было калі мне за сваё жыццё напівацца... Часцей ад гора-злыбяды п'яны хадзіў, аж хістаўся. З чатырнаццаці гадоў за гаспадара... З чатырнаццаці гадоў сям'ю кармлю... І ці толькі сям'ю?.. Калі ж

тут піць? Вады з калодзежа не заўсёды быў час напіцца... А цяпер людзі перасталі сябе карміць... Толькі грошы зарабляюць, пра грошы думаюць... А пра хлеб свой святы і думаць забыліся... Пустэча ў душы, во яны яе і заліваюць... Налівай, Мікола...

Ш а р г а ё ў. Як то перасталі? Ты мяне корміш, ці што?

Б а ц ь к а. Кожны павінен ад зямлі ўсё браць... Сам... Хлеб, ваду, соль... А вы ж на сталоўкі перайшлі, забыліся пра ўсё... Вы ж у гэтых сталоўках толькі закусваеце... Во, Ніна, давалі ж вам з Андрэем кавалак зямлі... Калгас даваў... Чаму не ўзялі?

Н і н а. А навошта? Мы ж даволі зараблялі, калгас кватэру даў... Навошта?

Б а ц ь к а. Вось... Не патрэбна ўжо людзям зямля... І сын мой, нябожчык, ад яе адрокся... Ці ж мужчынская гэта справа бібліятэкарам быць, у клубе з бабамі песні развучваць? Сілу ж сваю аддаць трэба! Але хай сабе на трактар не сеў, хай сабе і ў клубе рабіў... Дык хаця б кавалачак гэтай зямлі лашчыў... Не захацеў... Грошы былі... А тое, што зямелька наша чалавеку дае, ні за якія грошы не купіш... Налівай, Мікола...

М і к о л а. Ну гэта вы, дзядзька, дарэмна на нас... Ці толькі ж з-за таго п'юць, што на зямлі не робяць?! І ў гарадах п'юць...

Б а ц ь к а. А я, Мікола, не вучоны, што ведаю, як думаю, тое і кажу.... Пра горад кажаш? А хто ў ім жыве? Тыя ж, хто ўчора босымі вось па гэтай зямлі бегалі... Продкі іх спрадвеку, як ад малпаў род свой узялі, так і жылі на зямлі... Свае сілы, любоў, пот і здароўе ёй аддавалі, а яна іх карміла... Яны зямлі — зямля ім... Мір і згода былі... Хлеба ўдосталь не елі, а песні спявалі... Рукі былі мазолістыя, а сэрцы чыстыя... А цяпер рукі чыстыя, а сэрцы ў мазалях. З машынамі лягчэй жыць стала... Сам чалавек ужо нічога амаль не аддае, а толькі забірае... А гэта дрэнна! Гэта ўсё адно што глытаць паветра і не выдыхаць... Што ж будзе? Лопнеш! Ды я гэта і не пра цябе, Мікола... Ты піць не будзеш... Гора шмат бачыў у жыцці... А ад гора не п'юць, ад гора плачуць... А слёзы душу чысцейшай робяць...

М і к о л а. Дык няўжо ж ад добрага жыцця, ад радасці гэта бяда ў людзей?

Б а ц ь к а. Ад радасці і так хораша... П'юць, калі ні гора, ні радасці...

М а ц і. Ды што гэта вы завяліся, як на сходзе?

Б а ц ь к а. І то праўда... Чаго гэта мы? Налівай, Мікола...

Мікола налівае гарэлкі. Шаргаёў хапае шклянку, падымаецца.

Ш а р г а ё ў. Хачу тост сказаць.

Н і н а. Ашалеў...

Ш а р г а ё ў. Мы сабраліся, такскаць, тут, за гэтым жалоб-

ным сталом... Родныя і блізкія... сябры, каб памянуць нашага дарагога... нашага...

М і к о л а. Замаўчы! Дзядзька, скажыце, хай ён моўчкі п'е!

Ш а р г а ё ў *(разгублена)*. Я каб па форме...

М а ц і. Сядай ты ўжо... Не словамі добрымі памінаць трэба, думкамі. Шмат сталі людзі гаварыць... Шмат...

Шаргаёў сядае.

Б а ц ь к а. Давайце...

Усе, акрамя Міколы, выпіваюць.

А ты, Мікола?..

М і к о л а. Не магу, дзядзька... Ні слоў, ні думак няма. Не крыўдуйце...

М а ц і. Ён жа тваім дружбаком быў... Ты ж з ім усё дзяцінства на вось гэтай печы праседзеў... З жонкай яго цяперака спіш, і думкі добрае пра яго не знойдзецца... Каб табе...

Б а ц ь к а *(грукнуў кулаком па стале)*. Ціха, ёрш тваю ў лапці! Кажы, Мікола, кажы...

М і к о л а. Жыві доўга, дзядзька Міцік... Але вось калі мне давядзецца цябе памінаць...

Б а ц ь к а. Давядзецца, дзе ты дзенешся... Не хапала яшчэ, каб я цябе памінаў...

М і к о л а. Дык вось... Калі давядзецца — плакаць буду... Як па родным бацьку не плакаў... Таму што ты дзеля мяне, чужога чалавека, некалі на злачынства пайшоў...

Б а ц ь к а. Кінь ты...

М і к о л а. Памятаеш?

Б а ц ь к а. Не...

М і к о л а. Гарод у нас адразу пасля вайны вымак, а карову пярун забіў... Бацька хворы ляжыць, а я з голаду пухну, маці вешацца ад гора хацела... І вось тады ты паўмеха зерня з калгаснага свірна прынёс нам... На хлеб!

Б а ц ь к а. Не памятаю...

М і к о л а. Ты дадому зерне ніколі ў жыцці не насіў, Андрэй таксама недаядаў, а нам прынёс... Ты ж ведаў, што ў тыя часы за гэтае горкае зерне табе магло быць! Маці хлеба напякла... Тры боханы з блішчастай карычневай скарынкай... Толькі з печы дастала — мне лусту адрэзала... Я яго гарачым еў, губы апякаючы. З таго часу кожны кавалачак хлеба мне іх апякае... Я не толькі памяну цябе словам-думкай, я дзецям сваім, калі яны і ў мяне будуць, загадаю маліцца за цябе... За той гарачы хлеб...

Б а ц ь к а. Я не абразок, маліцца не трэба... Дый не памятаю я...

М і к о л а. Я памятаю... Ну, а пра Андрэя... Ведаю, што так нельга, ды яшчэ мне, але... Няма ў мяне добрай думкі. Няма. Што мне, добрым словам успомніць за тое, што вось яе *(кіўнуў на Ніну)* адабраў у мяне?

Н і н а. Коля, апамятайся! Успомні, дзе ты!

М і к о л а. Адабраў проста так, яна ж не патрэбна яму была... Прыгожае — значыць, маё! Успамінаць за тое, што мучыў яе гэтулькі год?! За тое, што я цяпер яго сына кармлю-рашчу і сэрца сваё любіць прымушаю? За тое, што шчасціла яму без меры ва ўсім? І за тое, што гэтым шчасцем ён ні з кім не падзяліўся?.. За тое, што і вам толькі гора прынёс?.. Не магу.

Ш а р г а ё ў *(усхапіўся)*. Выйдзі, анархіст! Здурэў?! Так пра нябожчыка...

М і к о л а. А як яшчэ?

Ш а р г а ё ў. Толькі добрае...

Б а ц ь к а. Чаму?

Ш а р г а ё ў. Завядзёнка такая... Па форме...

Б а ц ь к а. Памерці — гэта ўсе паміраюць... Медалёў за гэта не даюць. Памерці — гэта не ў космас злётаць...

М а ц і *(плача)*. Пень стары! Пра твайго роднага сына ды яшчэ на памінках такое, а ты... Вой, вылюдкі! *(Да Міколы.)* Дык а чаго ж ты прыпёрся тады, калі ў цябе гэткае ў сэрцы? Чаго прыйшоў?!

М і к о л а. Гора ваша разам з вамі выпіць... *(П'е гарэлку.)*

*З а ц я м н е н н е*

Кватэра Максіма Пакутовіча. Вечар. Д р а г у н адзін сядзіць каля акна. Звоніць тэлефон. Драгун здымае трубку.

Д р а г у н. Слухаю... Не, вы памыліліся, гэта не ён... Няма... Не ведаю, хутка прыйдзе... Я — ніхто... Што раблю тут?.. На зоркі гляджу... Не, без тэлескопа... А вы паспрабуйце, вельмі цікава... Добра, перадам... *(Кладзе трубку.)*

Дзверы асцярожна адчыняюцца. Уваходзіць Б у с л а й.

Б у с л а й *(пахмурна)*. Хто ў церамочку жыве?

Д р а г у н *(запальвае святло)*. Заходзь...

Б у с л а й. Здароў!

Д р а г у н. Прывітанне... Як жыццё?

Б у с л а й. Як у казцы. Гадзіну таму вешаўся...

Д р а г у н *(ашалела)*. Што-о?

Б у с л а й. Сто! Вяроўку ў кацельнай за крук, другі канец на шыю і з катла ўніз!

Д р а г у н. З глузду з’ехаў!

Б у с л а й. Крук разам з цаглінай са сцяны выскачыў і я-ак гваздане па патыліцы! Ну і будуюць, ёлкіна маць! Павесіцца немагчыма!

Д р а г у н *(не адразу)*. Ну, што сказаць? Ідыёт... І ўсё... Сядай... Есці хочаш?

Б у с л а й. Дай выпіць!

Д р а г у н. Есці хочаш?

Б у с л а й. Ідзіце вы к чортавай матары са сваёй спагадай! Праведнікі! Што вы са мной зрабілі? Чаму мне так мутарна? Мяне ўжо і гарэлка не бярэ!

Д р а г у н. Не крычы!

Б у с л а й. Дзе гаспадар?

Д р а г у н. Хутка прыйдзе...

Б у с л а й. Хто ён такі? Я ж пасля той праклятай ночы як пад гіпнозам хаджу! У мяне сэрца баліць! Я галіцца пачаў!

Д р а г у н. Падараваць электрабрытву?

Б у с л а й. Пайшоў ты! Ты мне адкажы: адкуль ён усё ведае? Ты тады спаў, а ён маю душу ўсю ноч на кавалачкі рэзаў, як каўбасу... Ведаеш, што ён сказаў? Чалавечая душа — крыніца! З яе павінны чэрпаць! Калі не чэрпаюць — хоць малюсенькая ручаінка павінна вылівацца... А з маёй нічога не вычэрпвалася і не вылівалася! Ані кропелькі! Яна і пачала пакутаваць! Зацвіла, памутнела... Лужынай стала, а не крыніцай! Бруднай лужынай! Сорак гадоў хутка! Ніводнаму чалавеку дабра не зрабіў, нікога не сагрэў, ніводнага разу над чужым горам не паплакаў, дрэўца не пасадзіў! Толькі браў, грэўся сам каля іншых, з чужых дрэў галінкі ламіў... Во й дажыўся! Выйсці толькі на плошчу Свабоды, задраць галаву да месяца і завыць, як галоднаму ваўку. Чаго? Чаго ты лыбішся?

Д р а г у н. Дай руку...

Б у с л а й. Ідзі ты!

Д р а г у н. Дай руку!

Б у с л а й. Я табе па мордзе гэтай рукой дам... Табе і твайму гаспадару...

Д р а г у н. За што?

Б у с л а й. За праўду.

Д р а г у н. Правільна зробіш...

Б у с л а й. І скажы ж ты, паразіт, як усё хітра робіць! Дзесяць гадоў адно толькі і чуў: кінь піць! Не губі сябе! У цябе ж сям’я! Ты ж на чалавека не падобны! Кінь піць! А ён за ўсю ноч, што мы з ім гаварылі, ніводнага разу і не сказаў, каб я кінуў піць... За душу маю ўчапіўся, як кот кіпцюрамі... Ёлкіна маць! Я думаў, што гэтай душы ў мяне ўжо і не засталося... І ў вочы

глядзіць, глядзіць... Ну, казачнік! Ну, дзед Міхед! Ты не ведаеш, чаму ён казкі піша? Чаму менавіта казкі?

Д р а г у н. Мабыць, таму, што людзі цяпер сталі вельмі адукаваныя, разумныя, разважлівыя... І па старадаўняй звычцы з невуцтвам змагаюцца. Казкі разбураюць... Таму што казка — гэта ўвогуле няпраўда, а чалавеку ісціна патрэбна... Канечне, патрэбна... Але і казка таксама... Казка, песня...

Б у с л а й. А я свайму сыну іх не расказваў, з жонкай ніводнай песні не спеў цвярозы... Саромеўся! Ведаеш, чым займаўся ўсё сваё пакручастае жыццё? Заробкамі! Каб дом быў, каб гарнітур быў, халадзільнік, водаправод, катлеты тры разы на дзень... І вось дом ёсць, гарнітур купіў, водаправод правялі, катлеты жрэм... Што далей? Машыну? Можна было і машыну... А далей? Дачу? У вёсцы жывём — дача не патрэбна... Усё!!! Прыехалі, хлопчыкі... Выпрагайце коней, налівайце чаркі... Вось я яе і наліваў штодня. І дакаціўся... Каб ён згарэў, твой казачнік!

Д р а г у н. Чаму мой? І твой ужо таксама...

Б у с л а й. Ну, на які д'ябал ён падабраў мяне тады на дарозе? Навошта душу мне развярэдзіў? Што мне рабіць?

Д р а г у н. Пачынаць усё спачатку...

Б у с л а й. Дык ужо ж сорак гадоў!!

Д р а г у н. Што зробіш, калі раней не атрымалася... Вінаваціць няма каго.

Б у с л а й. Значыць, я ва ўсім вінаваты? Адзін я?

Д р а г у н. А ты гэтага яшчэ не зразумеў?

Б у с л а й. Брэшаш! І я табе дакажу... Выхоўваюць нас, рыхтуюць да жыцця, да жыццёвых цяжкасцяў і перашкод! Ці не так? Так... А дзе яны цяпер, гэтыя цяжкасці? Дзе? Пузаты дзядзя ў магазіне абураецца, што мяса не хапае? Ніколі не скажа, паразіт, што яму веры, мэты, чысціні не хапае... Мяса!!! Гэта цяжкасці? Абжорства! Нас не да гэтага трэба рыхтаваць! Жыццё дасць па зубах раз-другі, сам навучышся, дзе галаву трэба прыгнуць, а дзе зубы сціснуць. Не здохнеш! А вось да лёгкага жыцця, да таго, калі ўсё само плыве ў рукі,— ніхто не рыхтуе... Думаюць, што лёгкае лёгка пераажыць можна! Чорта лысага! Блакаду мы пераажывём, а вось ад сытасці перадохнем! Ты ведаеш, што мае бацькі перажылі на сваім вяку? Ворагу пажадаеш — Бог не даруе! Але ж жылі! А я... Падумаў аднойчы: дзеля чаго ж ты, Андрэйка, жывеш? Каб нашчадкаў пусціць на свет белы? Дык гэта і жабы робяць... Каб мае дзеці жылі лепей за мяне? А што значыць лепей? Лепей елі, лепей апраналіся, утульней спалі... І ўсё? Якая ж гэта мэта? Я ж жыву лепей за сваіх бацькоў, спакойней, утульней... Чаму ж мне гэтак мутарна? Чаму ў мяне душа баліць?

Ці варта ўвогуле жыць, калі шчасце чалавечае толькі ў тым, каб смачней з'есці, мець прыгожую бабу, нічога не рабіць і атрымліваць кучу грошай?.. Ці варта?

Д р а г у н. Ведаеш што? Кацішся ты са сваімі адвечнымі пытаннямі далёка-далёка! Людзі жывуць не дзеля таго, каб лепей жыць, а каб лепей быць...

Б у с л а й. Ага! Толькі іншым разам блытаюць адно з другім...

Д р а г у н. Можа. Можа, і блытаюць. Але прыйдзе час, ён хутка прыйдзе, і яны зразумеюць, што толькі любоў, давер, спагада, глыбокая сумленнасць уратуюць іх ад пакут, сумненняў і душэўнага разладу... Што ўсе лозунгі, якія мы пішам і да якіх адносімся скептычна,— трэба прыняць! Душой прыняць! Прыйдзе час — прымем...

Б у с л а й *(паказвае кукіш)*. Во! Во з адной рукі, а во з другой... Во гэта во зразумеем, а во гэта прымем... Твой пісьменнік чудзік! І цябе зрабіў гэткім жа! Вы — чудзікі!

Д р а г у н. Чудзік... Што ён такога асаблівага, дзіўнага зрабіў ці сказаў табе?

Б у с л а й. Падабраў на вуліцы!

Д р а г у н. Але ж...

Б у с л а й. Маўчы! Нармальны чалавек праедзе міма, ну, а калі і спыніцца, дык здасць потым у міліцыю... А ён не здаў! І з табой няньчыцца, і з гэтай Алінай...

Д р а г у н. Дык што ж тут дзіўнага, растлумач тым мне?! Звычайная чалавечнасць, звычайная спагада! Чудзік... Дафіласофстваваліся! На людзей, якія жывуць па законах сумлення, ашчаджаюць чысціню душы, не хлусяць, не прыстасоўваюцца, кажам — чудзікі... Ён пражыў некалі тое, што і ты... Лёгка жыў, але зразумеў, што лёгка жыць — цяжкі грэх... І цяпер амаль усё аддае іншым. Так трэба! Аддаваць, аддаваць, аддаваць. Больш аддасі — спакайней спаць будзеш, радасней жыць, нават смерць сустрэнеш з усмешкай... Што, ён чудзік таму, што лічыць цябе за чалавека?

Б у с л а й. Я сябе за чалавека не лічу, а ён ліча! Навошта яму гэта? Што, яму больш займацца няма чым? Хай казачкі свае піша, а ў душу да мяне не лезе!

Д р а г у н. Чаго ты прыйшоў?

Б у с л а й. Сказаць гэтаму святому маразмаціку, што я яго ненавіджу!

Д р а г у н *(не адразу)*. Та-ак... Такім, як ты, мабыць, нельга пераступаць гэты парог... З табой толькі ў міліцыі і размаўляць... Ідзі! Чуеш? Зараз жа ідзі адсюль!

Б у с л а й *(злосна)*. Не, я яго пачакаю... Я і яму ўсё скажу!

Стук у дзверы.

А, вось і гаспадар! Заходзь, апостал цара нябеснага!

Уваходзіць м і л і ц ы я н е р. Трохі ўжо сівы, стомлены неспакойнай службай чалавек. Буслай аслупянеў.

М і л і ц ы я н е р. Дазвольце?

Д р а г у н. Добры вечар...

М і л і ц ы я н е р *(зірнуў на Буслая, потым на Драгуна)*. Пакутовіч Максім Данілавіч?

Д р а г у н. Драгун Аляксандр Пятровіч...

М і л і ц ы я н е р. Гэта дваццаць шостая?

Д р а г у н. Так...

М і л і ц ы я н е р. Але ж тут, здаецца, жыве...

Д р а г у н. Максім Пакутовіч...

М і л і ц ы я н е р. Дзе ён?

Д р а г у н. Хутка прыйдзе.

М і л і ц ы я н е р. А вы хто? Яго сябар?

Д р а г у н. Не... Пацыент...

М і л і ц ы я н е р. Што-што?

Д р а г у н. Па-цы-ент...

М і л і ц ы я н е р. Вы што, хворы?

Д р а г у н. Выздараўліваю...

М і л і ц ы я н е р. Так, так... Значыцца, усё ж правільна напісалі...

Д р а г у н. Што напісалі?

М і л і ц ы я н е р. А тое, што ў гэтай кватэры розныя дзіўныя рэчы вырабляюцца...

Д р а г у н. Правільна напісалі...

М і л і ц ы я н е р. Што сходкі розныя бываюць, размовы, людзі без прапіскі жывуць... *(Да Буслая.)* Вы таксама пацыент ці ардынатар?

Б у с л а й *(пахмурна)*. Медбрат...

Д р а г у н. Ён ніякіх адносін да Пакутовіча не мае...

М і л і ц ы я н е р. Але ж жыве тут?

Д р а г у н. Не. Ён... Ён да мяне зайшоў... Проста так...

М і л і ц ы я н е р. А вы тут жывяце?

Д р а г у н. Як бачыце.

М і л і ц ы я н е р. А дзе прапісаны?

Д р а г у н. Паказаць пашпарт?

М і л і ц ы я н е р. Дзе прапісаны?

Д р а г у н. Вуліца Міру, сто пяць...

М і л і ц ы я н е р. Чакайце, чакайце... Дык Драгун...

Д р а г у н. Мой бацька.

М і л і ц ы я н е р. Вунь яно што! Дык а чаго ж вы тут? Без прапіскі нельга...

Д р а г у н. З прапіскай таксама. Пакуль што...

М і л і ц ы я н е р. Ведаеш што, я міліцыянер, гэтыя вашы кантэксты-падтэксты не разумею... *(Да Буслая.)* А вы дзе прапісаны?

Б у с л а й. Я...

Д р а г у н. Няма чаго разумець. Тры месяцы таму я быў вызвалены па амністыі і за добрыя паводзіны...

М і л і ц ы я н е р. Адкуль вызвалены?

Д р а г у н. Ну, вядома ж, не з дому адпачынку...

М і л і ц ы я н е р. Сядзеў?

Д р а г у н. Не, не сядзеў. Лес пілаваў...

М і л і ц ы я н е р. Пакажы пашпарт...

Драгун падае пашпарт.

За што сядзеў?

Д р а г у н. Ні за што...

М і л і ц ы я н е р. Ну-ну!

Д р а г у н. Вы не нукайце! Я ведаю, што ў нас ні за што не садзяць... Было. Ішоў з дня нараджэння. П'яным не быў, але цвярозым таксама... Ну, і ўбачыў, што адзін даўгавязы падонак б'е дзяўчыну... Падбег, даў па мордзе. Той няўдала ўпаў — сатрасенне! Міліцыя, пратакол... П'яная бойка. Бацьку пазванілі... А той сказаў: судзіце шчанюка! Закон у нас для ўсіх адзін! Дайшло да суда. І вось на судзе гэта дзяўчынка бітая заяўляе, што я хуліган, чапляўся да яе на вуліцы з цёмнымі намерамі, а калі жаніх — той хлопец жаніхом аказаўся — хацеў заступіцца, я яго прыбіў. Суддзя пытае: так было?.. А я гляджу ў вочы гэтай нявесце і сам не ведаю, чаму адказваю: так!

М і л і ц ы я н е р. Ну й дурань!

Д р а г у н. Канечне, дурань... Хто ж яшчэ?.. Год і прыпаялі за дурасць. А бацька і на суд не прыйшоў. Ён у мяне прынцыповы...

М і л і ц ы я н е р. Ад крыўды да яго і не вяртаешся?

Д р а г у н. Ад злосці... Пакуль я знаходзіўся там, яна штодня, кожную секунду ў маё сэрца ўлівалася... У душы ўсё спрахла, у небыццё пайшло... Толькі злосць, толькі злосць... Я стаў нейкім дынамітным. Іскарку адну, і ўзарвуся... Ну нічога... Вызвалілі датэрмінова... Прыехаў у горад і пачаў выношваць план помсты... Як граф Монтэ-Крыста... Па-першае, з гэтай нявестай вырашыў зрабіць усё менавіта так, як яна расказвала на судзе!

М і л і ц ы я н е р. З глузду з'ехаў!

Д р а г у н. Па-другое, бацьку на вочы трапляцца як мага часцей у выглядзе затурканага няшчасцем чалавека... Але не размаўляць! Прага помсты даводзіць чалавека да ідыятызму... Але мне пашчасціла... Сустрэўся зусім выпадкова з Пакутові-

чам... І расказаў яму ўсё... Ведаеце, яму чамусьці ўсё хочацца расказваць... Слухаць, мабыць, умее...

М і л і ц ы я н е р. І ён адгаварыў?

Д р а г у н. Не... Па вуху даў...

М і л і ц ы я н е р. Як?

Д р а г у н. Кулаком. Сволач, кажа, з чым ты жывеш? Ідзі ўтапіся лепей, не ганьбі зямлю, якая нарадзіла цябе... За добрую справу, за высакародства пакуту прыняў? Ну й што? Малады, здаровы, што табе гэтыя чатыры месяцы? Я ўсяго чатыры месяцы адбыў... Ну, пакрыўдзілі, кажа, не разабраліся, але ж душа твая чыстая! Навошта ж ты ў яе бруд піхаеш? Ты ж, кажа, і ў галаву не возьмеш, з якой пакутай жыве гэта няшчасная дзяўчына... Яна сама сябе пакарала на ўсё жыццё! Ты ж ёй да самай старасці сніцца будзеш... А ўжо ні кахання, ні шчасця, ні радасці з тым вылюдкам, які падбухторыў яе на хлусню, ніколі не будзе... А ты помсціць, дурань! Калі даруем — гэта страшней за помсту... Супакойся, кажа, дай сэрцу адпачыць... А покуль злосць не выйдзе — пажыві разам са мной... Во і жыву.

М і л і ц ы я н е р. Гэта як жа разумець? На кватэры, ці што?

Д р а г у н. Як быццам... Лёгка з ім. Як у маленстве з маці — прылашчыць і пасварыцца... Казкі піша...

М і л і ц ы я н е р. І колькі ён з цябе бярэ?

Д р а г у н. Што з мяне можна ўзяць? На стыпендыю жыву... Ён мяне нават корміць...

М і л і ц ы я н е р. Проста так?

Д р а г у н. Не, з лыжачкі...

М і л і ц ы я н е р. А бацька ведае, што ты тут?

Д р а г у н. Не.

М і л і ц ы я н е р. Дрэнна...

Д р а г у н. Ужо ведаю... Страшны не той, хто робіць дрэннае, а той, хто не можа дараваць гэта...

М і л і ц ы я н е р. Занадта мудра...

Д р а г у н. Гэта ён сказаў...

М і л і ц ы я н е р. Чакай, чакай... А што дрэннага твой бацька зрабіў? Ты яму расказаў, як усё адбылося?

Д р а г у н. А ён і не спытаўся. Ён паверыў пратаколу...

М і л і ц ы я н е р. Та-ак... А праўда, што кватэра тут не замыкаецца?

Д р а г у н. Праўда...

М і л і ц ы я н е р. Ніколі?

Д р а г у н. Замка зусім няма.

Міліцыянер падыходзіць да дзвярэй, адчыняе, глядзіць.

М і л і ц ы я н е р. Трэба ж... Ну, а калі залезе хто?

Д р а г у н. Злодзеі, ці што? А хіба тут ёсць чым пажывіцца? Старэнькая пішучая машынка? Вось гэта лямпа? Тэлевізар? Ён яго не ўключае ніколі. Я не ведаю, ці спраўны ён...

М і л і ц ы я н е р. Ну, а навошта?

Д р а г у н. Што?

М і л і ц ы я н е р. Без замка жыць? Навошта выстаўляцца? Што, ён лепшы, больш сумленны за іншых?

Д р а г у н. Не. Ён лічыць, што людзі дабрэйшыя, чым ёсць... І трымае дзверы адчыненымі... У сваю хату і ў душу. А раптам хто зойдзе?

М і л і ц ы я н е р. А ён нармальны? Як ты лічыш?

Д р а г у н. А мы з вамі нармальныя? Як вы лічыце?

М і л і ц ы я н е р. Ладна, чорт з вамі! Я праверыў пісьмо, што на яго накрэмзалі, — лухта! Гарэлкі не п'яце?

Б у с л а й. Пілі б... Не даюць.

М і л і ц ы я н е р. Ого! Загаварыў. А я думаю, чаму гэта ён такі задуменны і маўклівы?

Б у с л а й. Сказаць няма чаго.

М і л і ц ы я н е р. А бабы сюды ходзяць?

Д р а г у н. Жанчыны ходзяць...

М і л і ц ы я н е р. Ім можна. Ну, а што без прапіскі... Лічы, што я ў цябе пашпарт не глядзеў... Толькі да бацькі ўсё ж схадзі... Ты і сам хлопчык, я бачу, не цукровы... Шмат ад людзей патрабуеш... Трэба ад сябе патрабаваць.

Д р а г у н. Ну во... Дзесяць мінут пабылі ў кватэры і ўжо загаварылі, як пісьменнік Пакутовіч...

М і л і ц ы я н е р. Як міліцыянер я гавару, як міліцыянер...

Д р а г у н. Вас бацька прыслаў?

М і л і ц ы я н е р. Служба мяне прыслала. Сігнал. Ты не ведаеш, чаму людзі не любяць адзін аднаго?

Д р а г у н. Ведаю. Таму што сябе не любяць.

М і л і ц ы я н е р. Та-ак... Чым там яшчэ абураўся сумленны грамадзянін? А-а... Дае прытулак алкаголікам і іншым цёмным асобам... *(Усміхнуўся.)* Вось навучыліся людзі пісаць! Ну, а гэта як?

Д р а г у н. Праўда. Недзе месяц таму ноччу падабраў на вуліцы чалавека і прывёз дадому. Не даў змерзнуць, прасцей кажучы... А ў чым тут крамола? Нават калі і цёмная асоба, дык што: лепей пакінуць яе здыхаць у гурбе снегу?

М і л і ц ы я н е р. Ну ладна, ладна... Вух, вожык! Я ж нічога не кажу... Правільна зрабіў, што падабраў. А то вунь аднаго мне ўчора давялося падымаць... Усю зіму праляжаў пад снегам. Бацька родны прыехаў — пазнаць не мог... Паліто яго, кажа,

пакажыце, тут і глядзець няма на што! Зірнуў на паліто, на пашпарт, далётаўся, кажа, бацян... Зламаў крылы...

Д р а г у н. Чаму бацян?

М і л і ц ы я н е р. Прозвішча ў яго такое мудрагелістае было... Як гэта? Ну, бацян, толькі неяк інакш...

Б у с л а й. Бусел...

М і л і ц ы я н е р. Во-во! Буслай... Я яшчэ падумаў: як быццам і наша прозвішча, а быццам і не... Рэдкае...

Б у с л а й *(раптам нервова зарагатаў)*. Ха-ха-ха!

М і л і ц ы я н е р. Чаго ты?

Б у с л а й. А адкуль ён?

М і л і ц ы я н е р. З Цыбулькаўскага раёна.

Б у с л а й *(дзіка смяецца)*. Бэра!!!

М і л і ц ы я н е р. Ты ведаў яго, ці што?

Б у с л а й. Не-а! *(Смяецца.)* Гэта я... так....

М і л і ц ы я н е р. А чаго ты рагочаш?

Б у с л а й. Ды бацька яго... смешна так... Далётаўся бусел... Зламаў крылы...

М і л і ц ы я н е р. Што тут смешнага?

Д р а г у н *(сам сабе)*. Жах! *(Міліцыянеру.)* Ну, а пахаваць яго паспелі?

М і л і ц ы я н е р. Наўрад! Учора вечарам толькі забралі...

Д р а г у н. А як вы даведаліся, што ён з вёскі?

М і л і ц ы я н е р. Дык я кажу, пашпарт у кішэні быў... Прапісаны ў вёсцы, а бадзяўся чамусьці тут...

Д р а г у н. Зразумела...

М і л і ц ы я н е р. Ну, ладна, будзь здароў. Перадай гаспадару, хай замок паставіць... І начаваць абы-каго не пускае... А то і вышэй напісаць змогуць. І каб да бацькі схадзіў, а то я выселю цябе адсюль... *(Буслаю.)* Да пабачэння...

Буслай у адказ нервова смяецца. М і л і ц ы я н е р выходзіць.

Б у с л а й. А гэта ж я... Мяне... хаваць будуць... Чуў? Ты ўсё чуў? Зламаў бусел крылцы! Нябожчык!

Д р а г у н. Ды кінь ты! Мабыць, аднафамілец...

Б у с л а й *(дрыжачым голасам)*. Не! Не! Паліто ў нас было адно на двух... Сваё ён прапіў...

Д р а г у н. Хто?

Б у с л а й. Бэра! Я ў яго ў кацельнай жыў... Аднойчы з раніцы рубель нашкрэблі на бутэльку «чарніла»... Бяжы, кажу, Бэра... Ён паліто і апрануў... А ў паліто пашпарт... Я ўжо і забыўся пра яго... Пайшоў, і з канцамі... І дзень няма, і два... І ўсю зіму...

Д р а г у н. А хто ж працаваў замест яго?

Б у с л а й. Я...

Д р а г у н. Чакай, чакай... Але ж усю зіму... Ён жа ў ведамасці распісвацца павінен быў... Няўжо не спахапіліся?

Б у с л а й. Я і распісваўся заместа яго... А ён заместа мяне пад гурбай снегу ляжаў... Нябожчык я!

Д р а г у н. Ды не, не можа быць... Супадзенне, мабыць...

Б у с л а й. Прозвішча! Пашпарт без прапіскі! Раён! І Бэра прапаў! Нябожчык я! Нябожчык! Госпадзі! Маці сястру пахавала, і зноў хаўтуры ў хаце! Што ж з ёй будзе? Ма-ма!!

Д р а г у н. Ну, Федзя Пратасаў! Ну... Зараз жа едзь дадому! Неадкладна! Ён сказаў, што забралі толькі ўчора... Можа, не паспелі яшчэ? *(Кінуўся да тэлефона, набірае нумар.)* Алё! Дзяўчына, мілая, прышліце тэрмінова таксі... Як праз гадзіну? Вы што? Чалавеку дрэнна! Я ведаю, што вы не «хуткая дапамога», але зразумейце... *(Паклаў трубку, сумна.)* Зразумела... *(Зноўку набірае нумар.)* Добры вечар... Паклічце, калі ласка, Аліну... Добра, пачакаю... *(Буслаю.)* У цябе грошы ёсць?

Б у с л а й *(разгублена)*. Дзве капейкі... Толькі пажарнікам пазваніць.

Д р а г у н *(дастае з кішэні дзесятку)*. На!

Б у с л а й. Апошняя?!

Д р а г у н. Бяры, ёлупень! Хопіць?

Б у с л а й. Не ведаю...

Д р а г у н. Колькі кіламетраў?

Б у с л а й. Да Цыбулек сто... А там побач...

Д р а г у н. Зразумела... *(У трубку.)* Аліна? Гэта я, Драгун. Слухай уважліва: каля вашага садзіка, здаецца, прыпынак таксі... Зірні, стаяць машыны ці не? Стаяць? Хапай машыну і неадкладна прыязджай да Пакутовіча... Не, з ім усё нармальна... Нашаму філосафу дрэнна... Я табе потым усё растлумачу... Што? Сама не зможаш прыехаць?.. Ну добра, добра... Збегай на прыпынак і назад... Грошы ў цябе ёсць? Колькі? Аддай шафёру ўсе, упрасі яго ў Цыбулькі злётаць... Потым, Аліна, потым... Чакаем машыну. *(Паклаў трубку.)* Зараз паедзеш... Тут побач... Ашалець! У кіно такога не бывае...

Б у с л а й *(раптам заплакаў)*. Не крыўдуй на мяне...

Д р а г у н. За што? Чаго ты румзаеш?

Б у с л а й. За тое, што я гаварыў тут пра нашага казачніка... Сволач я! Нябожчык!

Д р а г у н. Ладна! Не да гэтага цяпер...

Б у с л а й. Ён, мусіць, сапраўды святы... І вас зрабіў святымі...

Д р а г у н. Усе людзі на зямлі святыя... Толькі забываюць пра гэта... Значыць, так: прыедзеш, глядзі, адразу дадому не за-

ходзь... З глузду ўсе з'едуць... Зазірні спачатку да каго-небудзь з суседзяў...

Б у с л а й. Добра... Грошы я вам прышлю... Зараблю і прышлю...

Д р а г у н. Як ведаеш... *(Падыходзіць да сцяны, адчыняе бар, налівае вялікую чарку каньяку.)* На, выпі...

Б у с л а й. Не буду!

Д р а г у н. Пі, табе кажуць, а то чокнешся, пакуль даедзеш...

Б у с л а й. Ён жа сказаў: грэх перад прыродай... Злачынства...

Д р а г у н. Калі не трэба — грэх, а калі неабходна — грэх не выпіць... Давай!

Буслай п'е.

*(Глядзіць на вуліцу праз акно.)* Машына! Пайшлі!

Б у с л а й. Дзякуй... Дзякуй вам...

Выходзяць. Праз некаторы час Д р а г у н вяртаецца. Паўза. Сядае ў крэсла, пра нешта думае. Потым здымае трубку тэлефона, набірае нумар.

Д р а г у н. Добры вечар... Гэта кватэра Драгуна? Прабач, тата, я ўжо забыўся твой голас... Прабач мне... Недалёка... Так, у горадзе... Мне можна прыйсці? Ты, можа, не так зразумеў мяне? Я кажу — прыйсці зусім, дадому прыйсці... Не, машыну не трэба... Я пехатой... Ведаеш што: завары, калі ласка, чаю... Вялікі чайнік у васільках... Разбіўся? Ну, усё адно завары... Каб на ўсю ноч хапіла... Толькі чай... Піць мы не будзем... У мяне і так шмат туману ў галаве... Я — хутка... *(Паклаў трубку, хуценька сабраў свае рэчы, прысеў на хвілінку, абвёў позіркам кватэру, выключыў святло, выйшаў.)*

Звоніць тэлефон.

*З а ц я м н е н н е*

Вёска. Шаргаёва хата. Амаль такая ж, як і хата Буслаёў. Нікога няма. За вокнамі шапоча дождж. Уваходзіць Б у с л а й. Ён увесь мокры, без паліто і шапкі. Цвярозы.

Б у с л а й *(спыніўся каля парога)*. Добры дзень у хату...

Ніхто не адказаў.

*(Падышоў да печы, рукамі і тварам прытуліўся да яе.)* Ах ты, мая родненькая... Цёплая, ласкавая, белая... *(Пастаяў, падышоў да стала, узяў акраец хлеба, есць.)*

На вуліцы чуваць песню. Шаргаёў вяртаецца з памінак.

Ш а р г а ё ў *(уваходзіць п'яны-п'яны).*

А-а-а-аб ёй мне баюць казкі-сны
На лі-іпе бусел клёкатам
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладбішчы...

Б у с л а й *(паклаў хлеб).* Здароў, Фядос...

Ш а р г а ё ў. Здароў... Лье, падла, у трыццаць струменяў з пырскамі... Вясна... Зямля піць просіць... Туман снег з'есць і траўк... траўк... аў... аў... *(Вочы палезлі на лоб. Аслупянеў. Хаўкае ротам, прабуючы нешта сказаць.)*

Б у с л а й. Фядос! Слухай, Фядос...

Ш а р г а ё ў. Каў... каў...

Б у с л а й. Хопіць каўкаць, я зараз усё растлумачу.

Ш а р г а ё ў *(глядзіць вар'яцкімі вачыма).* І не баюся! Таму што цябе няма... Няма цябе! *(Замахаў рукамі.)* Кыш! Кыш, нячысцік... Ну выпіў трохі залішне — во і мроіцца ўсялякі опіум для народа... Кыш!

Б у с л а й. Ты пазнаў мяне? Гэта ж я...

Ш а р г а ё ў. І не баюся! Я ўжо і чарцей надоечы бачыў... Зялёненькіх! У місцы з агуркамі «Лявоніху» гоцалі... Гарэлка ўсё... Ідзі, адкуль прыйшоў...

Б у с л а й. Куды ісці?

Ш а р г а ё ў. Дадому, на кладзішча... А мяне не чапай... Я табе магілку выкапаў як мае быць... Пастараўся... Крыж там, вярбу пасадзіў, каб цянёк... Спяшаўся, праўда, каб на памінкі не спазніцца... Грэх, ведаю...

Б у с л а й. Жывы я, разумееш, жывы!

Шаргаёў заплюшчыў вочы і доўга трос галавой, расплюшчыў вочы.

Фядос...

Ш а р г а ё ў. Людзі-і-і!!!

Б у с л а й. Цьфу!

Шаргаёў падбег да парога, дзе стаялі вёдры з вадой. Зачэрпнуў кружку, выліў на галаву. Зірнуў на Буслая. Той не знікае. Шаргаёў зачэрпнуў другую, зноў выліў.

Ну, ачуняў?

Ш а р г а ё ў. Хто ты?

Б у с л а й. Андрэй я... Андрэй Буслай...

Ш а р г а ё ў. Хто цябе выкапаў?

Б у с л а й. Як выкапаў? Адкуль?

Ш а р г а ё ў. З магілкі... Ты памерлы... Я цябе закапаў паўдня назад...

Б у с л а й. Гэта памылка, Федзя! Во ж я стаю, размаўляю з табой...

Ш а р г а ё ў. І ўшчыпнуць мяне можаш?

Б у с л а й. Магу.

Ш а р г а ё ў. Ушчыпні...

Буслай падыходзіць, шчыпае яго за руку.

Гы! Баліць!.. А памацаць цябе можна?

Б у с л а й. Мацай, прыдурак...

Шаргаёў мацае.

Ш а р г а ё ў *(здзіўлена).* Цёплы... Дык як жа гэта? Чакай! Як цябе завуць?

Б у с л а й. Я ж табе казаў...

Ш а р г а ё ў. Кажы, як завуць, зараза!

Б у с л а й. Андрэем...

Ш а р г а ё ў. А маці як завуць?

Б у с л а й. Чыю?

Ш а р г а ё ў. Тваю...

Б у с л а й. Ды чаго ты дапытваеш мяне?

Ш а р г а ё ў. Кажы, а то хрысціцца пачну! Я хрышчоны, мне можна!

Б у с л а й. Марусяй — матку, бацьку — Міцікам, цябе, дурня, — Фядосам, старшыню сельсавета — Патапчуком!

Ш а р г а ё ў. Патапчука знялі...

Б у с л а й. Што яшчэ?

Ш а р г а ё ў. Дай мне ў вуха.

Б у с л а й. Ідзі ты!

Ш а р г а ё ў. Ну дай, я, можа, кеміць пачну... Я ж, такскаць, толькі-толькі з тваіх памінак прыйшоў... Усё як мае быць... Пасядзелі, памянулі, выпілі за ўпакой...

Б у с л а й *(ашалела).* Вы чужога чалавека пахавалі, а не мяне!

Ш а р г а ё ў. Як гэта? Цябе ж тыдзень назад міліцыя мёртвага знайшла ў Дубровенску...

Б у с л а й. Гэта яны не мяне знайшлі... толькі паліто маё. Вось жа я, вось!

Ш а р г а ё ў. Бачу... І не разумею... Калі ты здань, дык павінен быць халодным, а ты цёплы... А ўсё было як мае быць... Бацьку пасведчанне аб смерці ў сельсавеце выпісалі... У Дубровенску пісаць не згадзіліся, таму што пашпарт знайшлі, а ў пашпарце прапіска: нашы Калодзічы... Так што ты не залівай... Мы цябе правільна пахавалі... Па форме.

Б у с л а й. Ну, а маці? Бацька? Ты?! Няўжо вы не разабраліся, што гэта не я?!

Ш а р г а ё ў. Дык ты ж сапсаваны быў ушчэнт... Усю зіму пад снегам... І труну нават не адчынялі... Толькі партрэт паставілі зверху...

Б у с л а й. Ды не я гэта!! Не я!!!

Ш а р г а ё ў. Можа, і не ты, можа, і ты... На пашпарце быў? Быў... Паліто тваё? Тваё...

Б у с л а й. Госпадзі! Жывога пахавалі!.. На кладзішча адвезлі... У зямлю закапалі... Жывога...

Ш а р г а ё ў. А ты не перажывай... Усё як мае быць! Па форме... Касцюм табе купілі за сто пяцьдзесят рублёў, гальштук у крапінку, чаравікі мадняцкія... Мяне, такскаць, як сябра твайго, магілку папрасілі... Я пастараўся... Роўненька, глыбока... Там труна старая нечая трапілася, дык я яе акуратненька абышоў, дно лапнікам заслаў, каб табе, такскаць, утульна там было, ёмка, суха...

Б у с л а й *(істэрычна)*. Га-а-ад!! *(Б'е Шаргаёва па твары.)*

Той пакаціўся па падлозе. Так-сяк падняўся на калені.

Ш а р г а ё ў *(заплакаў)*. Ну, за што ты мяне? За што? Сам ведаю... усё... пра сябе... Ведаю, што нельга сябруку свайму магілку капаць... Грэх. Але выпіць, Андрэйка, хацелася выпіць... Ведаў, што дадуць... Калі гора — людзі шчодрыя на ўсё... І на грошы і на сэрца... Ведаў, што і на памінкі паклічуць... Вось таму і ўзяўся за рыдлёўку... І сорамна не было... Я нейкі парог пераступіў, а дзверы за мной хлоп — і зачыніліся. Я ж ужо не жыву, а так... смылею, як галавешка... Ад чаркі да чаркі... Маці пасівела, жаніцца не змагу ўжо, грошай мне не даюць, толькі распісваюся ў канторы. Шаргаём дзяцей пужаюць... За што ты мяне? Я, можа, нават табе і зайздрошчу, таму што ты ўжо адмучыўся... Ты ўжо там... Табе лёгка...

Б у с л а й. Матухна, мілая мая! Што ж гэта?

Ш а р г а ё ў *(плача)*. Смерць, Андрэйка... Сука ты касая... Твая матка праўду мне сказала: глядзіць яна мне ў вочы... Вой, глядзіць... Учора, калі табе магілку ўжо выкапаў, сеў на дне на лапнічак пакурыць... Зверху вецер сцюдзёны, макрэча, неба шэрае за зямлю чапляецца, а ў яміне ўтульненька, ціха, ціха... Гліна жоўценькая, лапнічак зялёны, зямлёй пахне... І думаю сабе: а мо тут і лепей?.. Га, Андрэй?.. Мо і лепей? *(Кладзецца на падлогу і засынае.)*

Буслай, скамянелы, стаіць сярод хаты.

Хата Міколы. Ужо ноч. Стол. На стале бутэлька. Б у с л а й з атупелым выглядам сядзіць насупраць М і к о л ы. Той не міргаючы глядзіць на яго.

Б у с л а й *(расказвае дрыжачым голасам)*. Паліто маё апрануў і пабег... Пайшоў, і з канцамі... Я яго ўсю зіму чакаў... А яно вунь як атрымалася...

М і к о л а. Ну, а сям'я? Сваякі? Няўжо яго ніхто не шукаў?

Б у с л а й. Якая сям'я, Мікола? Якая ў такіх, як мы, сям'я? Бабка ў яго адна была... Сектантка нейкая.. Заявіла ў кантору, што п'яніца ўнучак, грошы ёй пасылалі, а яна яму па пошце трыццатку ў месяц пасылала на хлеб... А мы заместа хлеба «чарніла» пілі... Як быццам калі грошай чалавеку не даваць, ён і піць не будзе... Яшчэ больш будзе... Я і думаў, што ён да гэтай бабкі задаў лататы і моліцца разам з ёй... А ён... Памяняліся мы з ім месцамі... Што я перажыў, Коля, за гэтыя гадзіны, не дай Бог... Чуць не чокнуўся...

М і к о л а. Дадому не заходзіў?

Б у с л а й. Ты што? Да Шаргая зазірнуў толькі... Я яшчэ ў горадзе выпадкова пра ўсё даведаўся... Агародамі прабіраўся па вёсцы, каб ні з кім не сустрэцца... Хацеў Шаргая папрасіць, каб да нас схадзіў, растлумачыў... Але ў яго вочы зусім залітыя... Налізаўся на памінках.

М і к о л а. Ён табе магілку капаў...

Б у с л а й. Ведаю... Як жа маці паказацца? У яе ж сэрца разарвецца... Ты вунь ні ў Бога, ні ў чорта не верыш, а да гэтага часу белы як палатно... Як жа гэта вы так?

М і к о л а. Мы? А ты?

Б у с л а й. Што пра мяне казаць?

М і к о л а. Не крыўдуй, але я нават узрадаваўся тваёй смерці...

Б у с л а й. Ды не маёй! Гэта Бэра...

М і к о л а. Прабач... Вось, думаю, і ўсё... Скончыліся мае пакуты, мой боль... Дзесяць гадоў сэрца балела... Дзесяць гадоў! Калі на вяселлі тваім з Нінай гуляў...

Б у с л а й. Дзе яна?

М і к о л а. Да маці пайшла начаваць...

Б у с л а й. І Рыгорка з ёй?

М і к о л а. З ёй... І калі Рыгорка ў вас нарадзіўся, і калі бачыў, што яна хадзіла заплаканая... І калі прыйшла да мяне — таксама балела! Ну скажы, ці любіў ты яе калі-небудзь хоць крапельку?

Б у с л а й. Не. Каб любіў, я б да такога не дакаціўся. Любоў чалавека ад усяго ратуе. Нікога я не любіў...

М і к о л а. Ужо два гады разам жывём... Я ёй сэрца сваё на патэльні падсмажыць гатовы, а яна цябе кахае... Цалую, лашчу

яе — вочы закрывае, каб цябе на маім месцы ўявіць... За што? Чым ты заслужыў гэта? Чым? Чым я не заслужыў? Ну хіба я горшы за цябе?

Б у с л а й. Лепшы, Мікола, лепшы, таму і не заслужыў... Мяне ўсе шкадавалі і заўсёды... А любоў з жалю пачынаецца...

М і к о л а. А чаму мяне ніхто не пашкадуе?! Толькі таму, што не п'ю? Таму, што нармальны чалавек? Але ж і ў мяне жывое сэрца! І ў мяне душа баліць... Я ж яе са школы кахаю...

Б у с л а й. І скажы дзякуй Богу, што кахаеш... Шчаслівы не той, каго, а той, хто кахае... Вось як ты... У цябе штодня душа працуе, дзейнічае... А дзеянне — жыццё, вечнае аднаўленне... Прасі лёс, каб не ўсё ў цябе гладка атрымлівалася... Каб зрэдку ён табе гора пасылаў... Гора робіць чалавека больш чыстым... Праз сваё гора зірнеш на людзей і пашкадуеш... А я вось нікога не пашкадаваў. Не разумеў! Хацеў, каб толькі мяне шкадавалі і разумелі... А душа, яна не дурніца! Яна свайго патрабавала... А я яе глушыў гарэлкай! Толькі хто я такі ў параўнанні з душой?! У ёй увесь наш сялянскі род сядзіць: справядлівы, чысты, мудры, цвярозы... Мае хаўтуры даўным-даўно адбыліся, а не сёння па памылцы... Заснула душа... Яна не можа, каб нікога не пашкадаваць, каб толькі цябе шкадавалі! Яна не можа гэтага вытрываць...

М і к о л а. А цябе і зноўку шкадаваць будуць. Ніна даведаецца, што ты жывы,— ратаваць пабяжыць... Змагацца за цябе. Яна ж вінаватай сябе лічыць, што не зберагла цябе...

Б у с л а й. Чалавек сам сябе павінен зберагаць... Жывіце спакойна...

М і к о л а. А я зноў адзін застануся са сваім шчасцем-каханнем... Зноў!

Б у с л а й *(нахіліўся да Міколы)*. Міколка, прабач ты мне...

М і к о л а. Ці толькі ты ў гэтым вінаваты? Як усё несправядліва на свеце...

Б у с л а й. Я не пра тое... Мне ва ўсяго свету прабачэння прасіць трэба... Я перад усім светам вінаваты... Дык пачну ўжо з цябе. А заўтра, калі ўсё ўтрасецца, пайду за вёску на поле... Памятаю з маленства адно: чырвоны камбайн плыве па збажыне, а мы за ім па ржышчы босыя бяжым... Сонца гарачае... І рабыя каровы каля жоўтых коп... Што ж гэта сталася з намі? Чаму ж я заблудзіўся? Прыйду на гэта поле, знайду праталіну, стану на калені, пацалую зямлю і буду ў яе прабачэння прасіць... А мо і даруе, а мо параду дасць... Няма іншага выйсця... Няма...

Ляпнула клямка, адчыняюцца дзверы, уваходзіць М а ц і. Буслай здрыгануўся ад страху, закрыў твар далонямі.

М і к о л а *(збялеў)*. Што? Што, цётка Маруся?

М а ц і. А дзе Нінка?

М і к о л а. Да маці пайшла начаваць... Кажа, пажыву дзень-другі ў маці... Цяжка ёй тут са мной... Я разумею...

М а ц і *(кіўнула на бутэльку)*. Памінаеце?

М і к о л а *(нервова)*. Ага, памінаем...

М а ц і. Мікола, не крыўдуй ты на мяне, дурніцу старую... Ад гора ў мяне галава і сэрца здранцвелі... Ад гора...

М і к о л а. Што вы, цётухна? За што крыўдаваць?

М а ц і. За тыя словы, што на цябе казала сёння... Даруй мне... Усё, што ты казаў,— чыстая праўдачка... Толькі хіба ж маці яе слухаць?..

М і к о л а. І вы мне даруйце... Не стрымаў я сёння свой боль... Вырваўся ён...

М а ц і. А пра яго не варта думаць блага... Добрым успомніць нямашака чым, дык хоць ужо саўсім не ўспамінай... Хай ён там ляжыць спакойна... Добра?

М і к о л а. Добра...

М а ц і. Ну, а паслязаўтра на тры дні прыходзьце... Разам з Нінай... І Рыгорку прывядзіце... Хоць за сталом пасядзіць. Мне лягчэй будзе...

М і к о л а. Добра, добра, цётка...

М а ц і *(да Буслая)*. І ты, дзетухна, прыходзь... Ведаў жа, мабыць, Андрэя нашага?..

Б у с л а й *(запалым голасам, не адымаючы далоняў ад твару)*. Ага...

М а ц і. Прыходзьце, дзеткі... Хочацца ж, каб усё як у людзей было... *(Выходзіць.)*

Паўза. Буслай павольна-павольна адымае далоні. На яго твар страшна глядзець. Мікола кідаецца да яго.

М і к о л а. Андрэй! Ты што? Ты чуеш мяне? На, на выпі... *(Дрыжачымі рукамі налівае гарэлкі, спрабуе выліць у рот Буслаю. Гарэлка разліваецца.)* Нічога... Я зараз яе даганю, растлумачу... Тут я не мог! Яна б не вытрымала... Андрэй!!

Б у с л а й. Вось... Вось яна, адплата... За ўсё!

М і к о л а *(апранае паліто)*. Я зараз, зараз...

Б у с л а й *(раптам імпэтна кінуўся на яго, павіс на руках)*. Стой! Стой, Мікола... Не трэба нічога! Не трэба! Так павінна быць... Няхай усё так і будзе! Адплакала-адгаласіла, ёй жа цяпер лягчэй будзе... І табе, і Ніне, і бацьку... Усім! Досыць... Магілка мая ёсць на кладзішчы, пасведчанне аб смерці ёсць! Навошта ж вам зноў пакуту на плечы ўзвальваць? У мяне толькі адна дарога... Адна... Туды, у небыццё! Я свой парог пераступіў... Я жыў не па-людску, дык хоць памерці трэба, каб вам

спакойней жылося... Хоць смерцю адплаціць вам за ўсё... Хоць апошні крок добра зрабіць...

М і к о л а. Што ты мелеш?

Б у с л а й. Бэру шукаць ніхто не будзе, мяне не знойдуць... Я так усё зраблю, што ніколі не знойдуць...

М і к о л а. Пусці!

Б у с л а й. Я толькі да Шаргая заходзіў... Ён п'яны, падумае, што прыснілася ўсё, а ты не кажы нікому... Га, Мікола? Я цвярозы сёння...

М і к о л а *(злосна)*. Гад! Гад ты! Ты што мне прапаноўваеш? Я лепей здохну ад уласнага гора, бабылём памру, чым вазьму такое на душу! Пусці, свалата! *(Адпіхнуў Буслая, выбег.)*

Буслай сеў на падлогу, нейкі час нерухома сядзеў, потым падняўся, пачаў нешта шукаць на стале. Яго позірк спыніўся на ручніку, якім быў прыкрыты хлеб. Буслай цягне яго да сябе. Ручнік вузкі і доўгі. Буслай ліхаманкава скручвае яго і робіць пятлю. Потым падыходзіць да стала, налівае поўную шклянку гарэлкі, падносіць да твару, хоча выпіць, але раптам шпурляе шклянку з гарэлкай на падлогу. Шклянка разбіваецца. Буслай ідзе да дзвярэй. З другога пакоя выходзіць заспаны Р ы г о р к а.

Р ы г о р к а *(у яго вочы яшчэ не расплюшчыліся)*. Татка...

Буслай здрыгануўся. Зірнуў на хлопчыка.

Б у с л а й. Рыгорка... Сыночак мой...

Р ы г о р к а. А дзе мой тата Коля?

Б у с л а й. Я ж твой... *(Схамянуўся.)* Ён пайшоў... На вуліцу пайшоў...

Р ы г о р к а. Ваўкоў праганяць?

Б у с л а й. Ага... Ваўкоў...

Р ы г о р к а. І мамка ваўкоў ганяе?..

Б у с л а й. І мамка...

Р ы г о р к а. А ты чаму не пайшоў ганяць?

Б у с л а й. Не ўмею...

Р ы г о р к а. А што ты ўмееш?

Б у с л а й. Сабакам сена касіць.. Толькі сабакам сена касіць...

Р ы г о р к а. А сабакі сена не ядуць...

Б у с л а й. А я вось кашу...

Р ы г о р к а. А я цябе ведаю... Ты сёння ў скрынцы ляжаў у бабы Марусінай хаце... І яшчэ на карцінцы з чорнай стужкай быў... Карцінка на скрынцы стаяла... Баба Маруся плакала, і мама плакала і цалавала мяне, а яшчэ цябе ў лес вазілі і ў ямку закапвалі... А ў мяне шапку адабралі... мароз за вушы кусаўся... А ты ўцёк з ямкі?

Б у с л а й. Уцёк... Толькі ты не бойся мяне...

Р ы г о р к а. А я і не баюся... Холадна табе там было?

Б у с л а й. Дзе?

Р ы г о р к а. У ямцы...

Б у с л а й. Холадна, сыночак, холадна...

Р ы г о р к а. А ты схавайся, каб цябе не знайшлі і зноўку не закапалі. Лезь да нас на печ... Яна цёплая... Мы зімой заўсёды з мамкай там спім...

Б у с л а й. Можна, я пацалую цябе, сыночак?

Р ы г о р к а. Не, ты, мабыць, калючы, дзядзя...

Буслай падыходзіць да хлопчыка, становіцца перад ім на калені.

Б у с л а й. Прабач, Рыгорка... Прабач, родненькі... прабач, маленькі... Буслік мой! Толькі ты прабач, а са светам я паміруся... Толькі ты адзін прабач... Прабач... Прабач... *(Схіляецца да маленькіх ножак, цалуе іх, плача.)*

Р ы г о р к а. Дзядзя, дзядзечка, не трэба плакаць... Гэта толькі дрэнныя дзеці плачуць... Ты мне лепей казку раскажы... Тата Коля мне заўсёды расказвае...

Б у с л а й *(бярэ хлопчыка на рукі).* Зараз, зараз, сыночак... *(Прытуляе да сябе.)* Жыў-быў... *(Успамінае.)* Жылі-былі... *(Намагаецца ўспомніць.)* Жылі-былі... *(З жахам.)* Не памятаю... *(Апускаецца на падлогу.)*

У хату амаль адначасова ўбягаюць М а ц і, заплаканая і расхрыстаная, Б а ц ь к а, Н і н а, М і к о л а. Усе спыняюцца каля дзвярэй. Глядзяць.

*(Яшчэ мацней прытуляючы сына да сябе.)* Не памятаю... Не памятаю... Не памятаю...

*З а с л о н а*

*1981*

# Вечар

**Меладрама ў дзвюх дзеях**

**ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ**

Васіль.
Ганна.
Гастрыт.

Нашы дні.

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Шэрая раніца. Сонца яшчэ спіць. Недзе далёка самотная зязюля лічыць некаму гады. Нястройны і яшчэ нясмелы птушыны хор і смелы ўрачысты покліч «ку-ка-рэ-ку-у-у-у» абвяшчаюць усёй вёсцы, што надышоў новы дзень. Павольна-павольна з-за вугла сваёй хаты выходзіць Васіль з вядром. Высокі, худы, нетаропкі ні ў рухах, ні ў словах, ні ў думках.

Васіль *(пазіраючы за сад).* Уставай, уставай ужо... Ранак выдаўся сцюдзёны, у свеце неспакойна, прэзідэнты шалеюць... Плюнь на ўсё і прачынайся... І сёння трэба жыць. З табой, з зямлёю і з людзьмі... Людзі добрыя ўсе, мо толькі забыліся пра гэта... Бягуць, едуць, ляцяць... Ці то ўцякаем ад некага, ці то даганяем — ліха нас ведае... *(Падыходзіць да калодзежа, пачынае даставаць ваду.)* Як у чыгунку жывём! Аж бурбалкі, аж пара прэ... Немаведама хто толькі гэту поліўку сёрбаць будзе, калі яна ўрэшце зварыцца... *(Дастаў вядро, пераліў у сваё, аднёс у бок ад калодзежа, выліў на зямлю.)* Гэта на тваю хату, Сёмка... *(Вяртаецца, зноў пачынае даставаць ваду.)* Як паспакайнець? Няма спакою, і дабрыні не знойдзеш... Дабрыня ціхая... *(Дастаў вядро, пераліў, аднёс, выліў.)* А гэта на тваю хату, Іван... *(Вяртаецца, зноў дастае ваду.)* Думаеш, глупствам займаюся? Няма каму ваду з калодзежа браць... Раз'ехаліся ўсе... А калодзеж жывы павінен быць... З яго чэрпаць трэба, каб і вада жывой была... Во я і выбіраю яе штодня... За былых сваіх суседзяў, за дзяцей іх і за свайго сына... *(Аднёс вядро, выліў.)* На тваю хату, Пятрок... Ах, дзеткі, дзеткі... Такія вы ў нас грамацеі выраслі! Яны табе і Бога на лапаткі пакладуць, дакажуць, што Іуда некалі добрую справу зрабіў... Усё могуць. Толькі сваіх дзяцей не хочуць на свет пускаць... Ці то баяцца, ці то лянуюцца, ці то хочуць, каб ніхто жыць не замінаў... Дык ты сам жывеш, дык і другому дай... Ненароджаныя дзеткі — гэта ж усё адно як памерлыя... Слухаеш? Ну, слухай, слухай... Холадна, мабыць, там і цёмна... Дзе там? У космасе, канечна... Дзе ж яшчэ? Я во падумаю-падумаю, а што, калі б мае бацька-маці ўзялі дый не нарадзілі мяне?! Га? Ды я б ім гэтага ніколі не дараваў! Хаця нясоладка было: тры вайны адпляскаў... мнагавата. Ды і без вайны жыццё мёдам не было... І ад чужых, і ад сваіх нацярпеўся... Сын пісем не піша. Слухаеш? Слухай, слухай... І прачынайся... Прачынайся...

Да калодзежа падыходзіць Ганна. Такая ж, як і Васіль, старэнькая, белая. Яна нікуды не спяшаецца. Спынілася, паслухала.

Ганна. Чаго й та ты, Васіль?
Васіль. Што?
Ганна. Бубніш нешта сам сабе... Маліўся, ці што?

В а с і л ь. Размаўляў... з Сонцам...

Г а н н а. Ашалеў пад старасць... З Богам, з Богам трэба размаўляць, а ты немаведама з кім...

В а с і л ь. З кім хачу, з тым і размаўляю... Свабода совесці... Маўчыць яно. Свеціць і маўчыць. Слухае...

Г а н н а. Доўга ты яшчэ пражывеш, Васіль...

В а с і л ь. Кінь ты!

Г а н н а. Гаварыць табе яшчэ хочацца з кім-небудзь... А перад смерцю чалавек заціхае і маўчыць, як тваё Сонца... Колькі гэта табе?

В а с і л ь. Восемдзесят, а мо і болей... Лічыць надакучыла...

Г а н н а. Дык гэта ты старэйшы за мяне?

В а с і л ь. А ты думала?..

Г а н н а. Ну-у, тады і мне яшчэ трохі пасмылець трэба... Хаця б да тваіх гадоў...

В а с і л ь. Смылей на здароўе...

Г а н н а. Вады з твайго калодзежа вазьму...

В а с і л ь. Бяры... *(Уважліва глядзіць некуды ўдалячынь, падымаецца, выходзіць уперад.)*

Г а н н а. Што там?

В а с і л ь. Ідзе нехта...

Ганна падыходзіць. Глядзяць удваіх.

Павярнуў... У Займішча, мабыць...

Ганна падыходзіць да калодзежа, марудна апускае драўлянае вядро.

Г а н н а. Грышка твой усё не піша?

В а с і л ь. З'ехаў пасля арміі і саўсім забыўся, што ў яго бацька ёсць.

Г а н н а. Была б Наста жывая, дык пісаў бы і прыязджаў.

В а с і л ь. Бацьку дзеці лягчэй забываюць... Твая праўда...

Г а н н а. Сон я сёння бачыла... Можа, разгадаеш?

В а с і л ь. Знайшла цыганку...

Г а н н а. Дык ты ж Сонцу молішся!

В а с і л ь. Расказвай, разгадаю...

Г а н н а. Іваньку бачыла... Старэйшага свайго... Здаецца, ро-оўненькае поле жытнёвае, неба над ім чыстае-чыстае! І жаўрукі ў ім вісяць. І як быццам Іванька мой ідзе гэтым полем, раз-пораз жменю зерня дастае з кішэні і сыпле сабе пад ногі. Я стаю на ўзмежку дый думаю: «Навошта ён зерне кідае ў зямлю? Жыта ж ужо вырасла, у каласы пайшло, а ён нанава сеяць надумаўся...» Спытаць хацела, а голасу няма. Ён і прайшоў. Я і не спытала...

В а с і л ь *(не адразу)*. Добры сон...

Г а н н а. А чым?

В а с і л ь. Неба было чыстае?

Г а н н а. Ну.

В а с і л ь.Чыстае неба заўсёды на дабро. Жыта было?

Г а н н а. Было...

В а с і л ь. Хлеб на дабро. Жаўрукі з песняй таксама на радасць...

Г а н н а. А Іванька? Нябожчыка ж сніць гэта ж, кажуць...

В а с і л ь. Ён жа «без весці»! Які ж нябожчык, дурніца старая?!

Г а н н а. Яно-та так...

В а с і л ь. Я табе кажу — добры сон... Чакай.

Г а н н а. Што чакаць?

В а с і л ь. Радасці, дзіва нейкага...

Г а н н а. Ну, дзякуй табе... Маліся далей, пайду казу пасвіць... У Займішча буду заходзіць, мо ўзяць што?

В а с і л ь. Хлеба купі... І пенсію сёння павінны даць...

Г а н н а. Ага...

Разышліся. В а с і л ь панёс вядро з вадой дахаты. З другога боку вуліцы выходзіць Г а с т р ы т. Маленькі, жвавы і нейкі калючы дзядок. Усё ў яго вострае: і барада, і плечы, і локці, і калені, і нос. Прыйшоў па ваду з чайнікам. Дастаў, наліў у чайнік, выпіў з носіка. Пастаяў, уздыхнуў, прысеў на лавачку.

Г а с т р ы т *(кліча)*. Васіль!

За плотам з'явіўся В а с і л ь.

В а с і л ь. Га?

Г а с т р ы т. Калі паміраць думаеш?

В а с і л ь *(без паўзы)*. У сераду...

Г а с т р ы т *(збянтэжыўся)*. У гэту, ці што?

В а с і л ь. У якую, ліха яе ведае, а што ў сераду — гэта як піць даць. Самы зручны дзень. Памру, значыць, зранку... Не, не! Пасля абеду. Памыюць вадой вось з гэтага калодзежа...

Г а с т р ы т. Халодная ж...

В а с і л ь. Табе халодная, а мне ў акурат... Ну, увесь чацвер паляжу ў хаце... У пятніцу, значыць, на кладзішча, а потым ужо ўсе выхадныя памінайце... Піце, гуляйце аж да панядзелка... На гэта сотню-другую пакіну...

Г а с т р ы т *(падумаўшы, злосна)*. Брэшаш! Не веру. І ты баішся. Павінен баяцца, а не... Ну што ты ў жыцці бачыў, каб з лёгкай душой смерць прымаць?

В а с і л ь. Усё трэба рабіць з лёгкай душой...

Г а с т р ы т. Брэшаш!

В а с і л ь. А ты не гаўкай тады! Прыпёрся, ёлкі-маталкі, і пра смерць бае. Знайшоў пра што... А я, можа, на ўсю сотню замахнуўся...

Г а с т р ы т. Нашто табе столькі капціць?

В а с і л ь. Унукаў дачакацца трэба...

Г а с т р ы т *(усміхнуўся)*. Дык а яны, можа, ужо ёсць, а ты і не ведаеш. Унукі... Піша каму-небудзь твой Грышка?

В а с і л ь *(ніякавата)*. Піша... Мне піша...

Г а с т р ы т. Брэшаш... Мае не пішуць, і твой павінен не пісаць...

В а с і л ь. Піша!

Г а с т р ы т *(спакойна)*. Брэшаш...

В а с і л ь *(нечакана)*. Калі ты нарадзіўся, Мікіта?

Г а с т р ы т. Ну, восенню...

В а с і л ь *(падумаў, нібы падлічваючы)*. Правільна...

Г а с т р ы т. Што правільна?

В а с і л ь. У Каляды цябе бацька з маткай рабілі, во што! У самую сцюжу... І на сугробе...

Г а с т р ы т. А цябе...

В а с і л ь *(не даў дагаварыць)*. Мяне на печы. На гарачых цаглінах. І ўсё! Ідзі дадому, Мікіта... З табой пагаворыш — потым цэлую ноч поскудзь усялякая сніцца...

Г а с т р ы т *(зацята)*. Ладна! Пагляджу я, ці такі ты будзеш вясёлы, калі гэта сука касая ўсур'ёз за цябе возьмецца... Пагляджу!

В а с і л ь. А мо мне давядзецца паглядзець? Га? Ты ж ад сваёй злосці капыты адкінеш... Твар вунь, як жоўты кукіш...

Г а с т р ы т. На гэта не надзейся! Здохну, а цябе перажыву!

В а с і л ь *(зірнуў на дарогу)*. Пачакай, пачакай... Едзе нехта! У вёску едзе!

Выбеглі ўперад, глядзяць. Чакаюць. Уздыхнулі.

Г а с т р ы т. Павярнулі... Па грыбы прыкацілі... А ты ўжо ўзрадаваўся! Не прыедуць... *(Засмяяўся.)* Яны і на хаўтуры не прыедуць! Сорамна будзе ў труне ляжаць...

В а с і л ь. І чаму ты так пра смерць любіш пагаварыць, не раўнуючы як я пра свой раўмацізм?.. Дык у мяне хвароба, яна, праклятая, косці ломіць, хочаш не хочаш, а будзеш і памятаць і гаварыць... А пра смерць... На які д'ябал языком мянціць, прымервацца да яе? Не спужаеш і не ўцячэш!

Г а с т р ы т. Не разумею! Як так можна? Усё яму добра, усё хораша! Што за народ?! Б'юць іх — добра, апошняе адбіраюць — хай, дзеці забыліся — так трэба, смерць у вочы глядзіць — заходзь, любая, чарку дам! Лапух!

В а с і л ь. Не хадзіў бы ты да майго калодзежа... Га, Мікіта?..

Г а с т р ы т. Хадзіў і буду. Не забароніш.

В а с і л ь. Забараніць не магу... Гэта калодзеж... Самая смачная, самая чыстая вада...

Г а с т р ы т. У цябе? Самая смачная? Цьфу!

В а с і л ь. Што ты робіш, вырадак?! На святы калодзеж пляваць! Гэта вада душу мякчэйшай робіць і галаву яснай...

Г а с т р ы т *(папрасіў)*. Васіль, растлумач ты мне... Хоць забі — не разумею...

В а с і л ь. Што растлумачыць?

Г а с т р ы т. Ты проста прыдурак ці толькі прыкідваешся? Сонцу, як людаед, моліцца, вада ў яго ну не проста вада, а жывая... Нябожчыку на пятку капні — у скокі пойдзе... Здзяцініўся пад старасць!

В а с і л ь. Ідзі ты, Мікіта, адсюль...

Г а с т р ы т. Не пайду.

В а с і л ь. Не трывож майго сэрца!

Г а с т р ы т. Не пайду! Вуліца не твая.

В а с і л ь. Тады злазь з лаўкі, падла! Лаўка мая, сам рабіў...

Гастрыт устаў з лаўкі, сеў побач на траву.

Г а с т р ы т. Падавіся сваёй лаўкай. Куркуль!

Васіль маўчыць.

Перажытак!

В а с і л ь. Сталоўка ўжо адчынілася, Мікіта... Ідзі гуляш калгасны ў Займішча есці... Вадзіцы з майго калодзежа напіся і ідзі.

Г а с т р ы т. І пайду. А ты бульбай нішчымнай давіся!

В а с і л ь. Я сам сябе ўсё жыццё карміў, кармлю і да смерці карміць буду...

Г а с т р ы т. Брэшаш! Грошай шкада, во і цягнеш з сябе жылы... А нашто яны табе? Богу ўзятку даваць уздумаў?

В а с і л ь. Не хачу нават пад старасць як той клоп жыць... Хадзіць па зямлі і ў сталоўцы абедаць... Гэта ж сорам!

Г а с т р ы т. Гэта не сорам! Гэта абшчэственная пітанія! І потым я заслужыў... У мяне пенсія!

В а с і л ь. Пенсія хутка ва ўсіх будзе... Хто толькі нас гуляшамі карміць будзе?..

Г а с т р ы т. Я калі-небудзь на цябе ананімку напішу. Пабачыш. (*Злосны, пайшоў.)*

Чайнік з калодзежнай вадой застаўся каля лаўкі.

В а с і л ь *(адзін)*. Ты не крыўдуй на яго... Душа ў чалавека баліць. Нічога за ўсё жыццё нікому не аддаў... Аддаць трэба... Трэба... Тады ты і сагрэеш, і суцешыш, і сілы пад старасць дасі... Праўда? Слухаеш? Пайду свіннату сваю карміць... Чуеш, вішчаць? Эх, ручухны мае, ручухны!.. Што ж гэта вы так расхадзіліся? Ці не дождж збіраецца?.. Не падобна як быццам...

З'яўляецца Г а н н а. З сумкай хлеба, стомленая і вясёлая.

Г а н н а. Канчай маліцца — будзем весяліцца...

В а с і л ь. Хлеба купіла?

Г а н н а. Ага...

В а с і л ь. А пенсію прынесла?

Г а н н а. Пенсію не далі... Ты, кажуць, з завітушкамі распісваешся, а я без завітушак... Сам сходзіш... *(Прысела на лаўку, зняла хустку.)* Ну, давай, Васіль!

В а с і л ь *(глядзіць здзіўлена)*. Што табе даць?

Г а н н а. Страсяні касцямі — пакажы самадзейнасць!

В а с і л ь. Ды ты, мабыць, піва ў сталоўцы выпіла?

Г а н н а. Пісьмо табе прынесла...

В а с і л ь *(захваляваўся, але наўмысна спакойна)*. Ад каго?

Г а н н а. Ну, ад каго ты думаеш?

В а с і л ь *(рашуча)*. Давай!

Г а н н а. Не-не-не! Табе радасць, дык ты ўжо і мяне парадуй... Згоцай «Лявоніху» з прыпеўкамі...

В а с і л ь. Не дуры галавы! Адкуль пісьмо?

Г а н н а. Ой, язык зламаць можна! Нешта такое джыкгам-гаў...

В а с і л ь. Джэсказган!

Г а н н а. Во-во!

В а с і л ь. Ад Грышкі...

Г а н н а. «Лявоніху», Васіль, «Лявоніху»...

В а с і л ь. Ну, што ты як маленькая, чэснае слова...

Г а н н а. А так — забі, не аддам!

В а с і л ь. А, ёлкі-маталкі! *(Падышоў, схапіў сумку, пашукаў і не знайшоў.)* Аддай, табе кажуць, а то зараз самую шчупаць пачну!

Г а н н а. Ой, спужаў! Мяне ўжо можна шчупаць...

В а с і л ь. Цьфу!

Г а н н а. «Лявоніху», Васіль, а то зараз пайду!

В а с і л ь. Дык я ж растрасуся...

Г а н н а *(паднялася)*. Пайду! І аддам толькі пад вечар...

В а с і л ь. Каб ты згарэла! *(Разы са два тупнуў.)*

Г а н н а. Не, не... Пад музыку. *(Заспявала.)*

> Ой, Лявоніха, ня жонка была,
> Нямытую рубашонку дала,
> Нямытую-некачаную,
> У суседа...

Ну, чаго ты колам стаў?! Танцуй! *(Спявае.)*

> Нямытую-некачаную,
> У суседа пазычаную...

Весялей, весялей...

Туры-туры-турытушачкі,
Туры-туры-турытушачку!

Васіль скача.

А цяпер упрысядкі! І-і-і-эх!

Васіль сагнуўся, каб пусціцца ўпрысядкі, і знерухомеў.

В а с і л ь *(схапіўся за спіну)*. Ой!

Г а н н а. Чаго й та ты?

В а с і л ь *(стаіць, сагнуўшыся, як пытальнік)*. Порхаўка старая! Прысядкі ёй трэба! З маім здароўем — «Лявоніху»! Хадзі во, разгінай мяне, каб табе не ведаю што... У мяне ж сярэдзіна!

Г а н н а. А, Госпадзі! *(Падбегла.)* Што ж рабіць?

В а с і л ь. Увапрыся далоняй усярэдзіну... Ды не кулаком, а далоняй! Так... так... Не, вышэй трохі... Во чокнутая! Ці ж можна так з чалавека здзекавацца?

Г а н н а. Ну ладна табе...

В а с і л ь. Дай толькі разагнуцца — ты ў мяне балетам заскачаш! Во так трымай. Цяпер бяры за галаву... Так... *(Камандуе.)* Разгінай!

Ганна спрабуе «разгінаць».

*(Стогне.)* Нічога не выйдзе... Цягні на лаўку, пакладзі як-небудзь... Сам буду разгінацца.

Г а н н а *(вядзе старога да лаўкі)*. Аёечкі, каб жа я ведала...

В а с і л ь *(сярдзіта)*. Галавой думаць трэба... Самадзейнасці ёй захацелася...

Ганна падвяла Васіля да лаўкі, асцярожна-асцярожна паклала яго на яе.

*(Паволі выпрамляецца.)* Давай пісьмо!

Г а н н а *(дастае з-пад кофты)*. На, на...

Васіль, лежачы, разрывае канверт, нецярпліва выцягвае белы лісток.

В а с і л ь. У цябе акуляры з сабой?

Г а н н а. Зараз, зараз... *(Дастае з сумкі.)* На...

Васіль надзявае акуляры. Ганна ўздыхнула, адышла да плота, глядзіць. Васіль жмурыцца, здымае акуляры.

В а с і л ь. Ты ў іх бачыш што-небудзь?

Г а н н а. Усё чыста.

В а с і л ь. Туман нейкі, і ўсё... *(Перавярнуў акуляры дужкамі ўперад.)* Во! Другое дзела... Ты ж іх не тым бокам носіш! *(Прачытаў некалькі радкоў, спахмурнеў, адразу, забыўшыся пра сярэдзіну, падняўся, сеў, паклаў на калені пісьмо, акуляры. Сумна глядзіць перад сабой.)*

Г а н н а *(устрывожана)*. Ну?! Што там у яго?

В а с і л ь. Маё гэта пісьмо, Ганна, маё... Пасылаў з месяц таму... Вярнулася... Зноў Грышка выбыў некуды... Во табе і «Лявоніха ня жонка была»...

Паўза. Старая павольна падыходзіць да лаўкі, сядае побач.

Г а н н а. Не сярдуй, Васіль...

В а с і л ь. Кінь ты...

Г а н н а. Табе хоць ёсць ад каго чакаць...

В а с і л ь. Дачакаешся...

Г а н н а. А я б, здаецца, з раніцы да ночы скакала, каб толькі ведаць, што мой Віцёк няўдачны калі-небудзь успомніць пра мяне... Хай ужо і пісьма не напішыць... Абы толькі ўспомніў... Не сярдуй... *(Дастае з сумкі хлеб.)* Булкі табе хопіць?

В а с і л ь. Хопіць...

Г а н н а. А то дзве магу пакінуць...

В а с і л ь. Хопіць адной...

Г а н н а. Ну, пайду... *(Пайшла.)*

Стары зноў разгарнуў пісьмо. Пакруціў у руках, паглядзеў і горка-горка засмяяўся. Падыходзіць Г а с т р ы т.

Г а с т р ы т *(весела)*. Жывеш?

В а с і л ь. Жыву...

Г а с т р ы т. А чаго гэта ты рагочаш?

В а с і л ь. Хачу і рагачу...

Г а с т р ы т. Атрымаў, я бачу?

В а с і л ь. Ну, атрымаў, а табе што?

Г а с т р ы т. Давай пачытаю...

В а с і л ь. Ідзі, Мікіта, не чапляйся...

Г а с т р ы т. Грошай, канечне, просіць. Прапіўся да ніткі, во і бацьку ўспомніў.

В а с і л ь *(стомлена і не злосна)*. Каб ты здох! Ну, што ты за чалавек? Гастрыт, адно слова — Гастрыт... Чаго ты такі злы?

Г а с т р ы т. Я не злы! Я чэсны...

В а с і л ь. Гвяздану я цябе калі-небудзь...

Г а с т р ы т. У суд падам. Пасадзяць...

В а с і л ь. Прэмію дадуць! Ад цябе ж ва ўсім свеце холадна... Ідзі, ідзі, я табе сказаў...

Г а с т р ы т. Я па свой чайнік прыйшоў... Забыўся тут... Дзе падзеў?

В а с і л ь. Вунь стаіць!

Гастрыт падышоў, узяў чайнік, выліў з яго ваду...

Г а с т р ы т. Вады свежай можна ўзяць?

В а с і л ь. Бяры...

Гастрыт пачынае даставаць ваду.

Г а с т р ы т. Што гэта ў свеце робіцца, Васіль?

В а с і л ь. Лета канчаецца...

Г а с т р ы т. Куды ідзём?

В а с і л ь. Не ведаю...

Г а с т р ы т. Чым далей — тым людзі паганей робяцца... Сёння каля сталоўкі бугая гэтага, Мішку Сіляўца, сустрэў... Вісіць на плоце, носам сваім чырвоным шмыгае... «Дзед, кажа, я як убачу цябе — кулакі свярбяць, так хочацца табе па вуху даць... На, кажа, тысячу і падстаў вуха... Я прымачу адзін разок». Алкаш няшчасны! І чаго яны такія? Толькі пра тое і думаюць, каб кожны дзень гарэлкі нажэрціся даікаўкі!

В а с і л ь. А што ім яшчэ рабіць? Ні рукі, ні душы не занятыя...

Г а с т р ы т. Хай над сабой працуе! Павышаіць уравень!

В а с і л ь. Во ён гарэлкай і павышае...

Г а с т р ы т. Мы ім шчасце заваявалі... Сытыя ўсе, абутыя-адзетыя... І недавольныя! Якой ім яшчэ трасцы трэба?

В а с і л ь. Шчасце з чужых рук заўсёды кіслае... Шчасце самому сабе рабіць трэба... Абутыя-адзетыя... І ўпрогаладзь жывучы, радасныя песні спяваць можна... Не ў сытым пузе шчасце...

Г а с т р ы т. А ў чым жа яно? Растлумач мне, цёмнаму, святы чалавек.

В а с і л ь. У працы... У радаснай працы... А вы адбілі ахвоту ў людзей радасна працаваць на зямлі...

Г а с т р ы т. Хто гэта мы?

В а с і л ь. Ты і такія ж асталопы, як ты... Сто гадоў гадзілі людзям і цяпер гадзяць...

Г а с т р ы т *(падняў палец угору).* І там гадзяць?

В а с і л ь. І там...

Г а с т р ы т. Васіль! Я цябе па-суседскі папярэджваю: не смушчай людзей. Ты ведаеш, супраць чаго выступаеш?

В а с і л ь. Супраць дурноты!

Г а с т р ы т. Васіль, я чэсны! Я магу ананімку напісаць...

В а с і л ь. Пішы...

Г а с т р ы т. Выклічуць... куды трэба за такія закідоны.

В а с і л ь. Не пужай. Скончыўся твой час...

Г а с т р ы т. Чэснае слова, напішу...

В а с і л ь. Пішы... *(Падняўся з лавачкі, пайшоў да веснічак.)*

Прыбягае Г а н н а. Без хусткі, рахрыстаная, заплаканыя вочы гараць.

Г а н н а *(крычыць).* Людцы-ы!! Людцы!

В а с і л ь. Чаго ты?

Г а н н а *(задышліва)*. Радзіва! Радзіва... Хутчэй уключыце! Слухайце!

Васіль подбегам кідаецца да акна, адчыняе яго, круціць дынамік. Урываецца голас дыктара.

Г о л а с д ы к т а р а. ...яе мацярынскую любоў і пяшчоту. Я памятаю яе ласкавыя рукі, што пяклі самы смачны хлеб і маглі трымаць зброю. У грозныя дні вайны, у партызанскім атрадзе, яна абараняла Радзіму...

В а с і л ь. Фу-у-у, я ўжо думаў, што ізноў вайна...

Г а с т р ы т *(да Ганны)*. Ты што, з глузду з'ехала?

Г а н н а. Сціхніце!

Г о л а с д ы к т а р а. ...Цяпер я далёка. Але вельмі часта мне сняцца начамі нашы Вежкі...

Г а н н а *(усхліпнула)*. Сыночак!

Г о л а с д ы к т а р а. ...хата канцавая, тры бярозкі пад акном і мама...

На гэтых словах Ганна, ужо не стрымліваючыся, загаласіла на ўвесь голас, пайшла да акна, схапіла з падаконніка старэнькі дынамік, прыціснула яго да грудзей.

В а с і л ь *(спалохана)*. Ганна, Ганна... Ты гэта... Сядзь... Супакойся. Не трэба так... Зараз вады дам... Чаго ты? *(Да Гастрыта.)* Чаго аслупянеў? Дай свой чайнік!

Гастрыт падае чайнік. Ганна п'е.

Г а с т р ы т. Дайце-ка даслухаць... *(Бярэ з рук Ганны дынамік.)*

Г о л а с д ы к т а р а. Паважаная Ганна Восіпаўна! Ад усяго сэрца мы жадаем вам моцнага здароўя і доўгіх год жыцця і па просьбе вашага сына Віктара перадаём для вас вашу любімую песню «Ой, ляцелі гусі з броду».

Г а н н а *(выціраючы вочы)*. Дачакалася, дзякуй Богу... Успомніў... Спакойна памру...

Гучыць песня па радыё. Старыя слухаюць. Ціха так слухаюць.

Во яно і дзіва... Ваську ў сне бачыла, а Віцёк аб'явіўся... Помніць... Любіць...

В а с і л ь *(бубніць паблажліва)*. А толькі ныла ўсё: няўдачліва я яго радзіла, няўдачны ён атрымаўся... А ён цябе на ўсю краіну... Увесь народ цяпер ведае, што на зямлі жыве... Ганна з Вежак... І што сын у яе ёсць... Хоць і далёка, але ж ёсць...

Г а с т р ы т. Оё-ё-ёй! Зірніце вы на іх! Загарэліся! Засвяціліся! Аж блішчаць!

В а с і л ь. Мікіта, ты... ідзі адсюль... Я цябе прашу.

Г а с т р ы т. Не пайду! Нечага тут... *(Да Ганны.)* Ганна, я цябе паважаю, але я чэсны... я справядлівы... Не крыўдуй... Не пра цябе гэта ўсё. Не ён гэта.

Г а н н а. А хто ж?

В а с і л ь. Табе вушы пазакладвала, ці што?! Пра нашы ж Вежкі гаварылі!

Г а с т р ы т. Другія Вежкі, другая Ганна і другі Віцёк! Ён такое не мог напісаць! Не мог!

В а с і л ь. Дык што ж, яна сама пра сябе напісала?!

Г а с т р ы т. Не ведаю. Дзе ён у яе? Дзе?

Г а н н а. Вы ж ведаеце... Сядзіць.

Г а с т р ы т. І каторы раз? Толькі, Ганна, прашу... не крыўдуй... Я чэсны. Я справядлівы. У мяне ў самога дзеці няўдачныя... Расціў-карміў іх, дык быў харошы, а выраслі — дрэнным стаў! Грошы толькі пасылаюць, рублямі ад мяне адкупліваюцца, а каб што-небудзь такое... і не падумаюць і не ўспомняць... Няўдачныя!

В а с і л ь. А вось Віцёк пра яе ўспомніў... Узяў і напісаў...

Г а с т р ы т. Ага! Сяджу на нарах, як кароль на імянінах,— перадайце для маёй маці «Ой, ляцелі гусі...»!

В а с і л ь. Ідзі адсюль!

Г а с т р ы т. Не пайду!

В а с і л ь. Ганна, не слухай... Ён кантужаны...

Г а с т р ы т. Ды не быў я кантужаны!

В а с і л ь. Цябе акушэрка кантузіла. *(Да Ганны.)* Прозвішча тваё перадавалі ці не?

Г а н н а. Не пачула я... Пра Вежкі толькі... Што добра чалавеку, калі ў яго куточак родны на зямлі ёсць, дзе некалі босым па расе бегаў... Добра, значыць, што цябе чакаюць і помняць заўжды... Яшчэ нешта... А прозвішча не пачула... Я не з самага пачатку слухаць стала...

В а с і л ь. Перадавалі, канечне... І тры бярозкі пад акном у цябе растуць...

Г а с т р ы т. Стоп! Калі ён з’ехаў, бярозка адна была... А гэтыя дзве без яго выраслі... Я памятаю... Скажыце, адкуль ён пра гэтыя бярозкі ведае? Ніводнага разу не прыязджаў, пісем не пісаў... Адкуль ён ведае?!

В а с і л ь. Прашу цябе, Мікіта, сыдзі з воч! Не дай і мне пад старасць у турму сесці... *(Да Ганны.)* Я ведаю, што пра цябе перадавалі... Пра цябе. І Віцьком яго завуць, і ў партызанах жа ты была, і Вежкі, і па бацьку ж цябе Восіпаўна...

Г а с т р ы т. А вось і не! Па бацьку яе Васільеўна...

В а с і л ь *(уражана)*. Як?!

Г а н н а. Гэта Піліпа майго Восіпавічам звалі...

В а с і л ь. Дык як жа гэта я?.. Забыўся...

Г а с т р ы т. Усё ясна! Так я і думаў... *(Тыцнуў пальцам у Васіля.)* Ён напісаў! Заяўку зрабіў замест твайго Віцька...

В а с і л ь. Ды не, Ганна, што ты?! Не! Што ты выдумаў, дурань?!

Г а с т р ы т. Ну, арты-ы-ыст! Ну, Васіль! За такія штучкі ведаеш, што бывае...

В а с і л ь. Ды пры чым тут я?! Ён, мабыць, напісаў і пра Піліпа, а там пераблыталі...

Г а с т р ы т. Хопіць лухту несці! Там не блытаюць...

Г а н н а *(устала з лаўкі)*. Нашто ты гэта, Васіль... Не варта было... *(Цяжка пайшла прэч.)*

В а с і л ь *(крычыць услед)*. Ды няхай мне рукі адваляцца, калі гэта я пісаў! Ды я і пісаць разумна не ўмею! Ды і не ведаю, дзе гэта радыё! Ганна!

Г а н н а не азірнулася. Пайшла. Гастрыт сумна глядзіць ёй услед. Васіль — на Гастрыта.

Г а с т р ы т. Расстроіў толькі бабу з-за глупства...

В а с і л ь *(выцягвае са штаноў дзягу)*. Здымай штаны!

Г а с т р ы т. Што-о-о-о?!

В а с і л ь. Здымай штаны, падла, я цябе вучыць буду!

Г а с т р ы т. Ну-ну-ну!

В а с і л ь *(наступае на яго)*. Асталоп! Пень! Гастрыт! Бульдозер пракляты! Што ў цябе пад сарочкай?!

Г а с т р ы т *(таксама завёўся)*. Рэбры ў мяне пад сарочкай! І пуп!

В а с і л ь. А сэрца?! Дзе тваё сэрца?! Радасць у чалавека была!!! Яна ж без яе ўсё жыццё сваё!!! Адна ўсё жыццё... Гаротніца, а ты...

Г а с т р ы т. А я не дазволю! Не дазволю ўсяму народу, усяму гасударству галаву дурыць! Мільёны людзей падманваюць! У мяне таксама дзеці! Але ж я не хачу, каб мне па радыё гусей спявалі! Па нашаму радыё толькі праўду перадаюць! І нечага...

В а с і л ь *(махнуў рукой)*. Што з табой гаварыць! Цяпла ў цябе, чалавеча, няма... Хоць сто гадоў яшчэ пражывеш — не даведаешся пра самае галоўнае...

Г а с т р ы т. Пра што гэта?

В а с і л ь. Навошта мы, людзі, з таго свету на гэту зямлю прыходзім? Навошта жывём...

Г а с т р ы т. Няўжо ведаеш?

В а с і л ь. Ведаю... Даў нам Бог жыццё, каб мы ўсё гэта сагрэлі... Душамі сваімі сагрэлі! Дык грэй жа, грэй! Хаця чым табе грэць? Халодны ты...

Г а с т р ы т. У мяне трыццаць шэсць і шэсць... Як ва ўсіх...

В а с і л ь. Не свеціць на цябе Сонца... *(Пайшоў.)*

Г а с т р ы т *(услед)*. Сам ты!.. *(Не прыдумаў, што сказаць, і змоўк.)*

*З а ц я м н е н н е*

Вечар. З'яўляецца В а с і л ь. Доўга-доўга глядзіць на дарогу. Уздыхнуў, падышоў да калодзежа, пачынае даставаць ваду. Прыходзіць Г а с т р ы т. У свежай кашулі, пры гальштуку нават. Сумны.

Г а с т р ы т. Здароў...

В а с і л ь. Зноў прывалокся? Мікіта, я сварыцца больш не буду! У мяне на цябе нерваў не хапае... Сядзі і маўчы.

Г а с т р ы т. Маўчу! А ты раскажы...

В а с і л ь. Што?

Г а с т р ы т *(смяецца)*. Як учора каня выпрошваў у старшыні... Іш ты, кавалерыст! Барон цыганскі! Каня яму трэба! Узятку нават даваў!

В а с і л ь. Я купіць хацеў!

Г а с т р ы т. Навошта ён табе?

В а с і л ь. Адчапіся!

Г а с т р ы т. Скажы нашто — адчаплюся!

В а с і л ь. З канём я сам сябе пракармлю. А так, год-два, я ж дзяржаве на шыю сяду, як і ты!

Г а с т р ы т. Я не на шыі! Я на пенсіі!!! І што чалавеку яшчэ трэба? Усё ёсць, гасударства пра яго клапоціцца, пенсію плоціць, а ён...

В а с і л ь. Гэтымі грашыма сына ад мяне адбілі... Пяты год немаведама дзе бадзяецца, бацьку роднага забыў...

Г а с т р ы т. Пры чым тут пенсія?

В а с і л ь. А пры тым: ведае ён, што мне яе даюць... А раз даюць, значыць, з голаду не здохну! А не здохну з голаду — навошта ж пра мяне клапаціцца, пісьмы пісаць: як ты там, бацька, жывеш-маешся ў нашых неперспектыўных Вежках? Ведае: рубель ёсць, сталоўка ёсць — накормяць якім-небудзь гуляшом! А я б, здаецца, крапіву з лебядой еў, каб толькі ўнука ці ўнучку за руку павадзіць...

Г а с т р ы т. Распусціўся ты, Васіль, ой распусціўся! Нічога не баішся! Дэмагогіяй займаешся, усім незадаволены... І гэта табе не тое, і тое не гэта... Ой, няма на вас пастуха!

В а с і л ь. А на цябе?

Г а с т р ы т. А я сазнацельны.

В а с і л ь. Ну, канечне... Ідзі гуляш у сталоўку есці...

Г а с т р ы т. Што ты да гэтага гуляша прычапіўся? Сёння шніцэль давалі!

В а с і л ь. Ну, шніцэль...

Г а с т р ы т *(уздыхнуў)*. Ой, няма... *(Пайшоў.)*

В а с і л ь *(адзін, глядзіць на дарогу)*. Стамілася, бедалага?.. Адпачывай ужо... Хаця дзе там? Амерыканцаў грэць пойдзеш? Давай, давай... І ім трэба... І там, мусіць, ёсць людзі, што чакаюць цябе... Дай ты ім здароўя, радасці, спалі ўсё благое сваім цяплом... *(Дастае вядро вады, адносіць яго ад калодзежа, вылівае на траву, пачынае набіраць новае.)* Толькі там не затрымлівайся ўжо... Як мне здаецца, дык ты ўсё-ткі нашага роду-племені... Мабыць, на нашу зямлю трохі раней зірнула... Ты — наша... Але і астатнія твае дзеці... І іх любіць трэба... Любі, не стамляйся... І нас, і іх... Ну, шчаслівай табе дарогі... *(Набраў вады, пайшоў у свой двор.)*

Са свайго двара прыходзіць Г а н н а. Марудна-марудна апускае ў калодзеж вядро. Падымае, пераліваε ваду ў сваё вядро. Узняла, панесла, паставіла вядро на зямлю, памахала рукой. Узяла, зноў трошкі пранесла... Зноў паставіла. Падышла да лавачкі, села, заплакала. Ціха, аднымі вачыма.

Прыходзіць Г а с т р ы т.

Г а с т р ы т. Чаго макрэчу развяла?

Г а н н а. Сілоў нямашака, Мікіта... Поўнае вядро ўжо занесці не магу...

Г а с т р ы т. А нашто табе поўнае?

Г а н н а. Прывыкла...

Г а с т р ы т Адвыкай...

Г а н н а. Казу ж напаіць трэба...

Г а с т р ы т. Пагаварыць трэба... *(Азірнуўся.)*

Г а н н а. Гавары...

Г а с т р ы т. Піначэта не бачыла?

Г а н н а. Каго-о?

Г а с т р ы т. Ката майго... Рыжага...

Г а н н а. Не...

Г а с т р ы т. Збег некуды, воўчае мяса... А я праз яго цэлую ноч не спаў...

Г а н н а. Праз ката?

Г а с т р ы т. Праз яго, старую падлу! Можа, паміраць куды пабег... Каты ж, кажуць, на вачах баяцца паміраць...

Г а н н а. Не бачыла я твайго Піначэта...

Г а с т р ы т. Лёг учора звечара, толькі вочы закрыў, толькі драмаць пачаў — чую, нехта глядзіць на мяне... Во так блізка-блізка нахіліўся і глядзіць... Аж страх за сэрца ўзяў! Вочы расплюшчыў — нікога! Толькі зноў драмаць — глядзіць, падлюга!

Г а н н а. Дык хто ж гэта?

Г а с т р ы т. А каб я ведаў! Насланнё нейкае. Позірк дурны... Здаецца, пранізвае ўсю галаву наскрозь і пад падушку зазірае...

Г а н н а. Адзінота гэта, Мікіта... Мне, калі Піліп памёр, гэткае ж мроілася...

Г а с т р ы т. А мо смерць ужо прыглядаецца, з якога боку за мяне ўчапіцца?

Г а н н а. Мо і яна, касая...

Г а с т р ы т. Ды не, ранавата яшчэ...

Г а н н а. Яно заўсёды ранавата...

Г а с т р ы т. Праз ката гэта ўсё! Збрадлівы, зараза, быў, ганяў я яго, біў, а ён, аказваецца, спакой мой сцярог па начах.

Г а н н а. Чым жа гэта?

Г а с т р ы т. Дыхаў... Падпнецца мне пад бок, клубочкам скруціцца, вурчыць... і дыхае... Куды збег?

Г а н н а. Можа, прыйдзе яшчэ... *(Устала.)* Ну, пайду...

Г а с т р ы т *(рэзка)*. Сядзь!

Г а н н а. У мяне ж каза там...

Г а с т р ы т. Не здохне твая каза... Сядзь! Гаварыць буду...

Ганна села. Чакае. Гастрыт хвалюецца, папраўляе гальштук.

Г а н н а. Ну, чаго ты мылішся, як дзеўка перад свахай?

Г а с т р ы т *(не адразу)*. Ганна, давай я на табе як-небудзь паджанюся... Га?

Г а н н а. Што-што-што?!

Г а с т р ы т. Ну чаго ты штокаеш? Ты адна, і я адзін... Разам як-небудзь ужо... на гэтым свеце...

Г а н н а. Во спасібачкі! Во ўважыў! Гэта ты мяне замест ката свайго рыжага да сябе завеш... Каб дыхала...

Г а с т р ы т. Дык і я ж табе дыхаць буду!

Г а н н а. А мышэй мне лавіць у тваёй хаце не трэба будзе?

Г а с т р ы т. Ай, ладна табе! Не хочаш да мяне, я да цябе перайсці магу... Шкода глядзець на цябе... Ледзь ногі валочыш, а ўсё: каза, агарод, соткі...

Непрыкметна выйшаў са свайго двара В а с і л ь. Стаў, слухае.

Няўжо ты за сваё жыццё не нарабілася? Адпачні... У мяне грошы на кніжцы ёсць, хату прададзім... Хоць пад старасць пажыві па-людску...

Г а н н а. Смяяцца ж будуць, Мікіта...

Г а с т р ы т. Каму смяяцца? Вёска пустая саўсім... Ні смяяцца, ні плакаць няма каму... Давай перабярэмся ў Займішча? Там асфальт, магазін, сталоўка, людзі... Пуцёўку мо якую возьмем на курорт... А што? Мы ж з табой за свой век напрацаваліся... Хопіць ужо! Мне нічога не трэба... Ды і табе... Адпачні ты... Га, Ганна? Хоць цяпер парадуйся жыццю, уздыхні на поўныя грудзі... Ты ж зарабіла сабе гэта... Ці праўда?

Г а н н а *(уздыхнула)*. Яно-то так, што казаць... Праўда.

Г а с т р ы т. А грошай нам з табой хопіць, за гэта не бойся... Пражывём...

Г а н н а. Ды нам шмат і не трэба...

Г а с т р ы т. Канечна...

В а с і л ь *(злосна)*. Ашалела, баба?!

Г а с т р ы т *(азірнуўся, спалохана)*. Не лезь! Я сватаюся...

В а с і л ь *(да Ганны)*. Каго ты слухаеш, бахіла старая?! Курортніца! Адпачываць захацела... Вунь наш курорт, за вёскай, пад бярозкамі... Прыйдзе час — адпачнём! Наляжымся, наспімся, наадпачываемся... А пакуль сілы ёсць хоць каліўца — рабіць трэба, рабіць, рабіць...

Г а с т р ы т. Для каго ёй рабіць?! Яна ж усё жыццё як праклятая, як катаржная...

В а с і л ь *(ужо спакойна)*. Ты не зразумееш... Ганна, адумайся! Жыць надакучыла?

Г а н н а. Не надакучыла... Стамілася толькі я...

В а с і л ь. І я стаміўся... Але мы з табой яшчэ толькі таму і жывём, што кожную раніцу па ваду ў гэты калодзеж ходзім, на сотках сваіх калупаемся... Хоць адзін дзень паспрабуй паляжаць паленам — усе хваробы, як саранча, наляцяць...

Г а н н а. Дык во ж на Мікіту нічога не налятае...

В а с і л ь. А ён іначай і не жыў... Усё жыццё з чайнікам па ваду хадзіў...

Г а с т р ы т. Я адказным і сазнацельным быў!!!

В а с і л ь. Кінь, Ганна, я табе сказаў...

Г а н н а. Дык сілоў няма вядро вады падняць! Што ж рабіць?

В а с і л ь. Бяры сваю казу за рогі і перавядзі ў мой хлеў... Няма сілы — па палавінцы насіць будзем... Ты палавінку, і я палавінку... Разам...

Г а с т р ы т *(уражана)*. Ну і гад ты, Васіль, ну і гад! Я сасватаў, а ён жэніцца! Чаго ж ты яе раней не прасіў?!

В а с і л ь. Саромеўся...

Г а с т р ы т. На восьмым дзесятку! *(Да Ганны.)* Пайшлі, не слухай яго. Самому не пад сілу варочаць, дык батрачку сабе захацеў узяць пад старасць.

В а с і л ь. Хадзі, баба, да мяне! Жыць будзем, як жылі... Памагаць адно аднаму... Адпачываць па святах... І рабіць на зямлі! Трэба так, Ганна, трэба...

Г а с т р ы т. Не слухай яго!

Г а н н а. Ціха, мужчыны... Не сварыцеся... А можа, мы пад адным дахам, у адной хаце ўсе разам сыдземся дый будзем жыць... Я вам бялізну буду мыць, а вы...

Г а с т р ы т. Цьфу! Я ёй руку і сэрца, а яна мне — абшчажыція! Дом прыстарэлых!

Г а н н а. Тады пайду ў свайго Піліпа спытаюся... Калі дазволіць — перайду...

Г а с т р ы т. Як у Піліпа? На кладзішча пойдзеш?

Г а н н а. Нашто? З партрэта спытаюся... Што скажа — тое і будзе.

В а с і л ь. Ідзі. Пытайся.

Г а н н а пайшла. Васіль і Гастрыт касавурацца адзін на аднаго.

Г а с т р ы т. Ну за што? За што ты мяне, Васіль, так ненавідзіш?

В а с і л ь. Кінь, Мікіта... Не ўмею я ненавідзець...

Г а с т р ы т. Добранькі, значыцца... Хіба можна ў гэтым свеце без нянавісці пражыць?

В а с і л ь. Можна...

Г а с т р ы т. Нянавісць і святая ёсць...

В а с і л ь. Святое ў жыцці толькі святло, цяпло, любоў і зямля...

Г а с т р ы т. Поп ты...

В а с і л ь. Васіль я...

Вяртаецца Г а н н а. Старыя чакаюць адказу.

Г а н н а *(выцершы ражком хусткі вочы)*. Дазволіў... *(Пасля паўзы.)* З табой, Васіль, жыць буду...

Г а с т р ы т *(блазнавата і горка ўсміхаючыся, пляскае ў далоні)*. Гор-ка! Гор-ка! Гор-ка!

*З а с л о н а*

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Хата Васіля. Звычайная, як і ўсе іншыя хаты. Усё ёсць, што трэба: стол, табурэткі, печ, старэнькі тэлевізар, радыё, фотаздымкі ў рамачках на сцяне. Г а н н а тупае каля печы. Чырвоныя водсветы полымя скачуць па старэчым твары. Раніца.

Г а н н а *(падышла да акна, кліча)*. Васіль! Хадзі снедаць... *(Дастае з печы патэльню, на якой шкварчыць яешня, і проста на чапяле нясе яе да стала. Паставіла, рэжа хлеб, прыносіць з сенцаў збанок малака, кладзе відэльцы, ставіць кружкі. Чакае. Потым зноў падыходзіць да акна.)* Ці чуеш ты там? Сонца не патухне, а яешня прастыне...

Праз хвіліну ўваходзіць В а с і л ь. Распранаецца, нетаропка мые рукі над вядром каля парога. І з кім сёння размаўляць? Хмары на небе...

В а с і л ь. З хмарамі размаўляў...

Г а н н а. На дарогу ты глядзеў... Стаяў і глядзеў... Бачыла я...

В а с і л ь *(крэкнуў)*. Мерзне зямля... Калі снегам за гэты тыдзень не прыкрые — вясной не нап'ецца ўдосталь... Па мёрзламу ўся вада ў раўкі сыдзе... Засмягне летам... Слабы колас будзе...

Г а н н а. Садзіся, еш... Во яешня, дранікі... Гуркі...

Васіль сядае.

В а с і л ь. А ты?

Г а н н а. А я каля печы нанюхалася... Пагляджу, як ты есці будзеш...

В а с і л ь. Дык ты еш і глядзі.

Г а н н а. Ай!

В а с і л ь *(голасам гаспадара)*. Сядзь, я табе сказаў!

Ганна сядае. Снедаюць. Ганна раптам ціха засмяялася.

Г а н н а. Добра замужам усё-ткі...

В а с і л ь. Аёечкі!

Г а н н а. Ты во крыкнуў — яно і добра... На мяне ж Піліп аніводнага разу голасу не падняў... Да вайны колькі мы там пажылі... А пасля... хварэў, асколкі ў сэрца калолі... Ніводнага разу не крыкнуў. А на бабу іншым разам і трэба... Весялей неяк...

В а с і л ь. Можа, цябе і паганяць калі для весялосці?

Г а н н а. Не. Ганяць не трэба, а крыкнуць — крыкні іншым разам...

В а с і л ь. Крыкну.

Г а н н а. Трэба было нам раней сысціся... Чаго не казаў?

В а с і л ь. Саромеўся.

Г а н н а. А бо-о-о... У нашых гадах саромецца?

В а с і л ь. Ды любіў я цябе трохі маладым...

Г а н н а. Ідзі ты!

В а с і л ь. Што ідзі ты? Па табе ж увесь сельсавет сох... Каса была — утрох павесіцца можна...

Г а н н а. Была...

В а с і л ь. Да гэтага часу дзіўлюся: такія хлопцы вакол тапталіся! Я таптаўся... Ніхто не думаў, не гадаў, што Піліп цябе акруціць, усім дарогу перабяжыць... І як ён цябе ахмурыў?

Г а н н а. Аніяк... Памятаю, на Купалле збіралася, а ён прыйшоў да нас у хату і бразь перада мной на калені! Ды як заплача! Ганна, кажа, ратуй! Не пойдзеш за мяне — сэрца лопне ад болю... І так мне яго шкада стала... так шкада, што тым жа вечарам і пайшла за ім па купальскія кветкі ў Чысты лог... Там ён маю касу і расплёў... Наліць малака?

В а с і л ь. Налі... *(Разважліва.)* Так яно, мабыць, трэба...

Г а н н а. Што?

В а с і л ь. Усё...

Снедаюць. Ганна ўстала.

Г а н н а. Пайду ў сваёй хаце печ прапалю...

В а с і л ь. Нашто?

Г а н н а. Хата павінна цёплай стаяць. Холад у яе грэх пускаць.

В а с і л ь. Ідзі.

Г а н н а *(падышла да дзвярэй)*. Васіль...

В а с і л ь. Што?

Г а н н а. Ты мне ўсё ж праўду скажы: ты тады пісаў радзіву, каб мне гусей праспявалі? Толькі праўду...

В а с і л ь *(злосна)*. Ну што ты з ёй будзеш рабіць! Паўгода я ёй — адно, яна — другое! *(Замахаў рукамі.)* Ну, я, я! Няхай буду я, калі табе лягчэй жыць ад гэтага! Ідзі!

Г а н н а. Пазней трохі сена казе падкінь...

В а с і л ь. Ладна...

Г а н н а выйшла. Васіль пачынае збіраць са стала. Уключыў дынамік. Зараўла музыка. Васіль выключае дынамік. У хату ўрываецца ўзбуджана-нервовы Г а с т р ы т. У руках газета.

Г а с т р ы т. Прывет, жаніх!

В а с і л ь. Здароў...

Г а с т р ы т. А дзе маладуха?

В а с і л ь. Печ пайшла паліць у сваю хату...

Г а с т р ы т. Добра жыве... І дома і замужам... Ну, чаго глядзіш? Усё адно буду хадзіць да цябе... Хадзіў і буду... І што я ў цябе такі ўлюбёны? *(Маладым пеўнем пахадзіў па хаце.)*

Васіль назірае за ім.

*(Спыніўся.)* Васіль, хочаш з глузду з'ехаць?

В а с і л ь. Хачу.

Г а с т р ы т *(радасна)*. Я машыну па латарэйцы выйграў! На пошту зараз зазірнуў, праверыў — во! *(Паказвае газету, беражліва дастае з кішэні латарэйку.)* Аўто! Аблапошыў гасударства!

В а с і л ь. Ну й што?

Г а с т р ы т. Ты рубель выйграваў хоць раз?

В а с і л ь. Не.

Г а с т р ы т. А я — машыну!

В а с і л ь. Ну й што?

Г а с т р ы т. Што ты завёўся: ну й што, ну й што?! Скажы, што зайздросна! Га? Ну, скажы?

Васіль глядзіць на яго. Спакойна і стомлена.

Ладна, стаў яешню — замочым... Машына ўсё-ткі... *(Дастаў з кішэні бутэльку віна.)* Ну й што, ну й што...

В а с і л ь. Сядай... *(Дастаў шклянкі, паставіў закуску.)*

Гастрыт адкаркаваў віно, наліў чаркі, задумаўся.

Г а с т р ы т. Васіль...

В а с і л ь. Оў!

Г а с т р ы т. А Бог ёсць?

В а с і л ь. Сонца ёсць...

Г а с т р ы т. Падла! *(Рашуча паставіў шклянку.)*

В а с і л ь *(злосна)*. Выганю зараз!

Г а с т р ы т. Ды не на Сонца я тваё, супакойся... На Бога, на лёс свой, на жыццё! Усё да мяне бокам, бокам, бокам! Усё жыццё прайшло на пяцьдзесят працэнтаў... Усё напалавіну... Ты во мне скажы: справядлівае жыццё на гэтай зямлі? Га? Хаця што пытацца — ты ж Сонцу молішся... А ці меў ты хоць раз у жыцці тое, чаго вельмі хацелася?

В а с і л ь. Заўсёды...

Г а с т р ы т. А я ні разу... Толькі напалавінку. Во, памятаю, у маленстве... Хадзіў неяк па грыбы... Цалюткі дзень па хмызняку поўзалі... Усе там сыраежак, лісічак збольшага накалупалі, а я во такенны во баравік. Белы, крэпенькі, шапка — дзвюма рукамі не накрыць. Лета тады сухое было. Яшчэ ніхто баравікоў не знаходзіў... Усе ахаюць, зайздросцяць, у кошык зазіраюць. Шчасце! Памятаю, на ўсіх глядзеў як... на мурашак... Дадому прыйшоў, ножычкам чык гэты баравік...

В а с і л ь. ...а ён чарвівы.

Г а с т р ы т *(пасля паўзы)*. Ага... Ушчэнт сточаны! Во табе і шчасце! Гадоў шэсць мне тады было... І з таго часу... усё напалавіну... *(Падняў чарку.)* Давай, Васіль...

В а с і л ь. Будзь здароў!

Г а с т р ы т. Ай!

Выпілі.

Ці хаця б жонку маю, нябожчыцу, узяць... Я ж так па ёй сох! Ад кахання плакаў па начах. Ніхто яе так не любіў... А яна... За братам тваім, за Андрэем, бегала...

В а с і л ь. Нядоўга, праўда...

Г а с т р ы т. Што, зноў я вінаваты?! Час быў такі, разумееш, час!!!

В а с і л ь. Я нічога не кажу...

Г а с т р ы т. Ну, забралі Андрэя... Паплакала мая Алёна, паплакала дый пайшла за мяне. Забылася, здаецца, пра ўсё. І вяселле было добрае. І яна вясёлая. Усё добра! Шчасце! Дачакаўся свайго! *(Паказаў кукіш.)* Во! З маслам, як кажуць! Зноў у мяне гэта палавінка, каб яе агонь спёк! Не, яна ніводнага разу не ўспомніла пра Андрэя. А толькі душой я адчуваў, душой, што клалася яна са мной спаць, як у труну кладуцца. Засне, дык ужо потым абдымае мяне, цалуе, шэпча нешта... Не разумеў, што з

бабай робіцца. А яна, аказваецца, яго, Андрэя, у сне бачыла, у сне лашчыла... Перад смерцю прызналася... Сорак гадоў жыла са мной, а па начах яго абдымала! Ведаеш, дзеці, здаецца, на Андрэя падобныя...

В а с і л ь. Што ты пляцеш?

Г а с т р ы т. У старэйшага і нос, і вочы, і чупрына, як у яго... Чарнявы ж... У нашым родзе спакон веку такіх не было...

В а с і л ь. У Алёны бацька цыган быў. Хіба не ведаеш? А Андрэй... Ён жа памёр праз паўгода ў Сібіры...

Г а с т р ы т *(нервова)*. Ды мае гэта дзеці! Мае! Хіба я не ведаю. Толькі мае і як быццам не мае... Напалову. Зноў на праклятую палову! Зубамі, рукамі вырываў шчасце... Што толькі не рабіў... Усё дарэмна!

В а с і л ь. А што рабіў?

Г а с т р ы т *(не адразу)*. Усё... рабіў... І вайна гэтак жа прайшла. Людзі галовы клалі, кроў лілі, калекамі вярталіся, а я ў палоне ўсе гады... І во, як бачыш, не ваяваў, а перажыць такое давялося — успомніць страшна!

В а с і л ь. Сам здаўся?

Г а с т р ы т. Што?

В а с і л ь. Я кажу, у палон...

Г а с т р ы т. Сам і не сам... Напалову. Нас пад Віцебскам раскалашмацілі, усю дывізію... Чалавек пяць сабраліся — выйсця шукаем... Вінтоўкі былі, а патронаў — у мяне адзін. І ўсё. Начамі да сваіх выбіраліся... На трэці, здаецца, дзень на немцаў напароліся... Я бабахнуў са сваёй вінтовачкі — і ўсё: няма чым больш ваяваць. І трэба ж было гэтай праклятай кулі ў немца трапіць... Паставілі яны нас — пытаюцца: хто? Маўчым. Яшчэ раз: хто? Маўчым. Афіцэр аўтамат хапае, замком клац-клац... Ну, думаю, капцы! І раптам адзін маленькі, худзенькі заморак з Полацка, што ад кожнага шораху бялеў і заікаўся, выходзіць. Я, кажа, я страляў... Немец яму чаргу ў жывот. А нас у лагер. *(Наліў віна, выпіў, паглядзеў на пустую бутэльку.)* Мо яшчэ збегаць?

В а с і л ь. Не трэба...

Г а с т р ы т. Чаго тады вылупіўся?

В а с і л ь. Нічога... Тут ужо не напалову атрымліваецца...

Г а с т р ы т. Я не ўсё расказаў. Той бедны хлопец яшчэ варушыўся на крывавым пяску, калі я апрытомнеў. Кінуўся да гэтага афіцэрыка: пан, крычу, пан, не ён гэта... не ён... Што, не верыш?

В а с і л ь. Чаго ж...

Г а с т р ы т. А яны рагаталі... Паскуды! І не паверылі... што я страляў... Во бачыш як? І тут... Хапіла смеласці толькі напалову. І шчасця напалову. Жыць застаўся, да пенсіі дажыў, а той

бледны твар хлопца да гэтага часу сніцца... Твар і крывавы пясок... От так во, Васіль... Усё жыццё так... Лёс. Працаваў заўсёды на нейкай пасадзе... Паважаць павінны ўсе былі... У вочы і паважалі, а за вочы... Як мяне ўсе сорак гадоў клікалі?

В а с і л ь. Гастрытам...

Г а с т р ы т. Ага... Нават пад старасць... Ганну во я ўгаварыў замуж выйсці... Згадзілася і... да цябе пайшла жыць! А цяпер во гэты білет... Нашто ён мне? Маладзейшаму б каму-небудзь... Каму пажыць хочацца. Каму трэба. А мне... У хлеў мне на ёй ездзіць, ці што?

В а с і л ь. Дзеці ж ёсць!

Г а с т р ы т *(злосна)*. Дзеці?! Самі! Самі хай хапаюць сваё шчасце! Дабіваюцца! Ірвуць! Адваёўваюць!

В а с і л ь. Ну, ну... Панятна... Тады давай з'ездзі куды. На мора! Ты ж хацеў на курорт... А чаго? Хоць пад старасць хапанеш на ўсе сто.

Г а с т р ы т *(стомлена)*. Нічога не будзе! Сплыў мой час. Растрасуся па дарозе... Не-е, гнілымі зубамі арэх не раскусіш.

В а с і л ь *(узяў білет, агледзеў яго з усіх бакоў)*. Дык кажаш, што не трэба табе гэтыя грошы?

Г а с т р ы т. Іх жа ў мяне няма. Як быццам ёсць, а няма... Як заўсёды. Палова туды — палова сюды.

В а с і л ь. Ну калі так... *(Нечакана скамечыў білет, сунуў яго ў рот.)* Няхай грошы ў дзяржавы застануцца... Ёй трэба... *(Пажаваў, праглынуў.)* Хоць і машына, а ўсё адно нясмачна... Закусіць трэба...

Г а с т р ы т *(дзіка)*. А-а-а!! *(Схапіў са стала нож, кінуўся на Васіля.)*

В а с і л ь *(хапаючы яго за рукі)*. Ты што, Мікіта? Хіба ж можна? Нажом чалавека? Ты што?

Г а с т р ы т *(вырываючыся)*. Гы... гы... гаад!

В а с і л ь. Во! Во як ты за сваё шчасце б'ешся... Да смерці... Да крыві... Мабыць, і Андрэй тваіх рук дзела...

Г а с т р ы т. Ад... аддай, гад...

В а с і л ь. Ты напісаў тады ў раён, на Андрэя?

Г а с т р ы т. Я!!!

В а с і л ь. Ах ты, слізняк... Палавіннік пракляты... *(Адкрыў кулак. Скамечаны латарэйны білет ляжыць на далоні.)* На! Во яно, тваё папяровае шчасце... Бяры... Цэлы...

Гастрыт схапіў білет.

І ідзі адсюль... Ідзі, Мікіта... У мяне нешта ў грудзях лопнула... Ідзі... *(Хіліцца да падлогі.)*

Г а с т р ы т спалохана выбягае.

Што гэта ты, га?.. Здурнела... пад старасць?.. Нам жа да серады дажыць трэба... Да серады... *(Кліча.)* Ганна! Ганна! Прынясі вады з калодзежа... Аблі мяне... Канцы аддаю...

*З а ц я м н е н н е*

Вые за акном вецер. А ў хаце цёпла, а ў хаце ўтульна. Старэнькі дынамік на сцяне іграе сумную-сумную мелодыю. На палку перад печкай ляжыць В а с і л ь. Роўны, выцягнуты, рукі сашчэплены на грудзях. У руках насовачка. Уваходзіць Г а н н а з вядром. Доўга і спалохана глядзіць.

Г а н н а *(ціха)*. Васіль, а Васіль...

Цішыня.

*(Выпусціла вядро з рук, загаласіла.)* А мой жа ты Васі-ілька! А нашто ж я цябе аднаго пакі-і-інула? А табе ж, можа, што-небудзь трэ-ба было, а можа ж, я б табе чым дапамагла-а-а... Анічога ж ты мне не сказаў, не развіта-а-аўся...

В а с і л ь *(нечакана расплюшчыў вочы, павярнуў галаву)*. Ты што, ашалела?

Г а н н а *(спалохана)*. Ай!

В а с і л ь. Чаго скуголіш?

Г а н н а *(цяжка дыхаючы)*. Каб ты праваліўся! Чаго ляжыш, як чурбан?! Я думала, што ты ўжо гатоў... І рукі сашчапіў!

В а с і л ь. Трэніроўку рабіў. Прымерваўся, як буду ляжаць на покуці...

Г а н н а. Ну і як?

В а с і л ь. Паскудства... Асабліва калі галосяць... Адным словам, калі што якое, каб каля мяне ніхто не скавытаў... І ты таксама.

Г а н н а. От гэта ўжо ў цябе не спытаем... Як захочам...

В а с і л ь. Устану з труны і выганю ўсіх к чортавай матары... Ціха пражыў — ціха і на Сонца пайду. Прыспічыць — бяжы ў хлеў і над казой паплач, а ля мяне каб моўчкі. Без слёз і без слоў. А то яшчэ Гастрыт жалобную прамову засабачыць...

Г а н н а. Забралі яго...

В а с і л ь. Куды?

Г а н н а. У бальніцу. Машына прыязджала. І ён занядужаў. Доктарка пытае, дзе баліць, а ён: п'яўка ў грудзях, кажа, сэрца смокча... У цябе дык хоць проста лопнула, а ў яго п'яўка... І што гэта такое? Усе нешта хвараюць у гэтым годзе...

В а с і л ь. Цяжка яму будзе...

Г а н н а. Што?

В а с і л ь. Нічога... Сонца і сёння няма?

Г а н н а. Няма. Снег круціць, неба нізкае...

В а с і л ь. І сцяжынку ў Вежкі замяло?

Г а н н а. Дык а каму ж па ёй хадзіць? Адна я на нагах... Замяло.

В а с і л ь. Не дачакаюся. Каб хоць каліўца Сонца — дальбог, устаў бы з ложка...

Г а н н а. Каб у бальніцу лёг, дык даўно б ужо ўстаў са сваім інхварктам...

В а с і л ь. Ніякага ў мяне інфаркту няма! Проста сэрца лопнула, і ўсё...

Г а н н а *(бубніць)*. І прасілі, і малілі — упёрся, як бык, ні ў якую... Пеўня, бачыце, яму ў палату трэба, каб кукарэкаў зранку...

В а с і л ь. Я без пеўня не магу! Баюся... Заснуць засну, а калі раніцой не закукарэкае — магу не прачнуцца...

Г а н н а. Дык хто ж гэтага пеўня ў палату пусціць?! А калі я захварэю, дык што мне — казу з сабой браць? *(Бубніць.)* Ляжыць сабе, калодзежную ваду сёрбае... Лечыцца!

В а с і л ь. Хопіць квахтаць! Хадзіла на пошту?

Г а н н а. Хадзіла... Паслалі ўсё. Хутка знойдуць, казалі... Прывязуць твайго Грышку.

В а с і л ь. Як гэта прывязуць? Што ён, злодзей, ці што, каб яго прывозіць? Сам прыедзе... *(Паўза.)* І чаго яны так жывуць? Ні ўва што не вераць, ні да чаго сэрцам не прывязаны, смяюцца над усім... Рэдка на Сонца глядзяць...

Г а н н а. Зноў Сонца!

В а с і л ь. А ты маўчы!

Паўза. Старая тупае каля печы. Дзед слухае завею. Гаворыць радыё.

*(Раптам роспачна засмяяўся.)* Ну, людзі!

Г а н н а. Чаго й та ты?

В а с і л ь *(паказаў рукой на дынамік)*. Ваююць!

Старая паслухала.

Г а н н а. У-у-у, знайшоў, з чаго дзівіцца. Заўжды ваююць. Не там, дык там...

В а с і л ь. Дурні. Як быццам рабіць больш няма чаго...

Г а н н а. Чаго ты разбубніўся? Сам жа ваяваў.

В а с і л ь. То не раўняй... То трэба было... То за Радзіму...

Г а н н а. А мо і ім прыспічыла. Сказалі «ваяваць» — і ваююць... *(Падышла, прысела каля палка.)* Як табе сёння?

В а с і л ь. А нічога... Палягчэла неяк, ды і баліць, здаецца, слабей... *(Маўчыць.)*

Слухаюць завею.

Г а н н а. Васіль, а чаго й та мы жылі?

В а с і л ь. А што было рабіць? Нашай згоды бацькі не пыталі... Нарадзілі, і ўсё... Хочаш не хочаш, а жыць трэба... Жыць і чалавекам застацца. Цяжка...

Г а н н а *(уздыхнула)*. У цябе хоць Грышка недзе ёсць... Ну хай сабе і не піша... Але ж жыве па-людску... А мой Віцёк... І ў каго толькі такі ўрадзіўся? І хто вінаваты? *(Паўза.)* А якім яму яшчэ радзіцца было? Вунь дактары па радзіву на жанок цяжарных сварацца: піць няможна, курыць няможна, хвалявацца няможна... А то дзіцёнак дрэнны родзіцца... А пад бомбамі ляжаць можна? А жыўцом гарэць у сваёй хаце можна? А сядзець во з такім жыватом у сцюдзёнай балотнай твані можна? А ўвесь час калаціцца ад страху, што цябе во-во схопяць і заб'юць,— можна? А галадаць можна? А самой у людзей страляць можна? *(Паўза.)* Ён, мой Віцёк, яшчэ там, у мяне пад сэрцам, на ўвесь свет абазліўся. Якім жа яму было яшчэ нарадзіцца? Толькі няўдачным... Бабе трэба ласкавай быць, на Сонца, як ты кажаш, часцей глядзець, тады і дзіцёнак цёплым родзіцца і ласкавым... А я... Толькі ваявала ды вайны баялася... Толькі дзетак нараджала ды хавала... Рабіла, рабіла, рабіла... а на гэтым свеце няма чаго пакінуць... І нашто нарадзілася?

В а с і л ь. Мы з табой нарадзіліся людзей хлебам карміць...

У сенцах нешта ляпнула.

*(Падняў галаву з падушкі.)* Чуеш? Нехта дзверы адчыніць не можа? Чуеш?

Г а н н а. Гэта вецер...

В а с і л ь. Не, Ганна, не! Прыйшоў нехта... Я крокі чуў... Ідзі, сустрэнь... Прыйшоў нехта...

Ганна пайшла да дзвярэй, але дзверы ўжо самі адчыняюцца. На парозе Г а с т р ы т . Загорнуты ў бальнічную коўдру. З-пад коўдры бачны белыя споднікі. На нагах галёшы.

Г а с т р ы т *(запалым голасам)*. Холадна... Ой, людцы, холадна...

Г а н н а. О Божухна!

Г а с т р ы т. Дзе Васіль?

В а с і л ь. Тут...

Г а с т р ы т. Хварэеш усё?..

В а с і л ь. Не. Паміраю.

Г а с т р ы т *(з адчаем)*. А я з бальніцы ўцёк... Вазьміце мяне... Коляць, а мне ўсё цяжэй... Парашкамі кормяць, а мне ўсё страшней... Не магу больш... Цяжка... Холадна... Страшна без вас... Я, Васіль... я тваю смерць на сябе вазьму... За дваімі яна не

прыйдзе... Толькі не праганяйце мяне... Пашкадуйце... Ведаю, няма за што... Проста так... Вы гэта ўмееце... Я во тут, каля печы, на падлозе прылягу... І маўчаць буду... Не праганяйце мяне... Не праганяйце толькі...

*З а ц я м н е н н е*

Хата. Каля печы на палку галава да галавы ляжаць В а с і л ь і Г а с т р ы т. Два старыя чалавекі. На сконе доўгая зімовая ноч. За акном злосна і тужліва вые вецер.

Г а с т р ы т *(падняў галаву, трывожна)*. Ты спіш, Васіль?

В а с і л ь. Не...

Г а с т р ы т. Не спі, ладна?

В а с і л ь. Не буду...

Г а с т р ы т. Баюся...

В а с і л ь. Чаго?

Г а с т р ы т. Баюся, што Бог ёсць ці Сонца тваё... Баюся, што спытае... А што мне сказаць яму?

Васіль бярэ кружку, зачэрпвае ваду.

В а с і л ь. Выпі... Вада душу супакоіць... Выпі...

Гастрыт п’е. Васіль таксама.

Г а с т р ы т. Ты пра мяне, Васіль, яшчэ што-небудзь скажы...

В а с і л ь *(уздыхнуў)*. Што казаць?

Г а с т р ы т. Усё... Самае нядобрае, самае паганае... я цябе слухаю — душа спакайнее...

В а с і л ь. Гэта ад вады...

Г а с т р ы т. Ад цябе... Ну, пагавары... Туды ж нельга з неспакойнай душой ісці... Пагавары... Жыў, як усе... Шчасця хацеў... Чаго ж мне так млосна? Чаму ж цішыні ў душы няма?

В а с і л ь. Ты любіў мала...

Г а с т р ы т. Мала...

В а с і л ь. Шкадаваў мала...

Г а с т р ы т. Мала.

В а с і л ь. Плакаў мала...

Г а с т р ы т. Мала... *(Нервова.)* Яшчэ! Кажы яшчэ!

В а с і л ь. Усё... Разумней любові, шкадавання і слёз людзі нічога не прыдумалі... І ці прыдумаюць?.. Спі...

Г а с т р ы т. Не магу... Болей скажы... Пасудзі...

В а с і л ь. Я не суддзя, Мікіта... Ды ты і сам усё ведаеш...

Г а с т р ы т *(заплакаў)*. Госпадзі! За што? Я ж чэсна працаваў, падтрымліваў, стараўся... Казалі ісці — ішоў, казалі рабіць — рабіў, гаварыць — гаварыў... Ой, Васіль! Свет, свет такі паганы...

В а с і л ь. Свет добры... Чысты... Гэта мы яшчэ дрэнныя... Нам саміх сябе перарабіць трэба, а мы, дурні, усё свет перарабіць хочам, пад сябе падагнаць...

Г а с т р ы т. На Андрэя вашага тады я... напісаў...

В а с і л ь. Я ведаю...

Г а с т р ы т. Але... Я праўду напісаў... Я не з-за Алёны... а таму, што сабатаж. *(Нервова.)* Не слухай! Зноў кручуся... З-за Алёны!

В а с і л ь. Я ведаю...

Г а с т р ы т. Дык любіў жа...

В а с і л ь. Любіў...

Г а с т р ы т. Як думаеш, дзеці прыедуць, калі я...

В а с і л ь. Прыедуць...

Г а с т р ы т. Ой, як цяжка...

В а с і л ь. Прыедуць...

Г а с т р ы т. Памажы мне, Васіль...

В а с і л ь. Чым?

Г а с т р ы т. Памаліся... Бога няма, каб быў... ён бы нас не давёў да гэтага... Памаліся свайму Сонцу, каб хоць на магілку маю свяціла...

В а с і л ь. Яно будзе свяціць... Спі...

Г а с т р ы т. Дай вады...

Васіль падае ваду. Гастрыт прагна п'е, ставіць кружку, адварочваецца і заціхае. Увайшла Г а н н а з вядром у адной руцэ і з дрывамі ў другой. Тупае ля печы.

Г а н н а. Ці спіце вы там?

В а с і л ь. Не...

Г а н н а. Што на сняданак рабіць?

В а с і л ь. Што зробіш — тое і ладна...

Г а н н а. Старшыню ж сустрэла... Перадай, кажа, свайму неўміручаму дзеду, гэта табе значыць, што калі пішуць ананімкі, дык не падпісваюцца і адрас не пакідаюць...

В а с і л ь. А я ведаў?! Першы раз у жыцці ананімку пісаў...

Г а н н а. А каня, кажа, мы яму і так дадзім... Бясплатна... Аформім як ветэрану. Варта было, кажа, з-за такога глупства шум на ўсю краіну падымаць...

В а с і л ь. Так і сказаў?

Г а н н а. Ну...

В а с і л ь. Дапякло! *(Уздыхнуў.)* Што ж рабіць? Я паміраць настроіўся...

Г а н н а. Кінь такое гаварыць! Не дражні яе!

В а с і л ь. А чаго? Нараджацца ж ні ты, ні я не баяліся... А яе чаго баяцца? Што на дварэ?

Г а н н а. Развязло... Вецер сыры, са страхі цячэ...

В а с і л ь *(зусім іншым голасам)*. Адліга... Першая...

Г а н н а. Яшчэ прымарозіць...

В а с і л ь *(сам сабе)*. Усё! *(Марудна-марудна пачынае падымацца, трымаючыся рукой за сэрца. Абапёрся на локаць. Паляжаў так, аддыхаўся. Потым яшчэ трохі. Яшчэ! Рука саслізнула — упаў на падушку. Ляжыць нерухома. І зноўку гэтак жа цяжка і марудна падымаецца. Сеў. Дрыжачай рукой узяў кружку, напіўся. Звесіў худыя босыя ногі ў белым.)*

Ганна выходзіць з-за печы.

Г а н н а *(уражана)*. Ці й та ты ашалеў?! Чаго ўскруціўся?!

В а с і л ь. Пайду на вуліцу, ветрам падыхаю...

Г а н н а. Вядро прынясу — тут дыхай...

Васіль не адказаў. Толькі глядзіць. Па-мужчынску. Як гаспадар.

*(Пакорліва і нават паспешліва прыносіць штаны, бубніць.)* З парваным сэрцам на вуліцу яму захацелася... Доктарка вунь казала, каб ляжаў і не варушыўся... Давай памагу...

В а с і л ь. Сам. *(Адзяваецца, нерашуча злазіць з палка. Выпрамляецца. Пастаяў, аддыхаўся. Зрабіў першы крок. Пайшоў па хаце. Зірнуў у акно.)*

Чуваць капёж.

*(Расчулена.)* Капае... *(Падышоў да жонкі.)* Накінь мне кажух на плечы... Рукі цяжка падымаць...

Ганна апранае Васіля. Гастрыт падняў галаву, глядзіць.

Г а н н а. Давай я цябе выведу...

В а с і л ь. Сам... *(Выходзіць.)*

Г а с т р ы т. Ганна!

Г а н н а. Га? Што, Мікіта?

Г а с т р ы т. Хадзі сюды.

Ганна падыходзіць.

*(Паказвае рукой на дзверы.)* Ты яму... яму не давай паміраць... Не пускай яго туды... Што хочаш рабі, сама заместа яго ляж, а не пускай. Ён тут павінен быць... Там яму няма чаго рабіць...

Г а н н а. Ляжы ты, Мікіта, ляжы...

Г а с т р ы т. Прытуліся да мяне... Калі можаш...

Г а н н а *(сагнулася да яго, прытулілася, пагладзіла па валасах)*. Мікіта...

Г а с т р ы т. Лягчэй стала... Саўсім лёгка... Памятаеш, ты хадзіла ў Піліпа свайго дазволу прасіць... каб жыць з Васілём?

Г а н н а. Ага...

Г а с т р ы т. Схадзі і яшчэ раз... На кладзішча... Ва ўсіх, хто там, прабачэння папрасі... За мяне... Сам не паспею... Сходзіш?

Г а н н а. Добра, Мікіта, добра... Ты не... не трэба.

Г а с т р ы т. А лепей цяпер схадзі... Зараз ідзі... Ідзі, Ганна, а то я раней... Ідзі...

Г а н н а. Добра, добра...

Г а с т р ы т. І скажы... Васілю скажы... каб... Ён ведае. Усё... Даруй... Ідзі...

Ганна спалохана падыходзіць да дзвярэй, але не выйшла, а толькі сцішылася ля парога. Гастрыт выпаўз з-пад коўдры, стаў на калені.

Дзе ты, хто ты, ці ёсць ты — не ведаю... Калі ёсць, на зямлю гэту ты мяне ўжо не пусціш... Я не слухаў цябе... І не пачуў... Дай здароўя Васілю... Ты на ім тут яшчэ і трымаешся... Калі б можна... Калі б другое жыццё... Я б... У мяне б нічога не было... Я здуру людзей жыць вучыў, а мне б дзяцей няньчыць, хлеб расціць і глядзець на Сонца... Гэта святое... Гэта ўсё... *(Падымаецца, узлез на палок, знік за посцілкай.)*

Ціхая-ціхая паўза.

Г а н н а *(ледзь чутна)*. Мікіта... *(Зразумела ўсё, усхліпнула.)* А-а-а Божачкі-і-і... А Мікітухна-а-а...

Ляпнулі дзверы. Увайшоў В а с і л ь. Ганна хуценька выцерла слёзы.

В а с і л ь. Капае... Ужо не прымарозіць... Цёплы вецер наваліўся... Вясна за дзела ўзялася...

Г а н н а. Ідзі ляж, Вася... На ложак, каля акна...

В а с і л ь. Няма калі разлежвацца... Гной хутка вывозіць... Каб з цёплым дажджом у зямлю... Развіднее — пайду за сваім канём...

Г а н н а. Куды? У цябе ж сэрца...

В а с і л ь. Сэрцы ва ўсіх. А зямля не чакае... *(Зірнуў на Ганну.)* Што?

Г а н н а. Ты толькі не хвалюйся... Табе нельга... Табе жыць, Вася, трэба... *(Заплакала.)*

В а с і л ь *(ласкава, нават пяшчотна)*. Чаго ты?

Г а н н а. Мікіта... памёр, здаецца...

Васіль узлез на палок. Зазірнуў за посцілку.

В а с і л ь. Які сёння дзень?

Г а н н а. Серада...

В а с і л ь. Што ж гэта ты, Мікіта, мой дзень заняў? Га? Значыць, у аўторак давядзецца... Ганна!

Г а н н а. Што, Вася?

В а с і л ь *(злазячы)*. За канём я ўсё-ткі пайду... А ты схадзі касцюм яму купі, бялізну, чаравікі, ну і на памінкі. Трэба па-добраму чалавека да Сонца адправіць.

Г а н н а. Добра...

В а с і л ь. На пошце тэлеграмы дзецям адбі: так і так, бацька памёр... Прыязджайце... Адрасы ў яго кішэні... Ён казаў... Хату прыбяры... І яго, і нашу... І ката яго забяры да нас...

Г а н н а. Ага...

В а с і л ь. Ну, а пра астатняе я са старшынёй дагаваруся...

Г а н н а. Вася... Ён цябе памаліцца прасіў...

В а с і л ь. Добра.

Г а н н а. Мне выйсці?

В а с і л ь. Нашто? Стой побач... Толькі ціха.

Г а н н а. Добра.

Яны выйшлі ўперад. Спыніліся. Двое старых працаўнікоў зямлі нашай. Глядзяць у той бок, дзе кожную раніцу за іх доўгае жыццё ўзыходзіла сонца, каб асвятліць і сагрэць вечную зямлю.

В а с і л ь *(ціха і ўрачыста)*. Аджыў сваё чалавек... Прыйшла яго ноч... Прыйшоў наш вечар... Дзякуй вам, бацька-маці, што вы нас нарадзілі і вырасцілі... Дзякуй таму, хто дадумаўся Адама з Евай стварыць... Дзякуй, што яны род людскі па свеце пусцілі, ішло-ішло і да нас дайшло... І мы некалі вочы расплюшчылі і Сонца ўбачылі... Ні за адну, нават самую горкую, слязінку не наракаем на жыццё. Дзякуй за тое, што жылі, мучыліся, смяяліся, плакалі... Дай і нашым дзеткам цяпла і святла... Сагрэй іх... І ўратуй ты нас ад нашай чалавечай дурноты. Уратуй ты нас ад гэтага!!! Уратуй!!! Няхай ва ўсіх будзе шмат дзяцей... Можа, і нашы душы прыляцяць з Сонца і ў іх уселяцца... Сонейка, наша Сонейка — прачынайся! *(Прыглядаецца, выходзіць уперад.)* Ганна! Ідзе нехта! У вёску ідзе...

Ганна падыходзіць да яго. Стаяць, глядзяць. Чакаюць.

*З а с л о н а*

*1983, 1988*

# Радавыя

**Драматычная балада ў дзвюх дзеях**

*Калі кожнага савецкага чалавека, што загінуў у бойцы з фашызмам, ушанаваць мінутай маўчання, давядзецца маўчаць 38 гадоў.*

З газет

## ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Дугін.
Дзерваед.
Бушцец.
Салянік.
Адуванчык.
Мар'я.
Ліда.
Вера.
Люська.
Жанчына.
Лейтэнант.
Тэлефаніст.
Глуханямы.

# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Сцяна невялікага касцёла, прабітая амаль на ўсю даўжыню цяжкім дальнабойным снарадам. Аграмадны чорны пралом. Гурбы рудога, бы ссохлая кроў, друзу. Злева і справа захаваліся невялічкія прадаўгаватыя акенцы з вітражамі, трошкі лепкі, і ўсё. Астатняе на зямлі.

Па будынку мітусяцца людзі. Побач, зусім побач грымоты бою. Выбухі, кулямётныя чэргі, чырвоныя бліскавіцы ў вітражах. Мабыць, гэта КП.

Хрыпаты голас тэлефаніста не дазавецца:

— Победа, Победа, я — Заря... Победа, Победа, я — Заря... Ну куды ж ты падзелася? Победа, родненькая, я — Заря...

Чуваць і іншыя галасы:

— Куды?! Куды, маць вашу! Што ён робіць? Дай Гарбачэўскага! Назад! Назад, я сказаў! Прапускайце іх... Пяхоту, пяхоту адсякайце!!!

— Першы замацаваўся...

— Перанясі агонь!

— Бі па леваму флангу... Там у іх танкі аднекуль!

— Сурнач! Хапай усіх каго можна — дуй налева да Гарбачэўскага. Скажы, загадай, каб... Адным словам — дуй! Там разбярэшся.

— Победа, Победа, я — Заря... Победа, Победа, я...

З грымотаў бою выдзяляецца прарэзлівы посвіст цяжкога снарада. Набліжаецца, мацнее...

— Лажысь!!

Выбух! Процілеглая сцяна здрыганулася і амаль уся абрынулася на людзей. Узнік яшчэ адзін пралом. Слуп сонечных промняў скрозь пыл урываецца ў будынак. Гэта толькі здавалася, што на вуліцы прыцемкі. А на вуліцы быў веснавы сонечны дзень. Усё раптоўна сціхла. І замест кулямётных чэргаў сыпануў свой пошчак салавей. Далёка праз пралом бачны спакойны лес, роўненькі зялёны луг, зверху звісаюць галіны нябачнага дрэва, што расце каля будынка. Нейкі час усё нерухома. Потым у адным месцы з-пад бітай цэглы выкараскаўся кантужаны тэлефаніст, усё яшчэ прыціскаючы да вуха разбітую тэлефонную трубку. Ашалела хаўкае ротам.

Тэлефаніст *(глядзіць шырока адкрытымі, невідушчымі вачыма і ідзе на сцяну).* По-бе-да... По-бе-да... Я — Заря... Я — Заря... *(Натыкаецца на сцяну, паварочваецца, ідзе па бітай цэгле да пралому насустрач сонечнаму святлу.)* По-бе-да... Родненькая... По-бе-да-а-а... *(Падае вонкі.)*

Спявае-заліваецца салавей. Паўза. Здалёк павольна-павольна ідзе Дзерваед. Брудны, запылены, расхрыстаны, без каскі. Колькі яму гадоў, цяжка вызначыць. Можа, сорак, а можа, і трыццаць. Сівы ўвесь, нават бровы сівыя. Змучаныя вочы ўвесь час глядзяць пад ногі. Цягнучы за рэмень аўтамат і спатыкаючыся, прайшоў праз разбіты будынак да сцяны, прытуліўся да яе, споўз на зямлю. У адной з ніш, дзе звычайна стаяць каменныя постаці, узнікае маладая бялявая Жанчына з дзіцем на руках. Доўгая, вышываная чырвоным белая-белая сарочка. Стаіць і калыша дзіця. Бязгучна, запаволена.

Дзерваед *(цяжка).* Жывы, жывы я, Мар'я... Хочаш не хочаш, а жывы... Даруй ты мне... Нацярпеўся... Так нацярпеўся...

Мар'я не адказвае. Калыша дзіця.

Пуста ў маім сэрцы, Мар'я... Выкіпела ўсё... Адпусці ты маю душу! Хоць трошкі на вайну спішы. Хоць трохі, Мар'я...

М а р'я не адказвае. Калышучы дзіця, знікае. Праз пралом уваходзіць Б у ш ц е ц. Стомлены каржакаваты хлопец гадоў пад трыццаць. Гаворыць заўсёды зацята і нервова. Вочы сухія.

Б у ш ц е ц *(прысеў ля процілеглай сцяны, зняў каску, выцер пот)*. Цэлы, партызан?..

Д з е р в а е д. Цэлы...

Б у ш ц е ц. Мяне адзін, сука, прыкладам гваздануў... Кацялок трашчыць... Гальчанскага не бачыў?

Д з е р в а е д. Не...

Б у ш ц е ц. Дай глынуць чаго-небудзь...

Дзерваед здымае пагнутую біклагу. Трасе над вухам.

Д з е р в а е д. Нямашака... Выцекла... Асколкам, здаецца, чапанула...

Б у ш ц е ц. Шчасціць табе...

Д з е р в а е д. Ага...

Б у ш ц е ц. Каго з нашых бачыў?

Д з е р в а е д. Кроў вытры... *(Моўчкі глядзіць перад сабой.)*

Б у ш ц е ц *(нервова)*. Ну, чаго ты глядзіш? Чаго глядзіш?

Д з е р в а е д. Цяжка мне...

Б у ш ц е ц. Мне лёгка! Так лёгка — палячу хутка...

Д з е р в а е д. То добра...

У праломе з'яўляюцца яшчэ два байцы. Хударлявы, з бледным тварам С а л я н і к вядзе А д у в а н ч ы к а з перабінтаванай галавой. Гэта зусім хлапчук. І сапраўды падобны на адуванчыка. Галава ў белых кучаравінках, толькі ў адным месцы над левай скроняй валасы не растуць. Плача. Салянік адпусціў таварыша, зняў каску, зняў з пляча аўтамат, перахрысціўся.

Б у ш ц е ц. Што, Адуванчык, атрымаў на абаранкі?

А д у в а н ч ы к. Балі-іць...

Б у ш ц е ц. Ідзі ў санбат... *(Да Саляніка.)* Апостал, завядзі яго...

А д у в а н ч ы к *(хныча)*. Вуха, паскуда, адгрыз... Счапіліся ў траншэі... У яго цясак, а ў мяне аўтамат... Адзін аднаго за рукі — і танцуем... Ён мяне нагой ззаду, я яго нагой ззаду... Худы, стары, а жылісты... І так я яго, і так... Як абцугамі за рукі схапіў! А потым хавальнік свой раскрыў, зубы жоўтыя, рэдкія, і за нос мяне — цап! Я морду ўбок, а ён за вуха, барбос паганы! І грызе... Я крычу, а ён грызе...

Б у ш ц е ц. Ты б яму яшчэ што-небудзь падставіў...

А д у в а н ч ы к. Ну як я буду без вуха? З аднаго боку падсмалены, а з другога без вуха!

Б у ш ц е ц. У цырк пойдзеш... Людзей смяшыць...

А д у в а н ч ы к. Дзякуй, Мішка Гальчанскі падаспеў... Закалоў гада, а то ён бы мяне саўсім загрыз...

Б у ш ц е ц. А дзе Гальчанскі?

А д у в а н ч ы к. Адкуль я ведаю? Ён далей пабег...

С а л я н і к. Супакоіўся Мішка... Каля брамы ляжыць... Крокі тры да сцяны не дабег...

Б у ш ц е ц. Мо параніла?

С а л я н і к *(паківаў галавой)*. Я яму вочы закрываў...

Б у ш ц е ц *(уздыхнуў)*. Значыць, закурым яго табачок... *(Пакорпаўся ў кішэнях, дастаў замусолены пачак «Казбека». Да Дзерваеда.)* Бяры, партызан... Казаў, калі што-якое — на памінкі вам пакідаю. А да Берліна дойдзем — перад Гітлерам выкуру, а акурак у яго на лбе затушу...

Д з е р в а е д *(бярэ папяросу)*. Не затушыў...

А д у в а н ч ы к. Дай і мне...

Б у ш ц е ц. Кашляць будзеш...

А д у в а н ч ы к *(злосна)*. Дай мне!!

Б у ш ц е ц. Чаго крычыш? У мяне вушы цэлыя... *(Да Саляніка.)* Мацвей, пацягнеш сатанінскага зелля? Бяры, бяры... Памяні Мішку Гальчанскага...

С а л я н і к. Я памяну... *(Папяросу не бярэ.)*

Кураць. Паўза.

Б у ш ц е ц *(задуменна глядзіць на дымок ад папяросы)*. Ну, вось і ўсё, Мішка... Старыя твае і дзеткі малыя ў Ленінградзе з голаду памерлі ў блакаду, жонку на фронце забіла, сам ты пяць разоў быў паранены і два разы кантужаны і лёг касцьмі на чужой зямлі перад канцом вайны... *(Нервова затушыў папяросу аб уласную далонь.)* Два гады пад адным шынялькам спалі, з аднаго кацялка елі, па чарзе наркомаўскую пілі! Мне б зараз выць, валасы на сабе рваць, а я куру яго папяроску, і хоць бы... Нават рады, сволач, што не мяне сёння, а яго паклалі...

С а л я н і к. Ужо і плакаць не можаш?..

Б у ш ц е ц. Чым плакаць?! Калі б па адной слязінцы на кожную смерць, на ўсё, што бачыў, ды я па кропельцы распляскаўся б ад Ржэва да Германіі...

С а л я н і к. Цяжка табе будзе... Калі ўсё высахла...

Б у ш ц е ц. Ідзі ты!

Паўза.

А д у в а н ч ы к *(падышоў да Дзерваеда)*. Дзед, а мне нашыўку дадуць?

Д з е р в а е д. Што?

А д у в а н ч ы к. Нашыўку, кажу, дадуць за вуха ці не? Ну, як у Гальчанскага былі... Раненне ўсё-ткі... Лёгкае...

Б у ш ц е ц. Нашыўкі за раненне ад кулі даюць, а не ад гнілых зубоў.

А д у в а н ч ы к. Дык мне ж яго не пацукі адгрызлі, а фашыст! Якая розніца, куляй ці зубамі? Вайна во-во скончыцца, а на гімнасцёрцы адны гузікі... Хоць бы нашыўку якую...

С а л я н і к *(ціха)*. Госпадзі, дай нам сілы...

Б у ш ц е ц. Каму ты молішся, ахламон? Гэта ж касцёл!

С а л я н і к. Бог адзін...

Б у ш ц е ц. Тут, можа, Гебельса хрысцілі, а ён моліцца, прыдурак. Адуванчык, папрасі, хай ён табе нашыўку вымаліць...

Д з е р в а е д. Не чапай чалавека... *(Да Адуванчыка.)* А ты за нашыўкамі не ганіся... Хопіць з цябе нашывак і на сэрцы... Жывым трэба застацца...

А д у в а н ч ы к. А мяне не заб'юць... Я яшчэ маленькі быў, матцы цыганка гадала на мяне... Па жылках... У мяне тады на твары жылкі такія сіненькія былі... Кажа, хай вады баіцца. Ад агню, ад кулі і ад сухот на ім закляцце ляжыць... А вады хай баіцца. Во! Агонь мяне і не ўзяў... Нас палілі... Прыходзяць, каля печы рукі пагрэлі, пытаюцца: «Матка, яйка, млеко, шпек партызант даваль?» Не, кажа, няма, не ведаем... «Шлехт, кажуць, плёхо, капут». Да печкі тварамі паставілі. У маткі сястрычка маленькая на руках. Матка просіць: «Паночкі, каб жа толькі не больна дзеткам было... Не страляйце больна...» А Зоська на вуха шэпча: «А гэта не шчыкотна... калі страляюць?» Шчыкоткі баялася. Шчыкотна ж не было. І больна не было... Яны нас абушком па галаве кожнага... Каб не мучыліся, значыць... *(Да Саляніка.)* Слухай, Мацвей, а я тады Бога трызніў... Гэта не грэх, Бога трызніць?

С а л я н і к. Гэта знаменіе...

Б у ш ц е ц. Цьфу!

А д у в а н ч ы к. Знаменіе... Стаю, здаецца, на снезе... Вакол ні душы... Ні хат, ні дрэў... Як вымерла зямля. Адзін роўны снег. Бог падыходзіць. З барадой і лысінай, усё як паложана... Здароў, кажа, Лёня... Здароў, кажу, хоць цябе і няма. Даю табе, Лёнька, медаль... Здымае сонца з неба і давай мне на галаву адзяваць... А яно гарачэннае! Мазгі ў чэрапе закіпаюць... Плачу, адпіхваю яго, а ён сонца мне як кепку на галаву...

С а л я н і к. Благадаць на табе, Леанід...

А д у в а н ч ы к. Галавешка на мне была, а не благадаць! Ачуняў, а яна во тут во, каля скроні дагарае... Выпаліла ўсё да мяса... І валасы не растуць...

Д з е р в а е д. Ты б іх зачэсваў на гэта месца...

А д у в а н ч ы к. Так што я ні агню, ні кулі не баюся... З агню тады нехта вынес, у партызанах адбыў, амаль год ваюю, і хоць бы драпіна... Кулі побач ціўкаюць... Ціў-у-у, ціў-у... Вуха толькі во сёння... І то не куляй...

Б у ш ц е ц. Майму дзядзьку цыганка нагадала: загінеш ад гарэлкі. Напужа-ала — дваццаць гадоў не піў... Нават піва. І загінуў.

С а л я н і к. Пачаў, значыцца...

Б у ш ц е ц. Суседка над намі жыла. Яе мужык любіў гэта дзела. Пачала аднойчы ганяць яго, непачатую пляшку праз акно выкінула, а дзядзька на лавачцы сядзеў... Бутэлькай «Московской особой» па цемечку — цюк! І гатоў. Загінуў ад гарэлкі... *(Нечакана.)* А пахаваюць у брацкай?

Д з е р в а е д. Каго?

Б у ш ц е ц. Мішку...

Д з е р в а е д. Схадзі зірні...

Б у ш ц е ц. Не пайду! Нікога мёртвага не бачыў... Ні маткі, ні бацькі, ні сясцёр... І яго не хачу! Схадзі ты... Га, партызан? Скажы даруй за мяне... Схадзі, партызан... Ну, чаго ты глядзіш? Сходзіш?

Д з е р в а е д. То добра... Нешта з маладых нікога няма...

Б у ш ц е ц. Усё ў кучу, як авечкі, лезлі. Толькі заляжам — са ўсіх бакоў да мяне паўзуць! Куды, маць вашу?! Па кучах толькі і лупяць. Усё адно паўзуць, вочы вытрашчыўшы. Мяне Мішка ў атаках і блізка да сябе не падпускаў. Смерць, кажа, дыхне нада мной, а ты побач — і табе пападзе... Адчуваў, ці што?

Праз пралом уваходзіць старшына Д у г і н. Камандзір аддзялення. Спакойны, высокі, мудрыя і трошкі жорсткія вочы. У руках нясе тэрмас, біклагу, рэчмяшок. Падышоў да байцоў, кінуў усё на зямлю, прысеў на тэрмас.

Д у г і н. Хто Саляніка бачыў?

Б у ш ц е ц. Вунь ён святых разглядвае... Мацвей!

С а л я н і к. Што?

Д у г і н. Цьфу! А я яго па траншэях шукаю... *(Да Дзерваеда.)* Партызан, чаму без каскі быў?

Д з е р в а е д. Забыўся...

Д у г і н. Я табе забуду! *(Да Адуванчыка.)* Што ў цябе, малы?

А д у в а н ч ы к. Вуха...

Д у г і н. Моцна?

А д у в а н ч ы к. Баліць...

Б у ш ц е ц. Гальчанскага забіла.

Д у г і н. Бачыў...

Д з е р в а е д. Яшчэ хто?

Д у г і н. Усё... Больш ніхто не прыйдзе. Якавенку мінай яшчэ ў сваім акопе да атакі... Гураў і Варонін у санбаце. Гураў, мабыць, выкараскаецца... У яго тут *(паказаў на грудзі)* скразное... Варонін цяжкі... І ў шпіталь не павязуць — паўжывата выдрала... Адваяваўся... Так што сёння нам лафа... Па паўлітру на брата наркомаўскай выйдзе... З трэцяга ўзвода падкінулі... Там саўсім піць няма каму. Пастраення не будзе, строіць няма каго... Усёй роце падзяка за вышыню... Так што будзем вячэраць, хлопцы... Давай, партызан, сцяліце плашч-палатку... Хто хоча, можа НЗ адкрыць. Хаця тут усяго хопіць... Бушцец!

Б у ш ц е ц. Што?

Д у г і н. Не што, а я! Хадзі сюды...

Б у ш ц е ц *(падыходзіць)*. Ну, я...

Д у г і н *(шэптам, зацята)*. Ты ў склепе быў?

Б у ш ц е ц. У якім склепе?

Д у г і н. Ты тут Ваньку не строй... Пакажы сваю фінягу!

Бушцец, крыва ўсміхнуўшыся, дастае з-за спіны трафейны эсэсаўскі корцік, падае Дугіну. Той разглядвае.

Б у ш ц е ц. Ну што ты, старшына... Я б яго выцер ці ў сажалцы спаласнуў... Бачыў, там сярод двара сажалка? Лебедзі чорныя плаваюць... Любяць, паскуды, чорнае... А што там у склепе, калі не сакрэт? *(І нечакана ўзвіўся.)* А калі б ён быў і ў крыві?! Што з таго?! Я з атакі, а не з бульварчыка!

Д у г і н. Разгаворчыкі! *(Спакойна, вяртаючы корцік.)* Адным словам, вось што, Сярожа: загад Вярхоўнага ты ведаеш... Ведаеш ці не?

Б у ш ц е ц. Ну, ведаю...

Д у г і н. Не «ну»...

Б у ш ц е ц. Так точна, таварыш старшына! За жорсткае абыходжанне з мірным насельніцтвам або з ваеннапалоннымі...

Д у г і н. Вось іменна... Ведаеш. Ты мне блізкі чалавек... Брат. Але азвярэць, стаць такімі, як яны, я табе не дам! Чуеш? Яшчэ што-небудзь... Я цябе без трыбунала... Сам... Усёк?

Б у ш ц е ц. Усёк.

Д у г і н. Мы з табой славяне, Сярожа... І прыйшлі сюды заваёўваць сімпатыю...

Б у ш ц е ц. А я на немцы жаніцца не збіраюся. Сімпатый мне не трэба.

Д у г і н. Мне таксама. Тваім дзецям можа спатрэбіцца.

Б у ш ц е ц. Чаму ж яны пра гэта не думалі?

Д у г і н. Мы з табой не яны! Я так думаю... Пытанні ёсць?

Б у ш ц е ц. Табе сны сняцца, Дугін?

Д у г і н. Я чацвёрты год не высыпаюся...

Б у ш ц е ц. А я засынаць баюся! Загад... Вярхоўны ў Маскве, а я тут... Бацька, маці, сястрычкі маленькія зямлю параць... Жонку ў канцлагеры спалілі... Мяне ад Люські з вясельнага стала ўзялі пасля першай чаркі... «Горка» нават не крычалі! Ведаеш, што мне сніцца?! Ад самага Ржэва! Вяселле маё. Сядзім за сталом усе ў белым... І перад кожным чарка... А ў чарцы кроў замест віна... І ўсе госці глядзяць на мяне! Я з Люськай павінен выпіць... Тады і ім не давядзецца... Я ўстаю, бяру гэтую чарку... І прачынаюся... Халодны пот, а ў роце салёны смак... *(Жорстка.)* Пытанні ёсць?!

Д у г і н. Пайшлі вып'ем... Вайна хутка скончыцца... І трэба будзе жыць... Разумееш, жыць...

Б у ш ц е ц. Жыць...

Падыходзяць да рассцеленай плашч-палаткі. Дзерваед і Адуванчык ужо сабралі на стол, расстаўляюць кружкі.

Д з е р в а е д. Другі фронт адкрываць?

Д у г і н. Што?

Д з е р в а е д. Тушонку мерыканскую, кажу...

Д у г і н. Давай...

Б у ш ц е ц *(да Саляніка)*. Мацвей, грамульку возьмем ці граху баішся?

С а л я н і к. Чаму ж... Гэта як быццам памінкі... На памінках можна. На памінках не грэх...

Дзерваед разлівае гарэлку. Дайшоў да Адуванчыка.

Б у ш ц е ц. Куды ты яму столькі?

А д у в а н ч ы к. А ты баішся, што табе не хопіць? Не баісь. Лі, дзед...

Б у ш ц е ц. Ты ж з зямлі не падымешся, певень бязвухі...

А д у в а н ч ы к. Што табе маё вуха?! *(Адчайна.)* Вып'ю! Усю сваю долю вып'ю! Назло.

Б у ш ц е ц. Старшына, скажы...

Д у г і н. Хай п'е...

Д з е р в а е д *(скончыўшы разліваць)*. Маўчаць будзем?

Б у ш ц е ц. Ты і так бы язык праглынуў... Толькі глядзіць... Чаго?

Д у г і н. Што маўчаць? Давайце, хлопцы... *(Вельмі-вельмі проста, звычайна, ледзь не абыякава.)* Памянём нашага таварыша Мішку Гальчанскага і маладзейшых, Якавенку, Вароніна...

С а л я н і к. Вароніна нельга... Жывы ж...

Д у г і н. Наўрад... Ідзі, кажа, старшына, мне сумна робіцца... І ўсміхаецца... твар нейкі светлы.

С а л я н і к. Грэх...

Б у ш ц е ц. Заткніся ты, расстрыга!

Д у г і н *(да Бушцяца, жорстка)*. Сядзь! Віны нашае перад імі няма... Ад куль з нас ніхто не хаваўся... Хай ім будзе пухам зямля чужая, а вам дай Бог выжыць... Давайце, хлопцы...

Усе выпілі. Але закусваць не сталі. Сцішыліся неяк і ўсё ж памаўчалі. А за будынкам буяе чужая вясна. І пошчак салаўся разліваецца ў прасторы, ляціць да самага неба і, здаецца, запаўняе ўсю зямлю. І так ён, гэты пяшчотны спеў, не дапасоўваецца ні да руін, ні да байцоў, стомленых цяжкім боем, ні да часу, што здаецца, во-во разарве сэрца.

Б у ш ц е ц *(не вытрываў)*. Ды змоўкне ён, сука, ці не?! *(Схапіў аўтамат і з рукі часануў доўгай чаргой у той бок, адкуль далятае пошчак.)*

Д у г і н *(вырываючы аўтамат)*. Ты што, здурэў?!

У праломе з'яўляецца Ж а н ч ы н а ў с в е т л ы м.

Д з е р в а е д *(ціха)*. Даруй, Мар'я...

Д у г і н. Што?

Пошчак салаўя.

*З а ц я м н е н н е*

Ноч. Ціхая, веснавая. Не змаўкае настырны салоўка. Перад чорным праломам у белай сарочцы, накінуўшы шынельку, сядзіць Д з е р в а е д. Глыбока ў праломе, нібы здань, мроіцца воблік светлай Ж а н ч ы н ы з д з і ц е м. І ці не гэты воблік песню спявае:

Ой, чыё ж та поле,  
Чые ж та пракосы?  
Чыя ж та дзяўчына  
Распусціла косы...

Д з е р в а е д. Чаромха цвіце, Мар'я... Бульбу б цяпер садзіць... Зямля цёплая... Дыхае... Можа, паспею... Пазней трохі... Яно нічога... Дробненькая будзе... Не хадзі ты за мной, Мар'я. Не адводзь ад мяне бяду... Смерці не баюся... Жыць страшна.

Ой, чыё ж та поле,  
Чые ж та пракосы?  
Чыя ж та дзяўчына  
Распусціла косы...

Падыходзіць Д у г і н. Ж а н ч ы н а з д з і ц е м знікае.

Д у г і н. З кім гэта ты?

Д з е р в а е д. Так... Адзін...

Д у г і н. Чаму не спіш? *(Не чакаючы адказу.)* І я не магу... Зоркі сёння нізкія... Пасля першай кантузіі як быццам душу з цела выбіла... І тады во такія яны былі... Буйныя, халодныя, аж

звіняць... Ляжу, і здаецца, як з паветра ўвесь... І мяне цягне ўгору, цягне, кожная зорачка мяне засмоктвае, нібы выліваюся некуды туды к чортавай матары... Пад бомбамі не страшна, а тут... *(Зірнуў угору.)* Чаго? Зоркі і зоркі... Зараз неба абвалачэ... Мабыць, дождж будзе... Чаго ты маўчыш?

Д з е р в а е д. А што казаць?

Д у г і н. Пахваліўся б, расказаў, як партызаніў...

Д з е р в а е д. Страляў...

Д у г і н. Дома хто-небудзь ёсць?

Д з е р в а е д. Нікога...

Д у г і н. А былі?

Д з е р в а е д. Усе былі...

Д у г і н. Фюрэры за гэту вайну ніколі не расплоцяцца з людзьмі...

Д з е р в а е д. Мы плаціць будзем. Гітлеры шалеюць — мы плоцім... Скажы, старшына: чаму яны нараджаюцца? Гітлеры?

Д у г і н. Страшна не тое, што яны нараджаюцца, а тое, што людзі ім верыць пачынаюць... *(Паўза.)* Выпіць хочаш? Мне ротны віна даў... У склепе знайшлі...

Д з е р в а е д. Можна...

Д у г і н. Усё адно спаць не буду... Зоркі нізкія...

Д з е р в а е д. Слухай, старшына, папрасі ротнага — хай нашага малога куды перавядзе. Ён і так нацярпеўся... Наскочыць, дурань, на кулю... А яму жыць трэба... Душа яшчэ расце... Зялёны... Мо і забудзецца... Папрасі... У яго дзеці павінны быць прыгожымі...

Д у г і н. Ладна... А цябе яшчэ раз заўважу ў атацы без каскі — скажу ротнаму, каб на «губу» пасадзіў... Ясна?

Д з е р в а е д. Ага...

Крадучыся, уваходзіць Б у ш ц е ц.

Д у г і н. Дзе швэндаешся?

Б у ш ц е ц *(спалохаўся)*. Цьфу, чорт! Думаў, на вартавога напароўся!

Д у г і н. Дзе быў?

Б у ш ц е ц. У мястэчку... Сімпатыі заваёўваў...

Д у г і н. Сяргей!

Б у ш ц е ц. Не, не, старшына, усё нармальна... Так пахадзіў, паглядзеў... Агародчыкі капаюць... У нас магілкі, а яны агародчыкі... У нас крыжы скалочваюць, а яны шпакоўні... І не баяцца!

Д з е р в а е д. А чаго ім баяцца?

Б у ш ц е ц. Ну, канечне... Мы добранькія... Вунь партызан учора свой НЗ адной немцы аддаў... Пляваць хацелася...

Д у г і н. А ты б плюнуў і супакоіўся...

Б у ш ц е ц. Не магу! Ведаеце, зазірнуў у адзін домік... Чысценька ўсё, акуратненька, сцяжынкі жоўтым пясочкам пасыпаны, свечка гарыць, на раялі нехта дрэнькае... Заходжу. Сядзіць маладая немка. Прычэсаная, рукі белыя, пальцы доўгія, у халаціку... Стаў, гляджу... Паварочваецца, зубы паказвае, гадаўка... Шуберт, кажа... Гляджу і маўчу... Падымаецца, курва, халацік расшпільвае! Маўляў, бітэ, рус Іван, атрымлівай кантрыбуцыю... Нашы дзяўчаты сажай твары мазалі, адна, я чуў, кіслатой сваю прыгажосць спаліла, а гэта халацік расшпільвае з усмешачкай...

Д у г і н. Далей...

Б у ш ц е ц. Што далей? Стаіць, паскуда, голая, гладкая... і ўсміхаецца... Плюнуў — і ходу... Глядзець не магу на іх! Трасе! Вось калі мёртвы немец ляжыць — цалаваць гатовы!

Д у г і н. Ідзі спаць...

Б у ш ц е ц. Закурыць дайце...

Д у г і н *(падае цыгарэты)*. На...

Б у ш ц е ц. Не... Партызан, дай свае махоркі... Ну, чаго глядзіш? *(Бярэ ў Дзерваеда паперы і махоркі і, скручваючы цыгарку, адыходзіць у цемень.)*

Д з е р в а е д *(нечакана)*. А яму лепей загінуць...

Д у г і н. Ты што, з глузду з'ехаў?! Малады, дурны, гарачы... Дый перажыў...

Д з е р в а е д. А ты не перажыў?

Д у г і н. Ва ўсіх нас душы выхаладзіла... Не хутка сагрэемся.

Д з е р в а е д. Можа, й памрэм халоднымі...

Д у г і н. Кінь!

Д з е р в а е д. Жонка, старшына, за мной ходзіць... З дзіцем... Спаленыя... Другі год ходзіць...

Д у г і н. Расказаў бы... Лягчэй будзе...

Д з е р в а е д. Лягчэй не будзе...

Д у г і н. Раскажы.

Д з е р в а е д. Што расказваць? Хлеб яна нам пякла, мая Мар'я, значыць... Для ўсяго атрада... Мы ёй мукі прывозілі, яна і пякла... Выдаў нехта... Аднойчы з разведкі ішлі, пяцёра нас было... Удала схадзілі, добрую разведку неслі... Брыгаду потым уратавалі... Да мяне зазірнулі... Мар'я толькі на стол паставіла, я з дзіцёнкам пазабаўляўся, прыбягае белая: «Хлопчыкі, немцы ў Максютках!» З хаты выскачылі, да лесу паўзлі, а яны і адтуль пруць ланцугом плячо ў плячо... На дарозе машын дзесяць... Куды? Хоць скрозь зямлю праваліся! Палоска жыта была каля хаты... Запаўзлі, залеглі... Жыта высокае, добра ў тым годзе ўрадзіла... Пад'ехалі, гергочуць нешта, у хату ўвайшлі... Ляжым, не дыхаем... Пяцёра нас усяго. Двое сувязных саўсім без зброі... Ляжым... Бачу праз калоссе — муку з сенцаў выносяць! У мяне

ўсё абарвалася! Адкуль у адзінокай бабы ў такі час гэтулькі мукі?.. І каму?.. Яснае дзела, каму... А на расправу яны лёгкія... Павярнуў галаву да камандзіра — той белы як палатно, шэпча дрыжачымі губамі: «Разведка, разведка...» І на сумку на сваю паказвае. Потым эсэсавец Васілька выносіць... На руках гушкае, забаўляецца, смяецца... І сынок смяецца... Адлягло трохі ад сэрца... Пашкадуюць, думаю... Смяецца ж...

Паўза.

Д у г і н. А потым?

Д з е р в а е д. А потым хату запалілі... Я сівець пачаў... Мар'ю не вывелі... І стрэлу чуваць не было... Не ведаю, што з ёй зрабілі... З хаты не выводзілі...

Паўза.

Д у г і н. Гавары, яшчэ гавары...

Д з е р в а е д. Васілька. *(Захліпнуўся паветрам.)* Не магу!!! Разоў дваццаць спрабаваў расказваць... не магу...

Д у г і н *(жорстка)*. Гавары!

Д з е р в а е д. Аддыхаюся... Перад хатай антонаўка старая расла... За кашульку на сучок зачапіў, самі адышліся... Горача стала... Хата гарыць, Васілька ад крыку на яблыньцы заходзіцца, я зямлю зубамі грызу... Пачуў, як па валасах холад пайшоў... І ўсё. У атрад хлопцы прынеслі... Яблыкі на антонаўцы печанымі сталі... Мар'я з Васількам за мной ходзіць... Вінаваты я...

Д у г і н. Чым ты вінаваты? Што ты мог зрабіць?

Д з е р в а е д. Зрабіць я, канечне, нічога не мог... Мне трэба было з імі разам... А я ў жыце ляжаў... Сівеў і ляжаў... Да гэтага часу перад сваёй душой апраўдваюся: выскачыў бы — хлопцаў засыпаў, а разведка важная была... План карацельнай экспедыцыі неслі... Брыгаду ўратавалі... Цэлую брыгаду... Што там Мар'я з Васількам? Праўда?

Д у г і н. Тут не па арыфметыцы трэба...

Д з е р в а е д. А па чым?

Д у г і н. Не ведаю... Можа, калі-небудзь хто-небудзь разбярэцца...

Д з е р в а е д. Да шаптухі хадзіў... Ведаеш, што сказала? Кроў трэба нявінную праліць за Мар'ю і Васілька... Тады іх душы супакояцца... А я ўчора кансервы свае аддаў... Дзіцёнак змораны, залатушны, нават не плача, стогне толькі... Якая там кроў?..

Д у г і н. Ведзьма нейкая сказала гэта табе.

Д з е р в а е д. Не трэба... Гэту ведзьму два разы расстрэльвалі...

Д у г і н. Каску ў атаках усё ж надзявай...

Д з е р в а е д. Не заб'юць... Мяне ўжо забілі... У жыцце... Звечарэла мая душа...

Д у г і н. Пойдзем, партызан! Вінца трафейнага цяпнем... Памянём тваю Мар'ю і сына...

Пастаялі. Паслухалі салаўя.

Чуеш? Спявае, гад...

Д з е р в а е д. То добра...

Пайшлі ўглыб. Салавей спявае. Паўза. Потым збоку шпарка выходзіць санінструктар Л і д а. За ёй, трымаючыся за шчаку, выбягае Б у ш ц е ц.

Б у ш ц е ц. Ты што, звіхнулася?

Л і д а. Я табе казала — не трэба!

Б у ш ц е ц. Усе спачатку кажуць «не трэба». Нашто па мордзе лупіць?

Л і д а. Я не спачатку, я ў канцы, Сярожа... Не чапай мяне, калі ласка...

Б у ш ц е ц *(падыходзіць)*. Ды ладна...

Л і д а *(жорстка)*. Сяргей!

Б у ш ц е ц *(таксама жорстка)*. Так бы адразу і сказала! Нашто рукамі махаць?!

Л і д а. Балюча?

Б у ш ц е ц. Балюча... *(Пасля паўзы.)* Што, знайшла з зорачкамі на плячах?

Л і д а. З зорачкамі... Толькі ў вачах.

Б у ш ц е ц. Ух ты! Гэта вясна з нямецкім салаўём на цябе дзейнічае... *(Паўза.)* Ну, а са мной і без зорачак няблага было? Пагрэлася і ў кусты?

Л і д а. Я не грэлася... Я цябе адагрэць хацела...

Б у ш ц е ц. Слаба нешта грэла. Плакала больш...

Л і д а. Хацела, каб і ты заплакаў...

Б у ш ц е ц. Ну-ну... І шмат для каго ты цёпленькай была? Толькі без рук!

Л і д а *(нечакана проста)*. Шмат... Даруй, Сярожа... Холадна мне з табой і страшна...

Б у ш ц е ц. Чаго прыйшла?

Л і д а. Пакліч Дувянца...

Б у ш ц е ц. Каго-о-о?! Адуванчыка?

Л і д а. Мне перавязку трэба зрабіць...

Б у ш ц е ц. Ноччу?

Л і д а. Пакліч...

Б у ш ц е ц. Ну, Лідэс! Ну, драпежніца! Ты ведаеш, колькі яму гадоў?

Л і д а *(нервова)*. А колькі мне?! Ты ведаеш?! Што, рукі не тыя? А колькі вашай крыві на гэтыя рукі вылілася, ты ве-

даеш? Грудзі не тыя? А колькі я прапаўзла на гэтых грудзях, ты ведаеш?

Б у ш ц е ц *(ніякавата).* Усё правільна... Зіма канчаецца — трэба гняздзечка віць... Нашто ён табе? На гады свае не глядзі. Ты даўно перарасла іх. Па акопах і бліндажах раскідала за вайну...

Л і д а. Сабяру...

Б у ш ц е ц. Не збярэш, дурненькая... Табе не Адуванчык, а такі, як я, патрэбны... Я цябе зразумею. У нас з табой вайна... Адна на дваіх. А ён нецалаваны, Лідка... Яго жанчыны там... падрастаюць. Яго ўсё там. За Перамогай...

Л і д а. А дзе маё?

Б у ш ц е ц. А тваё тут... у акопах. І ты ў іх застанешся назаўжды! Вайна нас з табой ніколі не адпусціць... Ты гэта разумееш? Кветачкі, месяц над рэчкай, салодкі салоўка — гэта прайшло міма...

Чутны грымоты навальніцы.

Таму, каля каго рваліся снарады, вясновая навальніца да самай смерці артналётам здавацца будзе... Мы з табой, Лідка, усё паклалі для Перамогі... І жыццё сваё. І душы. Ты дзіця хочаш?

Л і д а. Я жанчына...

Б у ш ц е ц. А я не хачу! Нікога пасля сябе не хачу пакідаць! Якія дзеці ў мяне могуць нарадзіцца? Не хачу, каб і яны раслі дзеля такога...

Л і д а. Гэта вайна апошняя...

Б у ш ц е ц. Ага. Залечаць раны, забудуць мёртвых... І зноў пачнуць... Праўда, нам з табой гэта ўжо не страшна. Я да вайны крыві баяўся... А цяпер у рукапашных баюся прамахнуцца, ударыць не трапна. Так вось пад левую лапатку — рраз! Ты ведаеш, мне гэта падабаецца... А кроў... Забыўся, якая яна... У сне бачу ружовую... Як віно... Адуванчыка я зараз паклічу...

Л і д а *(падышла да яго, нечакана прытулілася).* Сярожа...

Б у ш ц е ц *(зразумеў, што гэта ласка не жанчыны).* Вось гэтага не трэба!

Л і д а. Спыні сваю душу, Сярожа...

Чутны грымоты навальніцы.

Б у ш ц е ц. Дождж будзе?

Л і д а. Будзе...

Б у ш ц е ц. Спыні дождж, Ліда...

Л і д а. Сярожа...

Б у ш ц е ц. Пусці! *(Пайшоў.)*

Ліда прысела на друз. Слухае грымоты. Праходзіць С а л я н і к.

С а л я н і к. Чаму ты, Лідка, не спіш?

Л і д а. Пагадай мне, дзядзька Мацвей...

С а л я н і к. Я не ўмею...

Л і д а. А калі ў Бога не верыш, маліцца можна?

С а л я н і к. Можна. Хто-небудзь пачуе...

Л і д а. Я буду жыць, дзядзька?

С а л я н і к. Захочаш — будзеш... Ідзі спаць. *(Адыходзіць.)*

З глыбіні Б у ш ц е ц цягне за руку А д у в а н ч ы к а. Той упіраецца.

А д у в а н ч ы к. Пусці, я табе сказаў!

Б у ш ц е ц. Давай, давай...

А д у в а н ч ы к. Што табе трэба, Мазепа дурны?!

Б у ш ц е ц *(падвёў яго да Ліды)*. От! Цёпленькі... Акурат для сугрэву — з пасцелі падняў... *(Хацеў яшчэ нешта сказаць, але не сказаў. Павярнуўся і хутка пайшоў.)*

Ліда глядзіць на Адуванчыка. Той — на яе.

А д у в а н ч ы к. Ну што?

Л і д а. Сядай, я табе павязку змяню...

А д у в а н ч ы к. Дык ты ж удзень мяняла...

Л і д а. Яшчэ змяню... Але калі ты хочаш спаць — ідзі спі...

А д у в а н ч ы к. Спаць не хачу... Мяняй... *(Сядае.)*

Ліда пачынае разбінтоўваць яму галаву.

Л і д а. Кроў прысохла... Не баліць?

А д у в а н ч ы к. Не...

Л і д а. Лёнька, чаму цябе Адуванчыкам завуць?

А д у в а н ч ы к. Мішка Гальчанскі празваў... Калі ў роту прыйшоў, у мяне з гэтага боку валасы саўсім не раслі... Ён засмяяўся і кажа: «Зірніце — Адуванчык!» Так і завуць... Мішку забіла, а мяне завуць...

Л і д а. Хочаш шакаладу? Еш, ты ж любіш салодкае...

Адуванчык есць. Ліда пяшчотна разбінтоўвае.

А д у в а н ч ы к. А адкуль у цябе шакалад?

Л і д а. Лётчыкі падарылі...

А д у в а н ч ы к *(аддае)*. Не хачу!

Л і д а. Ну што ты, дурненькі?.. У мяне толькі з табой душа жыць пачала... Не думай нічога...

А д у в а н ч ы к. Я не думаю...

Л і д а. Я ні ў чым не вінаватая: ні перад табой, ні перад сабой... Але ты ўсё адно даруй мне...

А д у в а н ч ы к. Не трэба, Ліда...

Л і д а. Табе што-небудзь гаварылі пра мяне?

А д у в а н ч ы к. Я не слухаў...

Л і д а. Ведаеш, бацька, адыходзячы на фронт, сказаў маці: «Даруй мне... калі я загіну... Я табе дарую, калі не дачакаешся». І ты мне, Лёнька, даруй...

А д у в а н ч ы к. За што?

Л і д а. Не ведаю, але даруй... Я цябе не дачакалася... Чатыры гады полымя, кроў, смерць побач... кожны дзень. Мне схавацца за каго-небудзь хацелася... я і хавалася... А потым баяцца перастала... Нават клікала не адзін раз... З нашага аддзялення хлопец такі чарнявы, на цыгана падобны, з ранай у жывот... Як яго?

А д у в а н ч ы к. Варонін...

Л і д а. Як звалі?

А д у в а н ч ы к. Не ведаю... Ён з папаўнення... Малады...

Л і д а. Малады... Усміхаецца, а слёзы з вачэй... Сястрычка, я не плачу, гэта мне пяском у вочы ад выбуху... Дай вады, кажа, усё адно ж горай не будзе... Губы кусае, крычаць саромеецца... Я ад палаткі адышлася, на калені стала і... прашу... Смерці прашу: забяры яго, прашу, зрабі ласку, забяры... Вяртаюся — ён ужо сцішыўся... Толькі ўсмешка засталася... І вочы на сонца глядзяць. Гэта ж жудасць! Смерці маліцца... Яе ж праклінаць трэба... *(Паўза.)* Са мной нешта сталася, Лёнька, калі я сустрэлася з табой... Па начах у сне чую: плача нехта... Так тоненька, жаласліва ўсхліпвае... Я не вушамі, я сэрцам гэта чую... Ведаеш, хто гэта? Мо ненароджаныя дзеці плачуць... Да святла просяцца... Баюся, што пасля ўсяго гэтага я нарадзіць не змагу... Жыць застаецца мала — трэба яшчэ выжыць... Толькі б выжыць... Толькі б выжыць...

Яркая бледна-блакітная бліскавіца шуганула з неба. І ўслед за ёй траскучы ўдар грому. Адуванчык упаў на калені і нервова прытуліўся тварам да Ліды. Тая моцна прыціснула яго да сябе.

Што ты, што ты, дурненькі... Гэта ж не снарад... Гэта навальніца.

А д у в а н ч ы к. Я снарадаў не баюся... Я перуна баюся...

Л і д а. Чаго?

А д у в а н ч ы к. Ён перад вайной да нас у хату залятаў... Такі белы мячык. Акно было адчынена, ён і прыплыў... Мы вячэралі, ён над сталом і павіс... Маці схапіла чыгунок дый накрыла яго. Як чахнула перад самым носам! Я потым месяц заікам быў... Бацька кажа: нешта нядобрае будзе... Угадаў: праз месяц вайна пачалася. А мяне з таго часу, як навальніца надыходзіць, — трэсці пачынае. Снарады побач вухкаюць — не страшна, толькі рот раскрываю, а то вушам балюча, а як навальніца — гатовы пад зямлю залезці...

Л і д а. Гэта пройдзе... У цябе хоць хто-небудзь застаўся?

А д у в а н ч ы к. Бацька, можа, жывы, яго на вайну забралі... А так нікога... І вёскі няма. І суседзяў. Палілі нас...

Л і д а. Усё хутка скончыцца... І будзе ціха-ціха на зямлі... І я буду тваёй сястрой... І маці... Гэтаму я навучылася за вайну. Мы паедзем куды-небудзь далёка, дзе няма папялішчаў і руін, дзе шмат-шмат цішыні... Дзе журчыць чыстая рэчка... І будзем успамінаць толькі наша дзяцінства, нашых мам, школу, як нас прымалі ў піянеры... І ніколі-ніколі не ўспомнім вайну... А калі надыдзе навальніца — я заспяваю, і ты не пачуеш, як неба разрываюць грымоты... І пярун ужо не будзе прадвеснікам бяды... *(Абдымае яго, плача.)*

А д у в а н ч ы к. Не трэба, Ліда... Не плач.

Л і д а. Гэта не слёзы, Лёнька... Гэта душа мая смяецца...

З'яўляецца Ж а н ч ы н а з д з і ц е м на руках.

А д у в а н ч ы к. Пачакай, Ліда... Нехта глядзіць на нас...

Л і д а. Усе спяць...

А д у в а н ч ы к. Глядзіць!

З неба на зямлю абрынуўся ласкавы веснавы дождж.

*З а ц я м н е н н е*

Гэткія ж самыя руіны. Вельмі падобныя на першыя. Магчыма, гэта быў музей ці палац які-небудзь. Паўзмрок. Успыхваюць крывавыя бліскавіцы, выбухі. Так падобна ўсё гэта на навальніцу, ды гэта не навальніца. Гэта бой. Прарэзліва енчаць міны, захліпваюцца ад злосці аўтаматы, ціўкаюць кулі. У будынак урываюцца б а й ц ы. Д з е р в а е д на сярэдзіне схапіўся з некім, пакаціўся па друзу. Цяжкае дыханне, глухія гукі ўдараў. Падбягае Б у ш ц е ц.

Б у ш ц е ц. Галаву! Адвярні галаву, партызан!!! Пусці яго, суку!

Кароткі ўзмах корціка, хрыпаты стогн.

Цэлы?! Бяры аўтамат...

Д у г і н. Дзед! Вазьмі левае акно! Малы, прыкрывай яго!

А д у в а н ч ы к. Ад каго тут прыкрываць? *(Кідаецца да пралому.)*

Д у г і н. Куды лезеш, маць тваю?!

А д у в а н ч ы к. Што табе мая маці?!

Д у г і н. Біце доўгімі чэргамі, прыціскайце іх да зямлі! Зараз назад палезуць! Астатнія па аднаму за мной!

Д у г і н, Б у ш ц е ц і С а л я н і к па чарзе знікаюць у праломе. Дзерваед становіцца ля акна. А д у в а н ч ы к падбягае.

Д з е р в а е д. Куды?! Глядзі ззаду!

А д у в а н ч ы к. Ідзі ты к чорту! Ззаду нікога няма!

Д з е р в а е д. Не лезь! *(Страляе.)*

Недзе зусім блізка прашыпела зялёная ракета.
Страляніна паступова заціхае.

Здаецца, замацаваліся... Дзякуй Богу... *(Паклаў аўтамат на падаконнік, стомлена прытуліўся да сцяны.)* Хадзі, Лёнька, закурым...

А д у в а н ч ы к *(пакрыўджана)*. Сам куры...

Д з е р в а е д. Чаго ты?

А д у в а н ч ы к. А вы? Чаго вы мяне за свае спіны хаваеце? Цябе вунь да ордэна прадставілі, а ў мяне і нашыўкі няма...

Д з е р в а е д. Нашто табе ордэн, дурань?

А д у в а н ч ы к. На грудзях насіць!

Д з е р в а е д. Свой аддам, калі дадуць...

У праломе з'яўляецца разгарачаны Б у ш ц е ц.

Б у ш ц е ц. Дзе Салянік?

Д з е р в а е д. З вамі ж пабег...

Б у ш ц е ц *(узбуджана)*. Ротны загадаў далей не лезці... Зараз іх «кацюшамі» прычэсваць будуць. Гэй, Адуванчык! Вушы сёння цэлыя? Ты, партызан, паглядвай... Ці мала што ў іх наўме... Ох, вясёленькі бой быў!

Д з е р в а е д. Нашто ты яго?

Б у ш ц е ц. Каго?

Д з е р в а е д. Палоннага...

Б у ш ц е ц. Ён жа сядзеў на табе, пень! Які палонны? Вораг не здаецца — яго знішчаюць! Хто сказаў?

Д з е р в а е д. Я ў яго аўтамат выбіў...

Б у ш ц е ц. О-ё-ёй! Дайце яму крылы — анёлам будзе! *(Заціята.)* Мабыць, мала... яны вас білі...

Д з е р в а е д. Не табе казаць, як нас білі!

Б у ш ц е ц. Жаласнік, тваю дывізію! Ты яшчэ з Гітлерам у Берліне пацалуйся! Ладна! Пайду шукаць яшчэ аднаго праведніка... Толькі б выжыў, паскуда... Толькі б выжыў! *(Знікае ў праломе.)*

Д з е р в а е д *(хапае аўтамат)*. Ашалела дзеўка! Куды яна лезе? Куды?! *(Крычыць.)* Паўзі, дурная! Лажысь! *(Часануў доўгай чаргой у акно.)*

У адказ загрукатаў нямецкі аўтамат.

*(Страляе да тае пары, пакуль у акне не з'яўляецца Ліда. Кідае аўтамат, хапае дзяўчыну, цягне ў будынак.)* Што ў цябе ў галаве, прыпадачная?!

Л і д а. Невідзімкі, дзед. Невідзімкі ў галаве... Дзе Лёнька?

Д з е р в а е д. Лёня!

А д у в а н ч ы к. Ну што?

Л і д а. Ты жывы?

А д у в а н ч ы к. А ты не бачыш?

Л і д а. І я жывая... *(Корпаецца ў санітарнай сумцы, дастае некалькі плітак шакаладу.)* Вось я табе прынесла трафейнага. У бліндажы знайшла...

Д з е р в а е д. Што ты будзеш рабіць!

Л і д а. Еш, Лёнька... А я пабягу... Параненыя там. Сёння нешта параненых шмат... *(Падыходзіць да Дзерваеда.)* Дзед, гэта праўда, што сэрца заўжды бяду чуе?

Д з е р в а е д. Праўда...

Л і д а. Нуда мяне смокча апошнія дні... Аж мутарна... *(Шэптам.)* Дзед, родненькі, паберажыце вы яго! Гэта ратунак мой, маё збавенне...

Д з е р в а е д. Ідзі, Лідка... Усё будзе добра...

Л і д а *(падышла да Адуванчыка)*. Лёнька...

А д у в а н ч ы к. Што?

Л і д а. Нічога... Я пайду...

А д у в а н ч ы к. Ідзі...

Л і д а. Ты б хоць дзякуй сказаў...

А д у в а н ч ы к. Дзякуй...

Л і д а *(правяла рукой па яго валасах)*. Як у цябе павязка?

А д у в а н ч ы к. Нічога. Добра.

Л і д а рэзка павярнулася і пабегла ў пралом. Адуванчык падыходзіць да Дзерваеда.

Дзед, шакалад будзеш?

Д з е р в а е д. Табе маці сніцца, Лёнька?

А д у в а н ч ы к. Сніцца, а што?

Д з е р в а е д. Падумаеш дрэнна пра жанчыну — праклянеш сваю маці...

А д у в а н ч ы к. Я нічога не думаю!

Д з е р в а е д. То добра...

А д у в а н ч ы к. А да чаго ты гэта?

Д з е р в а е д. Так...

У праломе з'яўляецца С а л я н і к.

С а л я н і к. Як вы тут?

Д з е р в а е д. Чакаем...

С а л я н і к. Дзякуй Богу, у нас усе цэлыя... На левым фланзе дрэнна... Там у іх дот быў. Пятрок, чаму яны не скараюцца? Канец жа... Усё адно канец.

Д з е р в а е д. Чаму д'ябал Богу не скараецца? Таму што — д'ябал...

З'яўляецца Б у ш ц е ц. Падыходзіць да Саляніка.

Б у ш ц е ц. Пакажы аўтамат...

С а л я н і к. Нашто?

Б у ш ц е ц. Пакажы аўтамат, сволач!

Д з е р в а е д. Чаго ты?

Б у ш ц е ц. Не лезь, партызан!

С а л я н і к *(падае аўтамат)*. На...

Бушцец бярэ аўтамат, дастае з яго дыск. І раптам з маху б'е Саляніка па твары.

Б у ш ц е ц. Паскуда!

Д з е р в а е д. Ты што робіш?!

Б у ш ц е ц. На, зірні, усе патроны цэленькія, змазка свежая. Ніводнага разу, сука, за атаку не стрэліў... Мы павінны! Ён чысценькі, а мы — чэрці! Ён на беражку пастаіць, а нам за яго ў крыві купацца?!

С а л я н і к. А табе гэта падабаецца...

Б у ш ц е ц. Праз цябе, гадаўка, лёг Мішка Гальчанскі, Якавенка, Варонін і ўсе астатнія... *(Трасе дыскам.)* Гэтыя кулі, можа, ад іх смерць адвялі б...

С а л я н і к. З імі я заўжды побач быў... Ні за іх, ні за цябе ніколі не хаваўся... Не мая віна, што...

Б у ш ц е ц. Не твая? *(Спрытна забівае дыск у аўтамат.)* Ану, станавіся да сцяны!

А д у в а н ч ы к. Ты што?! У штрафбат захацеў?

Б у ш ц е ц. Я з сорак першага ў штрафбаце! Станавіся!

С а л я н і к. Не рабі гэтага, Бушцец... Прашу цябе... Не бяры і гэтага на сваю душу... Хопіць.

Б у ш ц е ц. Не клапаціся пра нашы душы. Ідзі да сцяны!

С а л я н і к. Як хочаш... *(Ідзе.)*

А д у в а н ч ы к *(у адчаі)*. Дзед!!!

С а л я н і к. Толькі я адвярнуся... Ладна?

Б у ш ц е ц. Ну не! Мішку Гальчанскаму ў твар стралялі...

С а л я н і к. Як хочаш...

Бушцец падымае аўтамат.

Д з е р в а е д *(цяжка)*. Пакладзі!

Б у ш ц е ц. Што?

Д з е р в а е д. Пакладзі аўтамат на зямлю...

Б у ш ц е ц. Шкада? Табе шкада?! А ты ўспомні, як тваіх палілі... Што рабілі з тваёй Мар'яй?! Як тваё дзіця пяклося на сучку з яблыкамі! Ён у іх не хоча страляць! Чаго глядзіш?!

Д з е р в а е д. Пакладзі аўтамат на зямлю...

А д у в а н ч ы к. Сяргей, кінь! Ну яго к чорту, не трэба... Супакойся... Я табе сёння сваю порцыю наркомаўскай аддам...

Д з е р в а е д *(да Саляніка)*. Адыдзі ад сцяны... Не корчы з сябе... На Хрыста ты не падобны... *(Да Бушцяца.)* А ты пакладзі аўтамат...

Салянік адыходзіць ад сцяны. Бушцец стаіць нерухома.
З'яўляецца Д у г і н.

Д у г і н. Ты што, аглух? Кінь зброю!

Бушцец шпурнуў пад ногі аўтамат і, цяжка дыхаючы, прысеў на друз.

Атака яшчэ не скончылася, хлопчыкі... Што такое?

Усе маўчаць.

*(Злосна.)* Што такое, я пытаюся, дзед?!

Д з е р в а е д. Нічога. Пагаварылі...

Д у г і н *(падымае аўтамат)*. Чый?

С а л я н і к. Мой... Я не страляў...

Д у г і н. Не чую...

С а л я н і к *(крычыць)*. Я не страляў! І раней не страляў! Верую я!

Д у г і н. Вось цяпер чую... *(Паўза.)* А гэта трыбунал, Мацвей...

С а л я н і к. Я ведаю...

Д у г і н. Толькі зараз даведаўся?

С а л я н і к. Не трэба, старшына... І раней знаў... Я грэшны, слабы чалавек...

Д у г і н. Значыць, зброю ўсё-ткі ўзяць узяў... І думаў якнебудзь ціхай сапай да канца вайны пратупаць... І перад Богам чыст, і людзі задаволены... І вашым і нашым... Але Бог шэльму меціць... Не атрымалася...

С а л я н і к. Я ў атакі разам з табой бегаў, старшына... Не хаваўся...

Д у г і н. На перадавой не схаваешся, Мацвей... Дзед, дай махоркі... *(Падыходзіць да Дзерваеда, пачынае круціць цыгарку.)* Што ж нам, бедным, рабіць? Га, партызан? Чалавек пад трыбунал пойдзе, а нам з Гітлерам трэба да канца разлічыцца... *(Закурыў, падышоў да Саляніка.)* Як думаеш: Боскае пракляцце і смяротны грэх на нашым Дзерваедзе ляжаць?

С а л я н і к. Я вам не суддзя...

Д у г і н. Я не казаў, каб ты нас судзіў. Я толькі спытаўся. Як ты думаеш?

С а л я н і к. Бог раз і назаўжды сказаў: не ўбій... Нікога! Нідзе! Ніколі! Нізашто! А чалавек, да крыві прывыкшы, адразу выйсце знайшоў: а калі хто супраць Бога? Значыць, можна! А калі не тымі пальцамі хрысціцца? Можна! А калі ерэтык? На касцёр яго! Хто забівае «во славу Божию», гэткі ж забойца, як і той, хто забівае за кашалёк! Бог сказаў: не ўкрадзі! А калі крадзенае? Можна! Святое дзела! Не пажадай жонкі бліжняга... А ў

мяне любоў! Можна! Што нам святое ні скажы — мы ўсё перакруцім, пераверцім і падгонім пад сябе... Не жыццё, не абставіны прымушаюць нас грашыць, а похаць душы нашае...

Д у г і н. Амінь?

С а л я н і к. Не трэба...

Д у г і н. Хто ў цябе дома застаўся, Мацвей?

С а л я н і к. Бацька, маці, жонка і дзеці...

Д у г і н. Усе жывыя?

С а л я н і к. Дзякуй Богу...

Д у г і н *(дагаворвае за яго)*. ...які нашымі рукамі, крывёй, грахом нашым не пусціў звера ў твой дом... Лёгка быць святому, Мацвей... калі ты адзін, у пустыні! У мяне, можа б, і хапіла сілы здохнуць з голаду, а чужога не ўзяць... А калі побач малое дзіця з голаду памірае? Тады што? Глядзець і думаць пра «не ўкрадзі»?!

С а л я н і к. Папрасі!

Д з е р в а е д. А не дадуць?..

С а л я н і к. Тады ўкрадзь...

Д у г і н. Ага!

С а л я н і к. Але ніколі не думай, што зрабіў добра...

Д у г і н. А калі прыйдуць у мой дом і на вачах у мяне заб'юць майго бацьку, раскрыжуюць маці, згвалтуюць сястру... Што мне рабіць? Папрасіць? Адуванчык, што твая маці ў іх прасіла: «Паночкі, не страляйце дзетак больна»? І што?!

Бушцец, як у сне, трасучыся, пачынае падымацца, сціскаючы аўтамат.

*(Не паварочваючыся да яго.)* Табе было сказана: пакладзі аўтамат на зямлю!

Бушцец сеў.

Дык што ж мне, грэшнаму, Бог параіць, Мацвей?

Салянік маўчыць.

Правільна... Забі, але не думай, што гэта добра. Дык я і без Бога ведаю, што гэта дрэнна... Ты колькі на фронце? А я забіваю з сорак першага! І з сорак першага знаю: не ў кожным немцу сядзіць Гітлер... Большасць з іх няшчасныя, простыя людзі... Але я буду страляць! І біць трапна! Да канца! Таму што ваюю супраць д'ябла! Праўда, ён у Берліне, але тут, у акопах, яго анёлы... Як там у вас: ці адракаешся ад д'ябла і анёлаў яго... Адракаюся!

С а л я н і к. Ім таксама кажуць, што з імі Бог... А мы д'яблы...

Д у г і н. Ма-аленькая розніца ёсць. Я не праліў ні кроплі нявіннай крыві...

С а л я н і к. Загадаюць — пральеш.

Д у г і н. Не!!! Сустрэну, партызан, дзяцей тых, хто паліў тваю Мар'ю, — я іх не зачаплю! Руку сабе да локця адсяку, але не зачаплю! Не ўбій!.. Яно ў яго было... *(Паказаў на Дзерваеда.)* Калі жонку з дзіцем на смерць аддаў, каб іншых не забілі... Ты думаеш, яму кара Гасподня страшная? Ды ён ужо быў у пекле. Тут, на зямлі...

Д з е р в а е д. Не трэба так, старшына...

Д у г і н. Трэба! *(Да Саляніка.)* Дай запалку. Патухла... *(Зноў прыкурвае. Паўза.)* Усё! Пагаварылі, і досыць... Зараз артпадрыхтоўка... Пойдзем далей... Раней сядзем — раней выйдзем... *(Вельмі проста.)* Бяры аўтамат, Мацвей...

Салянік стаіць нерухома.

Бяры...

Салянік маўчыць. Паўза. Дугін дастае з аўтамата дыск.

Хлопцы, у каго патронаў мала?

Д з е р в а е д. У мяне...

Д у г і н. На, дзед... *(Аддае дыск Дзерваеду, а пусты аўтамат Саляніку.)* Ротны з зампалітам у суседнім будынку... Здай зброю і пра ўсё далажы... Мне некалі. Зараз атака... Малы, завядзі яго...

Б у ш ц е ц *(хрыпата)*. Я завяду.

Д у г і н. А мабыць, і не трэба... Ты ж сам, Мацвей, дойдзеш? Праўда?

С а л я н і к. Дайду... Не насі на мяне злосць...

Д у г і н. Будзь здароў.

С а л я н і к пайшоў у пралом. Дугін падыходзіць да Бушцяца.

Устаць!

Б у ш ц е ц. Што? *(Падхапіўся.)*

Д у г і н. Ты хто? Вярхоўны Галоўнакамандуючы? Пракурор? Суддзя, каб чалавека да сценкі ставіць?

Б у ш ц е ц. Я — франтавік! Я маю права...

Д у г і н. Тады ў камендацкі ўзвод шуруй! А ў маім аддзяленні ніхто перад носам зброяй махаць не будзе! Усёк?

Прарэзлівы посвіст. Усе падаюць на падлогу. Бліскавіца на ўвесь пралом. Выбух. Пыл. Цішыня. Байцы падымаюць галовы.

А д у в а н ч ы к. Нічога сабе дзеўбанула... *(Падымаецца, падыходзіць да Дугіна.)* Старшына, ну на які д'ябал трэба было яго з абозу браць?..

Д у г і н. Людзей не было. Вышыню браць трэба... і маўчы!

А д у в а н ч ы к. Я маўчу.

У праломе, без каскі, шэры ад пылу, скурчыўшыся, з'яўляецца С а л я н і к.

Д у г і н. У каго ёсць пакет? Дайце пакет!

Д з е р в а е д. Зараз!

С а л я н і к. Не трэба, хлопцы... Нічога не трэба... Даруйце мне...

Д у г і н *(да Адуванчыка)*. Збегай за Лідкай... Яна на КП...

А д у в а н ч ы к знікае ў праломе.

С а л я н і к *(да Бушцяца)*. Даруй, Сяргей... Праўда твая... Толькі ты спыніся... калі можаш... Падыдзі, Пятрок...

Дзерваед падыходзіць.

Д з е р в а е д. Што, Мацвей? Што?

С а л я н і к. Адпусці мне грахі мае...

Д з е р в а е д. Што ты! Не веру я... Не веру...

С а л я н і к. У Бога можна не верыць, трэба жыць па ім...

Д з е р в а е д. Ты не бойся, Мацвей, не бойся...

С а л я н і к. Я не баюся.. На ўсіх нас на зямлі адна душа... Тыя, хто мучае, забівае, — пойдуць па слядах пакутнікаў, па жыцці ахвяр сваіх... Пекла тут... На зямлі... І ачышчэнне чалавека... Госпадзі, што ж Ты з намі робіш? Што ж Ты робіш?

Прыбягаюць А д у в а н ч ы к і Л і д а.

Л і д а. Зараз, зараз, дзядзька Мацвей... *(Корпаецца ў сумцы.)* Што гэта ты?

С а л я н і к. Не трэба, дачушка... Пасядзі так. Памаўчы...

З кароткім шыпеннем над будынкам праносяцца снарады гвардзейскіх мінамётаў.

Д у г і н. Пачалося! Рыхтуемся, хлопцы... Чакайце чырвонай! Артналёт кароткі будзе... Адуванчык! Памажы тут...

А д у в а н ч ы к. Што тут памагаць?

Д у г і н *(злосна)*. Рабі, што сказана!!

Дугін, Дзерваед, Бушцец падбеглі да вокнаў, чакаюць.

Л і д а. Дзядзька Мацвей, ну што мне зрабіць? Што мне зрабіць?

С а л я н і к. Заспявай...

Л і д а. Што?

С а л я н і к. Што хочаш... Заспявай, Лідка... Жаночая песня — малітва... Пра косы ведаеш? Гэта... ой, чыё ж та... поле... *(Заціхае.)*

Л і д а. Не ведаю...

С а л я н і к. Усё адно заспявай...

Л і д а. Не ведаю!

У праломе з'яўляецца Ж а н ч ы н а з д з і ц е м.
І палілася чыстая ціхая песня:

Ой, чыё ж та поле,
Чые ж та пракосы?
Чыя ж та дзяўчына
Распусціла косы...

Крывавым заравам успыхнула ракета.

Д у г і н. Пайшлі, мужыкі! Лапаткі ў рукі — пакажам ім кузькіну маць! Ура-а-а!!!

Усе выскокваюць праз вокны. Грознае, страшнае «ўра» пакацілася над зямлёй, перарасло ў крык-стогн «а-а-а». Стрэлы, выбухі, тупат тысяч ног па зруйнаванай зямлі.

Ой, чыё ж та поле,
Чые ж та пра...

Песня абрываецца.

*З а ц я м н е н н е*

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Руіны рачнога вакзала. Бой грыміць недзе далёка. Мокры да апошняе ніткі, сядзіць на камянях А д у в а н ч ы к. Есць размоклы шакалад і горка плача. Каля сцяны сушыцца Д з е р в а е д.

А д у в а н ч ы к. Дзед, чаму яна ўтапілася? Я плаваць не ўмею і выплыў... Чаму я выплыў? Я ж вады баюся... У плыт як дасць — у яе толькі калені мільганулі... А я выплыў... Ой, сволачы! Ой, гады... Ну, чаго ты маўчыш?

Д з е р в а е д. А ты паплач... Яно нічога... Паплач... Табе трэба плакаць...

А д у в а н ч ы к. Яна прыгожая была? Га, дзед? Ліплі ж усе да яе...

Д з е р в а е д. Прыгожая...

А д у в а н ч ы к. А я падсмалены і пакусаны... Чаго ж яна так да мяне... Я ёй пра цыганку расказаў... Пасмяялася, а потым рукой вось так правяла... Я, кажа, і ад вады на цябе закляцце зраблю...

Д з е р в а е д. Баба што хочаш можа... Калі душой любіць... Гэта сіла...

А д у в а н ч ы к. А можа, яна гэтым закляццем усе свае сілы аддала? Каб я жыў?

Д з е р в а е д. Можа...

А д у в а н ч ы к. Нарадзіць хацела... Я, кажа, Лёнька, ад цябе колькі змагу — столькі нараджу... Колькі на руках у мяне памерла... І колькі сама забіла... Столькі і нараджу... Тады душа супакоіцца... А чаго ў яе душа неспакойная была? Фрыцаў жа забівала...

Д з е р в а е д. Бабе дзяцей трэба няньчыць, а не...

А д у в а н ч ы к. Цяперака мне вады можна і не баяцца...

Д з е р в а е д. Можна...

А д у в а н ч ы к. Хочаш шакаладу?

Д з е р в а е д. Давай...

Без гімнасцёркі, з кацялком у руках падыходзіць Д у г і н.

Д у г і н. Ідзіце да кухні... Кашу ўжо даюць...

Д з е р в а е д. То добра...

Д у г і н. Там і абсушыцеся... Чаго цябе трасе, малы? Застудзіўся?

А д у в а н ч ы к. Застудзіўся...

Д з е р в а е д. Пайшлі, Лёнька... Што б там ні было, а каша — першае дзела...

Д у г і н. Дзед, хочаш грамульку для сугрэву душы...

Д з е р в а е д. Не хачу...

А д у в а н ч ы к. Дай мне! *(Бярэ ў Дугіна біклагу, робіць некалькі адчайных глыткоў, кашляе, закусвае шакаладам.)* Пайшлі, дзед...

Адыходзяць. Дугін сядае на зямлю і, заціснуўшы паміж каленяў кацялок, есць салдацкую кашу. Падыходзіць Л е й т э н а н т. Новенькая гімнасцёрка, новенькая фуражка, новенькія боты. Адным словам, з іголачкі. Нават і твар, здаецца, з іголачкі.

Л е й т э н а н т. Тут першы ўзвод, баец?

Д у г і н. Тут...

Л е й т э н а н т. Я са штаба дывізіі... Дзе камандзіра знайсці?

Д у г і н. Я камандзір...

Л е й т э н а н т *(прысеў побач)*. Слухай, у цябе тут служыць такі Дугін... Як ён?

Д у г і н. Ваюе...

Л е й т э н а н т. Ты за ім нічога такога не заўважыў?

Д у г і н. Ладна, лейтэнант, не будзем у кошкі-мышкі гуляць... Дугін я. Што я павінен быў за сабой заўважаць?

Л е й т э н а н т *(ніякавата крэкнуў)*. Та-ак... Тады пару пытанняў да вас, старшына...

Д у г і н. Давай... Толькі я кашу даем... Галодны як сабака.

Л е й т э н а н т. Еш, еш...

Д у г і н. Ты, калі хочаш, таксама да кухні падыдзі... У нас добрая каша сёння...

Л е й т э н а н т. Не, дзякую, я ўжо снедаў.

Д у г і н. Ну, глядзі...

Есць кашу. Лейтэнант назірае за ім.

Л е й т э н а н т. З якога года ваюеце?

Д у г і н. З сорак першага...

Л е й т э н а н т. І ў якім званні пачалі вайну?

Д у г і н. Старшы палітрук...

Л е й т э н а н т. Аднак вы выраслі... Такі малады і ўжо старшына... Як гэта так ліха ад старшага палітрука да старшыны?

Д у г і н. Ты ведаеш, што ў сорак першым тварылася?

Л е й т э н а н т. Адступалі... часова...

Д у г і н. Ды не адступалі мы, а ўцякалі...

Л е й т э н а н т. Не ўсе, канечне...

Д у г і н. Ага... Хто пад гусеніцы іх танкаў трапіў, канечне, не ўцёк... Супраць лома няма прыёма... Два месяцы быў у акружэнні, выйшаў са зброяй, праверка — радавым у строй... Пад Масквой узвод далі, потым роту, потым зноў у радавыя...

Л е й т э н а н т. За што?

Д у г і н. Вышыню не ўзяў. Потым яе два батальёны бралі, а я павінен быў з ротай узяць... Напалову выбітай... Пад Сталінградам званне вярнулі, пад Курскам разжалавалі... Падонка ў расход пусціў. У адным сяле жанчыну мардаваў... Яна там жыла з некім... ці то са старастам, ці то з немцам... Чорт яе ведае! Дык ён яе і яе дзіцёначка... Адным словам, самасуд атрымаўся... Добрага байца за нямецкую пасцілку хлопнуў. І каяцца не стаў... У цябе закурыць ёсць? Маё ўсё вымакла на пераправе.

Лейтэнант дастае пачак папярос. Дугін бярэ адну.

«Казбе-ек»... Даваенным пахне...

Л е й т э н а н т. Далей...

Д у г і н. Далей усё нармальна... Змыў віну крывёй... Пасля штрафбата далі аддзяленне... Цяпер замяшчаю ўзводнага...

Л е й т э н а н т. Біяграфія... Куды ні кінь — адусюль пакрыўджаны.

Д у г і н. Вайна, лейтэнант... Крыўдзіцца пасля Перамогі будзем. І вось што: хопіць цямніць! Што трэба — пытайся! Не строй з сябе Шэрлака Холмса...

Л е й т э н а н т. Спакойна, спакойна, старшына... Я, здаецца, пакуль што вышэй па званні...

Д у г і н. Даўно з вучылішча?

Л е й т э н а н т. Нядаўна.

Д у г і н. Яно і відаць. Пытайся...

Л е й т э н а н т. У вас ёсць жонка?

Д у г і н. Ёсць...

Л е й т э н а н т. А пісьмы ад яе?

Д у г і н. Няма. Ну, хопіць...

Лейтэнант дастае з сумкі канверт.

Л е й т э н а н т. Скажыце, старшына, як магло стацца, што ў той час, калі ваша дывізія стаяла на фарміраванні, была далёка ад фронту, ваша жонка, Вера Іванаўна Дугіна, атрымала пісьмо?.. Вось гэта во... На штабным бланку, за фальшывым подпісам фальшывага камандзіра... У ім паведамляецца, што... цытую: «Дугін Уладзімір Паўлавіч загінуў смерцю храбрых у баях за Радзіму і павахаваны ў брацкай магіле каля сяла Зельва». А ёсць такое сяло?

Д у г і н. Ёсць. І брацкая магіла ёсць.

Л е й т э н а н т. Раю казаць праўду, старшына...

Д у г і н. Я заўсёды праўду кажу... Пісьмо адпраўлена па маёй просьбе... Хто адпраўляў — не скажу! А ўвогуле так: бланк украў і напісаў сам... Нашто? Любоў у мяне, лейтэнант, разумееш? Сустрэў у шпіталі адну сястрычку, ну і закруцілася ў нас з ёй... Вырашыў: дзяцей няма, яна маладая... Не прападзе, знойдзе сабе... Ну і каб з маху абрэзаць усё...

Л е й т э н а н т. Стоп, стоп, старшына... Натхнёная хлусня — гэта талент. Вы ў гэтым — круглы нуль... Вочы выдаюць. Мітусяцца... Няма ж ніякай сястрычкі... Ды і не было. А можа, усё прасцей? Абрэзаць усе канцы і да іх махнуць.

Д у г і н. Да каго «іх»?

Л е й т э н а н т. Праз нічыйную паласу...

Д у г і н *(пасля паўзы)*. Лейтэнант, я куру тваю папяросу... Скажы дзякуй Богу... А так бы ты праехаўся ў сваёй новенькай гімнасцёрцы па зямлі...

Л е й т э н а н т. Добра. Больш я нічога пытацца не буду. Але скажы: як ты, франтавік, мог... *(Патрос пісьмом.)* Прыкрывацца ад чаго б там ні было тымі, хто ад Масквы да Германіі ў брацкіх магілах ляжыць? Прыкрывацца іх светлымі імёнамі, светлай памяццю тых, каго, можа, і сам хаваў... Як ты змог? Сволач ты, старшына! Гэта я не ад сябе кажу... Твая праўда, я толькі з вучылішча, пораху не нюхаў... Не мне цябе судзіць... Гэта я табе ад свайго бацькі! Ён пад Мінскам ляжыць. Дарэчы, у брацкай таксама...

З'яўляецца В е р а. Прыгожая жанчына ў форме ваенурача трэцяга рангу.

Гэта я табе і ад тваёй жонкі...

В е р а. Ад мяне не трэба, лейтэнант...

Л е й т э н а н т. Даруйце... *(Пайшоў.)*

В е р а. Дай пісьмо... *(Лейтэнант аддае.)* Пачакай мяне ў машыне, калі ласка... Я зараз прыйду...

Л е й т э н а н т. Добра... *(Пайшоў.)*

В е р а. Добры дзень, Валодзька...

Д у г і н. Добры дзень, Вера...

В е р а. Ты не бойся, Валодзька... Пра гэта *(паказала пісьмо)* ніхто не ведае... Лейтэнант мой сябар... Нікому не скажа. Не хвалюйся.

Д у г і н. Я не хвалююся...

В е р а. Ты нават можаш забраць яго. Бяры, бяры...

Дугін бярэ пісьмо.

І каб цябе не мучыла сумленне — скажу: я па табе не плакала... Як бачыш, не пасівела... Жанчыны, Валодзька, бяду прадчуваюць... Як звяры землетрасенне... Асабліва тыя, хто любіць... А я цябе люблю... Прачытала гэта і падумала: глупства нейкае, бязглуздзіца! І лягла спаць. І пакуль не заснула, шаптала ўсё: «Прысніся мне, Валодзька, прысніся...» Так і заснула. І ты мне прысніўся... Стаіш сярод белай чаромхі, памятаеш, мы пасля вяселля да мамы ездзілі? Было шмат чаромхі.

Д у г і н. Памятаю...

В е р а. Дык вось, ты стаіш і голенькага хлопчыка на руках трымаеш... Я ведаю, што гэта сон і што голы хлопчык у сне не к дабру... Пытаюся ў цябе: «Ты жывы?» Ты сумна-сумна галавой кіўнуў. Маўляў, жывы... А я чамусьці пытаюся: «Дзе ты загінуў?» Ты на куст чаромхі паказваеш... А пад тым кустом стол стаіць. Папера нейкая. Ты гэта на стале пісаў?

Д у г і н. На тумбачцы.

В е р а. Я запыт на наступны дзень зрабіла... Але дывізію вашу расфарміравалі ўжо... Канцоў не знойдзеш... Ты і гэта ўлічыў... Але я знайшла цябе...

Д у г і н *(цяжка)*. Ідзі, Вера... Даруй і ідзі...

В е р а. Табе не трэба прасіць прабачэння... І той, хто палюбіць, і той, хто разлюбіць, — аднолькава невінаватыя... Я толькі хацела паглядзець табе ў вочы, Валодзька... І ўсё.

Д у г і н. Глядзі.

В е р а. Хто яна?

Д у г і н. Жанчына.

В е р а. Як завуць?

Д у г і н. Лідка.

В е р а. Няпраўда... Калі б яна была, ты б сказаў Ліда...

Д у г і н. Яна... проста маладзенькая. Ідзі, Вера... Прашу цябе...

В е р а *(гледзячы ў вочы, спалохана)*. Госпадзі... Валодзька... Ты ж любіш мяне...

Д у г і н *(працягвае пісьмо)*. Любіў.

В е р а. Можа, табе што-небудзь пра мяне напісалі?.. Чатыры гады расстання... Потым фронт, шпіталі... Параненыя, скалечаныя, пакінутыя... Усялякае было... Але душа мая чыстая... І каханне маё чыстае... Клянуся табе! Ты чуеш?!

Д у г і н. Забяры пісьмо!!! У ім усё правільна...

В е р а *(амаль істэрычна)*. Растлума-а-ач!!

Д у г і н. У сорак першым мы выходзілі з акружэння... Знясіленыя голадам ушчэнт. Той, хто не мог ісці далей ці быў паранены, — цішком сыходзіў у хмызняк. Таму што не толькі несці каго-небудзь, а нават весці пад руку ні ў кога не было сіл. Пачнеш дапамагаць — ляжаш сам... Вось тады і ўзнікла такая маўклівая дамоўленасць: скончацца сілы — у лес! Прастрэлілі ногі — у лес! Палкавы камісар падаў прыклад. Падазваў мяне і кажа: «Слухай, палітрук: калі са мной што якое — павядзеш атрад. Не спыняцца! Што б ні здарылася! Паўтары». Я паўтарыў... Ноччу ён знік... З акружэння выйшла сорак шэсць чалавек. Астатнія ў лесе... Па аднаму. Лічы, што і я сышоў у гэткі ж лес... Гэта ўсё, што я магу табе сказаць.... Ты ні ў чым не вінаватая перада мной, а я перад табой... Вайна... Скончыцца, праклятая, — выходзь замуж...

В е р а. Што ты кажаш?!

Д у г і н *(упарта)*. Выходзь замуж і як мага больш нарадзі дзяцей... Колькі зможаш! Нас павыбівала к чортавай матары, а народ павінен быць моцным. Можа, яшчэ якую-небудзь бяду яму давядзецца ўзяць на свае плечы... Ідзі, Вера...

В е р а *(праз слёзы)*. Не разумею...

Д у г і н. Супакоішся і зразумееш...

Прыбягае Б у ш ц е ц.

Б у ш ц е ц. Старшына, танкі!!!

Д у г і н. Дзе?

Б у ш ц е ц. З-за ўзгорка па беразе пруць!

Д у г і н. Можа, нашы?

Б у ш ц е ц. Якое там?! «Фердынанды»!

Д у г і н. Ідзі, Вера, ідзі... *(Да Бушцяца.)* Пяхоты не відно?

Б у ш ц е ц. Здаецца, не...

В е р а. Валодзька, мілы... Даруй мне! Даруй! Я ўсё жыццё перад табой на каленях стаяць буду!!!

Д у г і н. Лейтэнант, забяры яе!

Прыбягае Л е й т э н а н т.

Дуй хутчэй адгэтуль! Зараз горача будзе! Заскочыш на КП палка! Скажы, каб агнём падтрымалі...

Л е й т э н а н т. А што такое?

Д у г і н. Танкі аднекуль прарваліся!

В е р а. Валодзька!

Д у г і н *(кідаецца да пралому).* Узво-од! У каго ёсць гранаты — звязкі, звязкі рыхтуйце! Астатнія — у будынак... Жмі, лейтэнант!

Л е й т э н а н т. Ёсць!

В е р а *(крычыць).* Я люблю цябе, Валодзька! Я люблю цябе!

Лёскат гусеніц танкаў.

*З а ц я м н е н н е*

Зноў руіны нейкага будынка. Разбітая мэбля, каля сцяны на століку патэфон. На падлозе разбіты бюст Гітлера. Ціха. Грымотаў вайны не чутно. У будынку размясцілася на адпачынак наша аддзяленне. Б у ш ц е ц курыць, Д з е р в а е д зашывае нешта на гімнасцёрцы, А д у в а н ч ы к сноўдаецца па будынку.

Д з е р в а е д. А старшыну, мабыць, ад нас забяруць... У штаб дывізіі выклікалі...

Б у ш ц е ц. Які ён старшына?

Д з е р в а е д. Старшына... Ён старшына і ёсць...

Б у ш ц е ц. Вайна канчаецца... Што рабіць?

Д з е р в а е д. Жыць...

Б у ш ц е ц. Жыць... *(Падышоў да кавалкаў бюста, пастукаў па галаве прыкладам.)* Праўду кажуць, што ён артыстам быў?

Д з е р в а е д. Хто?

Б у ш ц е ц. Фюрэр...

Д з е р в а е д. Кажуць...

Б у ш ц е ц. Устроіў спектакль... Слухай, а яго ж нехта і радзіў?..

Д з е р в а е д. Ну, вядома ж, не ў капусце знайшлі...

Б у ш ц е ц. І што адчувала гэта баба, калі радзіла яго?

Д з е р в а е д. Радасць...

Б у ш ц е ц. І грудзямі карміла?

Д з е р в а е д. Карміла, мабыць... А то як жа?

Б у ш ц е ц. І вось не захлібнуўся ж ад мацярынскага малака, паскуда... І радзімец яго не схапіў... Ой, сустрэць бы гэту ведзьму, калі яна жывая яшчэ... Ну чаго глядзіш?

Д з е р в а е д. Не крычы...

У гэты момант з другога пакоя выходзіць А д у в а н ч ы к. На ім вялікага памеру нязграбны генеральскі мундзір, фуражка з высокім верхам. З-пад казырка тырчыць толькі адзін нос. У руках лялька-галыш. Ціхенька падышоў да патэфона, паставіў пласцінку. Палілася песня. Не бравурная, а так... Просценькі нямецкі шлягер.

А д у в а н ч ы к *(блазнавата)*. Іх бін гойтэ дранг нах остэн!

Б у ш ц е ц *(азірнуўся, спакойна)*. Во дзіцёнак... *(І раптам узвіўся.)* Здымі!! Зараз жа здымі гэта, шчанюк!! Я каму сказаў?!

А д у в а н ч ы к *(спалохана скідвае фуражку і мундзір)*. Чаго ты?! Чаго затросся, псіх шалёны?!

Б у ш ц е ц падымаецца і выходзіць. Каля патэфона лёгка стукнуў прыкладам па пласцінцы. Песня захліпнулася.

Ідзі ў санбат! Табе лячыцца трэба... *(Паўза.)* Дзед, а я яго баюся. Калі заводзіцца, у яго вочы мутнымі робяцца... А тут генерал жыў... Генерала ўчора выкурылі... Мабыць, і дзеці ў яго былі... Бачыш, во лялька... *(Уздыхнуў.)* Каб Зоська не згарэла — ёй бы трафей прывёз... *(Запіхвае ляльку ў свой рэчмяшок.)* Дзед, а куды ты пасля вайны?

Д з е р в а е д. Не ведаю...

А д у в а н ч ы к. І я не ведаю... Дзед, а паедзем куды-небудзь разам? Га? Мы з Лідкай у Сібір дамаўляліся... Лясоў там! Звяр'я! Страляць навучыліся — на паляванне хадзіць будзем... Рыбу лавіць... Га?

Д з е р в а е д. Дадому трэба... У Максюткі... Я і магілкі сваім не зрабіў яшчэ...

А д у в а н ч ы к. Дадому не хачу. Хачу туды, дзе абсмаленых комінаў няма... Дзе ціха-ціха...

Уваходзіць Д у г і н. Ён у той жа засціранай гімнасцёрцы, але з новенькімі капітанскімі пагонамі. На грудзях Зорка Героя. Дзерваед і Адуванчык аслупянела падымаюцца.

Д у г і н *(жартаўліва)*. Вольна... Сам радавы...

А д у в а н ч ы к *(ашалела)*. Ёш тваю клёш! За што цябе так?..

Д у г і н *(сур'ёзна)*. За вайну...

А д у в а н ч ы к. Дай прымераць, га?

Д з е р в а е д. Гэта не мераюць, Лёнька... *(Падышоў да Дугіна, моцна пацінуў руку.)* Ну, то віншую... Гэта добра... Чэснае слова, рады...

Д у г і н. Дзякую, дзед...

А д у в а н ч ы к. Ды раскажы хоць!

Д у г і н. Выклікалі да камдзіва... Прыходжу. Па ўсім штабе шорах. Начштаба накінуўся: у чым ты прыйшоў?! Гімнасцёрка, бачыце, засціраная... Хацеў аднаго старшыну раздзець, каб я пераапрануўся... Пайшлі вы, кажу... Заходжу. А ў камдзіва маршал сядзіць.

А д у в а н ч ы к. Ідзі ты!

Д у г і н. Што ж ты, пытаецца, старшына, ад узнагароды бегаеш? Вайна ганяе, во і бегаю... Ну, раскажы, як танкі паліў... Я яму пра Маскву давай расказваць. Не тое, кажа... Я пра Ста-

лінград. Не тое! Я пра гэту рэчку праклятушчую, дзе нас «фердынанды» накрылі. Зноў не тое! Ну, тады, кажу, не па адрасу. Шукайце іншага. А пра Курск чаму не расказваеш, пытаецца? Пад Курскам мяне разжалавалі, што тут расказваць? Смяецца... Аказваецца, званне вярнулі адразу ж... Але шпіталь, перафарміраванне, усялякая катавасія — згубілася...

А д у в а н ч ы к. Гэта ж трэба! А ты столькі ў радавых хадзіў...

Д у г і н. А мы ўсе ў радавых... Ад маршала да цябе...

Д з е р в а е д. То добра...

Д у г і н. А потым Зорку дастае... У мяне ў вачах пацямнела... Я думаў, ордэн будзе... Гэта табе, капітан, і за Маскву, і за Сталінград, і за Курск, і за ўсю вайну... *(Задуменна і сумна.)* За ўсю вайну...

А д у в а н ч ы к. Ёлкі зялёныя! Герой... Слухай, старшына, цябе ж цяпер паважаць трэба...

Д у г і н. Паважай, паважай... А заадно збірайся, паедзеш у штаб дывізіі... Машына чакае.

А д у в а н ч ы к. Нашто?

Д з е р в а е д. Як нашто? Можа, і табе што-небудзь перападзе...

А д у в а н ч ы к. Не, сапраўды, нашто?

Д у г і н. Ім там тэлефаніст спатрэбіўся... Загадалі, каб...

А д у в а н ч ы к. Не паеду!

Д у г і н *(жорстка)*. Паедзеш!! Гэта я сказаў, малы... Усёк?

А д у в а н ч ы к *(плаксіва)*. Ну, за што, старшына? Што я табе зрабіў? Я ж прападу без вас...

Д у г і н *(прытуліў яго да сябе)*. Эх ты, Адуванчык... Дурань ты, дурань... Да начальства бліжэй будзеш... На вачах! Хутчэй медаль дадуць ці лычкі якія...

А д у в а н ч ы к. Не хачу я...

Д у г і н. Калі што якое, крыўдзіць пачнуць — скажы, што ў аддзяленні Дугіна ваяваў... Цэлы год...

Дзерваед сабраў рэчы Адуванчыка, падае.

А д у в а н ч ы к. Дзед, ну скажы ты... Колькі там тае вайны засталося? Цэлы я буду...

Д з е р в а е д. Едзь, Лёнька... Нічога, едзь...

Д у г і н. Давай, давай... Машына чакае... *(Дастае з кішэні шакалад.)* На шакаладу на дарогу...

А д у в а н ч ы к. Не хачу! Мог бы чарку паставіць за Героя...

Д у г і н. Бяры, што даюць! Ну і бывай, гвардзеец! *(Абдымае.)*

А д у в а н ч ы к. Ну, то бывайце... Калі што якое дзе-небудзь трохі не таго — ліхам не памінайце... Я вас... люблю... *(І каб да канца не расплакацца — выбег.)*

Д у г і н. Праводзь яго, дзед...

Д з е р в а е д. Ага... *(Пайшоў.)*

Д у г і н. І вось яшчэ... Там, каля калонкі, дзве нашыя жанчыны... Ну, рускія, з лагера... Прывядзі, накармі іх... Адна, здаецца, цяжарная...

Д з е р в а е д. Як?

Д у г і н *(амаль злосна)*. Ну, як жанчына цяжарная бывае?!

Д з е р в а е д. То ясна.

Д у г і н. У цябе знойдзецца што паесці?

Д з е р в а е д. Ды знайду... Ёсць трохі. Кансервы там, тушонка... А малы праўду кажа: магарыч з цябе, старшына... Выставіш ужо нам па грамульцы...

Д у г і н *(дастае з сумкі бутэльку)*. На, п'яніца... «Маскоўская»! Камдзіў павіншаваў.

Д з е р в а е д. О, то добра... Вечарком зазірні... На трох раздавім... Цяперака нас трое засталося... Сяргей, ты, я...

Д у г і н. Заўтра папаўненне прышлюць...

Д з е р в а е д. То добра...

Гудзе машына.

Д у г і н. Ды пачакай ты! Слухай, дзед, нешта мне сумна глядзець на цябе... Аж сэрца заходзіцца...

Д з е р в а е д. Чаго?

Д у г і н. Мар'я яшчэ ходзіць за табой?

Д з е р в а е д. Ходзіць...

Д у г і н. Давай я і цябе перавяду куды...

Д з е р в а е д толькі махнуў рукой і выйшаў.

*(Адзін.)* Ну што ж... Будзем яшчэ раз прымаць роту... *(Ідзе ў пралом.)*

Чуваць гук ад'язджаючай машыны.

Г о л а с А д у в а н ч ы к а. Бывайце, хлопцы! Я вас люблю-ю-ю!!!

Праз нейкі момант у будынак уваходзяць С т а р а я Ж а н ч ы н а і Л ю с ь к а. За імі Д з е р в а е д.

Ж а н ч ы н а. А вёска наша, салдацік, чыстая, вясёлая... Антанёва называецца... Чуў, можа?

Д з е р в а е д. Не... Я зараз, сядайце... *(Дастае з рэчмяшка хлеб, рэжа яго, адкрывае кансервы, да Люські.)* Я табе малака дам... У мяне тут згушчонка недзе была...

Ж а н ч ы н а. Вясёлая вёска... Над Нёманам стаіць... Вясной, у паводку, вада аж да парога падбіраецца... А на тым беразе шыро-о-ока, аж да самай пушчы...

Д з е р в а е д. Ешце... Толькі хапаць не трэба... Гэта я ўсё вам у дарогу аддам... І яшчэ таго-сяго назбіраю... *(Да Люські.)* Ну, не хапай ты так, я табе сказаў... Ты пажуй, пажуй... У цябе ж ніхто з рук не вырывае...

Ж а н ч ы н а *(есць)*. Смачна... Каўбасой пахне... Мы з маім старым добрыя каўбасы робім... Ці паверыш, аж да самага лета вісяць, адрэжаш, як свежыя... *(Есць.)*

Д з е р в а е д *(да Люські)*. Ну, усё... Пакладзі пакуль што... Пагаворым... Цябе як завуць?

Л ю с ь к а. Люська...

Д з е р в а е д. Адкуль?

Л ю с ь к а. Крынічанск... Гарадок такі невялікі...

Д з е р в а е д. Чуў, чуў... З лагера цяпер?

Л ю с ь к а. Былі ў лагеры... Паўгода таму баўэр адзін забраў... За свіннямі глядзелі... *(Усхліпнула.)* Цяжарная я, дзядзька...

Д з е р в а е д. Ну што ж... Дзела такое... Людзей пабіла шмат... Радзіць трэба... Дзела такое...

Л ю с ь к а. І нараджу!

Д з е р в а е д. А то як жа?.. На згушчонкі... Салодкая. Яно трэба...

Ж а н ч ы н а. Прыязджаў бы ты, салдацік, да нас у Антанёва... Дачка ў мяне вырасла... Ты ж адзін?

Д з е р в а е д. Адзін.

Ж а н ч ы н а. Дык і нявеста табе будзе... А вёска ў нас чыстая, вясёлая...

Д з е р в а е д. Што ты такое кажаш?

Л ю с ь к а. Памаўчы, дзядзька... Хай гаворыць...

Ж а н ч ы н а. О-о, Гальку ты маю не бачыў! Бывала, з бані прыйдзем, яна такая распараная, чыстая, свежым малаком пахне... Як памыецца — заўсёды свежым малаком пахне... А валасы ў яе! У Антанёва яе Вадзяніцай звалі... Русалка, значыцца... Я яе на камень стаўлю... Ля парога ў нас камень ляжыць... Таму што валасы ніжэй пят... І, як лён, мяккія-мяккія... Пастаўлю і грабянцом іх, грабянцом... А яна аж свеціцца... Сонца вечаровае ў валасах... Аж свеціцца... Прыязджай, салдацік...

Д з е р в а е д. Ты еш, еш...

Л ю с ь к а. Ты, дзядзька, не слухай... Нікога ў яе няма... Ні Антанёва, ні хаты, ні дачкі... У лагеры яны былі... Дачку ў дваццаты блок забралі... Блок такі ў лагеры быў... Яны там аперацыі вучыліся рабіць... І хваробы лячыць... Высокіх дзяўчат выбі-

ралі... Мяне ў той блок забракавалі: ногі тонкія і грудзей няма... А ім трэба, каб усё было... Гальку ўзялі... Сапраўды прыгожая была... Дык во ходзіць цяпер і каго ні сустрэне — за сваю Гальку сватае...

Д з е р в а е д *(да жанчыны)*. Цябе як завуць?

Ж а н ч ы н а. Наста... Наста з Антанёва... А дачку маю — Галька... Прыязджай, салдацік...

Д з е р в а е д. Я прыеду. Кончу вайну — і да вас у Антанёва...

Ж а н ч ы н а. А вёска ў нас чыстая, вясёлая... Каля кожнай хаты па крыніцы...

Д з е р в а е д. То добра... Ты толькі больш нікому не расказвай пра Гальку. А я прыеду... Гітлера кончым, і прыеду...

Ж а н ч ы н а. Ага...

Д з е р в а е д. Ешце... *(Да Люські.)* Ты хлебам, хлебам макай у згушчонку... Цяпер можна, калі жывот не забалеў... *(Дастае яшчэ хлеба.)* Гэта вам на дарожку... Нічога, дзеўкі! Нас не скруціш... І гэта перацерпім-перажывём... Нас б'юць, а мы жыта сеем...

Уваходзіць Б у ш ц е ц, несучы ў руках некалькі банак кансерваў, хлеб, канцэнтраты. Узбуджаны, вясёлы. І раптам нібы натыкаецца на нябачную сцяну. Пасунуўся назад, прыціснуўся спіной да сцяны. Стаіць здранцвела.

Д з е р в а е д *(да Люські)*. А ў цябе хоць хто-небудзь застаўся?

Л ю с ь к а. Расстралялі ўсіх... Мы партызанам медыкаменты ў лес перапраўлялі... Як яны даведаліся?

Д з е р в а е д. Значыць, нікога?

Л ю с ь к а. Нікога... Мужа ў армію з вяселля забралі... З папяровай кветачкай на грудзях... Забілі, мабыць... Як яны б'юць, дзядзька.. Як яны б'юць...

Д з е р в а е д. Яно нічога... Забываць трэба... Хутчэй забудзеш — лягчэй жыць будзе... А жыць трэба... Трэба жыць... А гэта... чый ён...

Бушцец нерухома стаіць каля сцяны.

Л ю с ь к а *(правяла далонню па жываце)*. Мой... Больш сказаць... няма чаго сказаць... ён пачаў жыць без любві, пад страхам і бяссільнымі слязьмі... Але без граху, дзядзька... Без граху!

Ж а н ч ы н а. А вёска ў нас чыстая, вясёлая... *(Есць.)*

Д з е р в а е д. А ты не плач... Бяды няма...

Л ю с ь к а. Можна праклінаць Бога, вайну, Гітлера, увесь свет, а яго і мяне... За што ж?.. Нам і так дасталася... Што

я толькі не рабіла! І ў халоднай вадзе сядзела, каб застудзіцца, і з лесвіцы знарок валілася, і... Што толькі не рабіла... А ён аднойчы сярод ночы пад сэрцам мяне пагладзіў... Знутры, па жываце... Як папрасіўся: не трэба, не вінаваты я, пусці мяне жыць... Я, я неяк супакоілася... Я ж са сваім нават не нацалавалася ўдосталь... З вяселля забралі... Толькі думала пра яго ды ў сне бачыла... У душы насіла... І гэта будзе яго дзіця... Яго. Душа мяне не асудзіць... Ні яго, ні мая... Людзі — хай. Душа не асудзіць...

Бушцец нерухома стаіць каля сцяны.

Д з е р в а е д. Які там суд? Ён твой... І ты яго нікому не аддавай.

Л ю с ь к а. Не аддам...

Д з е р в а е д. Зберажы ад усяго шалёнага свету...

Л ю с ь к а. Зберагу...

Д з е р в а е д. Навучы дабру і любові...

Л ю с ь к а. Навучу... *(Паўза.)* Дзякуй табе, дзядзька... Прыязджай да нас у Крынічанск...

Д з е р в а е д. Яно можна...

Ж а н ч ы н а. Крыніц у нас шмат... І Нёман вясной разліваецца шыро-о-ока...

Л ю с ь к а. Пойдзем, цётка Наста... *(Да Дзерваеда.)* Нас на зборным пункце чакаюць...

Д з е р в а е д. На згушчонкі... Еш патрохі... Яно трэба...

Л ю с ь к а. Дзякуй табе, дзядзька... Хай цябе куля абміне... Хадзем, цётка... *(Нізка пакланілася Дзерваеду.)*

Жанчына пакланілася таксама. Выходзяць. Бушцец як здранцвелы стаіць каля сцяны і не міргаючы глядзіць перад сабой. Дзерваед збірае рэшткі прадуктаў, заўважае Бушцяца.

Д з е р в а е д. Сяргей, хто гэта ў нас у роце з Крынічанска быў? Гураў ці Варонін?

Б у ш ц е ц *(хрыпіць)*. Я...

Дзерваеда як ударыла. Павольна-павольна падымаецца. Падыходзіць да таварыша. Паўза.

Д з е р в а е д *(ціха)*. Яно ўсё так... але дагнаць трэба... Не наша з табой гэта вайна, Сяргей... Не мы яе вынеслі, а яны... Бабы нашы... На іх яна лягла... У іх слязах і ў іх крыві Гітлер праклятны захлынуўся... У іх душах праўда вечная... І любоў. Калі б мне Мар'ю вярнуць... Каб толькі можна вярнуць.

У праломе з'яўляецца Ж а н ч ы н а з д з і ц е м.

Я б перад ёй да магілы на каленях хадзіў... Не мы ім, а яны нам дараваць павінны... За жудасць, якую перажылі... За страх і слё-

зы нявінныя, за смерць і пакуты, якія мы на сябе ўзяць не змаглі... За тое, што мы забіваем, а яны нараджаюць... Яно дагнаць трэба... Дзіцё, яно дзіцё... Нашае вады з крыніц пап'е, пад нашым сонцам пагрэецца, нашых песень наслухаецца — яно і нашым будзе... Нашы бабы добра спяваюць... Яно дагнаць трэба... Супакоіць...

Бушцец не зварухнуўся.

*(Крычыць.)* Дагані!!!

Б у ш ц е ц *(зрабіў рух, але, як падкошаны, апусціўся на падлогу)*. Не... магу... *(Таксама крычыць.)* Не магу!!!

Ж а н ч ы н а з д з і ц е м знікае.

*З а ц я м н е н н е*

Руіны нейкага будынка. Ноч. Скрыня з-пад снарадаў, на ёй газнічка, хлеб салдацкі, тры кружкі. Вакол скрыні сядзяць Д у г і н, Д з е р в а е д і Б у ш ц е ц. Ціха так сядзяць. Думаюць. І па ўсёй зямлі цішыня. Як вымерла ўсё. Дзерваед ціха-ціха спявае:

Ой, чыё ж та поле,
Чые ж та пракосы?
Чыя ж та дзяўчына
Распусціла косы...

Д у г і н. Дап'ём?

Д з е р в а е д. Можна...

Д у г і н. Давайце, хлопцы... За Перамогу... Цяпер можна... Сёння ці заўтра капітуляцыю падпішуць... Безагаворачную!! Будзьце жывы! *(П'е.)*

Дзерваед таксама выпівае. Бушцец сядзіць нерухома.

Чаго ты, Сяргей?

Б у ш ц е ц. Га?

Д у г і н. Пі...

Б у ш ц е ц *(бярэ кружку)*. Ціха... Як у магіле... Аж мутарна. *(Выпіў, ляпнуў кружкай па скрынцы. Раз! Другі! Трэці! Усё мацней, мацней, мацней.)*

Д у г і н. Хопіць псіхаваць!

Б у ш ц е ц *(кінуў кружку, да Дугіна)*. Ты ў арміі застанешся?

Д у г і н. Не... Здароўя няма...

Б у ш ц е ц. Дарэмна... З Зоркай пайшоў бы далёка... Куды дзявацца? Страляць умею... *(Дастае з-за спіны корцік.)* Біць пад левую лапатку — умею! *(Спрытна ўваткнуў нож у скрыню.)*

Гранату з дваццаці метраў у вядро закінуць змагу... Усё жыццё буду ўспамінаць вайну... Толькі вайну ўспамінаць...

Д з е р в а е д. Усё міне... Абы жыць...

Б у ш ц е ц. Нічога не мінае... *(Дражніць.)* «Абы жыць...» Капітан, хочаш, корцік падару? Пад Ленінградам здабыў... Ён на мяне замахнуўся, а я думаю: «Ого, які прыгожы!» Ды за руку! Ды сапёрнай лапаткай па шыі! Хочаш, падару?

Д у г і н. Давай... *(Бярэ корцік.)*

Д з е р в а е д. Малы пісьмо прыслаў...

Б у ш ц е ц. Што піша?

Д з е р в а е д. Медаль далі... Ну і прывет усім...

Б у ш ц е ц. Калі ж наступную чакаць?

Д з е р в а е д. Што?

Б у ш ц е ц. Вайну... Калі новы Гітлер народзіцца? І чаму так? Чаму ім вераць? Чым больш чокнуты, тым яму больш вераць...

Д у г і н. Хацеў, сволач, каб усе жылі, як яму хочацца... Як ён гэта бачыць... А не хочаш — трэба прымусіць! Страхам, агнём, куляй, канцлагерам... І народ за ім пайшоў...

Д з е р в а е д. Некалі людзі зразумеюць, што чужым хлебам заўсёды падавішся... Чужое сілай возьмеш — разлічышся... Не ты, дык твае дзеці, не дзеці, дык унукі... Гітлер во разлічыўся... Здох!

Б у ш ц е ц. Госпадзі, як ціха! Ёсць яшчэ гарэлка?

Д у г і н. Няма. Хопіць.

Д з е р в а е д. Сеяць трэба...

Б у ш ц е ц. Што?

Д з е р в а е д. Нічога...

Бушцец раптам засмяяўся.

Д у г і н. Чаго ты?

Б у ш ц е ц. Бачыш, колькі друзу? Колькі спаленага? Пабітага? Зруйнаванага па ўсёй зямлі?

Д у г і н. Ну...

Б у ш ц е ц. А калі і ў нашых душах тое ж... Га?

Д з е р в а е д. Адбудуем. Не прывыкаць. Абы трохі ціхага часу далі... Добраму чалавеку нічога не трэба... Абы ціхі час... Ён і хлебам накорміць усіх, і дзяцей вырасціць, і песню добрую складзе, і зямлю кветкамі засее... Дайце яму гэтую часіну! Не чапайце вы яго! Не дадумаліся людзі яшчэ, што на зямлі на ўсіх нас адна душа... Што пачынаць ваяваць — супраць сябе ж ваяваць, што пачынаць забіваць — сябе ж забіваць... Адна ж душа...

Б у ш ц е ц. Гэта і ў цябе, і ў Гітлера, і ў тваёй Мар'і?

Д з е р в а е д. Пры чым тут Гітлер?

Б у ш ц е ц. Тады не ный тут! Развёў дэмагогію... Адна душа... Як хто, а я нікому нічога не забуду! Ніколі. У мяне ўсё агнём і крывёй у сэрца ўвайшло... Адна душа... Іх усіх трэба пад корань! Як заразную балячку — гарачым жалезам!

Д у г і н. Ладна, хопіць... А то дагаворыцеся...

Паўза.

Д з е р в а е д. Спаць пойдзем, ці што?

Д у г і н. Я не буду... Зоркі нізкія...

Д з е р в а е д. Пыталіся цябе сёння, старшына... Забыўся сказаць. Калі ў камандзіра быў...

Д у г і н. Хто?

Д з е р в а е д. Ваенурач. З армейскага шпіталя. Я кажу: камандзір выклікаў... Заўтра заедзе, сказала...

Б у ш ц е ц. Знайдзі яшчэ грамульку, капітан...

Д у г і н. Уставаць заўтра рана... З саюзнікамі сустракаемся... Быць ва ўсім парадзе... *(Зірнуў угору.)* Ды хоць бы хмары нацягнула, ці што?

Б у ш ц е ц. Чаго ты?

Д у г і н. Ды не магу. Зоркі цягнуць... Аж трасе...

Маўчаць. Кураць. Думаюць. На зямлі цішыня. Зумер палявога тэлефона.

Д з е р в а е д. Звоняць, здаецца, старшына...

Дугін падымае трубку.

Д у г і н. Што, Лісянкоў? Чаму не спіш?.. А-а-а... Ну, давай... Слухаю, Іван Данілавіч, слухаю... Не, не спаў... Ды ўсё тут ціха, што яны выдумалі?! Во няхай заўтра прыходзяць і шукаюць, каго ім трэба! Добра, мы можам адысці, хай бамбяць, калі так баяцца... Што? Якая каштоўнасць? Іван Данілавіч, а мы не каштоўнасць? Вайна канчаецца... Ладна, яшчэ раз праверым... Злазім і ў падвалы... Хай прыязджаюць... Добра... Першы ўзвод вазьму... Усё як з іголачкі... Усё нармальна. Спакойнай ночы... *(Паклаў трубку, нервова.)* Кампалка званіў! Амерыканцаў нехта напужаў... Баяцца прыязджаць, кажуць, што да таго, як мы падышлі, тут снайпер сядзеў і зрэдку пастрэльваў... Самалёты гатовы прыслаць бамбіць...

Б у ш ц е ц. Ну і няхай бамбяць!

Д у г і н. Нельга... Архітэктурная каштоўнасць... Дванаццаты век...

Б у ш ц е ц. О-о-ой!

Д у г і н. Аж смешна! Як які-небудзь вывіх на зямлі — усё на нас! Усім павінны мазгі ўпраўляць: Чынгісхану! Рыцарам! Напалеону! Кайзеру! Гітлеру! Як праклянцце якое на народ! Тыдзень тут стаялі, а нам зараз шукай яго!

Б у ш ц е ц. Пазвані заўтра і скажы, што ўсё аблазілі і нікога не знайшлі...

Д у г і н. Не... Давайце для ачысткі сумлення глянем... Роту падымаць не буду... Самі зірнём... Чорт іх ведае... Можа, затаіўся дзе... Дзед, на ліхтарык, злазь у падвалы, пасвяці там... Толькі калі што-якое — не лезь здуру, адразу назад...

Д з е р в а е д. То добра... *(Пайшоў да пралому, потым нечакана і хутка вярнуўся.)*

Д у г і н. Што, дзед?

Д з е р в а е д. Гэта... Спытаць хацеў...

Д у г і н. Пра што?

Д з е р в а е д. Нешта хацеў, а во з галавы выскачыла... Чорт!

Д у г і н *(усміхнуўся)*. Ускочыш назад — спытаеш... Ідзі.

Свецячы ліхтарыкам, Д з е р в а е д палез у падвал.

*(Глядзіць угору.)* Што гэта... Царква, ці што?

Б у ш ц е ц. Чорт яе ведае! Можа, ратуша якая...

Д у г і н. Злазь наверх... Там, я бачу, закуткоў, як кратовых нор...

Б у ш ц е ц. Дык завалена ўсё к чортавай матары...

Д у г і н. На вуліцы дрэва... Можа, з дрэва як...

Б у ш ц е ц. Ага...

Д у г і н. Толькі ж глядзі! Сваю галаву я табе не пазычу...

Б у ш ц е ц *(аглядаючы аўтамат, радасна)*. Усё будзе абгэмахт, капітан... *(Пайшоў у пралом, спыніўся, блазнавата ўсміхнуўся.)* Іш, герой!

Д у г і н. Ідзі, дурань... А я пасты праверу на ўсялякі пажарны...

Б у ш ц е ц знікае ў праломе. Дугін глядзіць угору.

Ну і свецяць... *(Задуменна.)* Свецяць... *(Пайшоў.)*

Некаторы час будынак пусты. Потым у адной сцяне з рыпам адчыняецца патаемны ход, і ў чорнай яго пройме з'яўляецца м а л е н ь к а я п о с т а ц ь. Гэта падлетак. Хлапчук. Худы, мурзаты, валасы ўскудлачаныя, вар'яцкія, затраўленыя вочы... У руках снайперская вінтоўка. Не міргаючы глядзіць ці то на газнічку, ці то на кавалачак чорнага хлеба, што застаўся на скрыні. Павольна-павольна набліжаецца да газнічкі і скрыні. Мычыць нешта. Адным горлам. Мабыць, нямы. Падышоў. Глядзіць на хлеб. Вінтоўку паклаў на зямлю. З'яўляецца Д у г і н.

Д у г і н *(даволі гучна)*. Гэй, ты што тут забыўся?

Але падлетак нават не зварухнуўся. Ён узяў хлеб і павольна-павольна падымае яго над сабой. Разглядвае. Мычыць.

*(Больш гучна.)* Я цябе пытаюся... Што за чорт!

Нямы трымае акраец і мычыць.

Ты што, аглух? Ану-ка павярніся!

Хлапчук павярнуўся. Але не ад загаду капітана, а так, сам па сабе. Убачыў Дугіна! Адразу ж, як толькі ўбачыў, віскнуў дзікім звярком, кінуў хлеб, схапіў вінтоўку, адскочыў да сцяны. Мычыць.

Ого! Ціха, ціха... Не ерапенься... Усё гут... Усё алес гут... Крыг капут... Гітлеру вашаму трындзец... Ніхто цябе не зачэпіць. Пакладзі вінтовачку... Ду іст кляйне... Ніхт фашыст, ніхт зольдат... Пакладзі вінтовачку, пакладзі... Ты чуеш? *(Не зразумеў ці забыўся, што той не чуе. Зрабіў крок. Адзін толькі крок.)*

Са ствала шуганула полымя. Схапіўшыся за жывот, Дугін сагнуўся. Нямы кінуўся ў сваю дзірку.

*(Стогнучы.)* Во паскуда! Ах, каб ты здох... Так па-дурному...

З падвала выскоквае Д з е р в а е д.

Д з е р в а е д. Старшына!!!
Д у г і н. Спакойна, партызан... Усё алес гут...

Аднекуль зверху саскочыў Б у ш ц е ц.

Б у ш ц е ц. Што? Што такое?
Д у г і н. Ён тут... Ах, саюзнічкі... *(Паказвае на дзірку.)* Тут... шчанюк пракляты...
Б у ш ц е ц. Так, партызан, глядзі тут... Я зверху! Там такая ж нара ёсць... Зараз мы яго, суку, прычэшам! *(Пабег.)*
Д у г і н. Не суйцеся дарэмна... Яго лёгка ўзяць... Глухі... Ні храна не чуе...
Б у ш ц е ц. Зараз анямее, сука... *(Палез наверх.)*
Д з е р в а е д. Як жа ты гэтак, Валодзя?
Д у г і н. Дурань! Пісталет не дастаў... Што, што, дзед, ты ў мяне спытацца хацеў? Пытайся... пакуль не позна...
Д з е р в а е д. Так... нічога... Пакажы, куды цябе...
Д у г і н. Потым, потым... Ідзі, Сяргею памажы... Толькі не падлезце здуру, як я...
Д з е р в а е д. Цярпі, цярпі, старшына...
Д у г і н. Што ж мне яшчэ рабіць?
Д з е р в а е д. А мы зараз... *(Кляцнуў затворам аўтамата і нырнуў у дзірку.)*
Д у г і н *(як-кольвечы расправіўся, шэпча)*. Вера-а... Пачуй мяне... Ты ж недалёка... Прашу... Пачуй... Убач у сне ці так... Толькі пачуй...

У праломе ўзнікае Ж а н ч ы н а з д з і ц е м.

Я не вінаваты перад табой... Даруй, што хаваўся за гэту праклятую пахаронку... Пад Курскам быў паранены, Вера... Так, пусцяковіна... Але... цяпер можна... Цяпер ужо можна... Ні мужам, ні бацькам я быць ужо не змог бы... Ніколі... Ні для кога...

Выйсця не было, Вера... Гэта не той цяжар, які можна ўзяць на плечы жаночыя... І я ўспомніў пра лес, Вера... Пра лес сорак першага... І сышоў у яго... Пройдзе час... ты зразумееш, што іншага мне не заставалася... Ты чуеш мяне?!

Жанчына ў праломе калыша дзіця.

Нарадзі іх... Як мага больш нарадзі дзяцей... Толькі ніколі, ніколі не кармі іх грудзямі, калі ў цябе будзе злосць у сэрцы... Хай лепей будуць галоднымі, хай плачуць — не кармі! Пакуль не прымірышся з людзьмі і з усім светам... Пакуль у душы спакой не з'явіцца... Спакой, цішыня і любоў... Пакуль зоркі не зазвіняць... *(Павярнуўся і пайшоў да Жанчыны з дзіцем, да пралому. Спыніўся, падняў рукі, нібы хацеў абняць і Жанчыну, і дзіця, і свет, і ўсе яго пакуты.)* Я люблю цябе, Вера!!! Я люблю цябе!!! *(Падае ў пралом.)*

Ж а н ч ы н а з д з і ц е м знікае. Праз хвіліну з патаемнага ходу выкочваецца нямы п а д л е т а к. За ім, трымаючы ў адной руцэ аўтамат, а ў другой свой салдацкі рэмень, ідзе Д з е р в а е д. Ідзе і з усяго размаху б'е рэменем па чым папала.

Д з е р в а е д *(б'е)*. Во табе «хайль»! Во табе «Гітлер»! Во табе «млека»! Во табе «матка»! Я цябе навучу! Родзіну любіць! Я цябе...

З дзіркі, трасучыся, выскоквае Б у ш ц е ц. Белы, страшны. Падбег, адштурхнуў Дзерваеда.

Б у ш ц е ц *(хрыпіць)*. Не та-а-а-ак!!!
Д з е р в а е д. Сяргей!

Але Бушцец ужо ўскінуў аўтамат. Асечка! Кляцнуў затворам. Асечка! Яшчэ. Асечка!

Кінь! Ну яго, шчанюка... Сам здохне...
Б у ш ц е ц. Дай аўтамат!!!
Д з е р в а е д. Не чапай! Ён жа калека!! Мычыць толькі... Кінь, Сяргей! Калека ж...
Б у ш ц е ц. Дай, сволач, аўтамат! Я вас усіх! Жаласнікаў! У расход!! *(Схапіўся за ствол аўтамата, цягне да сябе.)*

Дзерваед змагаецца з ім.

Д з е р в а е д. Сяргей, супакойся! Апамятайся ты!
Б у ш ц е ц. Усё адно кончу! Разам з табой, падла! За Мішку Гальчанскага! За Люську! За бацьку! За ўсіх!!!
Д з е р в а е д. Пусці!

Змагаюцца. Удвух пачалі падаць, трымаючыся за аўтамат. Упалі! Аўтамат стукнуўся прыкладам аб каменную падлогу і ад сатрасення сам па сабе

стрэліў. Бушцец устаў і здзіўлена-здзіўлена паглядзеў на нямога падлетка, што заціснуўся ў кут. Твар яго стаў светлым, цёплым, нібы ў тую ж мінуту пасля стрэлу ён зразумеў нешта важнае і вялікае. Потым пачаў асядаць на зямлю.

Д з е р в а е д *(падпоўз да яго, кляцнуў затворам)*. На, Сяргей, на! Рабі што хочаш. Гэта не я... Прыклад ударыўся... Само. Бяры страляй... Толькі мяне спачатку, а потым яго... Яно нічога...

Б у ш ц е ц *(раптам усміхнуўся)*. Дурань ты, партызан... Дурань... Патрымай мяне... Кружацца... Зоркі кружацца...

Д з е р в а е д *(прыціскаючы таварыша да сябе)*. У-уй, гады... Уй, гады!

Б у ш ц е ц. Баяўся я цябе, дзед... Чаго я цябе баяўся?.. Цяпер глядзі... Цяпер можна... Эх, дзе-ед...

Д з е р в а е д. Ты не гавары, не гавары...

Б у ш ц е ц *(трызніць)*. Піць... Была маленькая светлая крынічка!.. Люська адбівалася ў ёй... У кароценькім паркалёвым плацці... Каля маіх губ адбівалася... І я п'ю яе валасы, яе вочы, яе кароценькае плацце... П'ю і напіцца не магу... Эх, дзе-ед... *(Памірае.)*

Д з е р в а е д *(прыціскаючы яго да сябе)*. Яно нічога... Ты засні... Цябе прымуць зоркі... І душа твая змучаная адагрэецца каля іх святла... Адагрэецца... І шмат хто ўспомніць цябе добрым словам... Ты спі... А я пайду... Я далажу... Яно трэба... *(Асцярожна паклаў Бушцяца на падлогу, стаў падымацца сам.)*

У той жа момант у праломе ўспыхнула рознакаляровае зарава. Загрукаталі аўтаматы, вінтоўкі, пісталеты. Як салют па тых, хто толькі што загінуў. Па апошніх. Дзерваед як-кольвечы дабраўся да сцяны, трымаючыся рукой за параненае вайной сэрца. А кананада нарастала, шырылася, трасіруючыя кулі ляцелі з зямлі да зорак. І з гэтай кананады вырас немы нечалавеча радасны крык-стогн: «ПО-БЕ-Е-Е-ДА-А-А-А!!!» Але не чуў наш салдат гэтае доўгачаканае весткі. Не было ў яго сілы пачуць гэта. Не бачыў ён і таго, як глуханямы нямецкі падлетак знайшоў хлеб і грыз, прагна грыз яго. Прагна еў рускі салдацкі хлеб. А Дзерваед плакаў. Горка, няўцешна. Грымеў салют над усёй зямлёй, радаваліся ўсе людзі. А Дзерваед плакаў.

Даруй... Даруй мне, Мар'я... Мы больш не будзем. Мы больш ніколі не будзем... Даруй...

Узнікла Ж а н ч ы н а з д з і ц е м і стала набліжацца да салдата. Падышла, трымаючы на руках сваё дзіця, сваё прадаўжэнне на гэтай зямлі. Падышла зусім блізка да свайго мужа і салдата і спынілася, каб суцешыць яго. Грымеў салют. А далёка ад свайго разбуранага дома, далёка ад спаленай зямлі сваёй сядзеў і плакаў просты салдат. С а л д а т-п е р а м о ж ц а. Радавы.

*З а ц я м н е н н е*

*1984*

# Князь Вітаўт

**Трагедыя**

**ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ**

Купала — князёўна Жыцця.
Вітаўт — вялікі князь літоўскі.
Ягайла — вялікі князь літоўскі.
Кейстут — вялікі князь літоўскі.
Кудаш — стражнік Вітаўта.
Амуліч — стражнік Кейстута.
Дамаш — баярын.
Люцень — стражнік Ягайлы.
Алёна — пакаёўка.
Княгіня Анна.
Каралева Ядвіга.
Алясніцкі — біскуп кракаўскі.
Арцыбіскуп.
Вільгельм — прынц аўстрыйскі.
Камандор.
Рамеснік.
Лучнік.
Ваявода.
Першы стражнік.
Другі стражнік.
Беражніцы, дзяўчаты, ратнікі, дружыннікі, прыдворныя, паслы, ганцы.

Дзеянне адбываецца ў Вялікім княстве Літоўскім і ў Польшчы напрыканцы XIV стагоддзя.

# АКТ ПЕРШЫ

## Сцэна першая

Лес перад замкам у Гародні. З'яўляецца К у п а л а.

К у п а л а

Вось-вось зямлю акрые лёгкі змрок,
І я лясы напоўню пахам мёду
І водарам лясных чароўных траў,
Што робяць кроў гарачай і ўзбуджаюць
Жаданне быць каханым і кахаць,
Жаданне быць каханай і жаданай.
З сівых вякоў у час буяння лета —
Кароткі час паміж змярканнем дня
І ранкам дня наступнага. Бывае
Сонцавароту свята. Светлы люд,
Што паадрокся ад багоў паганскіх,
Нясе даніну мне адной — К у п а л е,
Жыцця князёўне, гаспадыні лесу.
Па ўсіх лясах, гаях і змрочных пушчах
Мяне бялявыя дзяўчаты ў песнях славяць
І ўюць вяночкі з яркіх красак лета.
І вогнішчы па берагах азёр і рэк —
Як кроплі сонца: горача нябёсам.
Зямля паўнютка патаемных гукаў
У гэту ноч. І шорахі, і цені
Па ўсіх лясах спраўляюць летні баль.
З людзьмі жартуюць лесавік і хохлік,
І ў лесе кветка-папараць гарыць
У вочы тым, хто не спазнаў кахання.
Калі ж дзянніца золатам абмые
Дубоў, бяроз і елак вершаліны,
Усіх прымаюць у абдымкі воды. Азёр і рэк.
Так раз на год Купалу люд мой славіць.
Тут духі продкаў водзяць карагоды...

З'яўляюцца д з я ў ч а т ы. Водзяць карагоды. Спяваюць.

Д з я ў ч а т ы

У пана Івана
Пасярод двара
Стаяла вярба.
На вярбе гарэлі свечкі,
З той вярбы
Кропля ўпала,

Возерам стала,
У возеры сам бог купаўся,
З дзеткамі, з дзеткамі.

З'яўляюцца князь В і т а ў т і К у д а ш.

К у д а ш

Гэй, князь, зірні! Ой, што за хараство!
Вось постаці, якіх баіцца цемра.
Не ведаю, што свеціцца ярчэй
У небе — месяц срэбны, круглатвары
Ці грудзі прыгажунь — тваіх падданых.

В і т а ў т

Кінь блазнаваць!

К у д а ш

Раблюся блазнюком
Штогод я на святую ноч Купалля!

В і т а ў т

Вось гэта называеш ты святым?

К у д а ш

А што ж тады святое, любы княжа?
Хрышчоны я і, колькі сіл стае,
Малюся, каб пазбавіцца спакусы,
Але слабы я, грэшны чалавек,
Хоць раз на год дазволь пабыць паганцам.
Магутны Божа...

В і т а ў т

Хопіць! Замаўчы!

К у д а ш

Я потым замалю свае грахі!
Ноч на Купалле — толькі бліскавіца,
А потым цэлы год: даруй! ратуй! прабач!
Не буду... да наступнага Купалля.

В і т а ў т

Як ахрысціць такога вось змаглі?

К у д а ш

Хрысціў Альгерд, Ягайлаў бацька, так:
Усё сяло уздоўж Дняпра паставіў
І меч дастаў. Хто мне не вораг, кажа,
Умэнт змяніць усіх багоў на Бога
Адзінага. Збавіцеля Хрыста.
Я першы скочыў з берага ў Дняпро
І першы ахрысціўся. Не хапала,
Каб князь ды быў за ворага ў мяне!

В і т а ў т

Ну а Пярун? За здраду ж пакарае.

К у д а ш

А я маленькі, хіба ж ён пацэліць
З нябёсаў у такога чарвяка?

В і т а ў т

Кудаш, у што ж ты верыш?

К у д а ш

Адкажу —
У Троіцу святую: Бацьку, Сына, Духа,
Таксама ж паважаю Перуна,
Нядобрыка, Лесавіка, Анчутку,
Палудніцу, Ляшэню, беражніц,
Не дай Бог пасварыцца і з Дажбогам.
Ну, там яшчэ Ядрэй і Абілуха,
Без іх паганым будзе ураджай,
А калі Жыцень поле не вартуе,
То хлеба хопіць толькі да вясны.
Яшчэ сыны Ягі: то Везі, Пузі, Сіні,
Ну, Дамавік, і Баннік, і Дзядзюль,
Нямыцік, Зюзя, Маўка і Шышыга.

В і т а ў т

Ды ратнікаў, напэўна, менш у князя,
Чым у цябе багоў.

К у д а ш

Галоўная ж — Купала,
Царыня наша. Гэта сёння ёй
Спяваюць песні, ладзяць карагоды,
Яна жыве нядоўгае жыццё
Тут, на зямлі... Кароценькая ночка
Ёй дадзена, каб падарыць любоў.
Пасля ж прымае агнявую смерць
На цэлы год, да новага Купалля.

Д з я ў ч а т ы *(спяваюць)*

Дзядзюль ды Купала
У возеры купаліся,
Дзе Дзядзюль купаўся,
Лес там калыхаўся.
Купала купалася,
Трава рассцілалася.

К у д а ш

Бывай, мой князь, бо хутка прыйдзе дзень,
А ўдзень я, грэшны, каяцца павінны.

В і т а ў т

Кудаш, спыніся!

З'яўляюцца б е р а ж н і ц ы.

П е р ш а я б е р а ж н і ц а

Бедны, бедны княжа.

Д р у г а я б е р а ж н і ц а

Набожны, строгі і жанок баіцца.

Т р э ц я я б е р а ж н і ц а

Дазволь нам, гаспадыня, паказаць
Дзяўчыну тую, што яго кахае
І шэпча, як малітву, імя Віта-а-ўт...

П е р ш а я б е р а ж н і ц а. Віта-а-ўт...
Д р у г а я б е р а ж н і ц а. Віта-а-ўт...
Т р э ц я я б е р а ж н і ц а. Віта-а-ўт...

К у п а л а

Я дазваляю.

В і т а ў т

Прэч адсюль хутчэй!
Паганствам гэты лес зачараваны,
Тут звіў гняздо нячысцік-ліхадзей,
Што вораг Богу, свету, чалавеку.

Беражніцы абкружаюць князя. Водзяць карагод. Спяваюць.

Б е р а ж н і ц ы

А ў садзе, а ў садзе ды тры садочкі,
А ў тых садочках ды тры цвяточкі.
У адным цвяточку рута ды мята,
Рута ды мята мне непрыятна.
Ў другім садочку ружова рожа,
Ружова рожа мне непрыгожа.
Ў трэцім садочку сінь васілёчак,
Сінь васілёчак мне на вяночак.

В і т а ў т

Скавала млявасць цела. Не хачу
Ісці за імі і брыду бязвольна
На заклік грэшны прывідаў лясных.

П е р ш а я б е р а ж н і ц а. Віта-а-ўт...
Д р у г а я б е р а ж н і ц а. Віта-а-ўт...
Т р э ц я я б е р а ж н і ц а. Віта-а-ўт...

К у п а л а

Ах, мілы віцязь! Хай твой зрок патухне,
Ты сэрцам бачыць будзеш яшчэ лепш
І, што пачуеш ад мяне,— забудзеш.
Ты не кахаў, ну а цябе кахае
З чужога княства русая дзяўчына
І за цябе аддасць сваё жыццё,

Ўратуе князя. Стане беражніцай,
Што служаць мне ў кароткі час Купалля.

Б е р а ж н і ц ы *(спяваюць)*

З прыцемкаў — целы дзявочыя нашы,
Косы — з сівых туманоў,
Вочы мы маем ад зорак, мы скажам
Ўсё, што было і што збудзецца зноў.

П е р ш а я  б е р а ж н і ц а

Ты хочаш ведаць, хто цябе кахае?

В і т а ў т

Мяне кахае жонка.

Д р у г а я  б е р а ж н і ц а

Што сілком
Смаленскі князь цябе любіць прымусіў,
За згоду з княствам ён аддаў дачку.

Т р э ц я я  б е р а ж н і ц а

Яна ж з сабой да вас прывезла тую,
Што ўсё сваё кароткае жыццё
Цябе любіць і зберагаць павінна.
Купала хоча так.

В і т а ў т

Што ж, пакажыце,
Трызненне, мроя не грахі прад Богам.

Б е р а ж н і ц ы прыводзяць з лесу А л ё н у. Вочы ў яе заплюшчаны. Беражніцы пачынаюць расчэсваць ёй валасы.

Б е р а ж н і ц ы *(спяваюць)*

А ўжо выплыла,
А ўжо выплыла
Вутачка з-пад беражка.
А ўжо вынесла,
А ўжо вынесла
Рыбную грабёначку.
Ёсць чым расчасаці,
Ёсць чым расчасаці
Алёначцы галовачку.

В і т а ў т

Алёна?! То ж князёўны пакаёўка!

К у п а л а

Яна сама князёўна у каханні...

А л ё н а

Мой любы, мілы княжа...

В і т а ў т

Супыніся!
Няшчасная, ды як жа ты пасмела...

К у п а л а

Каханне не карона, храбры віцязь,
Яно зніжае ўладара да смерда,
А ўздыме і жабрачку да багоў...
Дзяўчына гэта воч падняць не смее
На князя цэлы год, а на Купалле,
У лес прыйшоўшы, тут цябе у мроях
Цалуе, песціць, ты яе паслухай.

В і т а ў т

Я не хачу!

К у п а л а. Так я хачу — Купала.

Беражніцы водзяць каля Вітаўта і Алёны карагод.

А л ё н а

Мой любы! Мой каханы! Мой адзіны!
Далёкі мой і блізкі. Для мяне
Ты слодыч неба і мая пакута,
Ты радасць і пякельная журба,
Жыццё маё і смерць, я гэта знаю.
Малю Хрыста і ўсіх нашых багоў,
Каб адвялі хваробы і напасці
І ад цябе і ад князёўны Анны.
Каб у сям'і тваёй быў лад і згода,
Любоў... што гаспадыня дорыць целам,
Ты не сумуй, бо я люблю душой.
Вой Вітаўт, ты — няўрымслівы агонь,
А я — вада... Мы — родны брат з сястрою.
Нам не сысціся. Толькі на Купалле
Прыйдзі у сне і пацалуй мяне.

Б е р а ж н і ц ы

Прыйдзі у сне і пацалуй яе...

К у п а л а

Прыйдзі у сне і пацалуй яе.

Вітаўт абдымае Алёну.

Б е р а ж н і ц ы *(спяваюць)*

Ды на мора, гусі-лебедзі,
Ды на мора на сіненькае,
Там вада халодненькая,
Там трава зялёненькая.
Да шлюбу, маладая дзеванька,
Да шлюбу, маладзенькая.
Там табе ручкі звяжуць,
Там табе праўду скажуць.

З'яўляюцца князь К е й с т у т са світай, К у д а ш, А м у л і ч.

К е й с т у т. Дзе Вітаўт?

К у д а ш. Трошкі адышоўся.

К е й с т у т. Дык ты ж павінен быць каля яго!

К у д а ш. Буду! Калі наваляцца татарын, турак, чорт, яшчэ які ліхадзей — буду! Побач! Заўжды! Як яго ўласная рука — куды ён, туды і я. Але... Вялікі князь... ну як жа тут быць побач, калі на Купалле... малады князь... трошкі... адышоўся.

А м у л і ч. Вялікі князь! Я раіў табе не раз: прагані ты гэтага юрлівага прахвоста. Заводзіць маладога князя, шэльма! Ад жонкі! Ад Бога! Паслухай старога слугу.

К у д а ш

Хто хадзіць не можа, кажа: «Асалода —
Па-ста-яць!»
Хто стаяць не можа, кажа: «Во, святое —
Па-ля-жа-ць».
Грэшны, я хаджу, хаджу.
Грэшны, я стаю, стаю!

К е й с т у т. Вось зараз бізуном як хвастану, дык ляжаш!

К у д а ш. Не, мой князь, падскочу!

К е й с т у т

Каб Вітаўт быў вось тут хоць з-пад зямлі!

К у д а ш

Дык вось жа ён, на купіну прылёг,
Стаміўся, мабыць. Спіць мой любы княжа.

К е й с т у т

Гэй, Вітаўт! Вітаўт!

К у д а ш

Князь, даволі спаць,
Закалыхалі, мабыць, беражніцы...
Князь...

В і т а ў т

Не чапай, мне вельмі добра тут,
Сярод лясных істот і лёгкіх ценяў.

К е й с т у т

Пакіньце нас усе.

Усе кланяюцца і адыходзяць.

Ты ж падыміся.
Князь на зямлю кладзецца толькі мёртвым.

Князь Вітаўт падымаецца.

Знядужыўся, няшчасны. Як не брыдка!
Жанаты муж і бацька. Як блазнюк,
Аддаў сябе дзікунскаму абраду!

В і т а ў т

Купалу бачыў я...

К е й с т у т

Пакуль ты сніў Купалу,
Твой брат Ягайла, мой пляменнік любы,
Што прысягаў прад Богам на крыжы
Сядзець спакойна ў Віцебску і з намі
Жыць у любові і ў братэрскай згодзе,
Сабраў сабак тэўтонскіх, неспадзеўкі
Напаў на Вільню.

В і т а ў т

Быць таго не можа!

К е й с т у т

Не можа? Ёсць ужо! Вось толькі
Ганец прыбыў з адсечанай рукой!
Яе адсек Ягайла сам, сказаўшы,
Што такое ж з табой і мною будзе,
Калі толькі мячы свае падымем на яго!

В і т а ў т

Дык крыжакі ўжо топчуць нашу Вільню?!
Хутчэй у Трокі!

К е й с т у т

Позна! Ён і Трокі
Здабыць паспеў. І гэта сын Альгерда,
З якім мы будавалі родны край,
Які лічыў каштоўнасцю вышэйшай
Спакой, любоў, лад у Вялікім княстве,
Быў першы сярод роўных. А нашчадак
Стаў братам ворагу і люты вораг брату.
Чаго маўчыш?

В і т а ў т

Не ведаю, што й думаць.

К е й с т у т

Дарэмна я цябе паслухаў, даўшы
Пачвары гэтай Віцебскі пасад.
Для злодзея пасад — турма. Карона — краты.
Хто мне крычаў: я веру, веру брату!
Не можа быць братэрства між братамі,
Калі адзін з іх воўк.

В і т а ў т

Дазволь мне
На перамовы ў Вільню зараз ехаць.

К е й с т у т

Дазволю войска найхутчэй сабраць
І выгнаць з Вільні вылюдка, што здрадзіў

Зямлі літоўскай, хто братам жадае
Пагібелі. Шчаслівы князь Альгерд!
Ты ў час памёр. Да гэтага дажыўшы,
Ты б дужа шкадаваў, што нарадзіўся.
Збірай дружыны. Руш хутчэй на Трокі.
Я ж — да Андрэя ў Полацк. Мы ўсе разам
Хрыбціну зломім рыцарам тэўтонскім,
Змяцём і ваўкалака-сваяка.

Вітаўт

Дык гэта ж кроў.

Кейстут

Калі б не выпадковасць,
Твая з маёй сцякла б з мячоў крыжацкіх
Яшчэ учора. З імі дамаўляўся
Даўно Ягайла.

Вітаўт

Гэта мне вядома.

Кейстут

Якой жа ты спалохаўся крыві?

Вітаўт

Брат супраць брата — страшны грэх прад Богам!

Кейстут

Перад якім? Тэўтонскім? Рымскім? Нашым?

Вітаўт

Перад Хрыстом!

Кейстут

Ягайлу гэта скажаш,
Адбіўшы Трокі з Вільняй у яго
І выгнаўшы з зямлі дзядоў чужынцаў!
Дагэтуль хай Хрыстос глядзіць з нябёсаў
На тое, як ліцвін грызе ліцвіна!
Я падстаўляў шчаку пасля удару,
Ён зноў ударыў! Што ж мне падстаўляць?!
Усё! Размову скончым пасля бітвы.
Я ў Полацк. Ты ж з дружынаю на Трокі!

Разыходзяцца. З'яўляецца Купала.

Купала

З любові гэты створаны Сусвет,
Любові ж творца — будаўнік Сусвету.
Калі нянавісць, ганарлівасць, зло
Не знойдуць месца ў сэрцы чалавека,
Сыдуцца разам цемра і святло,
Цяпло і холад. Заўтра і учора,
Жыццё і смерць. Пачатак і сканчэнне.
*(Уваходзіць у адно з вогнішчаў і згарае.)*

## Сцэна другая

Гародня. Пакой у замку Вітаўта. Раніца.
А л ё н а прыбірае к н я г і н ю А н н у.

К н я г і н я А н н а

Алёна, як сяброўцы, раскажы,
Што ты рабіла ноччу на Купалле?

А л ё н а

Пляла вяночкі.

К н я г і н я А н н а

А яшчэ, яшчэ?

А л ё н а

Пад месяц свае грудзі падстаўляла,
Каб поўнымі, як ён, заўжды былі,
Купалася.

К н я г і н я А н н а

Хто абдымаў?

А л ё н а

Не помню.

К н я г і н я А н н а

Не помніш? Але ж нехта абдымаў?

А л ё н а

Ой, не, княгіня, далібог, не помню,
Купальскай ноччу ў галаве туман.

К н я г і н я А н н а. Табе ўжо час падшукваць князя.

А л ё н а. Якога князя?

К н я г і н я А н н а. Жаніха... Хочаш замуж?

А л ё н а. Не, не хачу.

К н я г і н я А н н а. Чаму ж?

А л ё н а. Так Бог судзіў... Мой ад мяне далёка, хто ж мкнецца да мяне, ад тых далёка я.

К н я г і н я А н н а. Далёка, кажаш? Дык давай пашлём ганца.

А л ё н а. Туды ён не даскача. Ах, мая княгіня, калі б ты ведала, як я люблю цябе.

К н я г і н я А н н а

І я цябе люблю, Алёна. Усё ж скажы,
Хто замак збудаваў ў тваім дзявочым сэрцы?

А л ё н а

Ой, не, княгіня, лепей не пытайся!

К н я г і н я А н н а

Скажы...

А л ё н а

Не трэба!

К н я г і н я  А н н а

Я дапамагу.

А л ё н а

Мне дапаможаш ты? Ой, мілая княгіня,
Калі б ты знала...

К н я г і н я  А н н а

Што?

А л ё н а

Далёка вельмі ён.

К н я г і н я  А н н а

Запрасіць князь яго да нас у княства
Ці выкупіць, калі не вольны ён.

А л ё н а

Не, вольны, але выкупіць няможна.

К н я г і н я  А н н а

Жанаты?

А л ё н а

Так.

К н я г і н я  А н н а

Прачыстая Марыя!

А л ё н а

Любоў да Бога, кажуць. Калі грэх —
Каханне гэта, значыць, грэх ад Бога.

К н я г і н я  А н н а

Алёна, што ты кажаш?

А л ё н а

Я кахаю!
Хай гэта грэх. Дык гэта і збавенне.

К н я г і н я  А н н а

Здаецца, князь.

Уваходзяць В і т а ў т і К у д а ш.

В і т а ў т

Пакіньце нас з княгіняй.

К у д а ш і А л ё н а кланяюцца і выходзяць.

К н я г і н я  А н н а

Вітаю з ранкам светлым, любы княжа!
Дзе ты правёў святую ноч Купалля?
Ты, можа, кветку-папараць знайшоў?
Ці стрэў Купалу?

В і т а ў т

Гэтая дзяўчына,
Што тут была, адкуль яна?

К н я г і н я  А н н а

Алёна?
Яна ж сюды прыехала са мной,
Штовечар сцеліць ложа мне і князю.
Прыгожая?

В і т а ў т

Нахабны, дзёрзкі позірк!

К н я г і н я  А н н а

Няпраўда гэта. Не ў гуморы князь,
Алёна тваёй жонцы за сяброўку.

В і т а ў т

Хай Бог нам толькі ворагаў пакіне,
Зратуе ж ад сябровак і братоў.
Бяда у княстве. Брат паўстаў на брата.
Ягайла ў Вільні. Рыцары у Троках,
Зноў гвалт, вайна.

К н я г і н я  А н н а

О, бедны наш народ!
Чым толькі правініўся ты прад Богам,
Каб жыць у акружэнні чорных сіл.
Быць занядбаным, ссечаным, забітым
Тэўтонцам, туркам і рукой сваіх сыноў!
Пашлі ганцоў да бацькі найхутчэй,
Смаленскі князь паможа.

В і т а ў т

Не патрэбна.
Суседа запрашаюць толькі ў госці,
Ў час сваркі трэба дзверы зачыняць.
Зайшоў я развітацца. Еду ў Трокі.

К н я г і н я  А н н а

З дружынаю?

В і т а ў т

Адзін.

К н я г і н я  А н н а

Князь, ты жартуеш!
Каб без мяча ды ў логава ваўка
Ісці?

В і т а ў т

А меч крыві папросіць?
А гэта кроў знясіленых ліцвінаў,
Мы сварымся, а кроў ліюць яны.
Бывай, княгіня. Дзетак пацалуй,
Я веру, што Хрыстос нам дапаможа
Усталяваць спакой ў Вялікім княстве.

К н я г і н я  А н н а

Бывай, мой князь!

Выходзяць. З'яўляецца А л ё н а.

А л ё н а

О, гора! Гора! Гора!

## Сцэна трэцяя

Трокі. Пакой у замку. Князь Я г а й л а з чарай віна.

Я г а й л а

Калі, хто і нашто кроў параўнаў з віном
І з хлебам цела. Так, віно сп'яняе,
Жывём жа мы, з'ядаючы другіх.
Глынуў хоць раз — і ты п'яны ўжо,
Раз укусіў — і хочаш есці зноўку!
Не пі — тады не будзе мучыць смага.
Не еш — спатоліць голад нельга.
Гэй, Люцень!

Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Л ю ц е н ь

Што князь загадае?

Я г а й л а

Яшчэ віна!

Л ю ц е н ь

Пі на здароўе, князь!

Я г а й л а

Сабе налі!

Л ю ц е н ь

Вялікі гонар.

Я г а й л а

Пі!

Л ю ц е н ь

Бог, блаславі пасад Літоўскі ў Вільні!

П'юць.

Я г а й л а. Што паведамляюць даносчыкі?

Л ю ц е н ь. Кейстут з невялікім атрадам выправіўся ў Полацк да свайго гарбатага нашчадка князя Андрэя.

Я г а й л а. Навошта?

Л ю ц е н ь. На падмогу, трэба думаць. Проста так ён велікакняскі пасад не аддасць.

Я г а й л а. Велікакняскі пасад мой! Мой!

Л ю ц е н ь. Хай мне даруе вялікі князь. Я хацеў сказаць: проста так ён не скарыцца.

Я г а й л а. Чаму не паслаў дружыну напярэймы?

Л ю ц е н ь. Шляхоў багата ў Полацк. Па якім пойдзе Кейстут, не ведаюць і яго ратнікі.

Я г а й л а. А Вітаўт?

Л ю ц е н ь. Сядзіць у Гародні.

Я г а й л а. Ратнікаў збірае?

Л ю ц е н ь. Моліцца.

Я г а й л а. Яшчэ віна!

Л ю ц е н ь. Слухаю. *(Кланяецца і выходзіць.)*

Я г а й л а

Ты, Вітаўт, нарадзіўся быць другім,
Хаця па ўсім ты першы, мне вядома.
Як дзеўка, што народзіцца прыгожай,
Хоць у шаўкі яе, хоць у рыззё,
Ты хоць памый яе ці так пусці — нямытай,—
Прыгожая! А нейкая другая
Ваюе, каб багоў несправядлівасць
Хоць трошкі выправіць, з прыгожаю зраўняцца.
І мые твар крывёй і малаком,
І акунае сваё цела ў зёлкі,
І косткаю з хрыбта пярэстай стронгі
Расчэсавае нанач валасы.
Ну дык якая ж вартая павагі?
Хто атрымаў нябёсаў падарунак
Ці хто стварае боскае рукамі?
Як гэта я раблю. О не, мой браце!
Табе для першынства ўсё дадзена багамі,
А я рабіў ды і зраблю ўсё сам.

Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Л ю ц е н ь. Віно для князя. Хай вялікі князь даруе, калі засмучу.

Я г а й л а. Кажы!

Л ю ц е н ь. Увесь люд у Вільні і ў Троках адракаецца ад прысягі Кейстуту і нанава прысягае вялікаму князю Ягайлу.

Я г а й л а

Ты гэтым засмуціць мяне баяўся?
Я ведаю паскудны свой народ,
Ён прысягне татарыну і турку,
Паляку і тэўтонцу, маскавіту
І Залатой Ардзе. Таму, хто зверху будзе,

Блудніца прысягне таму, хто болей дасць,
А гэты люд — хто абдзярэ дашчэнту.
Хай прысягаюць, бачыць не хачу.

Л ю ц е н ь

Адзін сказаў: не буду прысягаць.

Я г а й л а

Хто ён такі?

Л ю ц е н ь

Янук Дамаш. Баярын.

Я г а й л а

Так і сказаў: не буду прысягаць?

Л ю ц е н ь

Інакш сказаў: не прысягну Ягайлу.

Я г а й л а

Сюды яго!

Л ю ц е н ь

Ён тут.

Я г а й л а

Не, пачакай.
Тры чары бачыш? З золата. Вось срэбра.
І медзяная. Іх таўрыдскі князь
Прыслаў з паклонам некалі ў дарунак
Князю Альгерду. Мы праверым зараз,
Ці кемлівы ты, Люцень. Адкажы:
Жыццё, хвароба, смерць. Вось тры сястрыцы,
І кожная з сваёй чары п'е.
Якая і з якой?

Л ю ц е н ь

Падумаць трошкі трэба...
Здаецца мне, што медзь — гэта жыццё,
Хвароба ж болей ладзіцца са срэбрам,
А золата вышэйшае — то смерць.

Я г а й л а

Налі ж віна тры чары і сачы,
З якой я вып'ю.

Л ю ц е н ь

Тое й стацца мусіць.

Я г а й л а

Сюды яго.

Прыводзяць звязанага Д а м а ш а.

Які сабака асмеліўся звязаць таго, хто мае герб?

Д а м а ш. Эх, князь... Не крыўдна, калі вяжуць, крыўдна, калі звязанага б'юць.

Я г а й л а. Люцень!

Л ю ц е н ь. Слухаю князя!

Я г а й л а *(б'е яго)*. Не датыкай сваіх паскудных рук да чалавека, адзначанага Богам!

Л ю ц е н ь. Даруй, князь, вінаваты!

Я г а й л а *(б'е)*. Паважай тытул!

Л ю ц е н ь. Даруй, князь!

Я г а й л а. Я табе пакажу, як таптацца па тым, хто стаіць зверху, нават калі ён мне закляты вораг! Развязаць! Наступным разам павешу на гэтых вяроўках! Пайшоў прэч, нягодны!

Л ю ц е н ь кланяецца і выходзіць.

Дык як завуць цябе, шаноўны мой баярын?

Д а м а ш

Янук Дамаш.

Я г а й л а

Адкуль ты будзеш?

Д а м а ш

З Вільні.

Я г а й л а

Дык што, не хочаш, кажуць, прысягаць?

Д а м а ш

Я прысягаў аж тройчы за жыццё.

Я г а й л а

І тройчы адмаўляўся?

Д а м а ш

Толькі двойчы.
Ад Перуна і ўсіх нашых багоў
І ад цябе, вялікі князь Ягайла.

Я г а й л а

А верным толькі Кейстуту застаўся?

Д а м а ш

Дадай яшчэ Альгерда, свайго бацьку,
І Гедыміна — дзеда, пры якіх
Наш край ажыў, аддыхаўся ад войнаў
І перайшоў к табе адбудаваным
І Кейстутам таксама, тваім дзядзькам.

Я г а й л а

Які напад зрабіў у Вільні на мяне,
Пазбавіў волі, княскага пасада
І ў Віцебск адаслаў, як у турму!
Яму вы прысягалі — дараваў я!
Прадалі, як Хрыста, і я забыўся!

Д а м а ш

Пеажагнайся, князь! Што ты гаворыш?
Не можа быць народзе наш Іудам,
Дый ты ўжо не раўняй сябе з Хрыстом.

Я г а й л а

Даруй мне, Божа!

Д а м а ш

Ён табе даруе.
Даруе, як і тое дараваў,
Што Кейстута і Вітаўта хацеў ты,
У Вільню заманіўшы, атруціць!
І крыжакам даваў пісьмова клятву,
Што востры крыж тэўтонскі залунае
Ад Вільні аж да Тураўскага княства!
Вялікі князь! Ды як жа свой пасад
Пад ногі падсцілаць паўночнаму суседу?

Я г а й л а

І хто ж табе такога вось наплёў?
Вітаўт ці Кейстут?

Д а м а ш

Я пячатку бачыў,
Віцязь без твару, меч і тоўсты шчыт
І подпіс: «Вільня, крыж, потым Ягайла»
Пастаўлены пад тым, што я сказаў.
Калі пячатка гэта не твая —
Ягайлу прысягну жыццём і Богам.

Я г а й л а

Жыццём не трэба. Каго з блізкіх маеш?

Д а м а ш

Дзяцей і жонку. Маці і дзядоў.

Я г а й л а

І дзе ж яны?

Д а м а ш

Усіх адправіў у Полацк.

Я г а й л а

Дык а чаму ж тады не з'ехаў сам?!
Застаўся, каб у вочы плюнуць князю?

Д а м а ш

Не злодзей я! Навошта мне ўцякаць?

Я г а й л а

Уцякаць не хочаш. Прысягаць не мусіш.

Д а м а ш

Хрысту сілком прысягу не даюць.
А я даваў, бо князь Альгерд прымусіў!
Пасля прымусам прысягаў табе!

Я г а й л а

Чаму ж прымусам?

Д а м а ш

Ці ты старшы ў родзе,
Каб сесці на Літоўскі наш пасад?

Я г а й л а

Так князь Альгерд жадаў!

Д а м а ш

Па просьбе жонкі
Ён перад смерцю здаў табе пасад.
Усім вядома: кволых дзетак любіць
Сапраўдная жанчына.

Я г а й л а

Гэта мне
Усё гаворыш ты і не баішся?

Д а м а ш

Абрыдла ўсё жыццё баяцца праўды,
Няпраўдзе ж прысягаць і дагаджаць.

Я г а й л а

Няпраўда — гэта я?

Д а м а ш

Ты так гаворыш.
Ты, князь, прывёў тэўтонцаў да Літвы,
Яны для нас — паўночныя татары!
Ты ў княстве хочаш быць уладаром,
А перад імі поўзаць на каленях.
Маскоўскі князь так робіць прад Ардой,
А нам нашто?

Я г а й л а

Даволі, зразумеў я!
Ты думаеш, што княствам кіраваць
Гэтак жа лёгка, як ціхмянай жонкай?
Тут трэба хітраваць і быць вужакай,
Падумаўшы адно — сказаць другое,
А ўрэшце нешта трэцяе зрабіць.

Д а м а ш

Ёсць «так» і «не», астатняе — ад д'ябла.

Я г а й л а

Не паважаць сумленнасць немагчыма,
Тут можна нават дзёрзкасць дараваць.
Не хочаш прысягаць, то і не трэба,
Хай будзе Бог суддзёй табе і мне.
У кожнага ад Бога свой пасад.
Пі княскае віно. Гэй, дзе ты, Люцень!

Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Налі віна баярыну.

Д а м а ш

Эх, княжа,
Калі ты атруціць мяне сабраўся,
Атруту вып'ю сам. І без віна.

З'яўляюцца К у п а л а і б е р а ж н і ц ы.

К у п а л а

Жыццяпачатак — першы крок да смерці,
А смерць — акно у новае жыццё.
Жыццё адно жыццё толькі разбурыць,
І смерць заўсёды разбурае смерць.

Б е р а ж н і ц ы *(танцуюць каля Дамаша)*

Не бойся, віцязь, мы цябе сустрэнем,
Аблашчым, супакоім, зберажом,
Тут гэтак, як і ў вас, спяваюць птушкі,
Сады квітнеюць і цурчыць ручай...
І зорнае святло з усіх бакоў
Тваю душу ласкава абагрэе.

Я г а й л а

Чаму ж ты князя лютым зверам лічыш?
Клянуся бацькам, не крануць цябе
Ні меч, і ні страла, і ні атрута,
Пакуль я князь. Вось табе чара. Пі!
*(Падае яму залатую чару.)*

Д а м а ш

Я, князь, бяды табе не пажадаю...
*(П'е.)*

Люцень накідвае яму ззаду на шыю засморгу і душыць. Дамаш асядае долу.

Я г а й л а

Ты хто, халуй?! Яму ж я кляўся бацькам!

Л ю ц е н ь

Вялікі князь і не парушыў слова,
Ні яд, ні меч яго не закрануў.

Я г а й л а

Прэч, ваўкалак!

Л ю ц е н ь

Як скажаш, любы княжа.

Разыходзяцца.

Б е р а ж н і ц ы

Цябе любоў сустрэне, мілы віцязь,
Пяшчотны пацалунак любай маці
І постаці сівых тваіх дзядоў...

К у п а л а

Замкнёны круг. Ты да сябе прыйшоў.

Беражніцы танцуюць над нерухомым целам Дамаша.

## Сцэна чацвёртая

Кракаў. Сад перад каралеўскім палацам. Уваходзяць прынцэса Я д в і г а і прынц В і л ь г е л ь м.

Я д в і г а

Паслухай, прынц... То ў каралеўскім садзе
Сірэнкі зараз ціха запяялі,
Ў іх галасах — і радасць і журба,
А песня іх вяшчуе нам каханне
Ці загучыць, калі прыходзіць смерць.
Ты чуеш?

В і л ь г е л ь м

Не. Пачуць зусім не здольны
Нічога я. Пакуль гаворыш ты.

Я д в і г а

Я памаўчу.

В і л ь г е л ь м

О не, мая прынцэса!
Твой цёплы голас так мне лашчыць слых
І у душу такі спакой прыносіць,
Што мне здаецца: я яшчэ дзіця,
І на руках ляжу у любай маці,
І веру, што ніколі не памру,
Што свет наўкола добры і ласкавы,
Мяне ўсе любяць. Я усіх люблю,
Ніхто мяне ніколі не пакрыўдзіць.

Я д в і г а

О, прынц! Ты сапраўды яшчэ дзіця,
Хоць і старэйшы за мяне гадамі.

В і л ь г е л ь м

Я буду табе мужам, але ты
Сястрой і добрай маці мусіш быці
Для ўсіх вяльмож Аўстрыйскага двара.
Кроў прынцаў — кроў халодная заўсёды,
Наш шлюб без нашых сэрцаў і душы,
І згоды заключаюць у палацах,
У неба не пытаюцца. За што ж
Так Бог мяне узнагародзіў,

Падараваўшы тую, што вышэй
Дзяржавы і кароны...

Я д в і г а

Зноў спяваюць!
Ты чуеш, прынц?

В і л ь г е л ь м

Не, я, на жаль, не чую.

Я д в і г а

Сірэнкі зноў журботна заспявалі.

В і л ь г е л ь м

Яны вітаць маё каханне рады.

Я д в і г а

Ці смерць старога бацькі-караля...

Уваходзяць А р ц ы б і с к у п і б і с к у п А л я с н і ц к і.

А р ц ы б і с к у п

Дзіця маё, кароль вас зараз кліча.

Я д в і г а

Я дзякую.

В і л ь г е л ь м

Праводзіць мушу вас.

А л я с н і ц к і

Вас, прынц, я папрасіў бы тут застацца.

Я д в і г а выходзіць.

А р ц ы б і с к у п. Сын мой, не будзем ад вас утойваць — Карона страціла свайго гаспадара.

В і л ь г е л ь м. Кароль Людвік памёр?!

А л я с н і ц к і. Калі ўзыдзе сонца, на Польшчу апусціцца ноч. Раніцай мы асірацеем.

А р ц ы б і с к у п. Кароль жыве апошнія часіны.

В і л ь г е л ь м. Не ў лепшы час прыехаў я прасіць рукі Ядвігі...

А р ц ы б і с к у п. За горам прыйдуць лепшыя часы, як за святлом заўжды прыходзіць цемра.

В і л ь г е л ь м. Не, лепш наадварот.

А р ц ы б і с к у п. Усё адно: калі святло зменіцца цемрай, значыць, цемра саступіць святлу. Пачатку тут няма. Ёсць толькі кола. *(Выходзіць.)*

А л я с н і ц к і. Прынц, вам лепш цяпер пакінуць Кракаў. Заручыны не робяць пры жальбе. Калі ў Польшчы высахнуць слёзы, яна будзе радасна спяваць на вяселлі сваёй дачкі Ядвігі і новага сына Вільгельма.

В і л ь г е л ь м. Дзякую, ваша вялебнасць. Дазвольце развітацца з прынцэсай.

А л я с н і ц к і. Яе паклікаў развітацца бацька-кароль на незлічона большы тэрмін, чым збіраецеся развітацца вы. Ці варта ім замінаць?

В і л ь г е л ь м. Кракаў нездарма ганарыцца мудрасцю вашай. Я ад'язджаю.

А л я с н і ц к і. Перадайце каралю аўстрыйскаму, што Польшча заўсёды была яго сястрой, а пасля вашага шлюбу з прынцэсай Ядвігай будзе сястрой крэўнай.

В і л ь г е л ь м. Дзякую, ваша вялебнасць.

А л я с н і ц к і. Я перадам прынцэсе, што вы па дарозе ў каралеўства Аўстрыйскае, але ваша сэрца адмовілася ехаць з вамі.

В і л ь г е л ь м. Лепш можа сказаць толькі Пан Бог.

А л я с н і ц к і

Хай Ён і баслаўляе вас. Бывайце.

П р ы н ц кланяецца і выходзіць.

На жаль, кароль нашчадкаў не пакінуў,
Хто заўтра будзе ў Польшчы каралём?
Хто павядзе цябе, мая Айчына,
Да непрадбачных будучых гадоў?
Жанчына — маці і жыцця пачатак,
А тут цяжкі дзяржаўны карабель.
Сярод Еўропы, дзе вятры і буры,
Штурвал рукой жаночай не ўтрымаць.

Уваходзіць А р ц ы б і с к у п.

А р ц ы б і с к у п

Няшчасце!

А л я с н і ц к і

Што? Кароль прадстаў прад Богам?

А р ц ы б і с к у п

Каб так было, то гэта быў бы смутак
І клопат наш: каму аддаць дзяржаву,
А так ён сам карону перадаў!

А л я с н і ц к і

Не можа быць! Каму? Няўжо Марылі?
Ці каралеве-маці?

А р ц ы б і с к у п

Не, не ім!
Ён абвясціў Ядвігу каралевай.
Малодшую з дачок.

А л я с н і ц к і

Ну, гэта, можа,
Зрабіў у непрытомнасці кароль,
І над уладаром хвароба уладарыць.

Аддаць дзяўчынцы Польшчу?! Гэта ўсё
Вар'яцтвам хваравітым мне здаецца...

Арцыбіскуп

Панам сказаць такое паспрабуйце
Ці чэлядзі. Адразу ж будзе бунт!
Ён вывеў сам Ядвігу на балкон
І голасам прамовіў уладарным:
«Мне Бог сказаў: вось ваша каралева!»

Аляснiцкі

Сам выйшаў на балкон?!
Прыкуты ж быў да ложка!
Не першы месяц. Тут без дзіўнай сілы
Не абышлося.

Арцыбіскуп

Д'ябал або Бог
Тут прымяшаўся, нам не гэта важна,
А тое, што Ядвіга — каралева!
А той, хто хутка возьме з ёю шлюб,
Наш будучы кароль і гаспадар!
Не для таго я ўсё жыццё пражыў,
Каб знішчыць Польшчу і зрабіць Карону
Наймічкай у Аўстрыйскага двара.
Вільгельм, як стане польскім каралём,
То Польшчу зробіць Аўстрыяй, бясспрэчна.

Аляснiцкі. Хто ў Польшчы можа стаць мужам для Ядвігі?

Арцыбіскуп. Для прынцэсы Ядвігі жаніхоў багата, для Ядвігі-каралевы іх няма! Але ў Аўстрыі іх няма таксама! Шлюб Вільгельма і Ядвігі я не бласлаўлю!

Аляснiцкі. Дзе ж выйсце?

Арцыбіскуп. У Літве. Трэба неадкладна накіраваць у Вільню паслоў... Прапанаваць вялікаму князю Ягайлу прыняць нашу веру, пасля руку каралевы Ядвігі і польскую карону.

Аляснiцкі. Тое, што чуюць мае вушы, не можа ўспрыняць мой розум. Ягайлу ў каталікі? Кудлатага пушчанскага зубра ў жаніхі высакароднай, вытанчанай Ядвізе? Дзікуна на каралеўскі пасад?

Арцыбіскуп. Лепш з аднаго дзікуна зрабіць караля-паляка, чым усіх палякаў зрабіць шляхетнымі аўстрыякамі.

Аляснiцкі. На Захадзе розум, а на Усходзе ці звычаі дзікунскія, ці страсці. Дык што ж мы выбіраем?

Арцыбіскуп

Скарыць заўжды любую страсць магчыма,
А розуму заўжды скарышся сам,
Паслоў рыхтуйце, едзьце у Літву.

А л я с н і ц к і

А што нам скажа каралева-маці?

А р ц ы б і с к у п

Што Польшчы трэба будзе, тое й скажа.

Уваходзіць п р ы д в о р н ы.

П р ы д в о р н ы

Кароль памёр!

А р ц ы б і с к у п

Вітаем каралеву!

Б’юць гарматы. Усе выходзяць.

## Сцэна пятая

Лес перад замкам у Троках. Уваходзяць В і т а ў т, К у д а ш і р а т н і к і.

К у д а ш

Забегалі па сценах, як мурашкі...
Князь, мы давай падыдзем да варот,
І ты скажы: «Я князь вялікі Вітаўт»
І загадай вароты адчыніць.
Як міралюбца ты паўсюль вядомы,
Народ адчыніць замак прад табой
І здасць табе нягодніка Ягайлу.

В і т а ў т

Ці не занадта часта ён здае
Сваіх гаспадароў без бою і без жалю?

К у д а ш

Такі народ... Ён жыў пад бізуном
Усе часы. Ты толькі лясні пугай,
І ён ужо гатовы прысягаць,
Мяняць, здавацца, каяцца і плакаць.
Я сам такі...

В і т а ў т

Вось гэта праўдай будзе.
Хто там ідзе праз лес? Сюды паклічце.

К у д а ш

Гэй, чалавек! Хадзі сюды! Князь кліча!

З’яўляецца Р а м е с н і к. Праходзіць міма.

Ты з замка? Стой! Куды ты? Во дзівак!
Зірні: тут князь, вялікі Вітаўт.

Р а м е с н і к

Мне ўсё адно, няхай хоць сам архангел,
Абрыдлі ўсе! Згары ваша радня!
Век між сабой грызецеся, сабакі,
Каб некаму на сучку першым скочыць?

К у д а ш

Ах ты, халоп смярдзючы!
*(Б'е Рамесніка.)*

Р а м е с н і к

Бі мацней!
Сячы наводмаш хоць мячом, хоць пугай,
А хочаш, дык і грудзі разарві,
І сэрца у зубах дастань для князя!
Мне ўжо нічога больш не забаліць.

В і т а ў т

Пакінь яго! Што ж у цябе за гора,
Што нават сэрца болей не баліць?

Р а м е с н і к

Прыйшоў твой бацька Кейстут і Ягайлу
Абвінаваціў у страшэннай здрадзе:
Як быццам ён хацеў цябе забіць
І княжыць у Літве аднаасобна.
Мой сын пайшоў да вас тады на службу,
І тут вярнуўся з Віцебска Ягайла,
У акружэнні белых крыжакоў.
І хуткі суд пачаўся. Майго сына
Павесілі за рэбры на крукі,
На вострым кол унука пасадзілі,
Два дні малую ўнучку мардавала
На загуменні княская гайня
За здраду бацькаву! Каму ж, каму ён здрадзіў?!
Хіба служыў не княству, не Літве,
Не роду Гедыміна? Адкажы,
Вялікі Вітаўт, простаму ліцвіну!

В і т а ў т

Ён у гарачцы, дай яму віна.

К у д а ш

Трымай, зямляк...

Р а м е с н і к

Пі сам сваё віно.
Я смагу наталіў крывёй сваіх унукаў.
*(Выходзіць.)*

Р а т н і к і

Ягайлу трэба будзе разлічыцца!
Вядзі нас, князь! Смерць вылюдкам! Пайшлі!

В і т а ў т

Усім маўчаць! Хто да крыві ахвочы
Ці хоча помсціць дзецям за бацькоў,
Няхай ідзе на службу да Арды,
Да крымскіх ханаў, злодзеем у лес!
У княстве месца для такіх не будзе!
Ну, а каму Хрыста святыя вочы
Глядзяць у сэрца, гэтыя за мной.
*(Дастае з похваў княскі меч і ўтыкае яго ў зямлю. Дастае з похваў кінжал і ўтыкае яго ў зямлю.)*

Кудаш і ратнікі робяць тое ж.

Са зброяй больш надзейнай, чым булат,
Іду я на цябе, Ягайла,— крэўны брат!

Усе накіроўваюцца да замка.

## Сцэна шостая

Трокі. Пакой у замку. Я г а й л а з чарай. Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Я г а й л а

Што там за шум?

Л ю ц е н ь

Да князя надта рвецца
Магістр Ліхштэйн — тэўтонскі камандор.

Я г а й л а

Пакліч яго.

Уваходзіць К а м а н д о р.

Ўсіх рыцараў вітае
З удзячнасцю літоўская зямля!
Ваш меч нам дапамог усталяваць
Парушаную ў княстве справядлівасць
І узнавіць законную уладу.

К а м а н д о р

Я прыйшоў
Сказаць: пакінуць сёння Трокі
Ўсе рыцары. Вяртаемся дамоў.
Скажы адкрыць паўночныя вароты,
Праз іх і пройдзе Белы легіён.

Я г а й л а. І ты цяпер пакінуць хочаш Трокі? Цяпер, калі бунтарскія дружыны вядзе з-пад Полацка Кейстут, а з-пад Гародні Вітаўт?

К а м а н д о р. Вы — браты... Мы тут чужыя. Калі вы памірыцеся, ва ўсім вінаватыя будуць рыцары.

Я г а й л а. О, баязлівае племя!

К а м а н д о р. Князь! Я — рыцар! І абразы змываю крывёй. Або сваёй, або крыўдзіцеля. Ці не прасіў я цябе пасля таго, як мы здабылі Вільню і Трокі, не дапускаць гвалту і рабункаў над тымі, хто служыў Кейстуту? Ты абяцаў?

Я г а й л а. Абяцаў.

К а м а н д о р. Ці не прасіў я цябе, калі гвалт пачаўся, прылюдна павесіць гвалтаўнікоў, нават калі яны табе браты родныя? Ты абяцаў?

Я г а й л а. Абяцаў.

К а м а н д о р. Зірні, што робіцца і ў Вільні, і ў Троках. Рэжуць сівых дзядоў, гвалтуюць дзяўчатак, малых на колле саджаюць! Учора дзесяць тваіх ратнікаў забаўляліся з цяжарнай кабетай. На вачах ва ўсіх! Тая выхапіла нож і з праклёнам, табе, князь, табе, прапарола сваё запаскуджанае лона! Ты верыш, што гэты праклён не даляціць да вушэй Бога? Ён ужо даляцеў. Сёння ўначы зарэзаны адзін з маіх рыцараў. Просты люд лічыць, што ва ўсім вінаватыя мы, бо мы — чужынцы. Як жа вы так адзін з адным абыходзіцеся, браты?

Я г а й л а. Наш народ здрады не даруе.

К а м а н д о р. А калі вернецца Кейстут, будуць рэзаць тых, хто служыў табе?

Я г а й л а. Будуць.

К а м а н д о р. І таксама за здраду?

Я г а й л а. І таксама за здраду.

К а м а н д о р. Адчыняй вароты. Рыцары пойдуць. Зразумей, князь, просты люд павінен слухаць гаспадара, кім бы ён ні быў. І гэта яго вартасць, а не загана. За гэта трэба хваліць, а не забіваць! Помста — зброя слабых.

Я г а й л а. У цяжкі час ты пакідаеш мяне, Камандор.

К а м а н д о р. Ордэн абяцаў дапамагчы вярнуць табе пасад. Пасад вярнулі. Ордэн не абяцаў быць стражнікам у вялікага князя. Хай твае ратнікі выкажуць мужнасць у бойцы з тваім ворагам. А не з дзявочымі спадніцамі... Загадай адчыніць вароты.

Я г а й л а

Гэй, Люцень!

Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Вароты для тэўтонцаў адчыніць!

Л ю ц е н ь. Як? Адчыніць?

Я г а й л а

Хай ціха адыходзяць.

Л ю ц е н ь *(крычыць)*

Вароты для тэўтонцаў адчыніць!

К а м а н д о р

Спрыяе князю хай магутны Божа!
Бывай.

Я г а й л а

Бывай. Бывай і дзякуй
За ўсё, што ты зрабіў і не зрабіў.
Ніхто не давядзе свой дом да ладу,
Калі ты сам яго не давядзеш.

К а м а н д о р выходзіць.

Люцень!

Л ю ц е н ь. Слухаю князя!

Я г а й л а. Усіх, хто з сённяшняга ранку будзе заўважаны ў рабунках, гвалтах ці забойствах,— імем вялікага князя Ягайлы вешаць! П'яных ратнікаў секчы бізуном! Усім, хто прысягаў Кейстуту,— дараваць! Нарабаванае — вярнуць. Хто там напаскудзіў з цяжарнай?

Л ю ц е н ь. Адзін з сотнікаў.

Я г а й л а. Імя!

Л ю ц е н ь. Рабыд. З ім яшчэ некалькі ратнікаў...

Я г а й л а. Самому сотніку і двум ратнікам галовы адсекчы і прыбіць над варотамі.

Л ю ц е н ь. Хай князь даруе, але гэта лепшая сотня ў князя.

Я г а й л а. Калі я паўтару яшчэ раз, і твая галава будзе над варотамі! Жанчына зарэзалася?

Л ю ц е н ь. Зарэзалася.

Я г а й л а. Абвясціць люду, што пакаранне за яе. Пайшоў!

Л ю ц е н ь выходзіць. Чуваць шум і спалоханыя выкрыкі: «Вітаўт! Вітаўт!» Л ю ц е н ь вяртаецца.

Л ю ц е н ь

Секчы галовы ўжо няма патрэбы,
Яны і ў бітве з плеч далоў зляцяць,
Падходзіць Вітаўт!

Я г а й л а

Вось і ўсё, здаецца,
Без рыцараў зубра нам не стрымаць.

Уваходзіць Л у ч н і к.

Л у ч н і к

Хай князь даруе. Першы раз такое
Я дзіва бачу. Без мячоў ідуць

І пешкі цераз поле напрасткі,
А дроцікі, мячы, нажы і коп’і,
Як голы лес, паўстаў здалёк сцяной,
І коні засталіся за спіной.

Л ю ц е н ь

Я адчуваю: хітрасць Вітаўт ладзіць.
Гэй, лучнікі! Са сценаў дружны залп!
Хай ведаюць, што мы не паддадзімся!

Паляцелі стрэлы.

Ну, што цяпер?

Л у ч н і к

Ідуць, як і ішлі,
З-пад ног паднялі стрэлы нашы. Ломяць.

Л ю ц е н ь

Прыгатаваліся!

Я г а й л а

Нікому не страляць!
Адкрыць вароты! Ўсім стаяць на месцы.

Л ю ц е н ь

Князю, мы здамо сябе на міласць?
Другі раз на няславу і на ганьбу?
Сабе ты здрадзіў, я табе не здраджу!
Хай гэта кожны будзе ў княстве знаць!
*(Страляе з арбалета.)*

Ягайла выхапіў меч і б’е плашмя Люценя.

Я г а й л а

Сказаў жа ўсім: нікому не страляць!

Уваходзіць В і т а ў т са сваім атрадам.

В і т а ў т. Ты вольны забіць мяне адразу і вольны выслухаць.

Я г а й л а. Гавары.

В і т а ў т. Калі тое, што я скажу, не кране твайго сэрца, ты павінен будзеш мяне забіць. Калі ты не зробіш гэтага, некалі цябе заб’ю я, брат мой. Калі ж словы мае душа твая прыме, ты пойдзеш у поле і прынясеш мне мой меч! Бо я першы раз і воляй вольнаю ўваткнуў яго ў зямлю.

Я г а й л а. Гавары.

В і т а ў т. З часоў сівога Рагвалода і пакутнай Рагнеды не ведаем ні шчасця, ні спакою. Нашы жонкі нараджаюць для смерці і пакут! Зірні наўкола: гэта не балоты дыхаюць пад нашымі нагамі — гэта зямля набрыняла крывёй ліцвінаў і продкаў іх. Хто

нас пракляў і за што? Там туркі, там татары, там тэўтонцы, там маскавіты, там Польшча. З нашых целаў і з нашых душ зрабілі рысталішча, дзе цкуюць адзін аднаго! Мы абязлюдзелі, сцяклі крывёй, наш гонар, наша годнасць пад конскімі капытамі чужынцаў. Ліцвін-дзіцёнак крычыць, выходзячы з жаночага лона, бо адчувае, што нарадзіўся для пакут, прыніжэння і здзекаў! Князь Ягайла! Прыйдуць часы, калі прыгожыя ліцвінкі згубяць здольнасць насіць жыццё пад сэрцам. Наша семя змярцвее! Ты гэтага хочаш?

Я г а й л а. Гэтага я не хачу...

В і т а ў т

Чаму ж ты сёння памагаты тым,
Хто выкрасліць з жыцця ліцвінаў хоча?
Ты меч падняў. І ты пачаў вайну.
І з кім? З сабой. Бо ты ўнук Гедымінаў,
Як Кейстут і Альгерд. Як я і як яны!
Што ж сёння? Брат гатовы рэзаць брата!
Татары мала рэзалі, дык мы
Паможам ім народ свой перарэзаць?

Я г а й л а

Паўстаў абараніць я свой пасад,
Што Кейстут захапіў гвалтоўна і знянацку!

В і т а ў т

Дадай: калі ты змову вёў супроць
Дзядзькі і брата з ордэнам Тэўтонскім!
Ты абяцаў абодвух нас забіць,
З тэўтонцамі зрабіць адну дзяржаву
І паўнаўладна ёю кіраваць.

Я г а й л а

Ты ж ведаеш, што я пісаў няпраўду!
Хто шчыры у палітыцы, дык той
Што немаўля і кіраваць няздольны
Ні княствам, ані войскам, ні людзьмі!

В і т а ў т

Сказаць усё раней было б патрэбна,
Адразу, калі гэта напісаў!
І я б паверыў, зразумеў бы й Кейстут.

Я г а й л а

На жаль, сказаць я гэта не паспеў,
Вы разам з бацькам захапілі Вільню.

В і т а ў т

Ну, а цяпер ты захапіў яе...
А заўтра Кейстут зноў яе здабудзе!
Кроў, кроў і кроў! І вось табе: прыходзь,

Хоць рыцар, хоць татарын, і утульна
Садзіся на скрываўлены пасад!
З прыдуркаў жа ліцвінаў пацяшайся,
Яны ў сябе табе адваявалі
Прастору і уладу. Так ці не?

Я г а й л а

Няпраўду, Вітаўт, ты казаць няздольны.

В і т а ў т

Калі так лічыш — прынясі мой меч.

Я г а й л а

Вось мой бяры, хай твой зямля трымае,
Як горкі напамін, ад брата брату,
Каб не губляў братэрскую любоў.
*(Аддае меч.)*

Вітаўт прымае.

К у д а ш

Вялікія князі! А што рабіць падданым?
Нашы мячы таксама у зямлі!
Яны заўжды рыжэлі ад крыві
Літвы і княства ворагаў заклятых,
А вось цяпер зрыжэюць ад расы!

Л у ч н і к

Вось мой бяры. Я твой знайду у полі.

Ратнікі Ягайлы з паклонам аддаюць мячы ратнікам Вітаўта. Абдымаюцца.

Я г а й л а

Ўсе ў Вільню! Змацаваць спакой і мір
Віном патрэбна! Ўсіх завём на пір!

Л ю ц е н ь

Мір — гэта час, калі ўсе точаць зубы
Для новай бойкі і для новай згубы.

Трубяць у рог. Усе разыходзяцца.

## Сцэна сёмая

Крэва. Стан дружын Кейстута. Уваходзяць К е й с т у т і А м у л і ч.

А м у л і ч

Вялікі князь,— ганцы.

К е й с т у т

Адкуль?

А м у л і ч

Прыслаў Ягайла.

К е й с т у т

Ягайла? Да мяне?
Ганцоў? Што ён уздумаў?
Меч і страла ганцы яму цяпер.
І ўсё ж пакліч.

А м у л і ч

Заходзьце, князь чакае!

Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Л ю ц е н ь. Вялікі князь Ягайла вітае вялікага князя Кейстута, жадаючы свайму дзядзьку здароўя і славы!

К е й с т у т. У княстве салаўі ўжо не спяваюць.

Л ю ц е н ь. Даруй, князь, я кажу чужыя словы.

К е й с т у т. Чые?

Л ю ц е н ь. Князя Ягайлы.

К е й с т у т. Ён успомніў, што мы родзічы?

Л ю ц е н ь. Разам з князем Ягайлам цябе вітае твой сын — вялікі князь Вітаўт.

К е й с т у т. Дзе Вітаўт?

Л ю ц е н ь. Пакуль ты вядзеш у Вільню ратнікаў, яны ў Вільні п'юць віно: Ягайла з мядзянай чары, Вітаўт са срэбнай, а залатая чакае цябе.

К е й с т у т. Брэшаш!

Л ю ц е н ь. Не. Кажу чужыя словы: залатая чара чакае цябе! У княстве — мір. Перад Вітаўтам адчыніліся вароты Трокаў, і Ягайла аддаў яму свой меч. Ратнікі абодвух князёў змагаюцца з бочкамі і падаюць п'янымі адзін на аднаго, як пры лютай сечы... Калі ты прывядзеш сваіх, у Вільні не хопіць віна...

К е й с т у т. Што гэта? Варажба? Ці Боскі цуд? Вітаўт змог адзін узяць Трокі?

Л ю ц е н ь. І Вільня адчыніла перад ім свае вароты.

К е й с т у т. Ягайла здаўся на міласць?

Л ю ц е н ь. Ягайла аддаў свой меч.

К е й с т у т. Іх ратнікі піруюць разам?

Л ю ц е н ь. О, гэта раней былі ратнікі Ягайлы і Вітаўта, а цяпер гэта войска п'янтосаў.

К е й с т у т. Падман!

Л ю ц е н ь. Вось грамата ад сына. Руку і пячатку Вітаўта князь, спадзяюся, ведае. *(Падае грамату.)*

Кейстут чытае.

К е й с т у т. Паверыць не магу.

Л ю ц е н ь. Калі не верыш мне, што зразумела, не верыш вачам сваім, што зразумела менш, можа, паверыш вушам і вачам адначасова?

Уваходзіць К у д а ш.

К у д а ш

Я рады, што вітаю бацьку-князя!

К е й с т у т

Дзе Вітаўт? Неадкладна адкажы!

К у д а ш

Калі я ад'язджаў, то быў забіты!

К е й с т у т

Забіты?

К у д а ш

Так. Зарэзаны віном,
Ляжаў, як сноп. Вось так. Са срэбнай чарай,
Абліты, як крывёй, густым напоем.
І нават не стагнаў, а толькі хроп.
Ягайла той і ўвогуле не можа
Аджыць. І толькі п'е расол.
Калі вайна заўжды такою будзе,
Я ўсё жыццё гатовы ваяваць.

К е й с т у т

Аддаў Ягайла меч?

К у д а ш

Аддаў, вядома.
І нават мне свой нехта перадаў
З паклонам. Я ж згубіў па п'янцы недзе.

К е й с т у т *(перачытвае грамату)*. «Адсылай назад полацкае войска, бо ўжо няма ў ім патрэбы. Чакаю цябе ў Вільні. Вялікае княства жадае, каб ім кіравалі супольна. Хай будзе мір для ўсіх ліцвінаў! Вітаўт». Рыгор!

Уваходзіць А м у л і ч.

Ад майго імя загадай ваяводам, каб здымалі лагер і вярталі войскі. Скажы, што полацкія ратнікі перамаглі Вільню пад Крэвам, не падымаючы мячоў. У княстве — мір.

А м у л і ч. Дзякуй табе, Божа! *(Выходзіць.)*

К е й с т у т. Ну, а добрым вешчунам — добрага віна!

К у д а ш. Эх, ваяваць дык ваяваць!

Л ю ц е н ь. Вялікая падзяка князю, толькі я павінен скакаць у Вільню, каб не адзін вялікі князь быў з добрай весткай.

К е й с т у т. Ад чаркі весялей паскача конь.

П'юць віно.

А што робяць тэўтонцы ў Вільні?

К у д а ш. Не ведаю, бо з імі я не піў. Лучнікі казалі, што яны адмовіліся браць удзел у бойцы і збеглі праз паўночныя вароты.

К е й с т у т. Значыць, Ягайла застаўся адзін без падтрымкі Ордэна?

К у д а ш. Выходзіць так.

К е й с т у т. І толькі пасля гэтага аддаў свой меч Вітаўту?

К у д а ш. Выходзіць так. Мы ўваткнулі свае мячы ў зямлю на вачах ва ўсіх і падышлі да Трокаў, не зважаючы на стрэлы.

К е й с т у т

А хто вам загадаў прыехаць да мяне,
Прасіць, каб з Крэва войска павярнула?

К у д а ш

Прасіў Ягайла, Вітаўт — загадаў.

К е й с т у т

Усё зразумела! Дагані слугу.
Скажы, што я загад свой адмяняю!
У Вільню пойдзе войска!

Л ю ц е н ь

Не, не пойдзе.

К у д а ш

Ты што, здурэў? Пярэчыць будзеш князю?

Л ю ц е н ь

Загад, мой князь, не трэба адмяняць!
*(Забівае мячом Кудаша.)*

К у д а ш

Тут здрада! Князь, хутчэй... хутчэй ратуйся!
*(Падае мёртвым.)*

К е й с т у т

Вось, Вітаўт! Вось твая спагада
І дабрыня. Вужака, ты памрэш
Ад гнеўнае рукі старога князя!
*(Б'ецца з Люценем.)*

Люцень выбівае ў Кейстута меч.

Л ю ц е н ь

Рукой старэчай, княжа, трэба гладзіць
Свае даўно сівыя валасы.
Мячамі ж хай махаюць маладыя!

К е й с т у т

Кроў бацькава, мой сыне, на табе!

Л ю ц е н ь

Крыві баішся? Дык яе не будзе!
Хай Вітаўт твой заўжды спакойна спіць.
*(Накідвае на шыю Кейстуту засморгу і душыць.)*

К е й с т у т

Рыгор, сюды! На дапамогу князю!
*(Памірае.)*

Л ю ц е н ь

Слуга аддасць загад і прыйдзе у пару,
Каб у нябыт пайсці служыць гаспадару.

З'яўляюцца К у п а л а і б е р а ж н і ц ы.

К у п а л а

Хто ад сябе смяротную стралу
Адпусціць у другога чалавека —
Той сваім сэрцам стрэне яе сам,
Калі мінулым势 стануць цьмяныя стагоддзі
І ўсе забудуць бойкі, сваркі, звадкі,
Ўвап'ецца ў сэрца здзіўленых нашчадкаў.

Б е р а ж н і ц ы *(спяваюць)*

Устань і пойдзем з намі. Ты не князь,
Не дзед, не бацька і не мужны віцязь.
Зямля, якой служыў, аддаўшы сілы,
Цябе да нас нарэшце адпусціла.
*(Танцуюць над нерухомым целам Кейстута.)*

## Сцэна восьмая

Вільня. Двор замка. Р а т н і к і балююць. Уваходзяць В і т а ў т і Я г а й л а.

В і т а ў т

Павер, мне ўсё адно, хто з нас вялікі князь,
Было б адно: мір у Вялікім княстве
І моц яго. Каб жыў наш родны край,
Квітнеў і рос для будучых нашчадкаў.

Я г а й л а

П'ю за тваё здароўе, добры брат!
Хай шмат мы для Айчыны нашай здзейснім.

П'юць.

В і т а ў т

Ганцы не прыбылі яшчэ з-пад Крэва?

Я г а й л а

Няма яшчэ. Павінны б прыскакаць,
Ці мо ўжо недзе ў Кейстута гуляюць?

Уваходзіць В а я в о д а.

В а я в о д а

Вялікі князь! Тут польскія паслы.

Я г а й л а

Каго з князёў вялікіх яны хочуць?
Мяне ці Вітаўта?

В а я в о д а

Сказалі, што цябе.

В і т а ў т

Твой абавязак княствам кіраваць,
А я пайду з дружынай баляваць.
*(Выходзіць.)*

Уваходзяць А л я с н і ц к і і п а с л ы.

А л я с н і ц к і. Каралеўскі сойм Польшчы вітае вялікага князя Ягайлу! Хай Пан Бог не пазбаўляе ласкі тваё княства.

Я г а й л а. Дзякую. Чаму ваша прывітанне толькі ад каралеўскага Сойма? Хіба кароль не вітае Вялікае княства Літоўскае?

А л я с н і ц к і. Спадзяюся, што ён моліцца за яго, укленчыўшы перад самім Панам Богам.

Я г а й л а. Кароль Людвік памёр?!

А л я с н і ц к і. Тры дні, як мы сіроты. Каралеўскі сойм упаўнаважыў нас зрабіць вялікаму князю прапанову.

Я г а й л а. Я слухаю.

А л я с н і ц к і. Калі вялікі князь Ягайла прымае нашу веру...

Я г а й л а. Каб я... дый стаў каталікам? Вось гэта прапанова!

А л я с н і ц к і. Хай вялікі князь даслухае. Прыняўшы каталіцызм, вялікі князь Уладзіслаў...

Я г а й л а. Хто такі Уладзіслаў?

А л я с н і ц к і. Гэта імя ў новым хрышчэнні вялікага князя Ягайлы. Прыняўшы новую веру, князь Уладзіслаў бярэ шлюб з дачкой караля Людвіка.

Я г а й л а. Я і так вялікі князь. Навошта мне яшчэ рабіцца прынцам?

А л я с н і ц к і. Хай вялікі князь дазволіць мне скончыць. Польскім прынцам вялікі князь, на жаль, не зможа стаць. Кароль перад смерцю перадаў карону адной з дачок. Польшча мае каралеву, а той, хто стане мужам каралевы...

Я г а й л а. Кароль... І якая ж з дачок носіць карону? Марыля?

А л я с н і ц к і. Ядвіга.

Я г а й л а. Малодшая?! Ядвіга?!

А л я с н і ц к і

Так. Яна.

Я г а й л а

Нябёсаў залатых чароўнае стварэнне!
Я згодны! Тут уладу перадаць
Мне давядзецца брату або дзядзьку?

А л я с н і ц к і

Як перадаць уладу? Князь, ты што?
Жаніх заўжды павінен быць з палацам.

Ну а нявеста мае свой пасаг.
Пасаг Ядвігі — Польская Карона,
А твой пасаг: Літва, Жамойць і Русь.
Як-небудзь тут з братамі разбярыся,
Мы ж адступнога жаніхам дамо.
А іх у каралевы... ой, багата!
Літва патрэбна Польшчы. Польшча — ёй.
Табе ж патрэбны Польшча і Літва
З чароўнаю Ядвігаю ў дадатак.
Прымай рашэнне зараз, бо чакаць
Не мае часу наша каралева.
Вільгельм, аўстрыйскі прынц, стаіць пасля цябе.

Я г а й л а

Калі у Кракаў мне патрэбна ехаць?

А л я с н і ц к і. Чым хутчэй, тым лепш. Там з нецярпеннем чакаюць жаніха Польскай Кароны. Прымі ад сваіх будучых падданых гэтыя сціплыя дарункі. Залаты пярсцёнак і залаты палаш.

Паслы з паклонам падносяць дарункі Ягайлу.Ягайла здымае з шыі амулет.

Я г а й л а. Перадайце польскай каралеве.

А л я с н і ц к і. Што гэта?

Я г а й л а. Зуб сівога пушчанскага зубра. Хай павесіць на шыю і не здымае нават у лазні.

А л я с н і ц к і. Каралева будзе надзвычай рада.

Я г а й л а. Зубра здабыў мой прадзед. Гэты зуб ратуе ад хвароб, адганяе нячысцікаў...

А л я с н і ц к і. О, літасцівы Божа!

Я г а й л а. ...Адводзіць пошасць і праклёны... Скажыце чароўнай Ядвісі, што я гатовы кінуць да яе ног і княства, і ўвесь свет, а аддаю пакуль самае дарагое, што маю. Вас адвядуць у лепшыя пакоі...

А л я с н і ц к і. Удзячны мы табе, вялікі князь, але тваю згоду чакае ўся Польшча, і мы павінны прывезці яе найхутчэй. Няхай жыве Вялікае княства Літоўскае!

Я г а й л а

Няхай жыве Польшча!

П а с л ы кланяюцца і выходзяць.

Я пазаўчора віцебскім быў вязнем,
А ўчора мог загінуць ад мяча.
І раптам сёння я жаніх Ядвігі,
А заўтра ў Польшчы уладар-кароль...
Я ведаю, што зоркі мне спрыяюць
І ўсе мяне навалы абмінуць.

Уваходзіць В а я в о д а.

В а я в о д а. Вялікі князь! Аднекуль з'явіўся паранены ратнік. Нож у грудзях тырчыць, дастаць не дае, шукае Вітаўта...

Л у ч н і к  і  р а т н і к і  прыводзяць скрываўленага А м у л і ч а.

А м у л і ч. Вялікі князь! Скажы, дзе Вітаўт... Я даскакаў жывым яго пабачыць...

Я г а й л а

Адкуль ты?

А м у л і ч

З Крэва.

Я г а й л а

Дай дастану нож!

А м у л і ч

Не трэба. Ён душу ў грудзях трымае.
Дзе Вітаўт, адкажы, вялікі князь?

З'яўляецца В і т а ў т.

В і т а ў т

Хто мяне кліча?

Я г а й л а

Гэты мужны ратнік.
*(Вырывае з грудзей Амуліча нож.)*

Амуліч павіс на руках у Лучніка.

В і т а ў т

Рыгор Амуліч? Бацькаў верны стражнік?
Найлепшы ён у Кейстута. Што з ім?

Я г а й л а

Не ведаю. Прасіўся да мяне,
Скрываўлены, вось нож з яго грудзей
Дастаў я, каб хутчэй перавязаць.

В і т а ў т

Няма ўжо сэнсу. Зараз ён памрэ.
Нож не даваў крыві ракою ліцца.

А м у л і ч *(апрытомнеў)*

Ратуйся, Вітаўт! Каля Крэва бацька
Задушаны рукой яго слугі,
І верны твой Кудаш мячом забіты
Пасля таго, як войскі адаслаў
Назад у Полацк князь вялікі Кейстут,
Як ты прасіў у грамаце сваёй...
Даруй, што не збярог слуга старога князя...
*(Памірае.)*

Я г а й л а

Усё ён трызніць!

В і т а ў т

Гэта не трызненне.
Здаецца мне, што трызніў толькі я,
Калі пачвары гэтакай паверыў!
Дзе Люцень твой, паўзучая змяя?!

Я г а й л а

Ён звар'яцеў! Схапіць яго, дружына!

В і т а ў т

Смерць лютую хай схопіць найхутчэй
Усё тваё асінае гняздо!
*(Кідаецца з мячом на Ягайлу.)*

Лучнік становіцца паміж імі і прымае ўдар на сябе.

Л у ч н і к

Князі! Князі! Пакуль жывыя мы,
Хай брат не забівае свайго брата...
*(Памірае.)*

Вітаўт б'ецца з ратнікамі Ягайлы. На яго навальваюцца і адбіраюць меч.

Я г а й л а

Звязаць і патаемна звезці ў Крэва.
Ён захварэў.

В і т а ў т

Ты ж здохнеш без хвароб!
Дружына, да мяне!

Я г а й л а

Паслухай, Вітаўт...
Твой брат не вінаваты прад табой.

В і т а ў т

Ты брат змяі, што прагна паядае
Дзяцей сваіх, усіх, каго народзіць!

Я г а й л а

Калі загінуў князь вялікі Кейстут,
Хто ў гэтым вінаваты, той заплоціць.
Альгердам я клянуся, сваім бацькам!

В і т а ў т

Цябеваўчыца некалі радзіла!
І бацька твой — пушчанскі люты воўк!

Я г а й л а

У Крэва! І трымайце пад аховай,
Нікога да яго не падпускаць!
Праз колькі дзён прыеду — разбяруся.

Што тут пачулі — зараз жа забыць!
Я б сам па мужным Кейстуту заплакаў,
Няма калі, мяне чакае Кракаў.

Звязанага В і т а ў т а выносяць. Усе разыходзяцца.

# АКТ ДРУГІ

## Сцэна першая

Гародня. Пакой у замку Вітаўта. А л ё н а расчэсвае к н я г і н і А н н е валасы.

А л ё н а *(спявае)*
Белая бяроза не цярэблена,
Суччайка, веццейка не падберана.
Хлопчыкі, малойчыкі, падцерабіце,
Суччайка, веццейка падбярыце,
А мая княгенечка не прыбрана,
Русая косачка не зачасана.
Дзевачкі, падружачкі, прыбярыце,
Русую косачку зачашыце.

К н я г і н я А н н а
Што праспявала зараз ты, Алёна?

А л ё н а
А гэту песню ў нашым родным краі
Пяюць, як прыбіраюць маладую.
Ёй косы расплятаюць, гладка чэшуць...

К н я г і н я А н н а
Адкуль ты родам?

А л ё н а
З Полацкага княства.
Наш князь маіх бацькоў вам падарыў.

К н я г і н я А н н а
А ў нас інакш спяваюць.

А л ё н а
Гэта праўда,
Колькі людзей, то й столькі галасоў,
Колькі мясцін, то й столькі добрых песень.

К н я г і н я А н н а
А вось паслухай, як у нас спяваюць.

А л ё н а
Спяваць княгіням не да твару, кажуць.

К н я г і н я  А н н а *(спявае)*

Дзевушкі, мае падружкі,
Вазьміце мяне пад ручкі,
Пасадзіце мяне на дзяжу,
Чашыце маю галаву.
Ціхонька галоўку чашыце,
З русых кос валасоў не рвіце,
Ета, ой, косанька расчасоная,
Піўцом галава мачоная...
У вас чым косы мажуць маладой?

А л ё н а. Мёдам.

К н я г і н я  А н н а. А ў нас півам.

А л ё н а. Півам?

К н я г і н я  А н н а. Півам.

А л ё н а

Ну, мёдам, каб салодкая была.
А півам?

К н я г і н я  А н н а

Каб сп'яняла целам мужа!

Смяюцца. З'яўляецца К у п а л а.

К у п а л а *(да Алёны)*

Твой сын, твой брат, твой бацька, твой каханы
Паранены і звязаны ляжыць
У Крэве і чакае паратунку.
Князёўну ў падарожжа прыгатуй,
Ратуй яго, ратуй яго, ратуй...

К н я г і н я  А н н а

Алёна, што? Чаму ты ўся збялела?

А л ё н а

Я маю дар ад продкаў адчуваць
Хваробу і няшчасце чалавека
Мне блізкага. Хоць на краі зямлі
Няхай ён будзе, а калі бяда,
Яна у маім сэрцы адгукнецца.

К н я г і н я  А н н а

Няўжо цяпер цябе здалёк гукае
Брат ці сястра? Ці маці?

А л ё н а

Муж твой — Вітаўт.
У Крэве ён паранены ляжыць,
Цябе й мяне чакае у цямніцы.

К н я г і н я  А н н а

Князь Вітаўт у цямніцы? Смешна мне.
І чым жа блізкі ён табе, Алёна?

А л ё н а

Той, хто, як маці, любіць гаспадыню,
Не можа не любіць гаспадара.
Хутчэй у Крэва!

К н я г і н я А н н а

Вітаўт жа у Троках!

А л ё н а

Княгіня, я малю, мяне паслухай!
Не маніць аніколі сэрца мне.

К н я г і н я А н н а

Ну, добра, добра, заўтра мы паедзем.

А л ё н а

Не заўтра! Сёння! Як мага хутчэй!
Бо заўтра быць патрэбна нам у Крэве,
Каб князя для цябе уратаваць!

К н я г і н я А н н а

Мо ты й напраўду з роду ведуноў,
Бо я ўжо адчуваю хваляванне
І у грудзях халодны неспакой.

А л ё н а

Прывесці коні загадаю я!

К н я г і н я А н н а

Мы найхутчэй павінны быць у Крэве!

Выходзяць.

К у п а л а

Ў каханні сэрца дзівіць і вяшчуе,
А без яго не бачыць і не чуе.
*(Раствараецца ў прасторы.)*

## Сцэна другая

Кракаў. Касцёл. А р ц ы б і с к у п і Я г а й л а на каленях.

А р ц ы б і с к у п

Усё, сын мой, цяпер перахрысціся,
У новай веры — новы чалавек.

Ягайла хрысціцца па-каталіцку.

Я г а й л а

Нязвыкла... Адкажы, святы айцец,
Як Бог...

А р ц ы б і с к у п

Пан Бог.

Я г а й л а

Ну хай сабе і Пан!
Як Ён не ўсталяваў адзін парадак?
Адзін закон і веру для людзей?
Хрысту і Рым, і праваслаўе служаць,
І ўсё ж здаўна грызуцца між сабой.
Ад Захаду — антыхрысты на Ўсходзе,
А ад Масквы — вы ворагі Хрысту.

А р ц ы б і с к у п

Не вы, а мы, мой сыне Ўладзіслаў,
Ад гэтых дзён і ты ужо католік.
У праваслаўі, сын мой, больш паганства,
Чым веры хрысціянскай. Іх папы
На святароў языцкіх больш падобны,
На ведуноў, што служаць Перуну.

Я г а й л а

Тут папа, там папы, а дзе ж Ісус Хрыстос?
Да нашых душ Ён так і не прырос.

А р ц ы б і с к у п

Ідзі! Цябе чакае каралева.

## Сцэна трэцяя

Кракаў. Каралеўскі палац. А л я с н і ц к і і Я д в і г а.

А л я с н і ц к і

Дзіця маё, цябе абраў сам Бог —
Айчыну нашу, Польшчу узвялічыць.

Я д в і г а

Святы айцец, каб нешта узвялічыць,
Няўжо сябе трэба стаптаць у бруд?
Вільгельма я люблю, а не Ягайлу!

А л я с н і ц к і. Вільгельма ты магла любіць прынцэсай! Для каралевы пачуцці — раскоша. Гэта абавязак і цяжкі крыж.

Я д в і г а. Я не здолею яго несці.

А л я с н і ц к і. Айцец наш нябесны ніколі не ўскладзе на чалавека той цяжар, які чалавеку не пад сілу. Цябе ніхто не думаў рабіць каралевай. Каб не Яго воля, ты б была ўжо жонкай Вільгельма і прынцэсай аўстрыйскай.

Я д в і г а. Гэта была воля майго бацькі!

А л я с н і ц к і. Хто памірае, вуснамі таго сам Бог гаворыць.

Я д в і г а. Няўжо Бог хоча, каб я пайшла ў абдымкі дзікуна?

А л я с н і ц к і. Гэты дзікун — уладар Вялікага княства. Княства, аб якое разбіваюцца хвалі татарскай навалы. Ваша вялікасць, няўжо вы не хочаце, каб гэта княства называла сябе Каронай? Ці вы не дачка Польшчы?

Я д в і г а. А ці ўсё павінна рабіць дачка дзеля маці сваёй?

А л я с н і ц к і. Дзеля маці не ўсё, дзеля Айчыны — усё.

Я д в і г а. Я павінна пабачыць Вільгельма.

А л я с н і ц к і. Няма патрэбы. Прынцу яшчэ ўчора паведамлена, каб ён не спадзяваўся на руку польскай каралевы.

Я д в і г а. І на сэрца?

А л я с н і ц к і. Сэрца каралёў у руцэ Боскай. Ты возьмеш на сябе смеласць распараджацца тым, што трымае Ён? Скарыся Яго волі і зрабі Айчыну шчаслівай.

Я д в і г а

А што, калі адмовіцца я мушу?

А л я с н і ц к і

Тады кроў Польшчы будзе на табе!
Мы лічым, што Пан Бог цябе абраў
Дзяржавы служкай і анёлам веры,
Што панясе яе ў пушчанскі край
І між ліцвін паганскіх распаўсюдзіць
Збавіцеля адзіны існы вобраз
І веры каталіцкай светлы дух!
Ты вольная абраць усё людское,
Жыць для сябе! Вільгельму ўсё аддаць!
І песціць сваё цела ў асалодзе!
Тады для Польшчы будзе Боскай карай,
Выпрабаваннем, крыжам на плячах
І заняпадам твой пасад, Ядвіга!
Ты — выбірай, мы прымем... Ўсё ад Бога.

Я д в і г а *(падае на калені)*

Даруй мне, о, даруй, святы айцец!

А л я с н і ц к і

Ядвіга-каралева, падыміся.
Ядвіга-маці і сястра — заплач.

Ядвіга падымаецца.

Будзь мужнай, цябе просяць твае дзеці,
Ты сёння сваё цела аддаеш,
Як мудраяваўчыца, ваўчанятам
На ростанях спустошанай зямлі,
Каб выжылі і каб далей пайшлі!
*(Выходзіць.)*

Я д в і г а

О, Маці Боска! Памажы! Ці ж я стрываю?!
Што сэрца адмаўляе — я прымаю...

Уваходзіць Я г а й л а.

Я г а й л а

Сястру вітае брат! Князь — каралеву.
І, ўкленчыўшы, уся Літва, Жамойць і Русь
Вітаюць вас, чароўная Ядвіга!

Я д в і г а. Я буду вашай жонкай, князь. Няма маёй волі, ды тое, што напісана на нябёсах, не нам перапісваць.

Я г а й л а

Я не хачу быць вам агідным мужам,
Дазволь мне толькі быць тваім рабом!
Клянуся пушчай, сонцам і зямлёю —
Ні дотык мой, ні позірк, ані слова
Цябе ні ў чым ніколі не абразяць.
Ты — вольная любіць каго захочаш!
Дай служкаю любові гэтай быць...

Я д в і г а

Даволі, князь! Спыніцеся!

Я г а й л а

Я сам употай ноччу прывяду
Абранніка. І буду вартаваць
Каханне ваша. Як сабака верны
Спакой гаспадароў вартуе ля дзвярэй.

Я д в і г а. Князь Уладзіслаў! Я дачка караля! І мне вядома, што такое абавязак!

Я г а й л а

Што абавязак закуе і звяжа,
Дык сэрца вызваліць, адпусціць і развяжа!

Я д в і г а. Я не абяцаю вам кахання, але вернасць і павагу захаваю да смерці. Карона — ваша.

Я г а й л а

Не трэба ні карона, ні пасад,
Ні золата, ні срэбра, ні алмазы!
Дай толькі побач жыць з табой і дыхаць
Паветрам, тым, што вусны цалавала
Найлепшага стварэння Пана Бога!

Я д в і г а. Даволі!

Я г а й л а

Каханая! Цябе адну чакаў,
Чакаю і чакаць да смерці буду!
Хай рай мне прапануюць без цябе —

Адмоўлюся! Не варта звацца раем
Усё, што не асвечана табой.
Тваёй усмешкай, постаццю, вачыма.

Я д в і г а. Князь!

Я г а й л а

Я сам у пекла лютае пайду
І прашапчу закляцце, як малітву.
Імя святое для мяне Яд-ві-га.

Я д в і г а. Князь, вы грэшнік!

Я г а й л а

І ў гэтым пекле з'явяцца святло,
Любоў, і радасць, і маё збавенне,
Каханая! Ты для мяне — закон.
Скажы, каб знік,— я назаўсёды знікну.
І рэштку дзён у пушчы правяду.
Скажы забіць сябе — я пракалю
Кінжалам сэрца, у якім твой вобраз.
Не пашкадую сэрца! Пашкадую,
Што разам з сэрцам вобраз згіне твой.

Я д в і г а

Князь!

Я г а й л а

Я пайду...

Я д в і г а

Падайце, рыцар, мне сваю руку.

Ягайла бярэ руку Ядвігі, цалуе і падае ў непрытомнасці.

Сюды! Дапамажыце! Князю дрэнна!

Прыбягаюць в а р т а і А л я с н і ц к і.

Збялеў увесь! Ляжыць, як нежывы!

А л я с н і ц к і

Што ён зрабіў?

Я д в і г а

Руку пацалаваў.

А л я с н і ц к і

Пацалаваў руку і змаху вобзем?!
Гарачы муж. Падайце нам віна!
Ад шчасця, каралева, не ўміраюць.
У сэрцы князя закіпела кроў.

Я г а й л а *(апрытомнеў)*

Аджыў я, каб памерці зноў і зноў...
*(Цалуе руку Ядвігі.)*

Усе п'юць віно.

## Сцэна чацвёртая

Крэва. Перад увaходам у замак. Уваходзяць стражнікі і княгіня Анна з Алёнай.

Першы стражнік. Хто тут? Хто каля замка ноччу ходзіць?

Алёна. Прыехала вялікая князёўна Анна з Гародні. Чаго ты ўстрывожыўся?

Другі стражнік. Трывожна, дзеўка... З самага Купалля на Крэва не ўпала ані кроплі дажджу. Хмары ходзяць кругамі, ліюць дажджы на ўсё наваколле, а над Крэвам неба як страха. Вычарпаны ў замку калодзежы, ваду ў ручаях выпіла зямля, сабакі выюць ад смагі.

Першы стражнік. Мой дзед гэткага не помніць. Пярун на зямлю пакрыўдзіўся.

Алёна. Перуна няма! Ёсць Бог.

Першы стражнік. Пярун ці Бог, а ўсе мы во-ох!

Княгіня Анна. Дзе Вітаўт?

Другі стражнік. Гэтага не знаем. Кажуць, што ў Вільні спрэчка між братамі ўсчалася. Пасля яе Ягайла з'ехаў у Кракаў, а Вітаўт знік некуды. Усіх ратнікаў паднялі на ногі Крэва ахоўваць, а ад каго ахоўваем — немаведама.

З'яўляецца Люцень.

Люцень

З кім каля замка варта размаўляе?

Княгіня Анна

Са мною.

Люцень

Ваша справа вартаваць
Вароты ад няпрошаных чужынцаў,
А не часаць аб зубы языкі!

Княгіня Анна

Маўчаць, халоп! Перад табой княгіня!
Стань на калені і закрый свой рот,
Каб словамі мне вушы не паскудзіў!

Алёна

Скарыся, вой. Аднойчы не скарыўся
Адзін...

Люцень

Дык што?

Алёна

Цяпер гарбатым ходзіць.

Княгіня Анна

Вядзі мяне да Вітаўта. Да мужа.

Люцень

Даруй, княгіня. Гэта не змагу.
Загад Ягайлы надта строгі маю —
Нікога да яго не падпускаць.

Княгіня Анна

Ты да яго нікога не падпусціш.
Ён — гэта я, а я ўся — толькі ён!
Ў Пісанні Богам так занатавана.

Люцень

Скараюся... Не быць жа мне гарбатым.
Гэй, стража! Хай княгіню адвядуць
Да Вітаўта ў пакой!

Княгіня Анна і Алёна накіроўваюцца да ўвахода.

Ты куды?

Алёна

Ну як куды? Іду служыць княгіні.

Княгіня Анна

Ці, можа, ты мяне там будзеш распранаць
І ложа падрыхтуеш мне і князю?

Люцень

Няхай княгіня дзёрзкасць мне даруе.
Хто служыць — паслухмяным мусіць быць.
Праводзьце іх да Вітаўта ў пакоі.

Усе разыходзяцца.

## Сцэна пятая

Пакой у замку. Вітаўт нерухома ляжыць на шкуры зубра.

Вітаўт

О, літасцівы Божа! Ну, няўжо ж
Хто хоча міру людзям і спакою,
Як ты, павінен узысці на крыж,
На плаху легчы, у агні згарэць
Ці быць закатаваным у цямніцы?

З'яўляецца Купала.

Купала

Пад месячным святлом натоўп гуляе,
Ад промняў сонца люд мой уцякае.

Праславіць тых, хто бурыць, забівае,
Забудзе тых, хто любіць і стварае.

Вітаўт

У пастку, як дурное зубраня,
Я трапіў праз даверлівасць да брата.
Забіты бацька, страчаны пасад,
Пагібель сёння княству пагражае!
Збавіцель! Колькі ж трэба дараваць
Разоў таму, хто саграшыць і здрадзіць?
Ты патрабуеш сем разоў па сем...
Але ж майго жыцця тады не хопіць.

Уваходзіць Ваявода.

Ваявода. Дзе загадае вялікі князь паставіць віно і ежу?

Вітаўт. З сабачых лапаў вялікі князь есці не будзе.

Ваявода. Дарма крыўдуеш, князь... Супраць цябе на маім сэрцы няма злога. Я служу Ягайлу гэтак жа, як бы служыў табе, каб Бог распарадзіўся быць тваім служкай. Дзе паставіць віно?

Вітаўт. Пайшоў прэч!

Ваявода. Я ведаю, што сам ты не п'еш і не ясі... аднак княгіню накарміць ты мусіш.

Уваходзяць княгіня Анна і Алёна.

Княгіня Анна

Мой князь!

Вітаўт

Княгіня Анна! Пачакай!
Пакуль тут будзе паслугач Ягайлы,
Я пальцам да цябе не дакрануся.

Ваявода

Я выйду. Хай мне слова дасць княгіня,
Што не пакіне яду ці кінжал
Для князя.

Княгіня Анна

Я клянуся Перуном:
Нічога тут яму я не пакіну.

Ваявода

Княгіні слова — лепшая ахова.
*(Выходзіць.)*

Вітаўт

Як ты дазналася, што я у Крэве?

Княгіня Анна

Алёна нам у гэтым памагла.

Яна — вядзьмарка. Чуе за паўсвету
Таго, каго палюбіць. Так ці не?

А л ё н а

Так.

К н я г і н я А н н а

Ну, дык вось, калі цябе схапілі
У Вільні і у Крэва павязлі,
Яна мяне прымусіла прыехаць
Сюды. Каб свайго князя ўратаваць.
А як яго адгэтуль уратуеш?

А л ё н а

Не ведаю.

К н я г і н я А н н а

Тут стражаў — як сабак.
На ногі ўсіх паўсюль падняў Ягайла,
Дзіўлюся, як цябе ён не забіў.

В і т а ў т

Кроў Кейстута і Вітаўта не вып'еш
Адразу. Трэба трохі адпачыць.

К н я г і н я А н н а

Падай віна для князя. Потым — выйдзі.
І за дзвярыма крыху пачакай.
Ты што, аглухла?

А л ё н а

Небяспеку чую.
Хай светлая княгіня пацярпіць,
Усё вельмі хутка скончыцца павінна.
Сюды ідуць!

Уваходзіць В а я в о д а.

В а я в о д а *(Алёне)*. Скажы князю і княгіні: прыбыў ганец. Праз колькі часу павінен прыехаць Ягайла са сваёй каралевай. Ён цяпер польскі кароль і католік. Палякі аддалі яму сваю Ядвігу. Хай княгіня развітваецца з князем і ад'язджае на бацькаўшчыну. Баімся гневу Ягайлы.

А л ё н а. Дай ім разам пабыць колькі часу, добры Ваявода. Немаведама, ці стрэнуцца муж з жонкай. Скажу па сакрэту: княгіня хоча нарадзіць і зоркі цяпер спрыяюць гэтаму. Я стану вось тут у кутку і буду маліцца, а ты прасачы, каб грэшныя вушы не слухалі тое, што ніхто, апроч двух, слухаць не павінен. Бог узнагародзіць цябе.

В а я в о д а. Хай так будзе. Я адвяду ад дзвярэй стражнікаў. Можаш выйсці і ты.

А л ё н а. Калі я малюся, я нічога не чую і не бачу... Да таго ж гаспадыня прывыкла, што я заўсёды побач.

В а я в о д а. Як ведаеш. Часіна ёсць у іх.*(Выходзіць.)*

Алёна нервова пачынае скідваць з сябе вопратку.

А л ё н а

Мой любы, мой каханы, мой адзіны,
Далёкі мой і блізкі для мяне...

К н я г і н я  А н н а

Ты з глузду з'ехала! Спыніся! Што ты робіш?!

А л ё н а *(распранаецца)*

Ты слодыч неба і мая пакута,
Ты радасць і пякельная журба...

К н я г і н я  А н н а

Князь, не глядзі! З ёй водзіцца нячысцік!

А л ё н а

Цяпер, мой княжа, распраніся ты,
Мы тут з табой мой шлюб смяротны справім...

К н я г і н я  А н н а

Вар'ятка! Ведзьма!

В і т а ў т

Анна, памаўчы!
Сам Бог яе паслаў мне на збавенне.
*(Пачынае распранацца.)*

Мяняюцца вопраткаю.

А л ё н а

Малю Хрыста і ўсіх нашых багоў,
Каб адвялі хваробы і напасці
І ад цябе і ад княгіні Анны,
Каб у сям'і тваёй быў лад і згода,
Любоў...

К н я г і н я  А н н а

Даволі! Ні глядзець, ні слухаць
Я болей не магу і не хачу!!!

А л ё н а

Князь! Стань у кут і ціха там маліся.
Табе ж, княгіня, зараз давядзецца
Абняць мяне на ложы, як яго!
Я на хвіліну стану табе мужам!

Вітаўт апускаецца на калені ў куце. Княгіня Анна і Алёна кладуцца на шкуру зубра.

Трымай мяне ў абдымках вельмі моцна,
Калі яго шчэ хочаш патрымаць.
І словы мне пяшчотныя кажы!

Уваходзіць В а я в о д а.

К н я г і н я  А н н а

Мой князь! Мой муж! Мой любы, слаўны Вітаўт...

В а я в о д а

Ягайла блізка!

К н я г і н я  А н н а

Дзверы зачыні!
І вочы апусці, каб не аслепнуць!

В а я в о д а

Даруйце мне! Ягайла пад'язджае.
Даволі, што ў яго ў палоне Вітаўт.
Навошта ж тут і ўся яго сям'я?

К н я г і н я  А н н а

Мы развітаемся! Звярні да сценаў вочы!

В а я в о д а

Я не гляджу.

К н я г і н я  А н н а

Бывай, бывай, мой муж!
Бывай і ведай, што тваю душу
Я панясу з цямніцы ў сваім лоне!
*(Цалуе Алёну. Шэптам.)*
За князя — дзякуй. Гэта ж ад мяне!
*(Б'е яе далоняй па твары.)*
За пацалункі ўночы на Купалле.
*(Гучна.)*
Алёна, ўстань! І з князем развітайся!
Маліцца і ў Гародні будзе час.

Вітаўт падыходзіць да Алёны і схіляецца перад ёй.

А л ё н а

Бывай, мой князь, бывай.

К н я г і н я  А н н а

А ты, Алёна,
На развітанне князя пацалуй.

Вітаўт абдымае Алёну.

Даволі! Ўсё! Вядзі нас, Ваявода!

В а я в о д а

Сюды, за мной. Даруй, вялікі князь...

К н я г і н я  А н н а

Ідзі, ідзі! Хай Бог табе даруе.

В а я в о д а,  к н я г і н я  А н н а  і  В і т а ў т  у вопратцы Алёны выходзяць.

А л ё н а

Ну вось і ўсё. Бывай, мой любы Вітаўт...

З'яўляюцца К у п а л а і б е р а ж н і ц ы.

К у п а л а

Сястра, рыхтуйся да мяне прыйсці
Празрыстай, чыстай, лёгкай беражніцай
З касою доўгай светлага туману,
Каб, жывучы нябачнай для людзей,
Аберагаць усіх маіх дзяцей...

Б е р а ж н і ц ы *(водзяць вакол Алёны карагод)*

Каліна-маліна
Бліз тыну стаяла
Ды на тын галлё клала,
Красою красавала,
Расою ападала.
Малада Алёначка
Расою ападала.
Малада Алёначка
Расою ўмывалася,
Касою ўціралася,
Да шлюбу прыбіралася.
*(Танцуюць вакол Алёны.)*

## Сцэна шостая

Другі пакой у Крэўскім замку. Я г а й л а і В а я в о д а.

Я г а й л а. Хай усе ліцвіны ведаюць: з гэтых часоў у Вялікім княстве Літоўскім веры паганскай няма. Той жа, хто паклоніцца Перуну або возьме ўдзел у брыдкіх абрадах Купалы,— той не ліцвін і вораг князю.

В а я в о д а. Ну, з Перуном яшчэ сяк-так можна зладзіць, а вось Купалу з ліцвінаў ніколі не вытравіш.

Я г а й л а. Вытравім. Апроч таго, ва ўказе паведаміць, што вялікі князь Ягайла, стаўшы каралём польскім Уладзіславам, прысягнуў усіх ліцвінаў, як мужчын, так і жанок усякага стану, роду і чыну, каторыя жывуць у граніцах Літоўска-Рускай дзяржавы, да якой бы ні належалі веры,— упрасіць, угаварыць, прызваць, а калі трэба, нават прымусіць прымаць веру каталіцкую!

В а я в о д а. Князь! Нельга так часта мяняць багоў! Вера ад гэтага слабне.

Я г а й л а. Бог — адзін. І вера павінна быць для ўсіх адна.

В а я в о д а. Нават пеўні ў Крэве кукарэкаюць інакш, чым у Гародні. Дзе ўжо прымусіць люд аднолькава маліцца?

Я г а й л а. Не будуць аднолькава маліцца — будуць аднолькава стагнаць. Што Вітаўт?

В а я в о д а. Пад аховай. Не есць і не п'е. Маўчыць. Даруй, што асмельваюся даваць параду: трэба памірыцца з братам і знайсці забойцу Кейстута. Іначай не будзе табе спакою ні на княскім пасадзе ў Вільні, ні на каралеўскім у Кракаве. Вітаўта любіць смерд, любяць жыды, рамеснікі і гандляры. Я баюся, каб ён не памёр. Хто нам паверыць, што не мы яго забілі?

Я г а й л а. Прывесці яго.

В а я в о д а. Слухаю князя.

Я г а й л а. Не слухаю князя, а слухаю, ваша вялікасць.

В а я в о д а. Даруйце, ваша вялікасць. *(Выходзіць.)*

Я г а й л а

Гэй, Люцень!

Уваходзіць Л ю ц е н ь.

Ты мне зможаш адказаць,
Як, і калі, і кім забіты Кейстут?

Л ю ц е н ь

Змагу, кароль.

Я г а й л а

І скажаш мне дакладна?

Л ю ц е н ь

Хіба твой верны служка памыляўся
Хоць раз?

Я г а й л а

Дык хто ж забіў? Кажы!

Л ю ц е н ь

Той, хто калісьці князем быў Ягайлам
І веры праваслаўнай.

Я г а й л а

Замаўчы!

Л ю ц е н ь

Даўно твае загады Люцень слухаў
Не з вуснаў і вушамі, а з душы.
І з сэрца. Надта ганаруся...
Што здагадаўся: золата і смерць —
Адно. І з гэтай чары нежывыя п'юць.

Я г а й л а

Крумкач!
*(Б'е яго кінжалам.)*

Л ю ц е н ь

Бывай, бывай, кароль мой любы,
Цябе я дачакацца мушу там.
Адно жыццё з табой — адзіны дар,
Адзіны лёс, адзіны гаспадар.
*(Заціскаючы рану, выходзіць.)*

Я г а й л а

Цяпер мне можна з братам гаварыць.

С т р а ж н і к і прыводзяць А л ё н у ў вопратцы Вітаўта.

Вітаю брата! Маю спадзяванне,
Што ты ўжо супакоіўся. Як мог
Ты толькі уявіць сабе такое,
Што я падняў на Кейстута руку,
Табе свой меч прылюдна перадаўшы?
Цяпер кароль я польскі. І табе
Пасад хачу аддаць ў Вялікім княстве.
Чаму ты адвярнуўся?

Уваходзіць В а я в о д а з г а н ц а м і.

В а я в о д а. Князь, ганцы!
Я г а й л а. Прэч! Ці галава ўжо муліць плечы?!
В а я в о д а. Выслухай іх, потым можаш секчы галовы.
Я г а й л а. Гэй, стража!
В а я в о д а

Здаліся Трокі толькі што.

Я г а й л а

Каму?

П е р ш ы г а н е ц

Іх захапіў твой брат, вялікі Вітаўт.

Я г а й л а

Мой брат? Князь Вітаўт? Трокі захапіў?

Д р у г і г а н е ц

Тэўтонцы з ім.

Я г а й л а

О, бедны я, няшчасны!
А Вітаўта пабачылі хоць вы?

П е р ш ы г а н е ц

Так, як цябе.

Я г а й л а

Дык, вылюдак, памры!
Бо Вітаўт — вось ён, у маім палоне!
*(Забівае першага ганца мячом.)*

В а я в о д а

Князь, супыніся!

Я г а й л а

Я не князь! Кароль!

П е р ш ы   г а н е ц

Дарма ўзяў грэх ты на сваю душу.
Я Вітаўта там бачыў. Паміраю.
*(Памірае.)*

В а я в о д а

Ты ўсё пачуў! Хто ж перад смерцю хлусіць?

Д р у г і   г а н е ц

Калі я вінаваты ў тым, што бачыў,
Забі й мяне!

Я г а й л а

Хто ж тут тады стаіць?!
*(Паварочвае тварам да ўсіх Алёну ў вопратцы Вітаўта.)*
Тут здрада! Здрада! Варта, да мяне!

Збягаюцца с т р а ж н і к і.

## Сцэна сёмая

Двор у замку. З'яўляюцца д в а   с т р а ж н і к і. Яны вядуць А л ё н у.

Д р у г і   с т р а ж н і к. ...І тады яна перакінулася ў перапёлку, прыляцела ў замак і ўвайшла ў цела Вітаўта... І ў адным целе дзве душы атрымалася. Адна — бабская, другая — мужчынская. Разумееш?

П е р ш ы   с т р а ж н і к. Не. А ты разумееш?

Д р у г і   с т р а ж н і к. І я не разумею. Гэта цуды Купалы!

П е р ш ы   с т р а ж н і к. А што далей?

Д р у г і   с т р а ж н і к. Потым з гэтага цела Вітаўтаву душу яна, канечне, выпхнула, ператварыла гэту душу ў сокала і загадала ляцець у Гародню. Там ён перакінуўся зноў з сокала ў Вітаўта, сабраў войска і рушыў на Трокі.

П е р ш ы   с т р а ж н і к. Дзіва дзіўнае!

Д р у г і   с т р а ж н і к. І за гэта вядзьмарства яе зараз будуць паліць. Трэбаназбіраць трэсак. Тыя дровы, што кінеш у агонь, на якім пячэцца ведзьма, чэрці дастануць з-пад цябе, калі будзеш смажыцца ў пекле.

П е р ш ы   с т р а ж н і к. А хіба мы трапім у пекла?

Д р у г і   с т р а ж н і к. А то куды ж?

П е р ш ы   с т р а ж н і к. Тады пайшлі па трэскі.

З'яўляецца Я г а й л а.

Я г а й л а

Можаш сказаць, што хочаш, прыгажуня?

А л ё н а

Хачу сказаць: шчаслівая... кахаю...

Я г а й л а

Ты на Літву наклікала вайну!
Я б з Вітаўтам даўно ўжо памірыўся
І перадаў бы ў Вільні свой пасад,
Каб тут ён быў.

А л ё н а

Купала, памажы!

Я г а й л а

А зараз ён збірае ваяроў,
І ўсе ліцвіны зноўку будуць біцца,
Паліць, бурыць, спустошаваць зямлю!
Скажы, хто дапамог табе?

А л ё н а

Купала.

Я г а й л а

Цябе за гэта спаляць!

А л ё н а

І няхай,
Я пасля смерці стану беражніцай.
Наша Купала кожны год гарыць,
Наступным летам прылятае зноўку.

Я г а й л а

Язычніца! Вядзіце!

П е р ш ы   с т р а ж н і к

Што ж... пайшлі.
Пайшлі, дачушка, з Богам сустракацца.
Пад кожным, мабыць, будуць свае трэскі,
І свой агонь нам выпаліць грахі...

Алёна падыходзіць і цалуе Ягайлу.

А л ё н а

Я дзякую табе, мой любы браце…
Што ты любоў у сэрца дапусціў.
Цяпер абодвух зберагаць я буду.

Я г а й л а

Вядзіце!

С т р а ж н і к і   выводзяць   А л ё н у.

Затрымцела ўсё ўва мне,
Які салодкі пацалунак ведзьмы!
Яна напраўду, мабыць, чараўніца.

Уваходзіць В а я в о д а.

Што скажаш, Ваявода?

В а я в о д а. Скажу, хай здохне, не пакінуўшы нашчадкаў, той, хто забіў Кейстута. У княстве разбурэнне, заняпад. Вітаўт у Троках рыхтуецца пайсці на Крэва. Сяляне кінулі палеткі і точаць на нас косы! Рамеснікі ўзяліся за мячы! Вялікі князь, кароль! Памірыся з братам! Хопіць таго, што ты падзяліў нас на праваслаўных і католікаў. Не дзялі на сваіх і Вітаўтавых. У мяне сын у Троках. Што, калі ён прысягнуў Вітаўту і заўтра я сыдуся з ім меч на меч? Не стрывае зямля, і расколюцца нябёсы.

Я г а й л а. Колькі зможа пратрымацца Крэўскі замак?

В а я в о д а. Палякі не паспеюць падысці. Дый ці пойдуць яны? З Вітаўтам просты люд: рамеснікі, гандляры, хутаране. З Вітаўтам — крыжакі!

Я г а й л а. Сам Камандор?!

В а я в о д а. Сам Камандор... Дапамагаў усталёўваць справядлівасць табе, цяпер ваюе за справядлівасць на баку Вітаўта... Даруй, князь... Даруй, кароль... Ліцвіны лічаць, што ты задушыў Кейстута, і за гэта перадушаць усіх тых, хто цяпер у Крэве і служыць табе.

Я г а й л а. Што каралева Ядвіга?

В а я в о д а. Спачывае.

Я г а й л а. Хай спачывае. Дай мне адзінаццаць ратнікаў. Тых, хто не баіцца пакласці галаву на плаху.

В а я в о д а. Досыць будзе і дзесяці. Я сам пайду з табой.

Я г а й л а. А хто застанецца з войскам і з каралевай?!

В а я в о д а. Калі вернемся, дык вернемся, а не... Вітаўт ваяводу знойдзе і каралеву не пакрыўдзіць.

Я г а й л а. Застанешся ў Крэве! Калі праз дзень я не вярнуся — адчыняйце вароты і прысягайце Вітаўту.

В а я в о д а. Тады ведай, што нікому, апроч цябе, вароты ў Крэве не адчыню! Пакуль дастане сілы, буду біцца!

Я г а й л а. Калі не шкада галавы — ідзі.

В а я в о д а. Той не п'яніца, што шкадуе золата, і той не ваявода, хто шкадуе галавы. *(Выходзіць.)*

Я г а й л а

Бывай, мая каханая, бывай,
Ты жонкай не паспела стаць Ягайлу,
І нехта іншы ўвойдзе да цябе,
Каб на зямлі ды ў светлы рай патрапіць.
Я ж, каб з душы і сэрца плямы сцерці,
Сам палячу ў абдымкі лютай смерці.
*(Выходзіць.)*

## Сцэна восьмая

Трокі. Двор у замку. Уваходзяць В і т а ў т і К а м а н д о р.

К а м а н д о р

На Крэва пойдзе першым легіён,
Свой строгі строй тупой стралой зрабіўшы,
Яшчэ завуць яго заўжды свіннёй,
Бо, як дзіка, яго спыніць няможна.
Багата гарадоў ключы здавалі,
Угледзеўшы, як горда і няўмольна
Ідзе на іх крыжастая страла.

В і т а ў т. Ты і на Кейстута выпускаў гэтую свінячую стралу?

К а м а н д о р. Ах, князь! Калі хочаш парадку ў сваім доме, пільна сачы за тым, каб парадак быў і ў суседа. Бунт — як чума. Калі ўскочыла да суседа, улезе і ў тваю дзяржаву. Я толькі дапамагаю навесці парадак, бо самі вы яго ніколі не наведзяце. Вы добра ўмееце ваяваць і грызці адзін аднаму глоткі, а жыць вы не ўмееце.

В і т а ў т. І, апроч парадку, Тэўтонскаму ордэну нічога не патрэбна?

К а м а н д о р. Толькі парадак.

В і т а ў т. Першымі на Крэва пойдуць мае дружыннікі.

К а м а н д о р. Князь!

В і т а ў т. Першымі пойдуць дружыннікі! А ўсе твае свінні ўслед.

Уваходзіць д р у ж ы н н і к.

Д р у ж ы н н і к. Вялікі князь! Да цябе пасол з Кракава.

В і т а ў т. Кліч!

Уваходзіць А л я с н і ц к і.

А л я с н і ц к і. Каралеўскі сойм вітае князя Вітаўта...

Д р у ж ы н н і к. Вялікага князя...

А л я с н і ц к і. ...Вялікага князя Вітаўта і жадае, каб Пан Бог спрыяў яму.

В і т а ў т. Дзякую...

А л я с н і ц к і. Каралеўскі сойм мусіць папярэдзіць вялікага князя Вітаўта, што вялікі князь Уладзіслаў з ласкі Боскай кароль Польшчы...

В і т а ў т. Ну дык што?

А л я с н і ц к і. ...І што ваяваць з ім — значыць ваяваць з Польшчай.

В і т а ў т. Я ваюю з Ягайлам! З забойцам свайго бацькі і клятваадступнікам! І не ведаю ніякіх каралёў Уладзіславаў! Калі

ў вас у Кракаве на каралеўскім пасадзе братазабойца — гора вам і вашай дзяржаве. Калі Польшча абараняе забойцу майго бацькі — буду ваяваць з Польшчай! Так і перадай, поп, свайму каралеўскаму сойму!!

А л я с н і ц к і. Я не поп, я — біскуп...

В і т а ў т. Ды ўсе вы аднолькавыя! Сёння прапаведуеце Хрыстова «не забі», а заўтра бласлаўляеце мячы ратнікаў секчы слабых суседзяў. І толькі за тое, што яны чужынцы і хочуць жыць па-свойму. А ці не казаў Хрыстос, што няма ні элінаў, ні іудзеяў і што ўсе мы дзеці Боскія?

А л я с н і ц к і. Ці не сабе ты гэта гаворыш, вялікі князь? Зірні: твой госць надта задаволены. Калі мы перагрызёмся, ён лёгка паставіць свой крыж і на Вялікім княстве Літоўскім, і на Польшчы. Сын мой...

В і т а ў т. Ідзі, святы айцец, я не католік.

А л я с н і ц к і. Хай судзіць цябе Бог, але дазволь Богу судзіць і твайго брата... *(Выходзіць.)*

В і т а ў т

Дружыны хай наперад зараз выйдуць!
А рыцары за імі пойдуць следам.
На Крэва ўсе!

Д р у ж ы н н і к

Вялікі князь! Ягайла
Да замка падыходзіць ад ракі!

В і т а ў т

Ах, дык ты сам прыпоўз сюды, сабака!
За сценамі не варта нам сядзець!
Адкрыць вароты! Выйсці ўсім у поле!

Д р у ж ы н н і к

Там гэткая дружына, што стрымаць
Любую колькасць войска зможа лёгка.

В і т а ў т

Цяпер мяне ніхто стрымаць не зможа!

Д р у ж ы н н і к

Дванаццаць іх. І без мячоў ідуць.
Так некалі і ты ішоў на Трокі.

В і т а ў т

Пусціце іх...

Уваходзіць Я г а й л а са сваімі р а т н і к а м і.

Я г а й л а

Даруй мне, крэўны брат,
За ўсё, у чым я вінен і нявінен.
Жыве ў душы святло і чарната,

Хто ў думках саграшае — той забойца,
Хоць і загад забіць не аддаваў.
Падумай толькі злое, выканаўца ж
Сам знойдзецца і зробіць для цябе
Усё, што ты ў душы паганай песціў!
Забойцу, брат мой, я ў душы забіў
І чарнату нікчэмнаю рабой зрабіў,
Хоць быў учора сам яе рабом.
Вось галава забойцы князя-бацькі
І дзядзькі майго Кейстута.
*(Выкідвае з мяшка галаву Люценя.)*
Халуй,
Пачуўшы ад мяне, што медзь — жыццё,
Хвароба — срэбра, золата — пагібель,
Рашыў, калі я з золата падам
Каму віно, то гэта не пашана,
А тайны знак яму, што гэтага — забі!
У Вільні ўсе мы Кейстута чакалі
І чару залатую для яго
Трымалі. Каб за мір ён з намі выпіў.
Вар'ят жа ў Крэве Кейстута забіў.

Вітаўт

Чаму ты не прывёз яго жывым,
Каб твае словы ён для нас пацвердзіў?!

Ягайла

Я ў гневе не ўтрымаўся і зарэзаў
Пачвару гэту. А цяпер — рашай,
Мой лёс, маё жыццё рашай ты, Вітаўт,
Калі я вінаваты — засячы. А не —
Хай прынясуць мой меч. Ён там, у полі,
На тым жа месцы твой каліσь тырчаў.
Адзін прыму я смерць ці мір. Адзін.
Хай больш ліцвіны між сабой не б'юцца.

Вітаўт

Ягайла, я табе заўсёды верыў,
А гэта вера несла кроў і смерць!
Баюся, што і зноўку будуць біцца
Ліцвіны ўсе, як лютыя звяры,
Каб выправіць твой грэх і крывадушша
Перад зямлёю роднай і прад Богам!
Хай гэтым разам толькі Ён рашае
Твой лёс і мой. Прынесці меч сюды!
Мы будзем зараз біцца, і калі
Ты не ўтрымаеш меч вялікакняскі,

Дык гэта будзе верны знак з нябёсаў,
Што ты забойца Кейстута! Што зноў
Ты хлусіш! І тады, Ягайла,
Я засяку цябе. Калі ж
Свой меч мне утрымаць не стане сілы,
Я на калені стану прад табою,
Да смерці мушу быць тваім рабом!

Я г а й л а

Хай будзе так.

В і т а ў т

Меч князю прынясіце!

Ягайлу прыносяць меч.

Я г а й л а

Мы пачынаем!

В і т а ў т

Дык судзі ж нас, Бог!

Б'юцца.

*(Выбівае ў Ягайлы меч.)*
Нябёсы падалі свой верны знак,
Аднак хачу пачуць яшчэ прызнанне!
Ты загадаў, каб Кейстута забілі?!

Я г а й л а

Сячы! Калі нябёсаў блаславенне
Ты атрымаў, нашто мне гаварыць?

Вітаўт падымае меч. З'яўляюцца к н я г і н я А н н а і к а р а л е в а Я д в і г а.

К н я г і н я А н н а

Спыніся, Вітаўт! Хіба хочаш ты,
Каб твой народ лічыў цябе за ката?!
Ты Бога спакушаў турнірам гэтым!
І ці не д'ябал знак табе падаў?

Я д в і г а

Мой брат! Няўжо сваю сястру,
Што яшчэ мужа нават не спазнала,
Маркотнаю ўдавою зробіш ты?
Пасварыш Польшчу родную з Літвою?

Я г а й л а

Сячы! Ці даспадобы прыніжэнне
Найлепшай і цудоўнейшай з жанчын?!

Я д в і г а

Даруй усім, і Бог табе даруе,

Я на калені стану: зберажы
Спакой і лад у дзвюх сваіх дзяржавах,
Не стань братазабойцам.

В і т а ў т

Ўся Літва
Схіляецца прад вамі, каралева.
*(Ломіць свой меч і параньвае руку.)*
Мой брат, ты бачыш, я руку парэзаў
Абломкам вострым княскага мяча.
Бяры яе...

Ягайла ломіць свой меч і параньвае руку.

Я г а й л а

А вось табе мая...
Тут кроплі ёсць Рагнеды, Рагвалода,
Міндоўга, Гедыміна, і ў цябе
З рукі сцякаюць гэтакія ж кроплі.
Давай іх злучым.

Вітаўт і Ягайла злучаюць рукі.

Д р у ж ы н н і к і

Хай жывуць браты!
Вялікія! Ў вялікім нашым княстве!

Я г а й л а. З сённяшняга дня і назаўсёды вялікае княжанне ў Вільні, пасад дзядзькі свайго, вялікага князя Альгерда, і бацькі свайго, вялікага князя Кейстута, возьме вялікі князь Вітаўт! Вялікаму княству Літоўскаму надаюцца правы незалежнай дзяржавы! Гэта мае ўказы як вялікага князя і як караля Польшчы.

Д р у ж ы н н і к і

Бог, блаславі нам Вітаўта на княства!

Я г а й л а

Здабыты мір! Хай будзе ён да скону!
Ўсе ў Вільню! Прымяраць табе карону.

Трубяць у рог. Усе разыходзяцца.

## Сцэна дзявятая

Вільня. Катэдральны сабор. В і т а ў т на каленях у акружэнні н а р о д у і д у х а в е н с т в а.

В і т а ў т

Жыві і веруй, мой святы народ,
Ты ўсклаў на галаву маю карону
І абавязак княства зберагчы,

Абараніць людзей ад злых напасцяў,
І з ворагаў сяброў сабе рабіць,
І сябру дараваць, калі ён — вораг.
Скарацца, адбівацца, нападаць
І церабіць мячом сваю дарогу!
Як цяжка князем быць і верыць Богу...

З'яўляюцца К у п а л а і Б е р а ж н і ц ы.

К у п а л а

І будзе тое, што калісь было,
А што было на гэтым свеце — будзе.
Тры чары ўсе адвеку людзі п'юць,
Медзь, золата і срэбра баль свой правяць!
Хто родзіцца, той мусіць паміраць,
Памрэ ж затым, каб зноўку нарадзіцца.
Ўсё бурыцца, каб зноў нам будаваць,
Будуецца затым, каб разбурыцца.
Ты сёння плачаш, каб смяяцца заўтра,
А потым зноўку будзеш слёзы ліць.
Вайна прыходзіць, каб чакалі міру,
А мір — чаканне новае вайны.
Замкнёны круг да часу да пары,
Гараць, гараць купальскія кастры.

Купала ўскладае на галаву Вітаўта карону. Вакол князя танцуюць беражніцы.

*1993*

# Палачанка

**Полацкая легенда**

## ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Рагвалод — князь полацкі.
Рагнеда — князёўна полацкая.
Уладзімір — князь наўгародскі.
Дабрыня — дзядзька Уладзіміра.
Блуд.
Любава.
Мамулька.
Брацiла.
Скамарох.
Селянін.
Палясоўшчык.
Дружыннікі, слугі, дзяўчаты.

Дзея адбываецца ў 978 годзе ў Полацкім і Наўгародскім княствах.

# АКТ ПЕРШЫ

## Карціна першая

Ноўгарад. Пакой у крамлі. Уваходзяць Д а б р ы н я і Б р а ц і л а.

Б р а ц і л а

Ганец да князя з Кіева!

Д а б р ы н я

Пакліч.

Брацiла прыводзіць Б л у д а.

Б л у д

Віват табе, шаноўны ваявода!

Д а б р ы н я

Якія весткі ты прывёз?

Б л у д

На жаль,
Я засмуціць павінен буду князя...
У бойцы з печанегамі загінуў
Князь Святаслаў...

Д а б р ы н я

Як гэта адбылося?

Б л у д

Там, на Дняпры, каля парогаў самых,
Знянацку наляцелі печанегі.
Дружына была стомленай...

Д а б р ы н я

І што?

Б л у д

Пабілі ўсіх... А князю галаву
Адсеклі. З чэрапа зрабілі сабе чару,
І з чары гэтай іхні п’е важак...

Д а б р ы н я

Што ў Кіеве?.. Хто сеў там на пасад?

Б л у д

Там Яраполк цяпер, бо ён старэйшы...
Па бацьку трызну робіць... Загадаў
Сваім братам малодшым, каб усе
Прынеслі Перуну сваю ахвяру —
Ахвярай быць павінен чалавек,
Юнак прыгожы... Самы смелы воін...
Ён будзе Святаславу ТАМ служыць...
І гэта для Ўладзіміра — загад...

Д а б р ы н я

Але Ўладзімір кляўся наўгародцам
Ахвяр людскіх багам больш не прыносіць.
Як жа цяпер парушыць слова князю?

Б л у д

Парушыць нешта трэба... Альбо слова
Ці волю брата... Кіеўскага князя...
А гэта... ўжо да бацькі непавага,
Да мёртвага! Да князя Святаслава...
За гэта можна і пасад згубіць...

Д а б р ы н я

Ці не страшней згубіць людзей павагу...

Б л у д

Ды хіба людзі могуць паважаць,
Любіць ці шанаваць таго, хто зверху?
Яны баяцца могуць... Як сабакі...
Ты моцны — любяць... Слабы — загрызуць.

Д а б р ы н я

Я ў чарку нават золата насыплю,
Каб не ахвяраваць багам людзей...

Б л у д

Ахвяраваць кагосьці давядзецца.
А хрысціяне ў Ноўгарадзе ёсць?

Д а б р ы н я

Так, ёсць...

Б л у д

Хто-небудзь з іх ахвяраю хай будзе...

Д а б р ы н я

Але Ўладзімір абяцаў...

Б л у д

Няхай
Разам з усімі стане і Ўладзімір
Пад жэрабя ахвярнае...

Д а б р ы н я

Ты што?
А калі выпадзе?..

Б л у д

Не выпадзе! Падумай...
Падумай! Скамароха падкупі,
Хай ён сляпым прыкінецца
І цягне... сумленна да ахвярнага слупа
Таго... каго ты скажаш...

Д а б р ы н я

Але князь
Не пойдзе на падман...

Б л у д

Навошта ж
Яму ўсё ведаць? Гэта толькі мы...
Мы — слугі княскія, хлусіць заўжды павінны,
Мы — грэшныя, а князь заўсёды чысты,
Сумленны, светлы... і для ўсіх як бог...
А што б без нас ён, гэткі чысты, змог?
А тут... ён першы прыклад паказаў,
Пад жэрабя ахвярнае сам стаў...
Высакародства дурні так шануюць...
Забі іх потым, ўсё табе даруюць.
Ах, нешта ў горле смажыць і гарыць,
Ты абяцаў насыпаць ці наліць?

Д а б р ы н я

Я за цябе усіх багоў малю.
Хадзем, мой брат! Насыплю і налью...

Выходзяць.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна другая

Полацк. Палац Рагвалода.
Уваходзіць Р а г н е д а. М а м у л ь к а нясе на руках Л ю б а в у.

Р а г н е д а

Кладзі сюды і прынясі ёй мёду.

М а м у л ь к а выходзіць.

Здымай сарочку! Вось табе ручнік.
Стань ля цяпла і хутка расцірайся.

Любава распранаецца.

Ссінела ўся! Дрыжыць...

Л ю б а в а

Я не магу...

Р а г н е д а

Давай сюды!
*(Расцірае Любаву ручніком.)*

Л ю б а в а

А дзе я?

Р а г н е д а

У палацы...

Л ю б а в а

А як цябе зваць?

Р а г н е д а

Мяне завуць Рагнедай...

Л ю б а в а

Князёўна наша?!

Р а г н е д а *(падае Любаве сарочку)*

Гэта апрані...

Л ю б а в а

Я ў княскае? Не, не...

Р а г н е д а

Тады будзь голай...
Ану, нясіце мёд хутчэй сюды!

Уваходзіць М а м у л ь к а. Любава хутка апранаецца. П'е мёд.

М а м у л ь к а

Я б тых, хто топіцца, спачатку ўратавала,
Дала б па срацы сотню бізуноў,
Пасля б дурную утапіла ў цэбры.

Р а г н е д а

Сагрэлася? Як ты ў Дзвіну нырнула?

Л ю б а в а

Мяне туды мой бацька падпіхнуў.
У цівуна шмат грошай ён пазычыў
І мною разлічыцца захацеў,
Дачкою роднай...

Р а г н е д а

Замуж хацеў выдаць?
Без тваёй згоды — гэта страшны грэх...
Перад багамі... Ды і перад князем...

М а м у л ь к а

Няможна без кахання зацяжараць —
Ярылу крыўда... Ён за гэта ўдарыць!

Л ю б а в а

Цівун жаніцца хоча...

Р а г н е д а

Гэта гвалт...

М а м у л ь к а

Скажы, як называць цябе?

Л ю б а в а

Любава...

Р а г н е д а

Любава... Ты задумала ўтапіцца?

М а м у л ь к а

Раней пары прыйсці да Мары ў госці...
Грэх вельмі цяжкі...

Л ю б а в а

Што ж было рабіць?
Пакуль жывая, дык цівун паскудны
Ад бацькі не адчэпіцца ніколі.
Ён супакоіцца, як толькі я памру...

М а м у л ь к а

Ты выйдзі замуж і зрабі што-небудзь,
Каб ён раней пары сам акалеў...
Стары кабель, а бач ты! Хоча дзеўку!

Р а г н е д а

А ты кахаеш іншага?

Л ю б а в а

О, не!
Раней з Ярылам трэба ажаніцца
Дзяўчыне... А кахаць хлапцоў пасля...

М а м у л ь к а

Ўсё зладзіцца... Ўсё будзе сваім часам.

Р а г н е д а

З табой мы да Ярылы пойдзем разам.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна трэцяя

Ноўгарад. Гара. Пантэон ідалаў. Уваходзяць к н я з ь У л а д з і м і р, Д а б р ы н я і н а р о д.

Д а б р ы н я

Будзь, Уладзімір, мужным... і багі
Зробяць усё, што будзе нам патрэбна.
Звярніся да народу.

У л а д з і м і р

Наўгародцы!
Народ адважны! Вольны, светлы люд!
Па просьбе вашай я цяпер тут княжу.
Заўсёды слухаў мудры голас веча,
Заўжды рабіў, што вам паабяцаў...
Вы верылі мне, вы мяне любілі...
Пачціва, нізка кланяюся вам!
За вас, мой люд, сваё жыццё аддам!

Н а р о д

Гонар і слава, князь наш Уладзімір!

Д а б р ы н я *(адводзіць убок Скамароха, пераапранутага ў старца)*

Ўбок адыдзі, чакай, пакуль паклічуць.
Вось золата... Глядзі не памыліся,
А то напраўду зробішся сляпым...

С к а м а р о х

Усё зраблю...

Д а б р ы н я

Вунь той... Стаіць за князем...

С к а м а р о х

А-а, ведаю... Ён моліцца Хрысту...
Прыгожы хлопец...

Д а б р ы н я

Прэч пайшоў! Браціла!

С к а м а р о х выходзіць. Да Дабрыні падыходзіць д р у ж ы н н і к.

Ён справу скончыць, скончыш ты яго...
Князям па смерці, трэба й скамарохі.

Адыходзяць.

У л а д з і м і р

У Кіеве загінуў Святаслаў,
Мой бацька родны. Ён прыслаў мяне
Да вас на княства. Гэта маё гора...
Але на вас звалілася бяда...
Кіеў ад нас ахвяру патрабуе,
Каб князю ў княстве мёртвых паслужыць,
Я абяцаў, што болей аніколі,
Пакуль я князь, ахвяр такіх не будзе.
А Яраполкаў Кіеў патрабуе
Крывавую даніну заплаціць...
Я ў роспачы! Парайце, што рабіць...

Маўчанне.

Тады я сам, як князь, прыму рашэнне...
Князь Святаслаў — мой бацька, і як сын
Служыць яму я лепш за іншых буду...
Сябе ў ахвяру лепей прынясу,
А слова не парушу...

Д а б р ы н я

З глузду з'ехаў!
Дружына! Людзі добрыя! Народ!

Высакародства князя нас штурхае
На ганьбу! На бясслаўе... Няўжо мы
Князя свайго ды пусцім на пагібель?
На страту... Намі ж будуць пагарджаць!

Н а р о д

Не! Не! Не!

Д а б р ы н я *(шэптам дружыннiку)*

Браціла, гавары,
Што пойдзеш замест князя як ахвяра...

Б р а ц і л а

Гатовы я пайсці!

Н а р о д

І я пайду! І я! І я!

У л а д з і м і р

Браты мае, я плачу... Мае слёзы
Не слабасць, а бязмежная падзяка
Вам за любоў... Я разам з вамі стану
Пад жэрабя ахвярнае...

Н а р о д

Не! Не! Не!..
Не рызыкуй, ты князь!

У л а д з і м і р

Маўчаць, дружына!

Д а б р ы н я

Усім маўчаць і слухаць свайго князя!

У л а д з і м і р

Мой лёс — ваш лёс, жыццё — ваша жыццё.
Я роўны вам, бо вы мае браты.
Я буду поплеч з вамі тут стаяць,
І хай багі з усіх нас выбіраюць...

Маўчанне.

Д а б р ы н я

Хай будзе так... Пярэчыць князю нельга.
Вядзіце старца! Людзі, ён сляпы...
І перад кім, нямоглы, ён укленчыць,
Той пойдзе да ахвярнага слупа,
Хоць гэта князь, хоць смерд. Вядзіце старца!

Прыводзяць С к а м а р о х а. Той, прыкідваючыся сляпым, ходзіць паміж людзей. Усе знямелі. Скамарох спыніўся каля Уладзіміра.

С к а м а р о х

Тут... Тут... Я чую гэта... тут!

Б р а ц і л а

Ён князя выбера...

Д а б р ы н я

Паскуда, што ён робіць?

Скамарох укленчыў перад х л о п ц а м, што стаяў побач з Уладзімірам, і абняў яго за калені. Радасныя крыкі. Усе кідаюцца да хлопца, зрываюць з яго адзенне і цягнуць да ахвярнага слупа.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна чацвёртая

Паляна ў лесе каля Полацка. Драўляная выява бога. Д з я ў ч а т ы распранаюцца і спяваюць.

Д з я ў ч а т ы *(спяваюць)*

Баславі, Ярыла,
Каб было шчасліва
На добрыя роды,
На многія годы.
А-а-ах!
Блаславі нас, божа,
На добрага мужа,
Каб любіць-кахаці,
Каб было дзіцяці.
А-а-ах!
Блаславі, маці,
Свайму дзіцяці,
Каб было жытліва,
Да веку шчасліва,
А-а-ах!
*(Знікаюць.)*

Уваходзяць С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н. Лепш мець лішнюю карову, чым дачку-дзеўку... *(Кліча.)* Любава! Любава! Нядаўна тапіцца бегала і зноў некуды знікла. Дзе яна можа быць?..

П а л я с о ў ш ч ы к. Мінулым летам Ярылу ладзілі на гэтай паляне... Вось тут скідалі адзенне, тут на досвітку рэзалі галовы белым пеўням, вымазвалі іх крывёй сабе грудзі і жываты... І вадзілі карагод вакол ідала... І ўсе так стогнуць, стогнуць...

С е л я н і н. Мая яшчэ малая была...

П а л я с о ў ш ч ы к. Значыць, падрасла...

С е л я н і н. А я думаў, куды белы певень падзеўся... Такі галасісты быў...

П а л я с о ў ш ч ы к. Адкукарэкаў... Крывёй ягонай голыя жываты мажуць...

С е л я н і н. Хаця б які-небудзь дзяцюк ёй уласную кроў не пусціў... голай...

П а л я с о ў ш ч ы к. Што ты! На гэтае відовішча ніякага хлопца на вяроўцы не зацягнеш... Ярыла не дарує таму, хто паглядзіць на дзявочыя ахвяры яму... Кажуць, што як толькі зірнеш... адразу... шась! Як адрэжа... на ўсё жыццё. Так што... лётаюць, скачуць голымі, колькі захочуць. Мужчыны баяцца вокам кінуць.

С е л я н і н. А ты ж глядзеў.

П а л я с о ў ш ч ы к. Эх, браце... Мне ўжо ані Ярыла, ані Пярун... з гэтым... нічога не зробяць... Я сваё адкукарэкаў...

С е л я н і н. Ой, багоў багата. І з кожным трэба ладзіць... І ўсе есці хочуць. Холадна — нясі ахвяру Дажбогу, каб сонца даў, засушыла — рэж ягня перад Макрынай... А там яшчэ Стрыбог, Хорс... А нячысцікаў колькі! З імі ж таксама па-добраму трэба... І іх падкармлівай, і ім давай... Во сёння дзеўка пеўня знесла Ярылу... І што зробіш... Не намажаш крывёю грудзі і жывот... пустыя ўсё жыццё будуць...

П а л я с о ў ш ч ы к. Гэта што! Наш Рагвалод хоць людзей перад ідаламі рэзаць забараняе... А ў Кіеве, у Ноўгарадзе... Толькі бяда якая страшная наваліцца... кідаюць жэрабя на самых гожых маладых хлопцаў і дзяўчат... На каго выпала, цягнуць няшчаснага да слупа, рэжуць... і крывёю з усіх бакоў ідала мажуць...

С е л я н і н. І чалавечыну багі любяць...

П а л я с о ў ш ч ы к. Яны нічым не грэбуюць... Хоць хлеб, хоць мяса, цыбуля, малако, мёд... Усё ядуць... А от наш цівун казаў, што ёсць такая зямля, дзе Бог адзін... Адзін.

П а л я с о ў ш ч ы к. Ідзі ты!

С е л я н і н. Клянуся Перуном! На ўсіх адзін і на ўсё адзін... Як князь... Хрыстос!

П а л я с о ў ш ч ы к. Не можа быць... Не справіцца ён адзін...

С е л я н і н. А я табе кажу...

П а л я с о ў ш ч ы к. Стой! Тут вываранень... Не пераступі яго глядзі! А то нас лесавік да рання па лесе вадзіць будзе...

Выходзяць. Гукі паляўнічага рога. З'яўляюцца У л а д з і м і р і Д а б р ы н я.

Д а б р ы н я

Прыпынімся... Далей пайшла града,
Урочышча... Мяжа чужога княства,
Там уладанні князя Рагвалода.

У л а д з і м і р

Што ж наш алень збег у чужое княства?

Д а б р ы н я

Іх княства — ўсе лясы.

У л а д з і м і р

А мо дагонім?

Д а б р ы н я

Багата сёння здабылі дзічыны.
Вунь сонца ружавее, хутка ноч.
Дружына заслужыла адпачынак
І чарку мёду. Абвясці прывал.

У л а д з і м і р

Прывал!

Д а б р ы н я

Прывал!
Вось тут, пад гэтым схілам!
На беразе ракі разбіце стан.
Засмажце вепрука і дзве казулі,
Рыхтуйце для вячэры пышны стол.
Ну, а цяпер прывальную для князя!

Выходзяць. З'яўляюцца д з я ў ч а т ы. Водзяць карагод вакол ідала. Спяваюць. Вяртаюцца У л а д з і м і р і Д а б р ы н я.

У л а д з і м і р

Што яны робяць?

Д а б р ы н я

Жэняцца з Ярылам.
Каб потым лепш з мужамі жыць было.
Каб муж жадаў яе і быў жаданым.

У л а д з і м і р

А кроў адкуль?

Д а б р ы н я

Скруцілі пеўню шыю...
І богу выдаюць як за сваю,
Як быццам толькі страцілі цнатлівасць,
Сваю дзявоцкасць аддалі яму...

У л а д з і м і р

Такі абрад я ў Кіеве не бачыў.

Д а б р ы н я

Тут люд больш дзікі, хоць і больш сумленны.
Пайшлі, пайшлі...

У л а д з і м і р

Ідзі, я пагляджу...

Д а б р ы н я

Ну, добра... Будзь супернікам Ярылу...
*(Выходзіць.)*

Уладзімір назірае нейкі час, потым збіраецца ісці і сутыкаецца з Р а г н е д а й.

У л а д з і м і р

Ці ты з людзей, ці дух лясной багіні?

Р а г н е д а

А ты адкуль? Ты бог ці чалавек?

У л а д з і м і р

Святлее ўсё наўкол...

Р а г н е д а

Дзень надыходзіць.

У л а д з і м і р

Але ж нядаўна наступіла ноч!
Сваім з'яўленнем ты яе прагнала,
Я сонца бачу...

Р а г н е д а

Не, не падыходзь!
Не на дабро я тут цябе сустрэла.
Але сустрэць усё жыццё хацела...
Не трэба, не!

У л а д з і м і р

Чаму?

Р а г н е д а

Глядзіць Ярыла.
Я гэтай ноччу жонка для яго...

У л а д з і м і р

Калі разумны, хай не падглядае...
*(Цалуе яе.)*

Р а г н е д а

Што ты зрабіў?! Ён люта пакарае...
*(Выбягае.)*

У л а д з і м і р

Няхай карае! Хай хоць і заб'е.
Я пакахаў. Я пакахаў яе.
Куды ты? Пачакай! Скажы сваё імя!
Маёю будзеш. Ды ты ужо мая!
*(Выбягае.)*

Д з я ў ч а т ы *(спяваюць)*

Блаславі, Ярыла,
Каб было шчасліва,
На добрыя роды,
На многія годы.
А-а-ах!

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна пятая

Лес. Уваходзяць С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н. Ночка добрая, ночка светлая, а не люблю...
П а л я с о ў ш ч ы к. Чаму?
С е л я н і н. Пасля яе дзень пачынае карацець.
П а л я с о ў ш ч ы к. Ну дык што?
С е л я н і н. Не люблю...

Убягае У л а д з і м і р.

У л а д з і м і р
Я — князь! Сюды! Патрэбна дапамога.
С е л я н і н
Пачціва, нізка кланяемся, князь.
П а л я с о ў ш ч ы к. І чым дапамагчы мы можам князю?
У л а д з і м і р
Ці не сустрэлі толькі што дзяўчыну?
С е л я н і н
Ды сёння іх тут, княжа, поўны лес.
Я сам дачку згубіў, цяпер шукаю...
У л а д з і м і р
Тутэйшыя вы?
П а л я с о ў ш ч ы к. Так, з Полацка. Хлопы Рагвалода...
С е л я н і н. А ты, князь, каго згубіў?
У л а д з і м і р. Дзяўчыну...
С е л я н і н. Як завуць?
У л а д з і м і р. Не ведаю.
П а л я с о ў ш ч ы к. А скуль?
У л а д з і м і р. Невядома.
П а л я с о ў ш ч ы к. А якая яна?
У л а д з і м і р. Не помню.
С е л я н і н. Абавязкова знойдзеш, калі так...
У л а д з і м і р. Яна незвычайнай прыгажосці...

С е л я н і н. Тады гэта мая жонка... Праўда, яна была такой гадоў трыццаць таму. Калі мела грудзі і не мела злосці, а зараз наадварот. А ўвогуле ўсе дзеўкі полацкія прыгожыя, і я, любы княжа, з задавальненнем выпіў бы піва за здароўе той, якую вы шукаеце...

У л а д з і м і р
Вунь, каля рэчкі, паляўнічы стан —
Туды ідзіце. Вас там пачастуюць.
І піце хоць да раніцы. Пайду,
Сябе згублю, але яе знайду...

С е л я н і н

Мой княжа! Мы да раніцы і ўдзень,
І ўвечар, і ўначы... Хоць цэлы тыдзень
Піць за здароўе добрай дзеўкі рады!

Выходзяць. З'яўляецца Р а г н е д а.

Р а г н е д а

Ён пацалункам сонца запаліў...
Гарыць агонь ў маіх грудзях дзявочых.
Ярылаву нявесту загубіў,
Забраў ў палон купальскай ціхай ноччу...
Ты чый? Ты хто і як цябе завуць?
Бягу я прэч, але іду насустрач —
Лель з Ладам у душы маёй пяюць...
Ты святам стаў, астатняе ўсё — пустач...
Святы Ярыла! Можа, гэта сон?
І хутка я у Полацку прачнуся...
Не, не! Не трэба! Хай не знікне! Ён!
Няхай я сплю... Прачнуцца я баюся.
*(Выходзіць.)*

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна шостая

Ноўгарад. Пакой у крамлі. У л а д з і м і р, Д а б р ы н я, с л у г і, д р у ж ы н н і к і, с к а м а р о х і.

Д р у ж ы н н і к і *(спяваюць)*

Гэй вы, слугі верныя,
Налівайце чары поўныя,
Адну чару — зелена віна,
А другую — піва п'янага,
А трэцюю — мёду пеннага.
Налівалі чары поўныя,
Налівалі піва п'янага,
Налівалі мёду пеннага.
Пазлівалі чары поўныя,
Пазлівалі ды ў адзіную.
Стала чара мераю ў вядро,
А вагою ў паўтара пуда,
Падносілі Уладзіміру,
Сонца — князю наўгародскаму.

На срэбным падносе падаюць чару Уладзіміру.

У л а д з і м і р

За наўгародскі люд!

Д а б р ы н я

За князя!

Д р у ж ы н н і к і. Слава! Слава!

Уладзімір і Дабрыня п'юць.

Д а б р ы н я

У добры час прыйшлі паслы у Кіеў
І папрасілі князя для сябе,
І ў добры час ты пагадзіўся, княжа.
Старэйшыя твае браты на поўдні
Каторы год грызуцца між сабой...
А Ноўгарад мацнее з кожным годам
Ў багацці, у пашане і ў святле...

У л а д з і м і р

Аднак яшчэ даніну ў Кіеў шле.

Д а б р ы н я

Хвошч іншым разам і вышэй за дуба,
Ды дуб расце... І пустазеллю — згуба.

У л а д з і м і р

Даволі! Прэч з вачэй!

Д а б р ы н я

Пакіньце князя...

С л у г і выходзяць.

Ты змрочны і як воўк галодны, злы...

У л а д з і м і р

Я і напраўду з голаду памру,
Калі яе яшчэ раз не пабачу.
Ты абяцаў знайсці яе...

Д а б р ы н я

А як? Ты загадаў, зрабі, як я жадаю!
А што жадаеш, ты не знаеш сам!
У тых мясцінах дзесяць палачанак
Мы скралі для цябе — ты адсылаў,
За перапуд узнагароду даўшы.
Любая з іх здаволіць Перуна.
Суніцы спелыя, а для цябе не тыя...
Ты, перапіўшы мёду, можа, трызніў?
Ці беражніцу дзікую сустрэў?..

У л а д з і м і р

Як з князем размаўляеш ты?

Д а б р ы н я

Як дзядзька.
І як тваёй матулі родны брат,
Што ў Кіеве цябе калісьці няньчыў.

У л а д з і м і р

Я ўспомніў!

Д а б р ы н я

Ну, нарэшце...

У л а д з і м і р

Вочы, вочы!

Д а б р ы н я

Што вочы?

У л а д з і м і р

Як у мацеры былі.
Яны ласкава ў сэрца мне глядзелі...

Д а б р ы н я

Малуша вельмі ясны позірк мела.
А колеру якога?

У л а д з і м і р

Я не ведаю...

Д а б р ы н я

У чым яна апранута была?!

У л а д з і м і р

Ні ў чым, здаецца...

Д а б р ы н я

Так, было ж Купалле...

У л а д з і м і р

Знайдзі яе...

Д а б р ы н я

Паслаў я два атрады.
Каб ведалі яны, каго шукаць,—
Знайшлі б даўно... І тым не менш шукаюць...

У л а д з і м і р

Знайдзі яе...
*(Выходзіць.)*

Д а б р ы н я

Зямля і неба ведаюць...
Ад дзеўкі можна сэрцам захварэць,
Але каб гэтак... гэтак ачмурэць —
Не варта смерда, што й казаць пра князя.

Уваходзіць с л у г а.

С л у г а

Дабрыня, да цябе дзівосны госць,
Не называецца, ў хусціне твар хавае.

Д а б р ы н я

Хай зойдзе, я чакаю... Прынясі
Віна, дзве чары і для госця стравы.
А да мяне нікога не пускаць,
Нікога, апроч князя... Хай заходзіць.

С л у г а выходзіць. Уваходзіць Б л у д з завязаным хусцінай тварам.

Б л у д

Вітаю дзядзьку лепшага на свеце!

Д а б р ы н я

Мой Блудзе верны! Дай цябе абняць...
Адкуль цяпер?

Б л у д

Я з Кіева.

Д а б р ы н я

Да нас?

Б л у д

Да вас па сэрцу... Службай к Рагвалоду...
У Полацк весткі важныя вязу.
Аднак сябрам раней іх трэба ведаць,
І я, загнаўшы вернага каня,
Праз Ноўгарад скачу да Рагвалода,
Для ног — даўжэй, ды карацей для сэрца.

Д а б р ы н я

Прымі нашу любоў, мой верны дружа.
Князь Уладзімір для цябе як сын...

Б л у д

Я спадзяюся, ён і сам так лічыць.

Д а б р ы н я

Не сумнявайся. Вып'ем за цябе,
Бо ў Кіеве — ты лепшы наўгародзец.
Для князя Яраполка ты — слуга,
А князю Уладзіміру ты — бацька.
І неўзабаве прыйдзе час такі —
Як бацька будзеш ты і ўшанаваны.

Б л у д

Віват!

Д а б р ы н я

Віват! А зараз пі і еш...
Мы пра навіны пагаворым потым.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна сёмая

Лес перад Полацкам. Драўляны ідал запырсканы крывёю. Уваходзяць С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н. Буду ахвяраваць. Палову біклагі вып'ем, палову хай п'е Ярыла. Ён маю дачку ўпадабаў... Пасля той ночы, як яна жанілася з ім і мазала жывот і ўсё астатняе крывёю пеўня... у мяне ўсё пайшло на лад.

П а л я с о ў ш ч ы к. Налівай.

С е л я н і н *(налівае)*. Каб жыта ўрадзіла і скот даў прыплод!

П а л я с о ў ш ч ы к. Ярылу капні...

С е л я н і н. Канечне... *(Вылівае з біклагі пад ідала.)* Госпадзі! О ты, што корміш нас, зрабі яшчэ раз ласку і пакажы шчодрасць люду свайму. *(Палясоўшчыку.)* Ну што, ты ўжо жлукціш? Стань на калені.

П а л я с о ў ш ч ы к. Ага, ага...

П'юць.

*(Рэжа мяса.)* На, вяндліны...

С е л я н і н. Ярылу адрэж.

П а л я с о ў ш ч ы к. Ага...

С е л я н і н. Пасля той ночы, калі Ярыла стаў маім зяцем... тры радасці ў хату... Жонка захварэла, сын зламаў нагу, і дачку забралі...

П а л я с о ў ш ч ы к. Налівай...

С е л я н і н *(налівае)*. Каб у ручкі, і ў ножкі, і пасярэдзіне трошкі!

П а л я с о ў ш ч ы к. Ярылу...

П'юць. Палясоўшчык рэжа мяса.

С е л я н і н. Ярылу...

П а л я с о ў ш ч ы к. Ага... Дык, кажаш, тры радасці... Ну, жонка захварэла, яно зразумела. Хворая баба дабрэе і не так грызе мужыка. Астатнія радасці не разумею...

С е л я н і н. Рагвалод набіраў весляроў на адзін са сваіх стругаў. Адабралі майго сына, а ён паламаў нагу. Паплылі без яго. На Дзвіне струг перакуліла... Усе весляры захлынуліся ў вадзе... А мой сын папраўляецца. Гэта радасць ці гора?..

П а л я с о ў ш ч ы к. Шчасце...

С е л я н і н. Дачку забралі...

П а л я с о ў ш ч ы к. Гора...

С е л я н і н. Пачакай... Забрала князёўна ў палац. Яна ёй цяпер пасцель сцеле. А мне далі віру.

П а л я с о ў ш ч ы к. Што далі?

С е л я н і н. Віру...

П а л я с о ў ш ч ы к. Што?

С е л я н і н. Ну, як адкупнога, быццам...

П а л я с о ў ш ч ы к. Не разумею...

С е л я н і н. Ну, вось мы з табой нап'ёмся бражкі, пасварымся, і я цябе заб'ю.

П а л я с о ў ш ч ы к. Ну...

С е л я н і н. За тое, што я цябе забіў, мушу выплаціць тваёй жонцы віру... Мне ж заплацілі за тое, што дачку забралі ў палац. Я, дурны, хацеў яе за даўгі замуж аддаць за старога пляшывага цівуна, а мне князёўна — грошы (*паказвае грошы*). Во, зірні... Доўг вярнуў, і яшчэ засталося... За гэта можна новую хату паставіць і купіць каня...

П а л я с о ў ш ч ы к. Дык выгадна...

С е л я н і н. А я табе што кажу...

П а л я с о ў ш ч ы к. Налівай...

С е л я н і н. Не, не... Перад трэцяй два разы трэба павольна абысці вакол ідала...

П а л я с о ў ш ч ы к. Ага...

Выходзяць. З'яўляецца Р а г н е д а.

Р а г н е д а

Каторы раз прыходжу да цябе
І плачу каля ног тваіх, Ярыла...
Каго той ноччу ты мне падаслаў?
Чый пацалунак сэрца маё сушыць?
Хай знойдзецца, калі ён чалавек,
А калі дух, няхай душу пакіне.
Ён мне і бог цяпер і уладар,
Прымі, Ярыла, сціплы гэты дар.
*(Здымае срэбныя завушніцы і кладзе іх да падножжа ідала. Выходзіць.)*

Вяртаюцца С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н. Мы прыйшлі сюды... Так?

П а л я с о ў ш ч ы к. Так.

С е л я н і н. Палову біклагі вырашылі выпіць... Так?

П а л я с о ў ш ч ы к. Так.

С е л я н і н. Палову біклагі вырашылі прынесці ў ахвяру Ярылу... Так?

П а л я с о ў ш ч ы к. Так.

С е л я н і н. Засталася роўна палова біклагі...

П а л я с о ў ш ч ы к. Гледзячы, якая палова засталася... Ці тая, якую мы выпілі, ці тая, якую трэба аддаць... Думаю, што тут тая, што мы выпілі, а, значыць, наша...

С е л я н і н. Калі гэта палова наша, што застанецца Ярылу?

П а л я с о ў ш ч ы к. Вяндліна з аленя...

С е л я н і н. Скажы, палачанін, ты, калі не п'еш, закусваеш?

П а л я с о ў ш ч ы к. Не.

С е л я н і н. Чаму ж ты лічыш, што бог дурнейшы за цябе? Што ён будзе рабіць з аленінай без бражкі?

П а л я с о ў ш ч ы к. Што ж рабіць?

С е л я н і н. Будзем думаць.

Уваходзяць Б р а ц і л а і У л а д з і м і р.

Б р а ц і л а

Тут князь! Ідзіце прэч, халопы.

У л а д з і м і р

Пакінь іх... Хай ахвяру прынясуць.
Бо да багоў па-за чаргой не ходзяць.

П а л я с о ў ш ч ы к

Вітаем шчыра князя.

У л а д з і м і р

Гэта вы?
Сябры старыя! Рады вас пабачыць...
На жаль, без палявання сёння я,
Пачаставаць няма чым... *(Дружыннiку.)*
Дай ім грошай.

С е л я н і н. Добры княжа! Ці знайшоў ты тую, якую згубіў...

У л а д з і м і р. Не, не знайшоў...

С е л я н і н. Тады шукай... і абавязкова знойдзеш. Бо мы летам так выпілі за яе здароўе, так выпілі, што жыць ёй гадоў трыста, не меней... А за трыста гадоў можна абысці ўвесь свет і памацаць кожную дзеўку...

У л а д з і м і р. Выпіце і сёння за яе.

С е л я н і н. Княжа! Мы, два палачаніны, прыйшлі сюды ахвяраваць палову біклагі бражкі Ярылу... Так?

П а л я с о ў ш ч ы к. Так.

С е л я н і н. Наш князь Рагвалод кажа, што пасля багоў самыя на зямлі важныя — князі... Так?

У л а д з і м і р. Так...

С е л я н і н. Князь! Дазволь прынесці ахвяру... палову біклагі бражкі замест Ярылы табе... А ты рабі з ёй што хочаш... Хоць і выпі...

У л а д з і м і р

Прымаецца ахвяра, а цяпер
Я ёй распараджуся, як жадаю...
Хадзі сюды... Вось гэтая біклага
Вам праз мяне дарунак ад багоў...

П а л я с о ў ш ч ы к

Святы Ярыла! Цуда! Цуда здзейсніў!
Што аддалі — вярнулася назад.
Пайшлі, сусед...

Выходзяць.

У л а д з і м і р *(дружыннiку)*

Зірні, зірні! Што гэта?

Б р а ц і л а

Там завушніцы срэбныя. Дарунак
Ярылу ад дзяўчыны...

У л а д з і м і р

Дай сюды!

Б р а ц і л а

Князь, пашкадуй і загадай, што хочаш —
З абрыву скокнуць, пераплыць Дзвіну...
Мячом жывот разрэзаць... Я ахвяру
Чапаць не буду... Не чапай і ты...

У л а д з і м і р

Я іх пазнаў... Яна была тут! Богі!
Удзячны вам, вы падалі мне знак!

Б р а ц і л а

Князь, не чапай! Ярыла пакарае!

У л а д з і м і р

Калі ж караў Ярыла за любоў?
Скачы дадому і скажы Дабрыню,
Што я яе знайшоў, чакаю тут
І дачакаюся, хоць сто гадоў хай пройдзе!
Чаго стаіш? Пайшоў!

Б р а ц і л а

Я не пайду!

У л а д з і м і р

Што ты сказаў?! Пярэчыць свайму князю!
Прэч, раю! Заб'ю! Заб'ю!

Б р а ц і л а

І забівай!
Тады адзін ты тут і застанешся!
А я цябе пакінуць не магу!..
Я не пайду.

Уваходзіць Д а б р ы н я.

Д а б р ы н я

Дружыннік, да мяне!
Хто князю супярэчыць, тых караюць!
Ідзі. Я тут. Цяпер князь не адзін.

Б р а ц і л а

Хай князь даруе мне непаслушэнства.

Д а б р ы н я

Цябе караць, дружыннік, буду я
І за непаслушэнства і за вернасць,
Ты ўсё зрабіў.

Б р а ц і л а

Хай мне даруе князь.

У л а д з і м і р

Ты мне даруй...

Б р а ц і л а

Я гэтага не чую...

Д а б р ы н я

Ідзі.

Б р а ц і л а выходзіць.

Ты князь, альбо блазнюк?!
Паехаць аднаму ў чужое княства
І праганяць апошняга слугу?
Ды ты за наўгародскі край адказны,
І за табою тысячы людзей!
А ты развёў тут гуленькі, каханне...
Ты хто, Ўладзімір? Князь ці скамарох?
Над княствам набрыяла небяспека,
Ну, а табе тут соладка дурэць?
Шукаці дзеўку, што пабачыў голай?!

У л а д з і м і р

Маўчы!

Д а б р ы н я

Ды не! Не буду я маўчаць!
Я вырас з тваёю маці ў прыніжэнні,
Ёй пагарджалі, кпілі... Сапраўды,
Хто паважаці ключніцу павінен?..
Нават тады, калі яе любіў сам князь!

У л а д з і м і р

Ты маці не чапай!

Д а б р ы н я

Мая сястра!
І твая маці нарадзіла князя!
Цябе! Ды князем трэба стаць,
Таму што князь ты толькі напалову.
Ад Святаслава — князь, з Малушы — ключнік!

У л а д з і м і р

Так, ключнік! Ключнік! Ключнік, як і ты.

Д а б р ы н я

Ды не, пляменнік, я даўно не ключнік.
Я праз цябе вяльможай стаў... І я
Зраблю усё, каб ты зрабіўся князем.

У л а д з і м і р

Што адбылося?

Д а б р ы н я

Брат твой, Яраполк, прыслаў ганца
Да князя Рагвалода.

У л а д з і м і р

Дык што?

Д а б р ы н я

Яго дачку за жонку хоча ўзяць...

У л а д з і м і р

Няхай бярэ.

Д а б р ы н я

Ды ты зусім звіхнуўся!
За Яраполкам — поўдзень, а цяпер
Ён замахнуўся і на нашу поўнач...
Далучыць Кіеў, Полацк да сябе...
І Ноўгарад калі-небудзь далучыць.
Пакуль ганец у нас, табе патрэбна
Паслаць сватоў да князя Рагвалода.
Раней зрабіць патрэбна прапанову
За Яраполка...

У л а д з і м і р

Усё! Пакінь мяне...

Д а б р ы н я

Ты разумееш...

У л а д з і м і р

Хто тут князь?! Даволі!
Жаніцца трэба?! Дык жаніся сам!
Мне жонка зусім іншая патрэбна!

Д а б р ы н я

Хто ж галаву табе так задурыў?!

У л а д з і м і р

Яе чакаць... яе чакаць тут буду...
*(Выходзіць.)*

Д а б р ы н я *(услед)*

На беразе раскінуты шацёр...
Там вогнішча... Глядзі не застудзіся!
Заявіцца куды-небудзь каханне —
І там бязладдзе уладарыць стане...

Уваходзіць Б л у д.

Б л у д

Дабрыня, я чакаць больш не магу.
Я затрымаўся... Яраполк спытае,
Чаму ў яго такі марудны сват...
Я ўсё, што мог, зрабіў і расказаў...
Паеду ў Полацк...

Д а б р ы н я

Дзякую...

Б л у д

Яшчэ...
Загад ад Яраполка строгі маю...
Ўсё расказаць пра нараджэнне князя,
Каб Рагвалод мог ведаць, хто была
Ўладзімірава маці...

Д а б р ы н я

А навошта?

Б л у д

Ён так настроіць хоча Рагвалода,
Каб той і на парог вас не пусціў...

Д а б р ы н я

Ах, Яраполк... Ты ж родны брат па бацьку...
А можаш ты не выканаць загад?

Б л у д

Ты хочаш, каб мне ссеклі галаву?
На ёй жа вашы вушы й вашы вочы,
Каб чуць і бачыць Кіеў...

Д а б р ы н я

Гэта так...
Не ў час, не ў час Ўладзімір закахаўся.

Выходзяць. Уваходзіць Р а г н е д а.

Р а г н е д а

Святлее небакрай, спяваюць птушкі,
А на душы маёй халодны змрок.

Уваходзіць Л ю б а в а.

Л ю б а в а

Князёўна светлая! Дамоў вяртацца трэба.
Па вёсках пеўні ўжо даўно крычаць...

Р а г н е д а

Пабудзем яшчэ трошкі...

Л ю б а в а

Можна й болей...
Аднак ці будзе з гэтага карысць?

Мы правялі з табой тут колькі ночак.
І ўсё дарма...

Р а г н е д а

Ён прыйдзе...

Л ю б а в а

Можа быць...
І з’явіцца, ды я ўжо пасівею...
Зраблюся страшнай стараю каргой...
Мяне тады й лясун не пакахае.

Р а г н е д а

Мне сэрца шэпча: недзе блізка ён.

Л ю б а в а

Князёўна мілая! Ды я табе дзіўлюся...
Бо ты ж заўсёды строгаю была...
І так размякла...

Р а г н е д а

Я й сама дзіўлюся.
Ў тумане ўсё... Я некуды плыву...

Л ю б а в а

Павер, мужчыны гэтага не любяць...
Ад холаду жаночага — гараць.
Ад нашай цеплыні адразу ж гаснуць...
Калі пагрэцца хочаш — астудзі.
Сама ж не разгарайся, ён астыне.
Я коні прывяду...

Р а г н е д а

Так, ехаць час...
Зноў без яго дзень новы надыходзіць.

Л ю б а в а выходзіць.

Святы Ярыла! Пуцявіны нашы
Звядзі хутчэй, хай спраўдзяцца ўсе сны...
А калі не, мне, мабыць, давядзецца
Ляжаць на дне сцюдзёнае Дзвіны.

З’яўляецца У л а д з і м і р.

Святы Ярыла...

У л а д з і м і р

Ён цябе пачуў!
І нас з табою звёў у гэтым лесе...

Р а г н е д а

Каханы мой, скажы, скажы мне, хто ты?

У л а д з і м і р

Той, хто цябе кахае...

Р а г н е д а

Скуль ты? Чый?

У л а д з і м і р

Я — твой...

Р а г н е д а

А дзе жывеш?

У л а д з і м і р

Не жыў яшчэ. Дагэтуль быў я мёртвым.

Р а г н е д а

Мяне твой пацалунак атруціў...

У л а д з і м і р

Ну, дык вяртай назад маю атруту...
*(Цалуе яе.)*

Р а г н е д а

Ты ўсё на гэтым свеце засланіў...

У л а д з і м і р

Мая... мая... салодкая пакута...
Якія вочы! Вусны... валасы...
Цябе багі на шчасце мне стварылі,
Адзіная мая, на ўсе часы,
Хай нас з табою зорны лес акрые.

Выходзяць. З'яўляецца Л ю б а в а.

Л ю б а в а *(спявае)*

Дзеўка коніка паіла,
На яе напаў Ярыла.
Кажа дзеўка: «Закрычу»,
А Ярыла: «Я хачу».
Кажа дзеўка: «Грэх прад небам!»
А Ярыла: «Трэба, трэба».
Кажа дзеўка: «Не губі!»
А Ярыла: «Палюбі».
Кажа дзеўка: «Будуць біці»,
А Ярыла: «Палюбіць ме».
Дзеўка коніка паіла
І Ярылу палюбіла.
Блаславі, Ярыла,
Каб было шчасліва,
На добрыя роды,
На доўгія годы,
А-а-ах!

*З а ц я м н е н н е*

# АКТ ДРУГІ

## Карціна першая

Полацк. Палац Рагвалода. Уваходзяць Рагвалод і Блуд.

Блуд

Пасля таго як згінуў князь Алег
І Яраполк — старэйшы Святаславіч —
Паўсюль аднаасобна уладарыць,
Ён цесныя стасункі хоча мець
З табою, Рагвалод...

Рагвалод

Ці азначае гэта,
Што ён і Полацк хоча ўзяць пад Кіеў?

Блуд

Не, што ты, не! Зусім наадварот,
Бо ў Полацка і Кіеў пад уладай...
Цяпер ужо.

Рагвалод

Як гэта разумець?

Блуд

Наш Яраполк прачуў, што ты хаваеш
Зброю у цераме... Ты з ёю захапіць
Без войска зможаш Кіеўскае княства.
Князь Яраполк таму здаецца сам
На тваю літасць... Пашкадуй яго.
Хай Полацк будзе ў Кіеве, а Кіеў
У Полацку...

Рагвалод

Дык пра Рагнеду рэч...

Блуд

З мяне сват, адчуваю, атрымаўся!
Так, пра Рагнеду. Князь наш хоча знаць,
Ці варта прысылаць сватоў сапраўдных,
А не разведчыка, якім з'яўляюся я.

Рагвалод

Пытанні ёсць...

Блуд

Я тут, каб адказаць...

Рагвалод

А князь у Полацку для Кіева намеснік?

Блуд

Сам па сабе...

Р а г в а л о д

І не дае даніну?

Б л у д

Сям'я адна... З каго ж даніну браць?
Яно, канечне, калі гора прыйдзе,
Хазары узбунтуюцца, тады
Ты войскам Яраполку дапаможаш...
А калі тут бяда... Паможа Кіеў...
Адна сям'я...

Р а г в а л о д

Браты князь Уладзімір з Яраполкам,
Ды цяжка іх назваць адной сям'ёй.
Так касавурацца... нібы чужога роду.

Б л у д. Які ж свой род, князь Рагвалод... Яраполк старэйшы, чыста княскага роду... Законны князь і наследнік... А Уладзімір... Іх бацька Святаслаў неяк пасля паходу, добра мёду выпіўшы, пазабаўляўся з ключніцай сваёй маткі княгіні Вольгі... Пазабаўляўся як воін, а тая не дурніца... узяла дый зацяжарала... Бух княгіні ў ногі: маўляў, князя, унука твайго, у пузе нашу... А Вольга да той пары ў Канстанцінопалі ахрысцілася і ўсіх шкадаваць пачала... Пытае ў сына: быў з ёй... Ну, а што... ці мала з кім воін не быў... Калі так, загадала Вольга, будзе расці як твой сын... Так што калі Уладзімір і ад Святаслава, дык і то напалову ключнік, напалову князь... А калі Малуша схітравала, то Ноўгарадам цяпер уладарыць скамарох... Яны церліся каля дзеўкі...

Р а г в а л о д

Даволі! Нецікава гэта мне...

Б л у д

Ён твой сусед...

Р а г в а л о д

Пяройдзем лепш да справы.

Б л у д

Два княствы, аб'яднаныя ў адно
Тваёй дачкой,— магутнейшая сіла.
Хто нас застрашыць? Пераможа хто?
Суседзям трэба будзе далучыцца
Альбо табе і нам плаціць даніну.

Р а г в а л о д

Наддзвінне пражыве і без даніны.
Якая ў Яраполка прапанова?

Б л у д

За жонку хоча ўзяць тваю дачку
І мець цябе за цесця... і за друга.

Р а г в а л о д

Нам полацкія правілы дыктуюць.
Пра гэта запытацца і ў князёўны...
Гэй, хто там!

Уваходзіць М а м у л ь к а.

Няхай да нас князёўна зараз выйдзе...

М а м у л ь к а

Няхай даруе князь, але князёўны
Цяпер няма ў палацы.

Р а г в а л о д

Дзе ж яна?

М а м у л ь к а

На капішчы багам ахвяры робіць...

Б л у д

Князь Яраполк набожнасць ухваляе.
Для жонкі якасць першая... Дык што
Мне перадаць яму?

Р а г в а л о д

Маю падзяку...
За гонар найвялікшы і няхай
Да нас сватоў пад восень засылае...

Б л у д

Лепшых навін я ў Кіеў не прывозіў!
Дазволь руку табе пацалаваць
Як будучаму цесцю Яраполка.
*(Цалуе руку Рагвалоду.)*

Р а г в а л о д

За стол цяпер! Там нас чакаюць чары.
З наддзвінскім мёдам і дарамі лесу...

Выходзяць.

М а м у л ь к а

Хутка Рагнедачку ды ў Кіеў павязуць.
Саспела ягадка... Цяпер цябе з'ядуць.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна другая

Лес. Капішча. Выява ідала. Уваходзяць С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н. Смажыць...
П а л я с о ў ш ч ы к (*трасе біклагу*). Пуста...
С е л я н і н. Ну не ваду ж з Дзвіны піць?

П а л я с о ў ш ч ы к. А што?

С е л я н і н. А можа...

П а л я с о ў ш ч ы к. Ну?..

С е л я н і н. Пазычыць...

П а л я с о ў ш ч ы к. У каго?

С е л я н і н *(паказвае на біклагу каля падножжа ідала)*. Вунь у яго...

П а л я с о ў ш ч ы к. Ты з глузду з'ехаў... Калі ахвярнае мы возьмем, нас жа...

С е л я н і н. Хто табе сказаў, што возьмем?! Пазычым... Потым аддадзім... Святы Ярыла, ты ж нас разумееш?.. Раз табе носяць бражку — значыць п'еш... А калі п'еш, ведаеш як паскудна, калі смажыць... Дазволь трохі ўзяць з гэтай ахвярнай біклагі... Аддадзім потым... Паспрыяй людзям тваім... А калі ты супраць — хай проста зараз гром грымне... хоць і неба чыстае... *(Паўза)*. Пералівай... Бачыш, усё ціха... Дзякуй табе, добры бог...

Пераліваюць вадкасць з біклагі ў біклагу і выходзяць.
З'яўляюцца Р а г н е д а і У л а д з і м і р.

Р а г н е д а

Здаецца, што на ўсёй, на ўсёй зямлі
Спакой і радасць...

У л а д з і м і р

А хіба ўжо ранак?
Як хутка ноч мінула...

Р а г н е д а

Ехаць час...

У л а д з і м і р

Дазволь яшчэ цябе пацалаваць.
*(Цалуе.)*

Р а г н е д а

Час... ехаць час... ды як жа развітацца?
І як цябе не бачыць і не чуць?
Не адчуваць, як апякаюць вусны вусны,
Каханы мой...

У л а д з і м і р

Каханая...

Уваходзіць Л ю б а в а.

Л ю б а в а

Ну, ўсё!
Я думаю, што нас ужо шукаюць,
Бо бацька твой дружыннікаў паслаў.

У л а д з і м і р

Дай развітацца нам!

Л ю б а в а

А колькі можна?
Ды з усім светам можна развітацца
За гэты час... Князёўна, ачуняй!
Ты сёлета ў ахвяру нас прынесла.
Князь за цябе мне галаву ссячэ!

Р а г н е д а

Бывай...

У л а д з і м і р

Бывай... Давай паедзем разам...

Р а г н е д а

Не, што ты, нельга...

У л а д з і м і р

Што ж прыдумаць мне,
Каб побач трошкі болей затрымацца?..

Р а г н е д а

Ды ты не побач, ты жывеш у сэрцы.
Ты мною стаў, і ты заўжды са мной,
Бывай...

У л а д з і м і р

Бывай... Не! Трошкі пачакай.

Л ю б а в а

Усё спачатку! Што ж гэта за гора?
Не толькі дзень, надыдзе так і старасць...
«Бывай — бывай» і зноў «бывай — бывай» —
Гэтак з жыццём развітвацца трэба.
Дык, пэўна, аніколі не памрэш...

У л а д з і м і р

Абдымемся апошні раз...

Р а г н е д а

Апошні?

У л а д з і м і р

Пакуль сваты, заручыны, вяселле...
І урачысты абыход Ярылы,
Злучыўшы рукі... Разам нам не быць...

Л ю б а в а

Я зараз закрычу...

Р а г н е д а

Бывай, мой любы...

У л а д з і м і р

Чакай мяне...

Р а г н е д а

Я ўсё жыццё чакала...

Р а г н е д а і Л ю б а в а выходзяць.

Уладзімір

Жыццё табе, Ярыла, ахвярую
За гэту ноч, за шчасце, што ты даў.
Ўва мне нават і княскага нямнога,
Я ж зараз адчуваю сябе богам...
*(Выходзіць.)*

*Зацямненне*

## Карціна трэцяя

Лес. Дабрыня і Блуд.

Дабрыня

Як Рагвалод сустрэў цябе?

Блуд

Гасцінна...

Дабрыня

І згоду даў?

Блуд

А хто б яе не даў?
Дачка — княгіня Кіеўскага княства.
Яму спакойна можна паміраць.
Цяпер будзе каму дагледзець Полацк
І вырасціць малых яго сыноў...
Ён пад крылом у Кіева... час ехаць...
Бывай, Дабрыня...

Дабрыня

Весткі падавай...
Ты ў Ноўгарадзе госць заўжды чаканы,
Не забывай... Як зможаш — прыязджай...
Вось наш табе гасцінец на дарогу.
Лёгкага шляху...

Блуд

Дзякуй...

Дабрыня

Бывай...
*(Перадае яму кошаль. Выходзіць.)*

Блуд

Калі служыць двум ворагам сумленна,
Здабудзеш перамогу несумненна,
Хто б з іх у рэшце рэшт ні перамог...
Аддзячыць, бо яму ты дапамог...
*(Выходзіць.)*

*Зацямненне.*

## Карціна чацвёртая

Полацк. Палац Рагвалода.
Р а г в а л о д і Р а г н е д а.

Р а г в а л о д

Багі твае ахвяры ўпадабалі,
За частыя малітвы па начах,
І за бяссонне у лясах наддзвінскіх,
Цябе узнагародзілі...

Р а г н е д а

Мяне?..

Р а г в а л о д

Цябе, мяне і полацкі ўвесь люд!
Старэйшы Святаславіч Яраполк,
Што ў Кіеве цяпер вялікім князем,
Вялікі гонар Полацку зрабіў
Сваім жаданнем парадніцца з намі.
Чаму збялела ты? Няўжо не рада?

Р а г н е д а

Мне млосна, бацька... Можна, я пайду?

Р а г в а л о д

Ты захварэла?

Р а г н е д а

Я пайду...

Р а г в а л о д

Рагнеда!
Па полацкіх законах трэба мне
Спытацца і ў дачкі пра яе згоду...
Сваю я згоду Яраполку даў...

Р а г н е д а

Раней мяне?

Р а г в а л о д

Цябе тут не было,
Дый што з таго? Адмовіць было нельга...
Тут княства лёс... Дзяржаўны інтарэс...
А ён за ўсё... за ўсё заўжды вышэйшы...

Р а г н е д а

Не, не за ўсё! Ёсць нешта і вышэй...

Р а г в а л о д

Я не пачуў... Скажы больш зразумела...

Р а г н е д а

Нам сэрца, бацька, дадзена багамі,
Каб слухаць іх загады...

Р а г в а л о д

Ну дык што?

Р а г н е д а

Маё цяпер ірвецца і крычыць:
«Не! Не!»

Р а г в а л о д

Што «не»?

Р а г н е д а

А тое, што ніколі
Для Яраполка жонкай мне не быць.
Ты паспяшаўся згоду даць...

Р а г в а л о д

Спыніся!
Ты з бацькам размаўляеш!

Р а г н е д а

Ты — з дачкой...
Не прымушай грашыць яе...

Р а г в а л о д

Што чую?!

Р а г н е д а

Для Яраполка жонкай мне не быць!

Р а г в а л о д

Дык бацька твой, выходзіць, проста хлус?
Ці балбатун?! Ці пустазвон дурненькі?
Не гаспадар для слоў і абяцанняў?
Рагнеда, ты жартуеш недарэчна...

Р а г н е д а

Укленчыўшы, прашу цябе: даруй...
Даруй мне дзёрзкасць і непаслушэнства,
Але сваё рашэнне адмяні...

Р а г в а л о д

Я згоду даў, а, значыць, гэта згода...
Твая таксама!

Р а г н е д а

Бацька, пашкадуй!
Не разбурай Ярылы падарунак,
Ад гэтага слязьмі зальёмся мы...

Р а г в а л о д

І што ж падараваў табе Ярыла?

Р а г н е д а

Каханне...

Р а г в а л о д

Ах, дык вось тут што... Каханне...
Князёўна ты! Халопкі хай кахаюць.

Дурноту гэту выкінь з галавы...
Хто б ён ні быў... Цябе чакае Кіеў...

Р а г н е д а

Мяне не дачакаецца ніхто!
Апроч яго...

Р а г в а л о д

Нахабніца! Маўчаць!
Распесцілася ад любові бацькі!
І яшчэ будзеш голас падымаць?!.

Р а г н е д а

Усім святым малю...

Р а г в а л о д

Даволі! Стража!

Уваходзяць с т р а ж н і к і і М а м у л ь к а.

Князёўну ў верхні церам адвядзіце
І там пастаўце варту... Каб ніхто...
Не змог зайсці туды... дазвол не атрымаўшы.
Ідзі рыхтуйся! Бо сваты прыедуць...

Р а г н е д а

Праз слёзы бачу я адчай і беды,
Апошні раз прашу...

Р а г в а л о д

Усё, ідзі!
*(Да Мамулькі.)*
А ты яе служанку прывядзі...

М а м у л ь к а

Пайшлі, Рагнеда... Слухаць бацьку трэба...

Р а г н е д у выводзяць.

Р а г н е д а

Праз слёзы бачу я адчай і беды...

Р а г в а л о д

Вось! Ад дачкі адна для бацькі радасць...
Як ні хавай яе — спакусяць і украдуць.

М а м у л ь к а прыводзіць Л ю б а в у.

Л ю б а в а

Я слухаю пачціва свайго князя...

Р а г в а л о д

Усё, што толькі ведаеш, кажы...

Л ю б а в а

Ды я і больш сказала б... Толькі што?

Р а г в а л о д

Куды з князёўнай ездзілі?

Л ю б а в а

Маліцца...

Р а г в а л о д

І хто маліцца вам дапамагаў?

Л ю б а в а

Няхай даруе князь — не разумею...

Р а г в а л о д

Кажы: з кім сустракалася Рагнеда?
Ці мне паклікаць грыдня з бізуном?

Л ю б а в а

Князь, пашкадуй! Рагнеда мне як маці.
І як сястра... Як мне яе прадаць?

М а м у л ь к а

Няшчасная! А ён хто? Печанег?
Ці бацька родны?

Р а г в а л о д

З кім яна была?
Хто-небудзь з палачан?

Л ю б а в а

Князёўна хай даруе...

Р а г в а л о д

Прасі багоў, каб дараваў і я...

Л ю б а в а

Яна сустрэла ўлетку выпадкова...
Калі дзяўчаты жэняцца з Ярылам.
Прыгожага і знатнага хлапца.

Р а г в а л о д

Хто ён такі?

Л ю б а в а

Не ведаю...

Р а г в а л о д

Кажы!

Л ю б а в а

Не ведаю. Апрануты быў чыста.
Сватоў сваіх паабяцаў прыслаць...

Р а г в а л о д

Калі сваты прыедуць да мяне,
Замест яе ты ім і скажаш: «Не!»

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна пятая

Ноўгарад. Палац Уладзіміра. У л а д з і м і р, д р у ж ы н н і к і, с л у г і, с к а м а р о х і, г у с л я р ы.

Д р у ж ы н н і к і *(спяваюць і танцуюць)*

Налівай мёду, налівай,
Праслаўляй князя, праслаўляй,
Слава Ўладзіміру!
Слава Ўладзіміру!
За тваё княства і за нас
Выпівай чару, светлы князь,
Добры наш бацюхна!
Добры наш бацюхна!

У л а д з і м і р

Усім віна! І п'ём за палачанку!

Д р у ж ы н н і к і

Віват! Віват!

У л а д з і м і р

За светлую князёўну!

Б р а ц і л а

А як завуць?

У л а д з і м і р

Дазнаешся яшчэ...
Яна тут хутка будзе гаспадыняй.
І калі жонка ёсць у Перуна,
Дык наша ёй нікольк і не саступіць.

Б р а ц і л а

За палачанку! Жонку Перуна!

У л а д з і м і р

Яе не аддамо і Перуну!

Б р а ц і л а

Сам Перуном стань...

У л а д з і м і р

Пахмяліся, грэшнік!

Уваходзіць Д а б р ы н я.

Дружына! Перад дзядзькам на калені!
Я ж на каленях чару паднясу...
*(Становіцца з чарай на калені.)*

Д а б р ы н я *(ціха Уладзіміру)*

Ты адурэў, Ўладзімір! Што ты робіш?!
Князь на каленях...

У л а д з і м і р

Слухаць! Бо я князь!..

Як князь і гавару перад дружынай,
Быў дурнем, што не слухаўся цябе...
А надалей, клянуся, буду слухаць...
Хоць загадай хадзіць на галаве...

Д а б р ы н я

Устань і не саром мяне...

У л а д з і м і р

Не, выпі!
Да дна за палачанку...

Д а б р ы н я *(хутка выпівае)*

Уставай!
З якой нагоды зладзіў ты гулянку?
І за якую піў я палачанку?
Няўжо знайшоў? І хто яна?

У л а д з і м і р

Князёўна...

Д а б р ы н я

Па прыгажосці, можа, і князёўна.
А род які?

У л а д з і м і р

Род княскі... Прыгажосцю ж
Яна не роду княскага... Багіня...

Д а б р ы н я

Няўжо гэта Рагнеда?

У л а д з і м і р

Так, яна...

Д а б р ы н я

Дык я магу у сваты зараз ехаць?

У л а д з і м і р

Злуюся, што ты ўчора не паехаў...
Але у гэтым вінен толькі я...

Д а б р ы н я

Дазволь мне дзейнічаць?

У л а д з і м і р

І як мага хутчэй...
*(Выходзіць.)*

Д а б р ы н я

Брацiла, да мяне! Пакінуць чару!
Сядлаць каня! І па шляху на Кіеў!
Скачы без адпачынку дзень і ноч...
Дагоніш Блуда...

Б р а ц і л а

Што тут госцем быў?

Д а б р ы н я

Так, той...
Папросіш завярнуцца,
А не пагодзіцца, то затрымай сілком.
У Кіеў не павінен ён даехаць
З той весткаю, якую атрымаў...
Ад Рагвалода...

Б р а ц і л а

Ўсё зраблю...

Д а б р ы н я

Вазьмі
З сабой атрад і лепей упрасі...
Скажы, я заклінаю на каленях
Яго на тыдзень госцем затрымацца,
Аддзячу я, і князь яму аддзячыць.
Скачы!

Б р а ц і л а выходзіць.

*(Другому дружынніку.)*
Ты ж зараз на каня,
Імчы у Полацк, скажаш Рагвалоду,
Што дзядзька Уладзіміра, Дабрыня,
З важным візітам мусіць хутка быць
Ля ног яго з вялікай прапановай,
Яна змацуе наша з іхнім княствы.
Скачы!

Д р у г і д р у ж ы н н і к выходзіць.

Збірайце скуры лепшых гарнастаеў,
Куніц! Баброў! І золата! І срэбра!
Грузіце бочкі грэцкага віна!
Надзеньце заўтра лепшыя апраткі.
Пачысціць зброю! Вычасаць каней!
Сабе княгіню едзем здабываці!
Ёсць бацька ў Ноўгарада! Хутка будзе маці!

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна шостая

Полацк. Палац Рагвалода. Р а г в а л о д і М а м у л ь к а.

М а м у л ь к а

Сваты ідуць! Усё як на Каляды:
Музыкі, скамарохі, гусляры

Кідаюць грошы, пояць жабракоў,
Даюць усім багатыя дарункі...
Рагнеду славяць!

Р а г в а л о д

Прывядзі яе...

М а м у л ь к а выходзіць.

Ты тут, Любава? Выйдзі да мяне...

Уваходзіць Л ю б а в а.

Л ю б а в а

Я слухаю...

Р а г в а л о д

Ты ўсё дакладна зробіш?
Ты ўсё запомніла?

Л ю б а в а

Даруй мне, любы князь...
Пусці мяне і іншай загадай...

Р а г в а л о д

Ўсё зробіш ты!

Л ю б а в а

На сэрцы маім жах!
І прадчуванне жудасці і гора...

Р а г в а л о д

Ідзі і праз хвіліну будзь гатовай.
Пасля чакай, калі цябе паклічуць.

Л ю б а в а

Хай мне багі грэх гэты не залічаць.
*(Выходзіць.)*

Уваходзяць Р а г н е д а і М а м у л ь к а.

Р а г в а л о д

Ты чуеш, колькі гоману і шуму?
Гэта сваты па Полацку ідуць...

Р а г н е д а

І да каго яны?

Р а г в а л о д

Ды да цябе...

Р а г н е д а

Нашто?
Я ўжо даўно сасватана Ярылам...

Р а г в а л о д

Але законы Полацкага княства
Прыняць сватоў гасцінна патрабуюць.
І даць адказ ім...

Р а г н е д а

Што ж, даю адказ:
Я аніколі не паеду ў Кіеў!
Хутчэй Дзвіна на поўдзень пацячэ
І за зімой надыдзе злая восень
Замест вясны, а потым зноў зіма...

Р а г в а л о д

Сваты не з Кіева...

Р а г н е д а

А скуль яны?.. Ўладзімір!!!
Каханы мой! Дзе ж гэтулькі ты быў?!
Я ўдвая за тыдзень пастарэла...
Сюды! Сюды, мой любы, я — твая...
Хай лішніх слоў сваты твае не трацяць...
З табой! З табой! Вязі, куды захочаш...
Не павязеш, я следам пабягу...
Каб толькі побач быць і цябе бачыць!

Р а г в а л о д

Вар'ятка! Завядзіце яе ў церам!
Яе дурманам нехта апаіў...

Р а г н е д а

Што будзе заўтра, княжа мой, не знаю,
Але цябе кахаю і чакаю...

Р а г н е д у выводзяць.

М а м у л ь к а

Князь... Сэрцам адчуваю: тут каханне...
Усіх змяце, хто супраць яго стане...

Р а г в а л о д

Ідзі адсюль і апранай Любаву...
Кахае княскі род толькі Дзяржаву!

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна сёмая

Вуліца Полацка. Д а б р ы н я і Б р а ц і л а.

Б р а ц і л а

Сячы маю, Дабрыня, галаву...
Я Блуда не дагнаў...

Д а б р ы н я

Ты прамарудзіў!

Б р а ц і л а

Скакалі дзень і ноч... Здыхалі коні...
За княствам, ля дубровенскіх гаёў,
Там, дзе Дняпро зварочвае на поўдзень,
Яго атрад даўно чакалі стругі...
Паднялі ветразі (папутным вецер быў),
Ды па цячэнню... Як нам па балотах
Дагнаць было па беразе?..

Д а б р ы н я

Няхай!..
Няхай вязе, што толькі абяцалі...
Пакуль прыедуць — ўсё тут разабралі...
Памыйся! Бо у княстве хутка свята
І на ўсю поўнач радасці багата!

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна восьмая

Палац Рагвалода. Р а г в а л о д і Д а б р ы н я.

Д а б р ы н я

Мы заблудзіліся ў тваіх лясах і пушчах
І прамачылі ногі у Дзвіне…
Дазволь нам, княжа, трошкі прасушыцца.
У горле суха, ломіць у спіне...

Д р у ж ы н н і к і *(співаюць)*

Мы з дарогі збіліся,
Коні прытаміліся,
Ці не пусціш ты нас
Ў добры час...

Р а г в а л о д

Полацк гасцям заўсёды вельмі рады.
За стол прашу... Гэй, слугі, ўсім віна!
Гасцей шаноўных добра пачастуйце!
Вас, госцейкі, прашу мне расказаць,
З якога краю будзеце і хто
Цяпер за князя ў вашым родным краі...

Д а б р ы н я

Мы з Ноўгарада-горада, стаіць
Той горад каля возера Ільменя,
Князь Уладзімір сёння княжыць там,
Ён Святаслава сын, і сын малодшы.

І вось не так даўно... Па нашай просьбе
Прыйшоў на наўгародскі наш пасад...
Жывём цяпер шчасліва і багата,
Ды нешта князь пачаў наш сумаваць...

Р а г в а л о д

Што ж здарылася з ім?

Д а б р ы н я

Аднойчы ехаў
Ён каля Полацка і нешта ўпадабаў
У тваім княстве і за гэта «нешта»
Гатовы княства роднае аддаць,
З людзьмі, з багаццем, з возерам Ільменем.
Вазьмі ўсё гэта, добры Рагвалод,
А нам аддай ты толькі гэта «нешта»...

Д р у ж ы н н і к і *(спяваюць)*

Табе славу пяюць нашы волаты,
Мы заплацім табе срэбрам-золатам,
Лепшы мёд, лепшы стол Наўгарода,
Для гасцей, для сыноў Рагвалода...

Р а г в а л о д

Ці не маю кабылу князь ваш хоча?

Д а б р ы н я

Ён дасць табе іх тысячу...

Р а г в а л о д

Дык што ж?
Яшчэ мядзведзі ёсць на ланцугах...

Д а б р ы н я

Іх шкурамі да нас твой шлях пасцелем...

Р а г в а л о д

А мо мой меч?

Д а б р ы н я

Гэй, дзецюкі, сюды!
Зброю ў дарунак князю паднясіце...

Дружыннікі падносяць Рагвалоду зброю.

Ад Уладзіміра ў дарунак як суседу...
За «нешта» ж зусім іншым будзе кошт...

Р а г в а л о д

Ну дык скажыце, што гэта за «нешта»?

Д а б р ы н я

Тое, што бацька больш за ўсё шануе,
Так любіць-песціць, але ўсё ж аддасць,
Калі надыдзе час... і будзе рады...
Што гэта «нешта» некаму аддаў...

Д р у ж ы н н і к і *(спяваюць)*

Чулі ўсе, чулі ўсе праз паўсвета:
Ёсць у князя дачушка Рагнеда...
І прыслаў, і прыслаў сюды нас
Малады, малады, светлы князь!

Р а г в а л о д

Разгублены я трохі...

Д а б р ы н я

Нам вядома...
Сватоў яшчэ у князя не было...
Князёўна свайго слова не казала...
Дык скажа хай...

Р а г в а л о д

Па полацкіх законах...
Яна павінна з сватам размаўляць...
Пры бацьку... Хай астатнія ўсе выйдуць,
На вуліцы для ўсіх багаты стол...

Усе, апроч Дабрыні, выходзяць.

Цяпер сюды князёўну пазавіце...

Уваходзіць Л ю б а в а ва ўбранні князёўны Рагнеды.

Д а б р ы н я

Я свайго князя зараз разумею,
Тут можа загарэцца нават лёд,
І старац мудры зможа розум страціць...

Р а г в а л о д. Рагнеда! Князь наўгародскі Уладзімір аказаў вялікі гонар Полацкаму княству і табе... Ён просіць цябе стаць яго жонкай і княгіняй наўгародскай... Пытаюся: што скажаш ты пасланніку князя Уладзіміра і свату?

Л ю б а в а *(ва ўбранні Рагнеды)*. Хто бацька Уладзіміраў быў?

Д а б р ы н я. Князь кіеўскі быў... Слаўны Святаслаў, сын Ігара і Вольгі...

Л ю б а в а

Ну а маці?

Д а б р ы н я

А маці была простаю дзяўчынай,
Цнатлівай, сціплай... Князь яе любіў...
І сына гадаваў ў сям'і як князя...

Л ю б а в а

Па старадаўнім звычаі я мушу
Прад шлюбным ложам мужа разуваць...
Ды як мне разуваць рабыні сына?..

Дабрыня

Ён князь... I Святаслава сын...

Любава

Як Яраполк...
Але ў таго была княгіняй маці...
Была княгіняй маці і ў мяне...
Вярба каля вярбы расці павінна,
Дуб каля дуба... Ля сасны сасна...

Дабрыня

Мне... гэта... князю... так і перадаць?
Ён жа цябе... Ён жа цябе... кахае,
Рагнеда, ён жа трызніць... Ён не спіць...
Ты для яго вышэй багоў і сонца.

Любава

Даруйце, я пайду...

Рагвалод

Ідзі, дачка...

Любава выходзіць.

Яна ўсё шчыра сэрцам гаварыла...

Дабрыня

Разбіла толькі сэрцы нам усім...
Туман паўсюдна, знікла сонца з воч...
І ва ўсім свеце... гаспадарыць ноч...
*(Выходзіць.)*

*Зацямненне*

## Карціна дзевятая

Бераг Дняпра ў дубровенскіх гаях. Уваходзяць Дабрыня і Блуд.

Блуд

Вітаю дзядзьку!

Дабрыня

Дзякуй, што прыехаў...

Блуд

Чаму ты змрочны?

Дабрыня

Змрочны? Ды не змрок!
Цяпер на маім сэрцы злая цемень
І чарната... Нам наплявалі ў твар!
Прынізілі і жорстка растапталі...
Як жабракоў прагналі са двара!
Паслаў мяне Ўладзімір да Рагнеды...

Б л у д

Адмовіла?

Д а б р ы н я

Сказала, што ён раб!
А разуваць раба яна не будзе!
Я да цябе прыехаў па параду...
Ён ад яе здурэў... Ён закаханы!
Дазнаецца, то распачне вайну!
Мой верны Блуд, парай, што мне рабіць?

Б л у д

Ўсё раскажы, дый больш напрыдумляй!
Каб князь адчуў абразу як мужчына!
Каб ваччу ад злосці памутнела,
Каб сам Пярун у сэрцы загрымеў,
Тады адчуе ён сябе зубром,
Той за сяброўку рогі свае зломіць
Ці скруціць шыю ворагу...

Д а б р ы н я

А Кіеў?

Б л у д

Вам Яраполк цяпер зусім не страшны,
У Кіеве ніхто яго не любіць,
Чакаюць, каб там княжыў Уладзімір,
Ён, як народ, пайшоў сам пад ахвяру...
На роўных з простым людам... Ён — герой!
Пачне вайну? Няхай і пачынае!
Ўсім закаханым бог дапамагае...

Д а б р ы н я

Бывай...

Б л у д

Бывай...

Д а б р ы н я

А за параду дзякуй.
*(Выходзіць.)*

Б л у д

Два княствы, два браты і два сябры...
Адна Рагнеда... Побач два зубры!
Хай б'юцца, будзем мы дапамагаць,
Таму, хто будзе ўсіх перамагаць.
*(Выходзіць.)*

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна дзесятая

Полацк. Каля палаца. Уваходзяць Рагвалод, Любава. Мамулька і слуга нясуць непрытомную Рагнеду.

Рагвалод
Што з ёю?
Любава
Мы з пятлі яе дасталі...
Мамулька
Адрэзала нажом сваю касу
І з валасоў спляла сабе вяроўку...
Каб я туды выпадкам не зайшла...
Рагвалод
Дачушка... Што ты? Чуеш?
Рагнеда
Уладзімір...
Рагвалод
Нясіце як хутчэй яе ў палац!
Любава
Яна з тугі па ім памерці можа
Ці кінецца ў Дзвіну... Князь, я прашу...
Рагвалод
Нясіце! І дружынніка сюды!

Любава і слуга выносяць Рагнеду.

Мамулька
Князь, ёсць закон багоў... Закон адвечны:
Каханню супярэчыць небяспечна.
Рагвалод
Любы закон парушыць можна князю,
Каб толькі слова княскае стрымаць!
Мамулька
Утопіцца...
Рагвалод
А я ўтаплю цябе!
Мамулька
За што?
Рагвалод
Што недагледзела князёўну!
Нідзе яна не дзенецца, астыне.
Каханне з часам ад разлукі згіне!
Мамулька
Ой, князь, глядзі, каб не было бяды.

Р а г в а л о д

Ідзі адсюль! Дружынніка сюды!

М а м у л ь к а выходзіць. Уваходзіць д р у ж ы н н і к.

У Ноўгарад скачы і там скажы,
Што я хачу Ўладзіміра пабачыць,
Абмеркаваць з ім важныя пытанні.
Хай прыязджае ў госці найхутчэй
Ці ў Ноўгарадзе сам мяне сустрэне.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна адзінаццатая

Ноўгарад. Палац Уладзіміра. У л а д з і м і р і Д а б р ы н я.

У л а д з і м і р

Не! Не! І не! Ніколі не паверу!
Няхай не толькі ты, а ўсе багі
Перада мной засведчаць яе словы —
Ўсё гэта будзе страшнаю хлуснёй!
Напраслінай! Яна не гаварыла!

Д а б р ы н я

«Я разуваць рабыніча не буду...
Бяроза хай расце каля бярозы,
Дуб каля дуба, ля сасны сасна...»
Не роўня ёй...

У л а д з і м і р

Маўчы!

Д а б р ы н я

Я памаўчу...
Крычыць маё скрываўленае сэрца...
І сэрца тваёй маці... Прыніжэнняў
Багата ёй і ў Кіеве было...
А гэта твая полацкая сучка
Змагла яе і мёртвую прынізіць:
«Не буду разуваць рабыні сына».
Не князь ён! Смерд і раб! Чарвяк паганы
Надумаўся папнуцца ў жаніхі...
Так зганьбіць княства наша і цябе!
І выбраць Яраполка...

У л а д з і м і р

Яраполка?!

Д а б р ы н я

Яна сказала так...

У л а д з і м і р

Няпраўда! Не! Няпраўда!

Д а б р ы н я

Навошта мне маніць? Хіба не я...
Маліў, каб ты сватоў паслаў у Полацк?
Паспеў ёй нейкі нелюдзь расказаць,
Хто нарадзіў цябе і кім была Малуша...
Паскудны княскі гонар і ўзыграў...
І пацягнуў яе да Яраполка...
Яна яго разуе перад тым,
Як будзе ногі падымаць у ложку...

У л а д з і м і р

Я — раб! Я — раб! Я — раб і сын рабыні...
Рабам не дазваляецца кахаць!
Яны каханне здабываюць сілай!
І твораць бессаромна на вачах
Жыцця для ўсіх святую таямніцу...
Я — раб! Я — раб! І я хачу князёўну!
Яна мяне не хоча разуваць...
Я і абуты ёй абрэжу косы...
На Полацк! Пад мячы ўсё! Пад агонь!
Хай гэты горад у пакутах згіне!
Рагнеду — мне! Астатняе — дружыне!
*(Выходзіць.)*

З'яўляецца Б р а ц і л а.

Б р а ц і л а

Там з Полацка ганец прыбыў да князя.

Д а б р ы н я

Забі яго! Бо з Полацкам вайна.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна дванаццатая

Полацк. Пажар. Гвалт. Уваходзіць У л а д з і м і р.
Два д р у ж ы н н і к і цягнуць Р а г в а л о д а.

Р а г в а л о д

Аддай мой меч! Я буду з табой біцца!

У л а д з і м і р

Я — раб! Я з князем біцца не магу!
У церам! У пакоі да князёўны —

Там прывязаць і хай на ўсё глядзіць!
Як раб з князёўнай будзе забаўляцца.
Папросіць смерці — зараз жа забіць!
А не папросіць — хай жыве да скону!

Р а г в а л о д а выводзяць. Д а б р ы н я і Б р а ц і л а цягнуць Л ю б а в у.

Д а б р ы н я
Князь, вось яна!

У л а д з і м і р
Ды гэта не яна!
Яе служанка!

Д а б р ы н я
Што?! Яе служанка?!

У л а д з і м і р
Шукаць яе! Усім шукаць Рагнеду!
*(Выбягае.)*

Д а б р ы н я *(Любаве)*
Дык ты служанка? Што ж, ідзі да слуг!
Бяры яе... Хай пройдзе страшны круг...

Выходзяць. Шум бітвы.
Уваходзяць С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н. Куды вы гледзіце, ідалы?! Нашто стварылі нас?! Каб мучыць?.. Праклятыя... Ненажэрныя! Крыві вам мала! Ахвяр! Даўбешкі вы, а не багі! Крывасмокі! І князі вашы дурныя!

П а л я с о ў ш ч ы к. Маўчы! На, выпі...

С е л я н і н. Не хачу!

Выходзяць. Б р а ц і л а цягне за валасы Р а г н е д у.
Убягаюць У л а д з і м і р і М а м у л ь к а.

У л а д з і м і р
Гэй, раб, сюды! Аддай рабу князёўну!

М а м у л ь к а
Не руш яе!

Б р а ц і л а
Ану, вядзьмарка, прэч!
*(Забівае яе.)*

М а м у л ь к а
Каб вас Пярун спаліў!
Бывай, мая дачушка...
*(Памірае.)*

Р а г н е д а
Звяры паганыя!

У л а д з і м і р

Са зверам ляжаш спаць!
Вядзі ў пакой! Здзяры з яе сарочку!
Я спраўлю табе рабскае вяселле!

Р а г н е д а

Што ж яшчэ можа справіць брудны раб?
*(Плюе яму ў твар.)*

У л а д з і м і р

Вядзі яе!

Выходзяць.

*З а ц я м н е н н е*

## Карціна трынаццатая

Полацк. Пажарышча. Цішыня.
Уваходзяць С е л я н і н і П а л я с о ў ш ч ы к.

С е л я н і н *(плача)*. Чым? Чым я вінен, што князь мой абразіў князя чужога... Чым вінаватая дачка мая, што ў нас гордая князёўна... За што яе замардавалі... За што яе грудзі парэзалі?.. Сына засеклі... Хату спалілі... Каб вас Пярун спаліў... Сына засеклі... Грудзі парэзалі...

П а л я с о ў ш ч ы к. На, выпі...

С е л я н і н. Праклятыя...

П а л я с о ў ш ч ы к. Маўчы! Княскую сям'ю захапілі... князёўну пры бацьку, пры дружыне, на вачах ва ўсіх... Рагвалод сам смерці папрасіў... Усіх пасеклі...

Уваходзіць Б р а ц і л а.

Б р а ц і л а. Вы! Прэч адсюль... Тут хутка будзе князь...

П а л я с о ў ш ч ы к. Хадзем, чаго сядзіш...

Б р а ц і л а. Ты што, не чуеш?

Селянін раптам кідаецца на Брацілу і б'е яго нажом. Брацiла падае.

П а л я с о ў ш ч ы к. Ты ачумеў! Хутчэй, бяжым хутчэй!

С е л я н і н. Не, пачакай... Я горла перарэжу...

Выходзяць. Уваходзяць Р а г н е д а і Л ю б а в а.

Р а г н е д а

Ты, Уладзімір, раб! І сын рабыні...
У тваім сэрцы звер, а не любоў.

Аддай мяне дружыне, толькі ведай:
Я твайго сына потым нараджу,
Ён будзе запаскуджаным...

Л ю б а в а

Князёўна...
Князь загадаў з табой нас вартаваць.
Нас не зачэпяць...

Р а г н е д а

Полацкая кроў,
Што у Дзвіну цяпер сцякае, выйдзе
З тваіх нашчадкаў... Я іх праклінаю...
Хай будзе смага ў іх на кроў братоў,
Бацькоў, сясцёр, сваіх сяброў і блізкіх...
Хай не спатоліць гэту смагу час...
Ні заўтра, ні пазаўтра, аніколі...
Не мець ім шчасця, ні дабра, ні волі...

Л ю б а в а *(спявае)*

Блаславі, Ярыла,
Каб было шчасліва,
На добрыя роды,
На доўгія годы
А-а-ах!

*З а ц я м н е н н е*

**Ад аўтара**. Уладзімір... Пасля знішчэння Полацка захапіў Кіеў, забіў свайго брата Яраполка, а жонку яго зрабіў сваёй наложніцай. Праз дзесяць гадоў гвалтам увёў на Кіеўскай Русі хрысціянства.

Кананізаваны Рускай праваслаўнай царквой як роўнаапостальны святы.

Памёр у 1015 годзе.

Рагнеда... Была першай жонкай Уладзіміра пад славянскім імем Гарыслава. Праз дзевяць месяцаў пасля знішчэння Полацка ў яе нарадзіўся сын Ізяслаў. Пасля замаху на жыццё Уладзіміра разам з сынам выселена з Кіева ў Заслаўль. Памерла ў 1000 годзе хрысціянкай пад імем Анастасія...

*К а н е ц*

*1997*

# Чорная Панна Нясвіжа

**Драматычная паэма ў трох частках**

**ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ**

Жыгімонт Аўгуст — польскі кароль.
Барбара — магнатка Вялікага княства Літоўскага.
Радзівіл Чорны — нясвіжскі князь, стрыечны брат Барбары.
Радзівіл Руды — ваявода, родны брат Барбары.
Бона Сфорца — польская каралева, маці Жыгімонта Аўгуста.
Мнішак — прыдворны.
Бжэнка.
Чорная Панна.

## Частка першая

## СМЕРЦЬ

Нясвіж. Лета 1551 года. Замак Радзівілаў.
Уваходзяць князь Радзівіл Чорны, Радзівіл Руды і Мнішак.

Мнішак

Мяне прыслала каралева Бона
Даведацца, што робіць тут кароль.

Радзівіл Чорны

Пасля хаўтур сястры ён мне сказаў,
Што хоча нейкі час жыць у Нясвіжы,
Пабыць ля дрэў, што бачылі яе,
І пахадзіць па парку, дзе сцяжынкі
Хаваюць цеплыню яе слядоў.
Вось ужо месяц неўпрыкмет прайшоў,
І боль ва ўсіх суцішыўся, а ён,
Як цень, блукае,
Безупынна плача.

Радзівіл Руды

Ён п’е віно, а потым горка плача...
Калі ж віно павыцекне слязьмі,
Ён зноўку п’е і зноўку горка плача.

Радзівіл Чорны

Калі ён слёзы выплача да дна,
Ў Літве не знойдзеш кропелькі віна.

Мнішак

Скажу па шчырасці: у Кракаве ўсе лічаць,
Што вы знарок трымаеце яго
І хочаце, каб жыў кароль у княстве,
Каб па Барбары вечна смуткаваў.

Радзівіл Руды

Не па Барбары, а па каралеве!

Мнішак

Па каралеве...

Радзівіл Чорны

Ён мой уладар,
Нашчадак па прамой вялікага Ягайлы,
Што з княства ў Польшчу каралём прыйшоў.
Хоць быў ліцвінам, стаў палякам лепшым.

Радзівіл Руды

Як караля мы можам затрымаць?

Ён гаспадар Літвы і майго замка...
І муж нашай нябожчыцы-сястры.

Мнішак

Паўгода Польшча ўжо без караля,
Спачатку ён сядзеў ля ложка хворай,
А потым пахаванне рыхтаваў,
А зараз трызну ладзіць у Нясвіжы.
Бязладдзе ўсюды... Даручыў мне сойм
Пры вашай дапамозе Жыгімонта
Вярнуць хутчэй у Кракаў на пасад.
Ён каралеву пахаваў... Навошта ж
Праз гэта і краіну ўсю хаваць?
Я буду гаварыць з ім...

Радзівіл Чорны

Гэта марна.
Ён размаўляе зараз толькі з ёй...

Мнішак

З кім «з ёй»?

Радзівіл Руды

З Барбарай! З каралевай...

Мнішак

Ён, пэўна, звар'яцеў...

Радзівіл Чорны

Калі сам пан
Ў сваім жыцці кахання слодыч зведаў,
То ведае й чароўны гэты сад.
Хто ў яго трапіў — той ужо вар'ят...
А тут... іх целы разлучыла смерць,
А душы разлучыць ніяк не можа.

Радзівіл Руды

Вунь ён ідзе... Дзівіцеся.

Мнішак

Мой Божа!
Адыдзем прэч!

Радзівіл Руды

Ды ён нас не заўважыць.

Уваходзіць Жыгімонт Аўгуст са свечкай і з чарай віна.

Жыгімонт *(гледзячы на свечку)*. Барб-а-а... Барба... Я ведаю, я ведаю, ты тут... І твая постаць цьмяная мільгае сярод дрэў... Не пакідай... не пакідай мяне... Усім на свеце тут кіруе д'ябал... Ці Бог тут пекла нам усім зрабіў... Навошта?! Навошта нас спачатку было злучыць, з'яднаць у адно... так, што я не заўважаў і не адчуваў... не бачыў, дзе ты, а дзе я... У нас былі адны вусны, адны рукі, адзін твар... І гэта ўсё... па жывому нехта

разарваў... разрэзаў... Дзе ты?! Дзе я?! Дзе ты, мая каханая, дзе я, душа мая, забраная мая... Ты мёртвая, ды нежывы і я... Душа мая, забраная мая. Сёння па парку бегала маленькая дачка дварэцкага... Бялявае кірпатае дзяўчо... Яна пляскала ў ладкі... і... смяялася... Як званочак... Гэта твой голас, Барба... Ты смяешся над усім светам... Барба-а-а... *(Выходзіць са свечкай.)*

Мнішак

Аж маё сэрца нават затрымцела.
О, боль які! Якое пачуццё!
Калі ён звар'яцеў — дык розум ёсць вар'яцтва,
Калі ж разумны — дык наш свет вар'ят...
На гэткі покліч нават з таго свету
Хто хочаш вернецца. Як ён кахаў яе!

Радзівіл Чорны

Ён не кахаў! Ён і цяпер кахае...
Яшчэ мацней... Заўжды перад канцом
Успыхне моцна полымя і... згасне...
Спявае лебедзь гучна і... памрэ…
І разгарыцца лета... перад сцюжай…
Калі ў прыродзе нешта забуяе
Не на дабро... Там смерць ужо гуляе.

Мнішак

Вы спрабавалі што-небудзь зрабіць?

Радзівіл Чорны

Спытайце лепей, што не спрабаваў.
Хаваў віно — ды ён яго знаходзіў.
І гаварыў не раз з ім — ён маўчыць.

Радзівіл Руды

Не раз і сонных зёлак падсыпаў.
Ён зёлкі піў, але не засынаў!

Мнішак

Не тое каралю вы падавалі,
Галоўны сродак не паспрабавалі.

Радзівіл Руды

Вы пра жанчын? Ды ён глядзіць праз іх,
Як мы праз шкло... Ён бачыць сваю Барбу...

Мнішак

Няхай наяве ўбачыць сваю мару...
Хадзі сюды, дзіця маё...

Уваходзіць Бжэнка, вельмі падобная на Барбару Радзівіл.

Радзівіл Чорны

О Божа!
Ці замагільны свет прыйшоў сюды,
Ці сам цяпер я ў свеце замагільным.

Радзівіл Руды

Барбара, гэта ты?!

Мнішак

Ідзі, дзіця...

Бжэнка выходзіць.

Радзівіл Чорны

Што тут было? Ці гэта ўсё трызненне?
Ці прывід ейны у Нясвіж прыйшоў?!
Барбара тут... Сястра наша! Барбара!
Ты прыплыла на заклік караля!

Мнішак.Супакойцеся, князь... Яна такая ж вам сястра і жонка каралю, як я вам — маці. Бжэнка... Дачка дробнага купца... Кракаўская мяшчанка й распусніца. У пятнаццаць год мела чатырох палюбоўнікаў адначасова... Спакусіла свайго духоўніка. Маладых лашчыла за так, са старых брала грошы. І вялікія! Яе змясцілі на выхаванне ў манастыр... Там яе выпадкова ўбачыла каралева Бона. Ведаючы душэўны стан свайго сына, яго каханне да вашай сястры, каб зменшыць яго боль... і пакуты...

Радзівіл Руды. ...Яна вырашыла зрабіць каралеве Барбары замену?

Мнішак. Можна сказаць, што так.

Радзівіл Чорны. І замена гэта... кракаўская распусніца?!

Мнішак. Князь Радзівіл! Ды хай бы любая жанчына ў Польшчы, любая графіня, дачка ці жонка гетмана, канцлера, маршалка мела такое падабенства на спачыўшую сястру вашу — даю слова, яна апынулася б у абдымках караля. Хто ж вінаваты, што такі твар, такую постаць, такія валасы, такія вочы дасталіся ну... не самай святой жанчыне каралеўства... Вы толькі зірніце... Хадзі сюды!

Уваходзіць Бжэнка.

Вы толькі зірніце! Каралева не была так падобна на сябе, як гэта істота на яе... Вы хоць толькі ад прывіду пачалі адмахвацца, а я, калі мне паказалі яе ў манастыры, вобзем грымнуўся... Вадой адлівалі... Ну, думаю, аджыла, зноў пачнецца... Не разумею, што вас абражае? Ваша сястра на нябёсах, і гэта... дзяўчо ёй не саперніца... Я зірнуў на караля — мне стала страшна... Калі ён пабудзе ў такім стане яшчэ адзін тыдзень — ён памрэ... Нябожчыкаў кахаць вялікі грэх... Хай спусціцца на зямлю і... вось, калі ласка... кахае копію... Яна верне яго да рэальнага жыцця, і мы не страцім караля.

Радзівіл Руды *(аглядае Бжэнку)*

Ўсё супадае: вусны, вочы, шыя.

М н і ш а к

О, колькі давялося адмываць...

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Няўлоўнае бывае падабенства,
А тут непадабенства не відаць.
Хіба вось толькі... гэтая радзімка.

М н і ш а к

Тут не адмыеш, трэба габляваць.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Скажы што-небудзь, мілая дзяўчынка.

Б ж э н к а. Мне гэты пан забараніў казаць. Мне можна толькі трошкі паўсміхацца.

М н і ш а к. Ды ладна, гавары ўжо.

Б ж э н к а. І няпраўда, што я такая і гэткая... Самі ж спачатку бедную паненку да ложка зацягнуць, самі ж усю ноч без перадыху спакушаюць, а потым і я ж сама вінаватая. І мяне ж у манасты-ыр! За што? Хіба я магла сілай спакусіць свайго святога айца, калі ён высокі, як вы, пане, ды яшчэ й таўсцейшы... Я яму каюся, а ён мае грудзі цісне... І мне інквізіцыя. І мне манастыр!

Р а д з і в і л   Ч о р н ы. Даволі.

Б ж э н к а. Маўчу.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Магутны Бог! Вось два твае стварэнні
Цудоўныя... Адно напоўніў ты
Высакародствам, розумам, пяшчотай,
Ў другім — прытулак бруду і граху.

М н і ш а к

На свеце трэба ўсё... ураўнаважыць.
Ні святасць грэх, ні грэх не спляжыць святасць.
Ты, Бжэнка, лепей князю заспявай.

Б ж э н к а *(спявае)*

На моры вутачка купалася,
Пакупалася, у бор паляцела,
У барочку шчыранька грагаць стала:
— Дзе ж мае дзетачкі падзяваліся?
Ад майго гняздзечка адцураліся.
Дзе ж мае дзетачкі падзяваліся?
Ад майго гняздзечка адцураліся.

З'яўляецца Ж ы г і м о н т.

Ж ы г і м о н т *(крычыць нема)*. Барбара! Любая Барбара! Каханая! Хадзі! Хадзі сюды! Я ведаў, што ты вернешся ў Нясвіж... Я абдыму цябе... Я ў гэта верыў... *(Абдымае Бжэнку.)*

Навальнічная бліскавіца. Жыгімонт падае.

М н і ш а к

О літасцівы Божа, ён памёр!

Б ж э н к а

Ну вось ізноў. Ізноў я вінавата...

Р а д з і в і л Р у д ы *(схіляецца)*

Цішэй... Заснуў... Заснуў нарэшце ён.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

І дзякуй Богу... Доўгім будзе сон...

Выносяць к а р а л я.

М н і ш а к *(Бжэнцы)*

А ты ідзі цяпер гуляць па парку.
Ды блізка да людзей не падыходзь,
Спявай ціхутка... Можаш і паплакаць,
І застагні, усхліпні мімаходзь.
Хай думаюць, Барбара зноў прыйшла
І ў замку тут прытулак свой знайшла.

Выходзяць.

## Частка другая

## КАХАННЕ

Вільня. 1543 год. Сад перад замкам Барбары Радзівіл.
Ноч. Уваходзіць Б а р б а р а.

Б а р б а р а

Баль адшумеў, і ціша навакол.
У чорным небе дрэмле ясны месяц,
Абліты цьмяным срэбрам лес і дол,
І болей не чутно птушыных песень.
Усімі зоркамі мяне цалуе ноч,
Ласкавы ветрык лашчыць, лашчыць грудзі,
І гладзіць цемра мне павейкі воч…
Я зведаю... чаго не зведаць людзям...

З'яўляецца каралевіч Ж ы г і м о н т.

Ж ы г і м о н т

А я ўжо зведаў...

Б а р б а р а

Божа!

Ж ы г і м о н т

Я пабачыў...
Што ўбачыць хіба можа толькі Бог.

Б а р б а р а

Як вы пасмелі?!

Ж ы г і м о н т

Гэта абурэнне...
Прымусіла прыстойнасць растаптаць.
Зірнуць на тое, ад чаго аслепнуць
Навекі можна...

Б а р б а р а

Значыць, вы сляпы...
Цяпер кажыце ваша абурэнне,
А потым абурацца буду я...

Ж ы г і м о н т

Як дазваляць, каб цемра цалавала
Такія вусны... Каб вятрыска мог
Брыльянты найкаштоўнейшыя лашчыць?
Ці ноччу вас кахае толькі ноч?
Куды ж глядзяць прыгожыя ліцвіны?

Б а р б а р а

Усё! Даволі! Прэч! Сыдзіце з воч!
А то я закрычаць павінна буду.

Ж ы г і м о н т

Ды вам нашто крычаць? Я закрычу:
Літва! Твая багіня сёння ноччу
Кахала месяц, той кахаў яе.
Я ўбачыў нерэальнае каханне
І з зайздрасці свяціла захінуў
Свінцова-чорнай хмарай.

Б а р б а р а

Ён заходзіць...

Ж ы г і м о н т

Я перамог...

Б а р б а р а

Ну, а цяпер пайшоў...
Да сціплых паннаў ходзяць госці ранкам.

Ж ы г і м о н т

Дык запрасіце, панна, калі ласка,
І я прыйду за некалькі гадзін
Да часу запрашэння і чакаць
Ля брамы буду... Гэта асалода —
Чакаць хвіліны, каб убачыць вас.

Б а р б а р а

Ой, майстра гаварыць...

Ж ы г і м о н т

Зусім не ўмею!
Ні гаварыць, ні на жанчын глядзець.

Б а р б а р а

А што ж цяпер вы робіце?

Ж ы г і м о н т

Малюся.

Б а р б а р а

Я не святая...

Ж ы г і м о н т

І таму вышэй...

Б а р б а р а

Усё... Ідзіце, хлопчык мой...

Ж ы г і м о н т

Бывайце...
Даруйце мне... Я болей не прыйду...

Б а р б а р а

Не прыйдзеце? А як жа запрашэнне?
Ці ветліва?

Ж ы г і м о н т

Дык запрашэнне ёсць?!

Б а р б а р а

Прыходзьце заўтра да мяне апоўдні
Не праз акно, вядома, як цяпер.

Ж ы г і м о н т

Ды не, вы што... ды я прыйду праз дзверы.

Б а р б а р а

Вы неяк разгубіліся?

Ж ы г і м о н т

Ага...

Б а р б а р а

Чакаю вас...

Ж ы г і м о н т

Бывайце, мая панна...
*(Накіроўваецца да выхаду.)*

Б а р б а р а

Скажыце мне, каго я запрасіла.

Ж ы г і м о н т

Я — Жыгімонт.
*(Выходзіць.)*

Б а р б а р а

О Божа! Каралевіч!
Я чую грозны голас твой, о лёс.
Ці на дабро ты мне яго прынёс?

Кракаў. Палац на Вавелі. Пакоі каралевы Боны.
Уваходзяць каралева Б о н а і М н і ш а к.

Б о н а

Што ў Вільні робіцца? І як там каралевіч?

М н і ш а к

Жыве, як і належыць маладым.
Вясёлы баль змяняецца банкетам,
Банкет затым змяняецца на баль.
Ды ўсё ж часцей бывае паляванне.

Б о н а

Без рызыкі?

М н і ш а к

Без рызыкі, вядома.
Зуброў ён лічыць сімвалам і іх
Ніколі не чапае, а касулі,
Ласі, алені, козы, вепрукі...
Для рыцара ці будуць небяспекай?

Б о н а

Ён п'е зашмат?

М н і ш а к

Не дужа. Нейкі келіх.

Б о н а

Ці мае ён жанчын?

М н і ш а к

О каралева! У такім узросце...

Б о н а

Мне ўсё вядома пра ягоны ўзрост,
Пытаюся: жанчыны ў яго ёсць?

М н і ш а к

Так, ёсць ужо.

Б о н а

І хто ж яны?

М н і ш а к

Яны?.. Гэта яна.
Брыльянт найпершы у Вялікім княстве,
Як каралевіч кажа.

Б о н а

Што... брунетка?

М н і ш а к

Не, каралева...

Б о н а

Ды няўжо бландзінка?

М н і ш а к

Незразумела. Валасы ў яе

Нібы святлом пранізаны. Такія
Бываюць, мабыць, толькі у русалак.

Б о н а

Або ў вядзьмарак...

М н і ш а к

Мусіць, так і ёсць.

Б о н а

Яна адна ў яго?

М н і ш а к. Мая нябожчыца маці, калі добразычлівыя суседзі сказалі, што ў яе мужа (майго, спадзяюся, бацькі) вельмі багата жанчын, сказала мудра і глыбока: «Чым больш, тым менш. Абы адна не завялася».

Б о н а

Яна адна ў яго?

М н і ш а к

Яна ў яго адна.

Б о н а

Відаць, дурная пакаёўка з замка,
Ім аддаюць каханне хлапчукі.

М н і ш а к

Ваш сын высакародны, каралева.
Высакародныя ж кахаюць каралеў
Або нікога.

Б о н а

У Вільні каралева?
Там нават роду добрага няма.

М н і ш а к

Той род магутны. Гэта Радзівілы.

Б о н а

Што?! Радзівілы? Хочаш ты сказаць...
І хто ж яна?

М н і ш а к

Барбара.

Б о н а

Не!

М н і ш а к

Барбара...
Ён трэці месяц з ёй ужо шчаслівы…
Ён вершы піша.

Б о н а

Ўсёмагутны Бог!
Як ты дазволіў?! Чорная блудніца!
Нікчэмнасць! Ведзьма дзікае Літвы.
Разбэшчаная дрэнь майго дзіцёнка
Спіхнула ў багну бруду і граху.

Яна звяла ў магілу свайго мужа,
Ёй не хапае соцень мужыкоў,
Каб спаталяць юрлівыя жаданні.
І ёй цяпер патрэбны Жыгімонт?!
Я сына ад цябе абараню!
Перад табой сцяна агню паўстане!
Або адыдзеш прэч, або цябе не стане!

Вільня. Спальня Барбары.
Жыгімонт і Барбара на ложы. Ноч.

Жыгімонт

Ці дзень ці ноч цяпер на белым свеце?

Барбара

Цяпер на свеце толькі ты і я,
І зоркі ўсе на наша ложа свецяць.

Жыгімонт

Каханая, каханая мая.

Барбара

Здаецца мне — я толькі што памерла
І нарадзілася... Мінулае маё
Ляжыць цяпер на могілках далёка.
І там не я... І там не я...

Жыгімонт

Барбара...

Барбара

Я толькі-толькі першы раз дыхнула,
Заплакала... і я яшчэ дзіця.
Жывая мама... Бацька на руках
Мяне ласкава гушкае... А потым
Бягу па парку... Родны мой Нясвіж!
Мая Літва, мае лясы і пушчы...
Я — чыстая... Нічога не было,
Што без цябе... Сплыло... Сплыло... Сплыло...
*(Засынае.)*

Жыгімонт

Спі, любая... Хай прыляціць анёл...
Не! Не хачу! Ён будзе любавацца
Тваім празрыстым целам... Толькі змрок
Цябе схавае ад вачэй нясціплых.
Але ж тады не буду бачыць я...
Як мне цябе схаваць, але каб бачыць.
Самому... Трэба ў сэрца увабраць,
З табою зліцца і адзіным стаць.
*(Засынае.)*

Грукат у дзверы.

Голас Радзівіла Рудога. Барбара! Барбара! Зараз жа адчыні!

Барбара. Хто там?

Радзівіл Чорны. Не прыкідвайся, ты пазнала нас. Адчыні!

Барбара. Што вам трэба?

Радзівіл Руды. Нам трэба, каб ты адчыніла дзверы.

Барбара. Навошта?

Радзівіл Чорны. Пагаварыць.

Барбара. Пагаворым заўтра.

Радзівіл Чорны. Сёння. Толькі сёння.

Радзівіл Руды. Калі ты не адчыніш сама, клянуся, я ўзламаю дзверы.

Барбара *(ціха Жыгімонту)*. Ідзі.

Жыгімонт. Бывай.

Барбара. Бывай.

Радзівіл Руды. Барбара!

Жыгімонт выскоквае праз акно.
Барбара адчыняе дзверы. Заходзяць Радзівілы.

Барбара

Што адбылося, каб сярод начы
Ламіцца ўпарта ў дзверы да жанчыны?

Радзівіл Чорны

Не да жанчыны, Барба! Да сястры!

Радзівіл Руды

Так, да сястры, што гонар свой згубіла!

Барбара

Брат мой...

Радзівіл Руды

Маўчы! Няхай бы толькі свой…
Ты гонар роду збэсціла!

Барбара

Пра што ты?

Радзівіл Руды

У княстве сёння кожны дурань знае:
Што ты наложніца! Ты дзеўка Жыгімонта!
Падсцілка каралеўскага сынка!

Жыгімонт *(з'яўляецца ў акне і з кінжалам кідаецца на Радзівіла Рудога)*

Вы за абразу сплоціце спаўна!

Б'юцца.

Радзівіл Чорны

Ваша высокасць! Хто ж вас абражае?

Барбара

Спыніцеся!

Жыгімонт

Прасіце прабачэння!

Радзівіл Руды

За што прасіць? Ці я сказаў няпраўду?
Тады чаму вы тут сярод начы?

Б'юцца. Барбара хапае са століка штылет і прыціскае вастрыём да грудзей.

Барбара

Спыніцеся! Ці я сябе зарэжу!!!

Жыгімонт і Радзівіл Руды апускаюць зброю.

Мой брат... Дазволіць можа гэта
Раўнівы муж... Але ж ты мне не муж!

Радзівіл Руды

Я і шкадую, што яго няма.
Інакш бы ён абараняў твой гонар!
Абараняў бы гонар Радзівілаў.

Барбара

Што ж я такога грэшнага зрабіла?
Хіба ў мяне каханкаў не было?
І хіба ты пра іх зусім не ведаў?

Радзівіл Чорны

Яны былі ніжэйшымі за вас!
Яны заўжды былі для вас, як слугі,
Як цацкі, як забава, як капрыз,
Як неабходнасць маладой жанчыны.

Барбара

І ты на іх увагі не звяртаў?
Глядзеў спакойна, як сястра грашыла?..
Калі ж на гэта ложа ласкай Божай
Ўзышоў вось ён, адразу ж вы прыбеглі?
Каго мой брат забіць тут зараз хоча?
Яго? Забі. Але заб'еш мяне.
Я ў ім уся. Крывінкі нашы разам.
Я зараз побач Бога адчуваю...
Кахаю, мілы брат мой, я кахаю...

Радзівіл Чорны

Ты нарадзілася, сястра, не для таго,
Каб некаму быць простаю каханкай,
Хай ён хоць каралевіч! Хоць кароль!

Ж ы г і м о н т

Я вас прашу: пакіньце маю жонку.
Прашу, браты, бо я вам дараваў.
Даруй і ты, Барбара, за абразу.
Цябе абразіла братэрская любоў,
А не браты.

Б а р б а р а

Ды я ўжо даравала.

Ж ы г і м о н т

Кажу яшчэ раз! Гэта мая жонка.

Р а д з і в і л  Р у д ы

Калі ўсё так... Тады я на каленях.
Пакорліва прашу мне дараваць,
Хоць вы мяне і закалоць хацелі.

Ж ы г і м о н т

А я й напраўду мог вас закалоць.

Р а д з і в і л  Р у д ы

Што да мяне, скажу вам вельмі шчыра:
Крыві б я каралеўскай не праліў.
А вось яе гатовы быў знішчожыць.
Вы зразумейце...

Ж ы г і м о н т

Я ўсё разумею.

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Вы павянчаліся? Паклікаць святара?

Ж ы г і м о н т

Мне ўсё адно.

Б а р б а р а

І мне.

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Тады паклічам.

Р а д з і в і л ы выходзяць. Жыгімонт і Барбара становяцца на калені.

Ж ы г і м о н т

Прымі нас, Уселітасцівы Божа…

Б а р б а р а

Прымі, як непадзельнае — Адно...

Ж ы г і м о н т

Прымі, як непадзельнае — Адно...

Б а р б а р а

Прымі, нас Уселітасцівы Божа...

Ж ы г і м о н т

Адна Душа, адно Жыццё і Кроў.

Б а р б а р а

Ты ёсць Любоў, і мы цяпер — Любоў.

Ж ы г і м о н т

Ты ёсць Любоў, і мы цяпер — Любоў.

Б а р б а р а

Адна Душа, адно Жыццё і Кроў.

З'яўляюцца Р а д з і в і л ы.

Р а д з і в і л  Р у д ы

Нас ненавідзіць каралева Бона.

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Але цяпер у нас... у нас яе карона!

Кракаў. Замак на Вавелі.
Пакоі каралевы Боны.
Каралева Б о н а і М н і ш а к.

М н і ш а к

Вітаю на каленях каралеву.
Вітаю і паведаміць хачу,
Што каралевіч едзе з Вільні ў Кракаў
Па выкліку. Ён хутка будзе тут.

Б о н а

У Вільні не змянілася нічога?
Яна не надакучыла яму?

М н і ш а к

Хто? Вільня ці...

Б о н а

Так, гэтая... Барбара...

М н і ш а к

Я засмуціць баюся каралеву,
Ды там хутчэй усё наадварот.
Каб не мазоліць вочы гараджанам,
Ён паміж замкамі зрабіў таемны ход.
І гэтым ходам ходзіць да Барбары.
І кажуць людзі: прынц наш крот і кот.

Б о н а

О Божа, каб так нізка апусціцца!

М н і ш а к

Яшчэ даруйце...

Б о н а

Ну, кажыце, што там...

М н і ш а к

Ды гэта толькі плётка можа быць.

Б о н а

Заўсёды плётка — маці чыстай праўды.
Што там яшчэ?

М н і ш а к

Ды ў горадзе балбочуць,
Што сын ваш абвянчаўся тайна з ёй.
Кажу яшчэ раз: гэта толькі чуткі.

Б о н а

Ды ўжо й ад чуткі можна ашалець.

М н і ш а к

А вунь і прынц. Я з вашага дазволу
Цяпер пайду.

Б о н а

Я дзякую. Бывайце.

М н і ш а к

Цалую вашы ногі, каралева...
*(Выходзіць.)*

Уваходзіць Ж ы г і м о н т.

Ж ы г і м о н т

Матуля мілая!

Б о н а

О сын мой!

Ж ы г і м о н т

Каралева,
Дазвольце мне абняць вас. Божа мой,
Як сумаваў я там па роднай маці,
Як часта сніў вас.

Б о н а

Ты ласкавым стаў
І памужнеў. Цяпер сапраўдны рыцар.
Жыццё у Вільні на карысць пайшло.
Ты — не юнак.

Ж ы г і м о н т

Чаму ж вы гэтак сумна?
Юнак заўсёды робіцца мужчынам,
А вось калі мужчына, як юнак...

Б о н а. Я не пра тое. Кароль, твой бацька, занядужаў. Лекары кажуць, што заўтра ці пазаўтра трэба чакаць горшага. Надыходзіць час, калі адказнасць за лёс дзяржавы і людзей яе пераходзіць ад бацькі да сына. Да цябе.

Ж ы г і м о н т

Як Бог распарадзіцца. Яго воля.

Б о н а. Традыцыя нашае дынастыі патрабуе, што кароль павінен узысці на пасад разам з каралевай. Каб сустрэць падрыхтаванымі непазбежнае, я накіравала паслоў да двара Габсбургаў, да імператара Карла...

Ж ы г і м о н т. Навошта?

Б о н а. Прасіць рукі прынцэсы Кацярыны Габсбургскай польскаму каралевічу Жыгімонту... Будучаму каралю Польшчы. Вядома, гэта чыстая фармальнасць, згоду імператара Карла маем даўно. Прызначаны дзень шлюбу.

Ж ы г і м о н т. Калі?

Б о н а. Праз месяц. Дай Божа каралю дажыць да гэтае падзеі.

Ж ы г і м о н т

Паслоў вярнуць ніяк ужо не можна?

Б о н а

Яны ўжо там. Ці заўтра будуць там.

Ж ы г і м о н т

Тады і я паслом туды паеду.

Б о н а

Навошта?

Ж ы г і м о н т

А каб выправіць памылку,
Што ненаўмысна зроблена была.
Бо дурань кожны ў гэтым свеце знае:
Жанаты муж сватоў не пасылае.

Б о н а

Дык ты жанаты?

Ж ы г і м о н т

Так.

Б о н а

Калі ж
Цябе благаслаўляла я на гэта?
І хто яна?

Ж ы г і м о н т

Барбара...

Б о н а

Радзівіл?!
Пачварная літоўская блудніца?!

Ж ы г і м о н т

Ты абражаеш жонку маю, маці.
Мяне таксама. Значыць, і сябе.

Б о н а

Якая жонка? Жыгімонт, ты трызніш!

Ж ы г і м о н т

Я, каралева, абвянчаўся з ёй.

Б о н а

Ты абвянчаўся? Без благаславення?

Ж ы г і м о н т

Нас, каралева, Бог благаславіў.
Нас абвянчалі, маці, я жанаты.
Яна мая... мая на ўсё жыццё.

Б о н а

Ты пра Радзіму, ты пра Польшчу думаў,
Каго ты на пасад ёй прывядзеш?
Каго?

Ж ы г і м о н т

Яе!

Б о н а

Паганую ліцвінку?

Ж ы г і м о н т

Кароль Ягайла быў літоўскім князем.
Ён продак мой, а, значыць, я — ліцвін.
Багацце і вышэйшую уладу
Бог шмат каму дае сярод людзей.
Каханне ж — Яго ласка для абраных.

Б о н а

На ейным полі пабыло паўкняства!

Ж ы г і м о н т

У яе душы нікога не было.
Мне ўсё адно, што кажуць злыя людзі,
Хто быў — тых не было, нікога больш не будзе.

Б о н а

Яна цябе, напэўна, апаіла
Чым-небудзь. Гэта зёлкі з іх лясоў!

Ж ы г і м о н т

Я атруціўся, лекараў не трэба!
Дазволь ад шчасця мне памерці.

Б о н а

Сын!
Ты разумееш, за табой краіна!

Ж ы г і м о н т

Адна краіна... Там жа ўвесь Сусвет.

Б о н а

Спусціся на зямлю!

Ж ы г і м о н т

Навошта, маці?
Шчэ давядзецца быць зямлёю на зямлі!
Размову скончым. Зараз я паеду.
Сватоў да Габсбургаў павінны мы вярнуць.

Б о н а

Яны ўжо там! Вярнуць іх немагчыма.
Прынцэса ўжо нявеста для цябе!

Ж ы г і м о н т

Тады я на каленях перад ёй
Скажу: «Ты найцудоўнейшая ў свеце!

І я люблю цябе, як родную сястру,
Ты, можа, прыгажэй, ты лепей за Барбару,
Ды з ёй мая душа, маё жыццё і мары.
Даруй мне, я ні ў чым не вінаваты,
Я не жаніх табе. Прымі мяне як брата».
Бывайце, маці.
*(Выходзіць.)*

Б о н а. О, як ён змяніўся, Божа літасцівы! Што гэтая літоўская змяя зрабіла з ім! З ціхага, сціплага, пяшчотнага хлопчыка, які так любіў, калі яго гладзілі па галаве, ён ператварыўся ў нейкую жорсткую непахісную істоту, якой ніхто... ніхто, апроч гэтай нясвіжскай сучкі, не патрэбны! Яна адабрала яго ў мяне! Яна ада-брала яго ў Польшчы! Ён стаў прыгожы... Ён мне нават некага нагадвае... З маленства... Каго? Каго? Не помню... Нешта цёплае... Ласкавае... Жаданае... Ведзьма!!! Ведзьма!! Ведзьма!..

Нясвіж. Парк перад палацам Радзівілаў.
Б а р б а р а і Р а д з і в і л ы.

Р а д з і в і л Ч о р н ы
Навошта Жыгімонт у Кракаў з’ехаў?
Табе вядома?
Б а р б а р а
Захварэў кароль.
Р а д з і в і л Р у д ы
І ўсё?!
Б а р б а р а
Усё. Паехаў развітацца.
Р а д з і в і л Р у д ы
А ці не развітаўся ён з табой?
Б а р б а р а
Пра што ты, брат?
Р а д з і в і л Ч о р н ы
Паведамляюць людзі...
Ён з Кракава да Габсбургскай прынцэсы
Раптоўна выехаў.
Б а р б а р а
Нашто?
Р а д з і в і л Ч о р н ы
Прасіць рукі.
Б а р б а р а
Пакінь, мой брат, ды гэта проста смешна.
Р а д з і в і л Р у д ы
Смех іншым разам і прадвесце слёз.
А калі праўда?

Б а р б а р а

Гэтакая ж праўда,
Як я цяжарная. І вельмі-вельмі хутка
Ад Жыгімонта сына нараджу.
Даўно ўжо ў Вільні чэшуць языкамі.

Р а д з і в і л  Р у д ы

О, калі б так...

Б а р б а р а

Калі б... Было б цудоўна.
Ды толькі Бог нічога не дае...

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Так ці не так, а абвяргаць не варта,
Хай чуткі ў Кракаў вецер данясе
Да слыху найяснейшага.

Б а р б а р а

Навошта?

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Каб ведалі: нашчадак Жыгімонта
Народзіцца не ў Польшчы, а ў Літве.

Р а д з і в і л  Р у д ы

І яго маці гожая ліцвінка,
А не заморак з Аўстрыі.

Б а р б а р а

Усё!
Мне гэта непрыемна чуць.

Р а д з і в і л  Р у д ы

Барбара!
Ты Жыгімонту верыш?

Б а р б а р а

Ён кахае.
Любоў жа, брат, заўжды вышэй за веру
І за ўсё іншае.

Р а д з і в і л  Р у д ы

Няхай бы так было.
Тут холадна, хадзем, сястра, ў пакоі.

Б а р б а р а

Я пагуляю ў парку яшчэ трошкі.

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Чакаем вас.

Выходзяць.

Б а р б а р а *(спявае)*

На моры вутачка купалася,
Пакупалася, у бор паляцела,
У барочку шчыранька грагаць стала:

— Дзе ж мае дзетачкі падзяваліся?
Ад майго гняздзечка адцураліся.
Дзе ж мае дзетачкі падзяваліся?
Ад майго гняздзечка адцураліся.

З'яўляецца М н і ш а к.

М н і ш а к. О ясная панна! Я вітаю вас і жадаю, каб жыццё вашае было гэткім жа чыстым і звонкім, як ваша песня, але не такім сумным.

Б а р б а р а. Дзякую.

М н і ш а к. Скажыце, цудоўная панна, беднаму вандроўніку, што гэта за краіна?

Б а р б а р а. Вы ў Вялікім княстве Літоўскім.

М н і ш а к. Панна не зразумела. Я хацеў спытацца: не якая гэта краіна, што гэта за дурная краіна? Чаму тут столькі дарог? Адны ростані. Еду гасцінцам на Вільню і раптам — тпр-р-р... Адзін шлях проста прама, другі прама і трошкі ўлева, трэці прама і трошкі ўправа, чацвёрты ў левы бок, пяты ў бок правы, шосты назад і ўлева, сёмы назад і ўправа, а восьмым я прыехаў. Стаю, як дурань, і гадаю, а які ж на Вільню? Гэта ж колькі трэба было таптацца па гэтым краі, каб натаптаць столькі дарог. Рымляне зрабілі некалі так, што ўсе дарогі вялі толькі ў Рым... Тут жа ўсе дарогі вядуць к чортавай матары... Дзе я, ласкавая панна?

Б а р б а р а

Гэта Нясвіж, да Вільні два дні шляху.

М н і ш а к. Дзякую магутнаму Богу! Я выехаў з Кракава маладым дзецюком і збіраўся дабрацца да Вільні сівым дзедам. Такая краіна, такая краіна...

Б а р б а р а

Вы з Кракава? Што там чутно, скажыце?

М н і ш а к. Там непагадзь, чароўная панна, непагадзь і ў прыродзе, і ў народзе. Жыгімонт Стары доўга памірае, а Жыгімонт малады розуму не мае.

Б а р б а р а. Чаму так?

М н і ш а к. Каралі не павінны доўга паміраць, ад гэтага дзяржава слабее, і ўжо ім зусім не да твару быць закаханымі — ад гэтага дзяржава чмурэе. А ў Польшчы і тое, і гэта. Калі ты надумаўся паміраць, дык памірай на здароўе... Дай народу радасна крыкнуць: «Кароль памёр! Няхай жыве кароль!» Дык не! Каторы год квохча, скрыпіць як... не ведаю што...

Б а р б а р а. А ў каго ён закаханы?

М н і ш а к. Ён закахаўся ў Смерць, а тая круціць хвастом... Ну ты ж кароль! Ды атруціся ты на карысць народа! Для шчасця народнага! Усё адно ж памрэш...

Б а р б а р а. Вы казалі, што малады ў некага закаханы...

М н і ш а к. І гаварыць пра гэта не хачу! Брыдота! Яго маці каралева Бона — італьянка. І паўднёвы тэмперамент усёй Італіі перайшоў да Жыгімонта. Ён з дзяцінства каго бачыць, таго і кахае. Перакахаў усіх фрэйлін яе вялікасці, усіх сваіх выхавальніц і настаўніц... Усе пакаёўкі ў каралеўскім палацы ад яго плакалі... Калі на карову надзець спадніцу — ён пакахае карову. І гэта будучы ўладар Польскай Кароны! Няшчасная краіна!

Б а р б а р а

Дык , а ў каго ж цяпер ён закаханы?

М н і ш а к. Цяпер яму, мабыць, надакучылі вытанчаныя полькі і прыгожыя ліцвінкі. Наеўся! Бацька ляжыць на смяротным ложы, а ён едзе сватацца...

Б а р б а р а. Да каго?

М н і ш а к. Да Кацярыны Габсбургскай! Цьфу! Паверце, яснавяльможная панна, там няма на што глядзець, ды хіба яго зразумееш? Для яго іншым разам пакаёўка — каралева, каралева — пакаёўка. Закахаўся! Піша вершы! Захацелася аўстрыячкі! Дзе ж гэта бачна, каб жаніх сам... сам паехаў прасіць рукі... Кажа, стану на калені перад ёй і буду стаяць да таго часу, пакуль не дасць згоду быць маёй жонкай.

Б а р б а р а. Вы гэта самі чулі?

М н і ш а к. Гэта чулі ўсе прыдворныя і ведае ўся Польшча. Каралева Бона залівалася слязьмі, маліла не рабіць гэтага, бо вяселле з хаўтурамі ніхто не ладзіць адначасова, ды хіба маладога жарабка зацугляеш? Паехаў! Чароўная панна! Калі да вас будуць сватацца, не давайце згоды італьянцу. Народзіцца сын ці дачка з тэмпераментам Жыгімонта, і ўсё жыццё будзеце пакутаваць з імі. Трэба ехаць далей. Два дні, кажаце, да Вільні?

Б а р б а р а. Два дні.

М н і ш а к. Неяк даеду. Вам не даводзілася, чароўная панна, рабіць у жыцці тое, што вы ніколі не збіраліся рабіць. Мне давялося... За Бярэсцем на дарогу зляснога гушчару выйшаў кудлаты сівы вяшчун. Пытаецца: «Ці не мае пан жаданне мець сродак, каб марудна-марудна памерці?» Я кажу: «Такі сродак я маю, бо гэта маё ўласнае жыццё, і я тое і раблю ад нараджэння, што марудна паміраю». Кажа: «Калі жыццё ваша параўнаць са свечкай, то пасля таго, як гэта вып'еце, застанецца малюсенькі агарачак. Праз паўгода згаснеце ціха, непрыкметна і без пакут. Ніхто не ведае часу свайго, а вы будзеце ведаць». І, ведаеце, чароўная панна, я купіў. Я аддаў гэтаму ведзьмаку ўсе грошы, што браў на дарогу, вось за гэтую бутэлечку. Зараз праклінаю сам сябе: нашто мне гэтая атрута? Далібог, ачмурэнне нейкае найшло... Не збіраюся ні сам піць, ні некага частаваць... Бачылі

дурня? Ад Бярэсця еду галодным, бо не маю за што купіць кавалка хлеба... ці жменю аўса для каня. А яшчэ да Вільні два дні...

Б а р б а р а

Вунь стайня, адвядзіце туды коней,
Пасля прыходзьце да мяне ў палац.
Мы разам павячэраем, і вы
Раскажаце пра Кракаў падрабязна.

М н і ш а к

О, дзякуй вам! Чым толькі адплаціць
Змагу я панне за такую ласку?
Ну, не атрутай жа…

Б а р б а р а

Не, шчыраю размовай.
Чакаю вас.

М н і ш а к кланяецца і выходзіць.

Не веру, а бывае...
Калі ў вадзе чысцюткай, як сляза,
Жыве хвароба страшная. І мёдам
Салодкім можна проста атруціць…
Каханы мой! Няўжо ўсё гэта праўда?!
Няўжо цяпер душой ты не са мной?
Ад усяго я ў гэтым свеце збегла,
Альбо з табою ў рай, альбо адной у пекла.

Кракаў. Каралеўскі палац.
Пакоі каралевы Боны.
Уваходзяць каралева Б о н а і Р а д з і в і л ы.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

Мы дзякуем вам шчыра, каралева,
Што вы ў такі для вас нялёгкі час
Змаглі прыняць нас.

Б о н а

Слухаю.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

Кароль як?

Б о н а

Надзеі, князь, ужо зусім няма,
Наш уладар паўстане перад Богам
Не сёння-заўтра.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

Літасцівы Бог!
Прымі свайго пакорлівага служку
Ласкава. І занадта не судзі.

Б о н а

Я слухаю.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

У Кракаў нас прыслалі
Два абавязкі: перад сваім родам
І перад каралеўскаю сям'ёй.

Б о н а

Я слухаю.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Адкрыць я тайну мушу.
Наша сястра і сын ваш Жыгімонт
Каханнем моцна звязаны.

Б о н а

Няўжо?

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Паверце, я хацеў гэта спыніць.
Сястра яму не пара.

Б о н а

Гэта праўда.

Р а д з і в і л   Р у д ы

Але яна й не цацка для забавы.
Род Радзівілаў — самы годны род
Ў Вялікім княстве.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Я зрабіў усё.
Усё, што толькі мог, каб перашкодзіць
Ім сустракацца.

Б о н а

Ну і ўрэшце што?

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Ды іх нядаўна тайна павянчалі!

Б о н а

Што, гэта праўда?

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Праўда, каралева.
Я з тым плябанам сам размову меў!
Ён іх вянчаў па просьбе Жыгімонта.

Р а д з і в і л   Р у д ы

Ці па загаду.

Б о н а

Гэта можа быць.
Ды толькі ўсё, што робяць па-зладзейску,
Употайкі, цішком — не трэба Богу,
А значыць, не патрэбна будзе ўсім!

Я гэты шлюб ніколі не прызнаю.
І Польшча не прызнае! І касцёл!
Бо з прынцам можна ўпотайкі кахацца,
Ды толькі нельга ўпотайкі вянчацца.
Ён не жаўнер, а будучы кароль,
І жэніцца ён з Габсбургскай прынцэсай.

Радзівіл Руды

Яна чакае ад яго дзіця.

Бона *(паказвае Радзівілам аркуш)*

Вось спіс каханкаў вашае сястры,
Усіх каханкаў пасля смерці мужа,
Калі ў ім праўды толькі напалову...
Што напалову! Толькі адна чвэрць.
Ёй пазайздросціць можа куртызанка.

Радзівіл Чорны

Няпоўны спіс. Дадайце свайго сына,
Ён у яе не першым быў, але
Ён у яе апошні, каралева!
Апошні самы!

Бона

У яе гады
Занадта рана ў гэтым ставіць кропку.
Яшчэ ўсё будзе.

Радзівіл Руды

Не, ужо не будзе.
Ёй без яго не жыць. Яна памрэ!

Бона

Каб ад кахання людзі паміралі,
Ўсе гарады даўно б пустымі сталі.

Радзівіл Чорны

Каханне проста не даецца людзям,
Адзін агнём гарыць, другі яго астудзіць.
Шчаслівы той, хто некалі кахаў,
Бо ад яго дабрэйшым свет наш стаў.
А спіс складалі, каралева, людзі.
Галоўны спіс яшчэ у Бога будзе.

Радзівіл Руды

І, можа, нехта, што тут свята жыў...
Больш за Барбару нават награшыў.
І не паперка будзе! Цэлы стос!
Блудніцы ж дараваў Ісус Хрыстос.

Бона. Я штодня чытаю Святое Пісанне... Хрыстос сапраўды дараваў Марыі Магдаліне. Але пасля гэтага яна ўсё жыццё плакала, каялася і маліла Бога ёй дараваць, а не села на кара-

леўскі пасад, каб быць для людзей прыкладам высакароднай жанчыны і маці народа.

Р а д з і в і л  Р у д ы. Сястра не хоча быць каралевай. Яна хоча кахаць і быць каханай.

Б о н а. А сын мой хоча ці не хоча, а павінен быць каралём Польшчы! І побач з ім будзе жанчына, якую ні ў чым... ні ў чым не змогуць папракнуць ні Бог, ні людзі. З вышэйшых асоб, асоб царскага роду людзі бяруць прыклад ва ўсім. Вы жадаеце, каб маладыя жанчыны Кароны жылі па прыкладу сястры вашае? Думаю, што вы гэтага не жадаеце.

Р а д з і в і л  Ч о р н ы. Мне даражэй той, хто сваю хворую душу вылечыў...

Б о н а. Вы пра сваю сястру?

Р а д з і в і л  Ч о р н ы. ...А не той, хто здаровую душу прымусіў захварэць... А ў асоб царскага роду гэта часцей за ўсё і бывае.

Б о н а. Князь!

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Цнатлівасць часам на пасад садзіцца.
А пройдзе час, і ўжо сядзіць блудніца.
Сястра народзіць сына Жыгімонта,
Пра гэта ведаюць і ў Польшчы і ў Літве.

Р а д з і в і л  Р у д ы

Хай сын ваш жэніцца, але няхай і знае,
Што у яго ў Літве нашчадак падрастае.

Р а д з і в і л  Ч о р н ы

Цалуем вашы рукі, каралева...

Р а д з і в і л ы кланяюцца і выходзяць.

Б о н а

Ліцвіны каралеве пагражаюць
І зброяй лічаць грэшную сястру,
Яна ў жыцці кахала шмат мужчын,
Ну, а ў мяне быў толькі родны сын,
Жывая краска на стаптанай пожні,
Ён у мяне і першы, і апошні.
*(Гукае.)*
Пан Мнішак!

З'яўляецца М н і ш а к.

М н і ш а к

Я слухаю ўсім сэрцам каралеву.

Б о н а

Ну, як адбыўся ваш вояж у Вільню?

М н і ш а к. О, найяснейшая каралева, гэтым разам я толькі змог дабрацца да Нясвіжа. Нейкі літоўскі вядзьмар з пушчы прымусіў мяне купіць у яго бутэлечку атруты. Нашто яна мне была?! Даю слова гонару, ён зачараваў мяне, і я, зачараваны, аддаў яму ўсе грошы, што браў з сабой на дарогу... Усе сто дукатаў!

Б о н а. Колькі?

М н і ш а к. Дзвесце. Ну дык вось: узяўшы мае трыста дукатаў, ён аддаў мне малюпасенькую бутэлечку. Калі яе выпіць, роўна праз шэсць месяцаў, дзень у дзень, гадзіна ў гадзіну, аддасі Богу душу... Вы чулі? Ну, ці варта было за гэтую дрэнь аддаваць чатырыста дукатаў? Дапусцім, я з'ехаў з глузду і выпіў гэтае зелле. Чакаю, каб роўна праз шэсць месяцаў, гадзіна ў гадзіну, аддаць канцы. А калі мне раней камень на галаву зваліцца ці ліхаманка якая прычэпіцца, і я памру раней... За што ж тады я аддаў свае пяцьсот дукатаў?! Калі Бог хоча пакараць чалавека — перш-наперш пазбавіць розуму... Я ехаў галодны, а, уяўляеце, як бы я мог пагуляць за гэтыя шэсцьсот дукатаў? Дзякуй Богу, я неяк дабраўся да Нясвіжа, і сястра нясвіжскага князя (дай Бог ёй дабра і усялякай радасці), даведаўшыся, што я па дурноце сваёй згубіў семсот дукатаў, ласкава прыняла мяне, накарміла, напаіла і нават дала грошай на дарогу.

Б о н а. Колькі?

М н і ш а к. Два дукаты. Але што... што гэтыя два дукаты ў параўнанні з тымі васьмістамі, што гэты пушчанскі змей выцыганіў з мяне. Больш таго, ад'язджаючы, я забыўся ў ласкавай панны гэтую гадасць, гэтую атруту на стале... Не дай Бог яна вып'е яе!

Б о н а. Хіба вы не папярэдзілі яе?

М н і ш а к. Як можна, найяснейшая каралева, як можна! Канечне, папярэдзіў. Усё расказаў. І пра шэсць месяцаў, і пра тое, што аддаў за бутэлечку аж дзевяцьсот дукатаў гэтаму ваўкалаку з пушчы.

Б о н а *(падае кашэль)*. Вось тысяча дукатаў. Наперад будзьце разумнейшымі, калі сустракаеце чараўнікоў. І пра гэта... не варта нікому расказваць...

М н і ш а к. О, што вы, каралева?! Як можна. Хіба сабе я вораг? Хіба я хачу, каб над маёй дурнотай насміхаліся людзі? Слова гонару, я пра гэта забыўся і ніколі не ўспомню. Нават на споведзі.

Б о н а. Няхай мне падрыхтуюць экіпаж.

М н і ш а к. Куды паедзе каралева?

Б о н а. У Вільню!

Вільня. Замак Барбары Радзівіл.
Уваходзіць Б а р б а р а.

Б а р б а р а

Паехаў ты, і добрае усё
З табою з Вільні з’ехала таксама.
Змрок надышоў, і холадна паўсюль.
Завялі ружы, і камін не грэе,
І сад ля замка сумны. І пусцее.
Цябе я, любы, ўдзень і ўночы сню,
Балюча слухаць пра цябе хлусню.
Пачуй здалёку голас сэрца мой,
Прыйдзі. Прыйдзі хутчэй! І супакой.

Уваходзяць Р а д з і в і л ы.

Р а д з і в і л Ч о р н ы. Мы з Кракава.

Б а р б а р а. І што там?

Р а д з і в і л Р у д ы. Жыгімонт, парушыўшы ўсе межы прыстойнасці... сам... сам паехаў сватацца да Габсбургаў!

Б а р б а р а. Гэта няпраўда!

Р а д з і в і л Ч о р н ы. Праўда! Пра гэта пляткарыць уся Польшча!

Р а д з і в і л Р у д ы

Ён каралеве-маці гаварыў:
«Прынцэса найцудоўнейшая ў свеце!»
Яе ён любіць! Будзе на каленях
Прасіць яе рукі. Бо ён кахае!
Цябе учора. Сёння ўжо яе!

Б а р б а р а

Няпраўда гэта.

Р а д з і в і л Р у д ы

Праўда!

Б а р б а р а

Сэрцам чую...
Ён мне не здрадзіў... Ён душою тут.

Р а д з і в і л Р у д ы

Было б найлепш, калі б ён быў тут целам.
Ты... не цяжарная? Нам шчыра адкажы.

Б а р б а р а

Мы ўжо раней пра гэта гаварылі.

Р а д з і в і л Р у д ы

Ты ўпэўнена?

Б а р б а р а

Мне не дванаццаць год.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

Але чаму?

Б а р б а р а

Не ведаю! Напэўна,
Бог у жыцці не дасць яму дзяцей.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Дык што, карона будзе без нашчадка?

Р а д з і в і л   Р у д ы

Барбара... ты павінна нарадзіць...

Б а р б а р а

Ды як?

Р а д з і в і л   Р у д ы

Як хочаш. У яго
Дзіця ў Вялікім княстве застанецца.
А ў Кракаве ніводная прынцэса
Яму яго ніколі не народзіць.
Барбара... Ты павінна нарадзіць!

Б а р б а р а

Ды ад яго дзіця ў мяне не будзе!

Р а д з і в і л   Р у д ы

Было б дзіця... Няхай не ад яго...

Б а р б а р а

А ад каго... яшчэ?.. Што ты гаворыш?!
Мне, значыць, трэба з некім... Божа мой!
Я, мабыць, сплю цяпер... Але так брыдка...
Што зараз я прачнуся...

Р а д з і в і л   Ч о р н ы

Пачакай!
Даўным-даўно чароўная Юдзіф,
Ратуючы народ ад асірыйцаў,
Сама пайшла на ложа Алаферна,
Прыспала ваяводу, і мячом,
Яго ж мячом, адсекла галаву.
Пазбавіла свой горад ад чужынцаў,
Табе ж не трэба будзе забіваць.
А толькі даць жыццё! І даць Літве надзею!

Р а д з і в і л   Р у д ы

Мы столькі часу стогнем пад Каронай,
З часоў Ягайлы. А твой родны сын…
Узыдзе на пасад! І будзе ён ліцвін!
І княства наша стане каралеўствам.

Б а р б а р а

Пакінь мяне!

Р а д з і в і л   Р у д ы

Здараецца такое...
На трыста год адзіны толькі раз,
Ліцвіны пра цябе складуць паданні.

Б а р б а р а
Як я пачварна здрадзіла каханню?!
Куды мяне ты клічаш, родны брат?
Ды ты вар'ят! Вар'ят! Вар'ят! Вар'ят.
Ты з д'яблам пад руку цяпер ідзеш,
Сястру сваю, як дзеўку, прадаеш!

Р а д з і в і л   Р у д ы
Твой абавязак...

Б а р б а р а
Ён — мой абавязак!

Р а д з і в і л   Р у д ы
Твая Радзіма...

Б а р б а р а
І Радзіма ён!
Брат! Бацька! Бог! Увесь-увесь Сусвет!
Сыдзіце з воч! Нямілы белы свет!..

Р а д з і в і л   Ч о р н ы
Ты супакойся і падумай добра...

Р а д з і в і л   Р у д ы
На свеце можна ўсім ахвяраваць,
Калі Радзіму трэба ратаваць.

Р а д з і в і л   Ч о р н ы
Бывай, сястра...

Выходзяць.

Б а р б а р а
Бывай. О людзі, людзі!
Шануюць тых, хто і ў граху, і ў брудзе,
Калі ж ты вырашыў на светлы шлях звярнуць,
Імкнуцца зноўку ў пекла зацягнуць.
Прыйдзі, каханы мой, прыйдзі хутчэй!
Мне страшна! Я хачу тваіх вачэй.

Уваходзіць каралева Б о н а ў чорным вэлюме.

Адкуль вы тут?

Бона падымае вэлюм.

О Божа! Каралева...
*(Апускаецца на калені.)*

Б о н а. Устаньце, дзіця маё... Гэта не вы, а я павінна апусціцца на калені і маліцца... Маліцца таму высокаму пачуццю, якое даў вам Бог ці то ва ўзнагароду, ці на выпрабаванне.

Б а р б а р а. О, светлая каралева...

Б о н а. Мой сын кахае вас... Кахае глыбока, шчыра, самаахвярна... Кахае так, як не могуць... і не павінны кахаць намеснікі

Бога на зямлі... Яго душа разрываецца паміж вамі і святым абавязкам дзяржаўнага мужа перад Айчынай... Перад Польшчай... Венцаносныя асобы ніколі не зведаюць шчасця з тым, каго кахаюць... Дзеля карысці дзяржавы яны мусяць цярпець... цярпець на сваім ложы... нялюбых, нямілых... і мець ад іх дзяцей... Вы ж ведаеце, колькі намаганняў, колькі часу патрэбна, каб з'явіўся нашчадак прастола... Ва ўсіх каралеўствах гэта страшная праблема... І ведаеце чаму? Каля трона не жыве каханне... А без кахання дзеці цяжка нараджаюцца... Ой, як цяжка... Паверце, я гэта ведаю... А калі і народзіцца, дык хваравіты, кволы, худасочны... Па ўсёй Еўропе на пасадах сядзяць убогія... Тыя, хто народжаны не ад кахання... І яны змушаны дзеля дзяржаўных інтарэсаў нараджаць сваіх дзяцей з нялюбымі... Выраджэнне, заняпад...

Б а р б а р а. Гэта праўда, што каралевіч Жыгімонт сам... сам паехаў да Габсбургскай прынцэсы Кацярыны?

Б о н а. Гэта праўда.

Б а р б а р а. Гэта праўда... даруйце, каралева, гэта праўда, што ён збіраецца стаяць перад ёй на каленях і казаць, што яна найцудоўнейшая ў свеце і што ён яе любіць...

Б о н а. Праўда, дзіця маё... Я магу паклясціся на Бібліі... Тым, хто служыць народу, сваёй Айчыне, амаль ніколі не даводзіцца казаць тое, што ён думае, і рабіць тое, што хоча... Абавязак... Лёс...

Б а р б а р а. Чым я магу аддзячыць сваю каралеву за той гонар, які...

Б о н а *(перапыняе)*. Мой тайны візіт да вас — гэта клопат пра будучага караля Польшчы, пра свайго сына... І ў гэтым я таксама магу паклясціся на Бібліі...

Б а р б а р а. Я слухаю сваю каралеву і зраблю ўсё, што яна мне загадае...

Б о н а. О, даруйце мне, мая прыгожая дзяўчынка... Я ехала ў Вільню, спадзеючыся сустрэць халодную драпежніцу, якая шукае сваёй выгады... а сустрэла... Вы кахаеце каралевіча?

Б а р б а р а. Мне добра тады... калі яму добра... Калі яго вочы свецяцца радасцю. Я... адчуваю сябе на нябёсах... Бог не даў мне дзетак, але я ведаю, як іх любяць. Маці памрэ, калі гэта спатрэбіцца яе дзіцяці.

Б о н а. Вы кахаеце.

Б а р б а р а. Вы прыехалі загадаць мне, каб я больш не бачылася з каралевічам?

Б о н а. Не. Гэткай пакуты ні ён, ні вы не здолееце стрываць. Я прашу вас прыбыць да двара яго каралеўскай мосці.

Б а р б а р а. Навошта?

Б о н а. Каб стаць маёй фрэйлінай.

Б а р б а р а. А яго высокасць ажэніцца з аўстрыйскай прынцэсай?

Б о н а. Так.

Б а р б а р а. Але ж... мы з яго высокасцю павянчаныя...

Б о н а. Святая царква ніколі не прызнае гэты шлюб... Як жанчына, як маці я прызнаю... Уся Польшча не прызнае! Душа Жыгімонта разарвецца паміж вамі і Польшчай... Пашкадуйце яго, Барбара...

Б а р б а р а. Што... мне... рабіць?

Б о н а. Даць згоду быць маёй фрэйлінай. Вы будзеце штодзень бачыць караля, ён будзе бачыць вас... А я здолею паклапаціцца пра вашае дзіця.

Б а р б а р а. Я не маю дзяцей...

Б о н а. Я пра таго, хто будзе...

Б а р б а р а. У мяне дзяцей не будзе...

Б о н а

Вы ўпэўнены?

Б а р б а р а

Мне не дванаццаць год.

Б о н а

Я ўсё адно чакаю вас. Бывайце.
*(Выходзіць.)*

Б а р б а р а *(адна)*

Я — фрэйліна... Я — фрэйліна... Быць побач.
І быць далёка ад цябе... О, не!
Такой пакуты не знайсці і ў пекле,
Я — побач, побач, іншая ж цябе
Цалуе, лашчыць.
Божа! Божа! Божа!
Пякельны жах з маёй душы здымі,
Даруй ты мне... і грэшную прымі...
Баль адшумеў, і ціша навакол,
У чорным небе дрэмле ясны месяц,
Абліты цьмяным срэбрам лес і дол,
І болей не чутно птушыных песень.
Усімі зоркамі мяне цалуе ноч,
Ласкавы ветрык лашчыць, лашчыць грудзі,
І гладзіць цемра мне павейкі воч...
Я зведаю... чаго не зведаць людзям.
*(Адкаркоўвае бутэлечку, што пакінуў Мнішак, і выпівае.)*

Кракаў. Каралеўскі палац.
Жыгімонт і Бона.

Бона

У Польшчы яшчэ слёзы не прасохлі,
Пасля нядаўняй смерці караля,
А ты ірвешся ў Вільню?

Жыгімонт

Так, да жонкі.

Бона

Яе ніхто ніколі не прызнае
Як тваю жонку. Гетман гаварыў,
Што лепш на троне бачыць Сулеймана,
Скарыцца туркам, чым тваёй...

Жыгімонт

Маўчыце!
Я ад яе не адступлюся, нават
Хай будзе свет увесь супроць яе!

Бона

Сенатары і біскупы даводзяць,
Што ты абразіў іх, абразіў Польшчу,
Што ганьба — выбар твой для іх ўсіх...

Жыгімонт

Я ў жонкі ім яе не прапаную!
Не прымушаю іх яе любіць.
Але Барбара будзе каралевай,
Таму што муж яе цяпер — кароль!

Бона

Я не прыеду на каранаванне.

Жыгімонт

Згадайце, што гаворыцца ў Пісанні:
«Ад бацькі-маці трэба адысці,
І ўсёй душой да жонкі прырасці».
І гэта для людзей любога звання,
Грэх страшны быць з жанчынай без кахання.

Бона

Ды ад цябе адвернецца ўся Польшча!

Жыгімонт

Я адвярнуся ад яе і сам!
Мне Польшча без Барбары не патрэбна!
Хай ведае і канцлер, і сенат,
Усе, хто пасылае ёй праклёны,
Я лепей адракуся ад кароны,
Чым ад яе. І з'еду у Літву.

А Польшча караля хай выбірае
З тых, у каго душы няма, хто не кахае...
Хто мне не вораг, той яе прызнае.
А не прызнаюць нелюдзі і злыдні!
Каранаванне будзе праз два тыдні.
Бывайце, каралева.
*(Выходзіць.)*

Бона

Ён за яе да смерці будзе біцца,
Выйсця няма. Даводзіцца... скарыцца.
О жорсткі лёс! Няслава ўсёй Кароне.
О страшны сон! Ліцвінка ўжо на троне.
Пан Мнішак!

Уваходзіць Мнішак.

Мнішак. Слухаю, мая каралева...

Бона. Вам належыць неадкладна выехаць у Літву і выправіць сваю памылку.

Мнішак. Якую памылку, каралева?

Бона. Мне сасніўся нядобры сон... Як быццам пушчанскае зелле, якое вы незнарок пакінулі ў Нясвіжы, выпіла маленькая дзяўчынка...

Мнішак. Калі каралева сніла сон?

Бона. Сёння ноччу.

Мнішак. Сны ў ноч на нядзелю ніколі не спраўджваюцца.

Бона. Тым не менш у мяне неспакойна на душы... Выязджайце зараз жа.

Мнішак. Я паеду зараз жа, забяру гэтую бутэлечку і дзенебудзь закапаю яе ў лесе.

Бона. Грэх закопваць смяротнае зелле ў зямлю. Прывязіце яе сюды...

Мнішак. Слухаю, каралева...

Нясвіж. Палац Радзівілаў.
Жыгімонт і Радзівілы.

Жыгімонт

Я толькі з Вільні. Мне сказалі ў замку...
Барбара пераехала да вас?

Радзівіл Чорны

Так, тут яна, ды бачыць вас не хоча.

Радзівіл Руды

Я не хачу, каб бачыліся вы.

Радзівіл Чорны

Даруйце нам, даруйце нашу дзёрзкасць.

Жыгімонт

Я вам ужо аднойчы дараваў,
Хай будзе так. І гэты раз дарую.
Дзе мая жонка?

Радзівіл Руды

Я вас не пушчу!

Жыгімонт

Я ваш кароль.

Радзівіл Руды

Яна — мая сястра,
Якая з вашай ласкі захварэла.

Жыгімонт

Што з ёю?

Радзівіл Руды

Ды цяжэй няма хваробы,
Калі душу параніць.

Жыгімонт

Дзе яна?

Радзівіл Чорны

Ваша вялікасць, я прашу...

Жыгімонт

Мне што,
Паклікаць стражнікаў, каб вас яны звязалі?
Барбара дзе?!

Уваходзіць Барбара.

Барбара

Пакіньце нас, прашу...

Радзівілы выходзяць.

Жыгімонт

Барбара, любая!

Барбара

Скажыце мне, кароль...
Як ваша найкаштоўнае здароўе?

Жыгімонт

Ужо цудоўна!

Барбара

Я надзвычай рада.
Калі ваш шлюб?

Жыгімонт

Ды роўна праз два тыдні.

Барбара

Мне загадаеце да Вавеля прыбыць?

Жыгімонт

Малю! Прашу! Прашу і загадаю,
Бо я на гэта трошкі права маю.

Барбара

Вядома, мой кароль...

Жыгімонт

Вы нездаровы?

Барбара

Так... Глупства... Пройдзе...

Жыгімонт

Лекараў прыслаць?

Барбара

Не трэба, мой кароль, я... я прыеду
На цырымонію...

Жыгімонт

Я гэта добра ведаў.
Бо як жа можна нарадзіць дзіцяці,
Калі няма ці бацькі, ці то маці.
І не бывае ў свеце шлюбных фэстаў,
Калі жаніх памёр альбо няма нявесты...

Барбара

Якой нявесты?

Жыгімонт

Вам напраўду дрэнна...
У ложак хуценька! Мне жонка не патрэбна
Нядужая. А ў Польшчы каралева
Павінна быць прыгожай і здаровай.
У хуткім часе будуць нас каранаваць,
А гэты здзек не проста так стрымаць.

Барбара

Мяне? Каранаваць?

Жыгімонт

Каго ж яшчэ?
Вы — мая жонка. Значыць, каралева.

Барбара

Дык вы не жэніцеся?

Жыгімонт

З кім жа мне жаніцца?
Калі вы здольная яшчэ раз нарадзіцца,
Тады яшчэ раз ажанюся я.

Барбара

Ці не казалі вы, што любіце прынцэсу?

Жыгімонт

Казаў. Люблю, як родную сястру.

Б а р б а р а

Лепш за яе нідзе на белым свеце...

Ж ы г і м о н т

І прыгажэй не будзе і няма,
Ды гэтага ніколі я не ўбачу,
Бо ў сэрцы вы.

Б а р б а р а

Яе вы цалавалі?

Ж ы г і м о н т

Яна сама мяне пацалавала
І пажадала шчасця мне і вам:
«Жывіце доўга, смерць сустрэньце разам.
Каханне Бог вам даў, дык не згубіце часам».

Б а р б а р а

Я — грэшніца!

Ж ы г і м о н т

Што з вамі, каралева?
Я вас пакрыўдзіў, можа, незнарок?

Б а р б а р а

Я — грэшніца, я — грэшніца, о Божа!
За самую пачварную хлусню
Страшней недагавораная праўда.

Ж ы г і м о н т

Я ўсё вам расказаў! Ды не, яшчэ не ўсё!
Яна падаравала вам пярсцёнак.
Ён цудадзейны! Гоіць добра раны!

Б а р б а р а

Я — грэшніца... Даруй мне, мой каханы.
*(Падае на рукі Жыгімонту.)*

Ж ы г і м о н т

Сюды, сюды! Ёй дрэнна! Памажыце.
*(Выносіць Барбару на руках.)*

З'яўляецца М н і ш а к.

М н і ш а к. Каралева сказала, што бачыла свой сон у ноч перад нядзеляй. Самай занюханай знахарцы вядома, што гэтыя сны спраўджваюцца толькі да апоўдня, у тую ж нядзелю, перад якой быў сон. Калі ён спраўдзіўся, дык беднай дзяўчынцы нічым не дапаможаш — хай яна будзе свае апошнія паўгода шчаслівай. Калі да апоўдня маю бутэлечку ніхто не чапаў, дык сон каралевы быў пусты і нічога нікому не пагражае. І ў тым выпадку, і ў тым няма сэнсу шукаць гэтую бутэлечку. Гары яна гарам! Але ж каралева запатрабавала, каб я яе абавязкова прывёз. Дык што з таго? На гэтай зямлі столькі атруты, столькі гадасці, знайду я што-небудзь і для каралевы. Тады чаго ж я сюды прыязджаў? Нясвіж! Палац Радзівілаў. Файныя мясціны... Чаму б не прыехаць?

Кракаў. Кафедральны сабор.
Ж ы г і м о н т і Б а р б а р а ў каранацыйных уборах.

Ж ы г і м о н т

Прымі нас, Уселітасцівы Божа...

Б а р б а р а

Прымі як непадзельнае — Адно...

Ж ы г і м о н т

Прымі як непадзельнае — Адно...

Б а р б а р а

Прымі нас, Уселітасцівы Божа...

Ж ы г і м о н т

Адна Душа, адно Жыццё і Кроў...

Б а р б а р а

Бог ёсць Любоў, і мы цяпер — Любоў...

Ж ы г і м о н т

Бог ёсць Любоў, і мы цяпер — Любоў...

Б а р б а р а

Адна Душа, адно Жыццё і Кроў...
Няхай Твой грозны гнеў нікога не кране,
Даруй усім і ўжо апошняй — мне.

Ж ы г і м о н т

Барбара, што з табой?

Б а р б а р а

Бывай, мой любы...

Ж ы г і м о н т

Чаму бывай?

Б а р б а р а

Я — грэшніца...

Ж ы г і м о н т

Ніхто...
Няма нікога без граху на свеце,
Каханне наша ўсё нам даравала.

Б а р б а р а

Я злу паверыла і грэшнай болей стала,
І не зямны, нябёсаў строгі суд
Абвесціць справядлівы свой прысуд...
Мой любы, ты даруй мне...

Ж ы г і м о н т

Я кахаю...
І не аддам!

Б а р б а р а

І мне не трэба раю...
Ніколі ад цябе не адыду.
Нават тады, калі ў нябыт сыду...

## Частка трэцяя

# ВЕЧНАСЦЬ

Нясвіж. Лета 1551 года. Парк перад замкам Радзівілаў.
Ноч. М н і ш а к і Р а д з і в і л ы.

М н і ш а к

А каралю з Нясвіжа трэба з'ехаць.
І тэрмінова.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

А чаму?

М н і ш а к

Чаму?
Мы трошкі загуляліся з чарцямі
І пратапталі сцежку на той свет.
Яна па гэтай сцежцы і прыходзіць,
І па Нясвіжы ходзіць, ходзіць, ходзіць...

Р а д з і в і л Р у д ы

Ды хто яна?

М н і ш а к

Сястра ваша! Барбара!
Я тыдзень па начах ужо не сплю
І Бога, хоць не веру, а малю,
Каб заступіўся. Чуеце? Ізноў
Рыданні, стогны, плач у вашым парку.

Р а д з і в і л Р у д ы

Ды гэта вецер...

М н і ш а к

Гэтак галасіць
Не можа вецер! Гэта здань Барбары...
Яе кароль так клікаў апантана.
Яна і прыляцела... нечакана...

Р а д з і в і л Ч о р н ы

А мо дзіця якое ў парку плача?..

М н і ш а к

Князь, не і не! Я сёння сам убачыў!

Р а д з і в і л Р у д ы

Каго?

М н і ш а к

Каго-каго! Каго ж яшчэ? Барбару...
У тым баку... Вунь там. Паміж трох ліп.

Р а д з і в і л Р у д ы

То, можа, гэта Бжэнка?

М н і ш а к

Не, не Бжэнка!
Яна была са мной... каля мяне...
А тая... калыхалася ў паветры!
Ў адзенні чорным і... плыла між дрэў!
Калі дзяўчо ад жаху закрычала,
Дык тая ўсхліпнула вось так во... і прапала.
Па мне й цяпер цячэ халодны пот,
І сэрца закацілася ў жывот.

Р а д з і в і л Ч о р н ы

Дзе ўсё было?

М н і ш а к

Вунь там вунь.

Р а д з і в і л Р у д ы

Пакажыце.

Выходзяць. З'яўляецца Ж ы г і м о н т.

Ж ы г і м о н т

Заснуць бы так, каб не прачнуцца зноў,
Бог ёсць Любоў... Бог ёсць Любоў...
Сысці ў нябыт, як бы прыйсці дамоў,
Бог ёсць Любоў... Бог ёсць Любоў...
І ў спёку холадна, аж стыне ў сэрцы кроў,
Бог ёсць Любоў... Бог ёсць Любоў...
Пакута вечная, як кара ўсіх багоў,
Бог ёсць Любоў... Бог ёсць Любоў...

З'яўляецца Б ж э н к а.

Б ж э н к а. Ваша вялікасць! Я прашу вас: адпусціце мяне! Мне страшна... Лепей ужо ў манастыр! Лепей куды заўгодна... толькі не тут... Я... Я не магу... Я баюся! Яна мяне задушыць, а за што? Хіба я вінаватая, што падобная на яе?.. Я ёй нічога дрэннага не зрабіла... Мне страшна... Мне страшна, калі вы гледзіце на мяне... Мне страшна, калі вы датыкаецеся да мяне... Мне страшна, калі вы цалуеце мяне... Мне здаецца, што мяне цалуе... нябожчык... Мярцвяк!

Уваходзіць Р а д з і в і л Р у д ы.

Р а д з і в і л Р у д ы

Ваша вялікасць! Мнішак утапіўся!
Ён нешта страшнае заўважыў
Сярод дрэў
І бегчы кінуўся…

Там сажалка... Ён скочыў!
І каменем на дно. Ўсё, не дастаць.
*(Выходзіць.)*

Б ж э н к а

Я жыць хачу!!! Не саграшу ніколі!
Маліцца буду вечна за яе!
Я выйду замуж, калі нехта возьме!
За што?! За што? За што ёй помсціць мне?
Я перад ёй ні ў чым не вінавата!
Я не сама... Мяне сюды прывезлі!
І загадалі, каб любіла вас...
Замест яе... Не давядзі, Гасподзь!
Любіць вас... Лепей брыдкая пачвара,
Любы страшыдла, чымсьці вы, кароль!
Адпусціце мяне...

Ж ы г і м о н т. Супакойся, дзяўчынка... Заўтра цябе адвязуць да бацькі ў Кракаў...

Б ж э н к а. Не! Я пайду сёння... Пешкі пайду... Гэта дурное месца! Гэта Нясвіж! Калі я застануся тут хоць яшчэ на адну ноч... Яна мяне задушыць... Адпусціце... Я прашу вас, адпусціце мяне... зараз...

Ж ы г і м о н т. Як хочаш... Я загадаю, каб табе далі грошай...

Б ж э н к а. Не трэба!

Ж ы г і м о н т. Як хочаш. Бывай.

Б ж э н к а. Дзякуй, ваша вялікасць... Хай вас Бог прылашчыць у вашым адчаі і горы... Дазвольце руку пацалаваць... свайму каралю... Толькі як каралю... *(Цалуе руку Жыгімонта.)*

Ж ы г і м о н т. Праспявай мне на развітанне і... бывай.

Б ж э н к а *(спявае і адначасова адыходзіць)*

На моры вутачка купалася,
Пакупалася, у бор паляцела.
У барочку шчыранька грагаць стала:
— Дзе ж мае дзетачкі падзяваліся?
Ад свайго гняздзечка адцураліся!
Дзе ж мае дзетачкі падзяваліся?
Ад свайго гняздзечка адцураліся.

З'яўляецца Ч о р н а я  П а н н а.

Ч о р н а я  П а н н а

Хадзі сюды, хадзі сюды, каханы...

Ж ы г і м о н т

Памерла ты, і я з табой забраны,
Журба — мая дзяржава, мой прастол,
Змрок на душы, як у асеннім лесе.

Ч о р н а я  П а н н а

Баль адшумеў, і ціша навакол.

Ж ы г і м о н т

Каханая...

Ч о р н а я  П а н н а

У чорным небе дрэмле ясны месяц.

Ж ы г і м о н т

Барба-а-а...

Ч о р н а я  П а н н а

Абліты цьмяным срэбрам лес і дол.

Ж ы г і м о н т

Любая...

Ч о р н а я  П а н н а

І болей не чутно птушыных песень.

Ж ы г і м о н т

Родная...

Ч о р н а я  П а н н а

Усімі зоркамі мяне цалуе ноч.

Ж ы г і м о н т

Адзіная...

Ч о р н а я  П а н н а

Ласкавы ветрык лашчыць, лашчыць грудзі...

Ж ы г і м о н т

Не пакідай мяне...

Ч о р н а я  П а н н а

І гладзіць цемра мне павейкі воч.

Ж ы г і м о н т

Не пакідай...

Ч о р н а я  П а н н а

Я зведаю... чаго не зведаць людзям.

Ж ы г і м о н т

Не пакідай...

Знікаюць у цемры.

**Ад аўтара.** Літоўская прыгажуня Барбара Радзівіл была каранавана як каралева Польшчы ў снежні 1550 года. Роўна праз паўгода, 8 мая 1551 года, яна памерла. Пахавана ў Віленскім саборы. З яе партрэта быў намаляваны абраз Маткі Боскай Вастрабрамскай — вечны помнік вялікаму Каханню...

*К а н е ц*

*1998*

# Крыж

**Дыялогі вякоў у сямі частках з эпілогам**

**ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ**

Прадслава.
Богша.
Цівун.

*Святой Еўфрасінні Полацкай,*
*нябеснай заступніцы Беларусі*

## Частка першая

Г о л а с. **Бысть князь в граде Полотсце именем Всеслав, той имея сыновы многы. И беше у него меньший сын именем Георгий, от негоже родися сии блаженнаа отроковица. Родителя же ея възрадовастася о рожестве ея со всеми домашними своими. И по днех неколицех повелеста крестити ю, и крестиста ю во имя Отца и Сына и Святаго Духа. И питома бяше доилицею ея, дне от дне растяше отроковица, тело млеком растяше, а душа Святаго Духа наполняшеся. Лучи же ся девици деснаго естества и молитвы плод, и толма бысть любящи учение, якоже чудитися отцу ея о толице любви учениа ея...**[1]

Лета 1121-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Бераг Дзвіны пад Полацкам. З'яўляецца
Б о г ш а, цягнучы на плячах драўляную постаць Збавіцеля, за ім ідзе
Ц і в у н з бізуном.

Ц і в у н. Пакладзі ідала на зямлю.

Богша апускае фігуру на зямлю.

На калені!

Богша становіцца на калені.

Усё, што буду казаць, паўтарай... *(Б'е бізуном.)* Да Цябе, Госпадзі, узношу душу маю!

Б о г ш а *(стогне)*. Да Цябе, Госпадзі, узношу душу маю...

Ц і в у н *(б'е)*. Скіруй мяне на ісціну Тваю і навучы мяне, бо Ты Бог збавення майго!

Б о г ш а *(стогне)*. Скіруй мяне на ісціну Тваю і навучы мяне, бо Ты Бог збавення майго!

Ц і в у н *(б'е)*. Грахоў юнацтва майго і злачынстваў маіх не ўспамінай!

Б о г ш а *(стогне)*. Грахоў юнацтва майго і злачынстваў маіх не ўспамінай...

Ц і в у н *(б'е)*. Табе веру, на Цябе спадзяюся і аніколі не пакланюся ідалу, бо гэта ёсць прытулак д'ябла...

Б о г ш а *(стогне)*. Табе веру, на Цябе спадзяюся і аніколі не пакланюся ідалу, бо гэта ёсць прытулак д'ябла...

Ц і в у н. Бяры сякеру...

Богша бярэ.

---

[1] У п'есе выкарыстаны ўрыўкі з «Жыція Еўфрасінні Полацкай».

Сячы яго! Сячы на дробныя кавалкі, на трэскі, стружкі, у дробны пыл... Потым прынясеш свечку з Сафійскага сабора і падпаліш ёю... Гарачы попел у прыгаршчах будзеш насіць да Дзвіны і тапіць... Сячы!

Богша марудна-марудна падымае сякеру...

Б о г ш а. Госпадзі! Ты ж ведаеш, што гэта не так... Не рабіў... не рабіў я ідала... З пастом і малітваю выразаў з мёртвага дрэва жывы светлы воблік Твой...

Ц і в у н. Хрыстос павінен быць на крыжы! А гэта ідал у яго вобліку, што насміхаецца над Богам! Сячы!

Б о г ш а. Не магу...

Ц і в у н. Богша! Людзі хацелі цябе спаліць! Разам з ім, я ўратаваў цябе ад вогнішча, паабяцаўшы, што ты будзеш пакараны і раскаяны. Сячы!

Б о г ш а *(кідае сякеру)*. Не магу...

Ц і в у н. Што табе гэта дзеравяшка?! Святы Пётра ад Хрыста тройчы адракаўся...

Б о г ш а. Я не рабіў ідала...

Ц і в у н. Люд веруючы чакае... Калі ты не пасячэш яго, я змушаны буду секчы цябе бізуном да смерці... Сячы! *(Б'е.)* Сячы! *(Б'е.)* Сячы! *(Б'е.)*

З'яўляецца П р а д с л а в а.

П р а д с л а в а. Пакінь яго!

Ц і в у н. Адыдзі, дзяўчо!

П р а д с л а в а. Я не дзяўчо! Я дачка князя!

Ц і в у н. Слухаю князёўну...

П р а д с л а в а. Што зрабіў гэты чалавек?

Ц і в у н. Гэты чалавек зрабіў драўлянага ідала. Разгневаны натоўп прывязаў яго да дуба, абклаў хмызняком і хацеў спаліць разам з ідалам. Я ледзьве адбіў! Я яго з агню дастаў, а ён не жадае знішчыць ідала.

П р а д с л а в а. Чаму ты лічыш, што гэта ідал?

Ц і в у н. Хрыстос павінен быць на крыжы! І хто паклоніцца іншаму — язычнік.

П р а д с л а в а. Як завуць цябе?

Ц і в у н. Яго завуць Богша. Лазар Богша. Полацкі разьбяр і ювелір.

П р а д с л а в а. Ты аздабляў алтар Спасаўскай царквы?

Б о г ш а. Я...

П р а д с л а в а *(да Цівуна)*. Як жа ён мог рабіць ідала?

Ц і в у н. А гэта хто?

П р а д с л а в а. Хрыстос...

Ц і в у н. Хрыстос павінен быць на крыжы!

П р а д с л а в а. На крыжы Хрыстос быў мёртвы!.. Пасля таго як яго прадалі, адракліся і раскрыжавалі! Але ён быў жывы да Галгофы і праз тры дні пасля Галгофы ўваскрос! І тут ён жывы! І тут ён жывы і кажа: «Любіце ворагаў вашых, благаслаўляйце тых, хто праклінае вас, і маліцеся за крыўдзіцеляў вашых і толькі тады будзеце сынамі Айца вашага нябеснага, бо Ён кажа сонцу Свайму ўзыходзіць над злымі і добрымі і пасылае дождж на праведных і няправедных...» А хіба ён вораг табе?

Ц і в у н. Я... уратаваў яго... Я выпадкова праязджаў...

П р а д с л а в а. І ты тут не выпадкова, і я не выпадкова... Паслалі цябе, паслалі і мяне.

Ц і в у н *(разгублена)*. Хто?

П р а д с л а в а. Ты ведаеш...

Ц і в у н. Не разумею, князёўна.

П р а д с л а в а. Ідзі і скажы ім, каб разыходзіліся. Ёсць Боскі суд і ёсць суд княскі... Хто робіць свой — разбойнік...

Ц і в у н. Слухаю.

Ц і в у н кланяецца і выходзіць.

П р а д с л а в а. Балюча?

Б о г ш а. Смешна... Хрыстос павінен быць на крыжы... Яны яго некалі і раскрыжавалі для гэтага... Каб маўчаў! Адкуль ты ведаеш, што ён гэтыя словы гаворыць? Менавіта гэтыя?

П р а д с л а в а. Дай я перавяжу цябе... *(Перавязвае.)*

Б о г ш а. Рукі ў цябе ласкавыя, князёўна...

П р а д с л а в а. Не баліць?

Б о г ш а. Не. Каб Цівун не падаспеў... як вепрука падсмажылі б. І за што? Добра, каб хоць самі былі святыя, а то ж... Сто трыццаць гадоў моляцца Хрысту, святкуюць на Яго Ражство, а Каляды, святую Тройцу так не чакаюць, як Купалле... У самы строгі пост любую мярзоту зробяць, а пакажы ім на чалавека і скажы, што ён грэшнік — як зграя галодных ваўкоў кінуцца і загрызуць...

П р а д с л а в а. Судзіш...

Б о г ш а. Нікога я не суджу! І Бог сведка, што я іх люблю... Кожнага паасобку! Да таго часу, пакуль не саб'юцца ў адну кучу. У народ! А народу сам Айцец Нябесны рады не даваў... Не паспее адвярнуцца, а ён ужо робіць злое перад вачыма Яго... Кожнага з нас трэба пасяліць у пустыню, аднаго, і адразу ж надыдзе Царства Божае.

П р а д с л а в а. Даруй ім...

Б о г ш а. Каму, князёўна? Каму? Мне іх спачатку падзяліць трэба... Адзін крычыць: «Распні!», а другі шкадуе... Я гатовы аднаму дараваць, а другому падзякаваць. Не! Я ім павінен разам

дараваць і разам дзякаваць. І злы схаваецца за спіну добрага, і добры зробіцца яго паплечнікам.

П р а д с л а в а. Ты ж ведаеш — іх паслалі...

Б о г ш а. Калі пасылаюць туды, куды табе не хочацца хадзіць, куды цябе сэрца не пускае, дык ідзі марудна, накульгваючы... А яны прыбеглі! З радаснымі вачыма. Адны адразу біць пачалі, а іншыя ж па майстэрні шнарыць і хапаць дзе што ляжыць. Адзін паскуднік набухаў бражкі ў пацір, што я зрабіў для Спасаўскай царквы, і жлукціць з яго! Прычашчаецца! Ну, дык гэтыя яшчэ нішто сабе... Проста п'яніцы і зладзюгі... А хацелі спаліць і білі сумленныя! Білі ад чыстага сэрца. А за што-о? Сляпы ўбача, не кашчунства гэта! Я ўбачыў Яго лік у вялікім кавалку дубу, што праляжаў на дне Дзвіны не адну сотню гадоў. Я працаваў, не заўважаючы ні дня ні ночы, усё лішняе, усё непатрэбнае лёгка здымаў разак... І з'явіўся Ён... Добры, спагадлівы, безабаронны... Збавіцель наш. Мая душа спявала райскія песні... І за гэта біць? І за гэта на касцёр? Госпадзі Ісусе Хрысце, Сыне Божы! Колькі людской крыві пралілося ў славу Тваю! Колькі нявінных душ загублена! А сам жа Ты, нават раскрыжаваны, разбойніку рай дараваў... Дык чаму ж мы не ідзём шляхамі Тваімі, Госпадзі?!!

П р а д с л а в а. Фрэску святога Георгія ў саборы ты рабіў?

Б о г ш а. Я рабіў... *(Паўза.)* Я не вінаваты, што ён атрымаўся непадобны на князя! Я хацеў зрабіць яго падобным, у мяне не атрымалася... Я не рабіў гэтага знарок! У мяне не атрымалася! Я стараўся! У мяне не атрымалася!

Прадслава падыходзіць і цалуе Богшу.

П р а д с л а в а. Я цябе люблю...

Б о г ш а *(нясмела абдымае яе)*. Што ты, князёўна, што ты?..

З'яўляецца Ц і в у н.

Ц і в у н. Князёўна, князь загадаў мне, каб я зараз жа прывёў цябе да яго.

П р а д с л а в а. Бывай.

Б о г ш а. Бывай.

П р а д с л а в а выходзіць.

Ц і в у н. Маліся Богу, што яна апынулася тут.

Б о г ш а. Малюся.

Ц і в у н. Маліцца толькі перад святымі абразамі і перад Святым Распяццем. Уразумеў?

Б о г ш а. Уразумеў.

Ц і в у н *(паказвае на выяву Хрыста)*. Зробіш яшчэ хоць што-небудзь такое — павешу... І не смей, не смей так глядзець на князёўну... Вочы выкалю... *(Выходзіць.)*

Абняўшы сваю работу, выходзіць і Б о г ш а.

## Частка другая

Г о л а с. **И пришедши ей в возраст 12 лет, и нача отец ея глаголати княини своей: «Нама уже лепо дати Предслава за князь». ...Она же глагола ему: «Да како Бог хощет и твоя, княже, воля, тако да будет». Тогда слышавши Предслава, размышляше в собе, глаголющи, паче же реку, от Святаго Духа наплъняшеся мысль ея, и рече в собе: «Како се будет, же отец мой мыслит припрячи мя мужеви? То аще тако будет, то печали мира сего никакоже лзе гоньзнути». Пакы в собе рече: «Что бо успеша преже нас бывшии родове наши? И женишася, посягаша и княжиша, нъ не вечноваша; житие их мимотече и слава их погибе, яко прах и хужее паучины...»**

Лета 1918-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Губпалітупраўленне. Уваходзіць Ц і в у н. Звоніць тэлефон.

Ц і в у н *(падымае трубку)*. Слухаю... Скажыце ёй, што налётчыкі затрыманы і па законах рэвалюцыйнага часу імем рэвалюцыі заўтра будуць расстраляны... Дык што ёй трэба? Ёсць мне час з манашкамі валэндацца... Ладна, хай зойдзе...

Уваходзіць П р а д с л а в а.

П р а д с л а в а. Добры дзень.
Ц і в у н *(уражаны)*. Вы... вы з манастыра?
П р а д с л а в а. Так.
Ц і в у н. Як вас завуць?
П р а д с л а в а. Завіце мяне проста сястра.
Ц і в у н. Вы надзвычай прыгожая, сястра... Колькі вам год?
П р а д с л а в а. Дваццаць два.
Ц і в у н. Пайшлі ў манастыр адразу пасля рэвалюцыі?
П р а д с л а в а. Не. Ужо восем гадоў мінула.
Ц і в у н. Восем гадоў? Ці быў у вас бацька?
П р а д с л а в а. Быў.
Ц і в у н. І хто?
П р а д с л а в а. Князь.
Ц і в у н. Загінуў?
П р а д с л а в а. На ўсё воля Бога.
Ц і в у н. І ён змог вас некалі адпусціць у манастыр?.. Такую.
П р а д с л а в а. Хто каго можа спыніць, калі Ён пакліча.
Ц і в у н. Што ў вас да мяне?
П р а д с л а в а. Нам перадалі, што рабаўнікоў, якія ўчынілі гвалт у нашым манастыры, злавілі.
Ц і в у н. Злавілі.

П р а д с л а в а. І вы хочаце іх забіць?

Ц і в у н. Што вы, што вы, сястра! Ніхто іх забіваць не збіраецца... Іх заўтра расстраляюць. Расстраляюць як гвалтаўнікоў-марадзёраў.

П р а д с л а в а. Усе сёстры моляцца Богу, каб гэтага не адбылося. І я прыйшла прасіць вас аб гэтым.

Ц і в у н. Аб чым?

П р а д с л а в а. Хай іх не забіваюць...

Ц і в у н. Кім быў ваш бацька?

П р а д с л а в а. Камандзірам крэйсера.

Ц і в у н. Крэйсер «Аляксандраўск»?

П р а д с л а в а. Так.

Ц і в у н. Як загінуў, ведаеце?

П р а д с л а в а. Быў бунт.

Ц і в у н. Паўстанне. Матросы раззброілі афіцэраў, сарвалі з іх пагоны і кожнага прымушалі прайсці парадным крокам па палубе, аддаючы чэсць п'янай камандзе. Тым, хто адмаўляўся, звязвалі канатамі рукі-ногі і кідалі за борт.

П р а д с л а в а. Навошта вы мне гэта расказваеце?

Ц і в у н. Гэтыя — былыя матросы крэйсера «Аляксандраўск». *(Паўза.)* Вы па-ранейшаму просіце дараваць ім жыццё?

П р а д с л а в а. Прашу.

Ц і в у н. І моліцеся за іх?

П р а д с л а в а. Малюся...

Ц і в у н. Ну, Бог хай і даруе. Рэвалюцыя не даруе. Ведаеце, сястра, што самае брыдкае... Гэта сволач, даруйце, гэта брудная мярзота палічыла, што калі рэвалюцыя адмаўляе існаванне Бога, значыць, ім можна ўсё: рабаваць, гвалціць, красці, заяўляючы, што мы, як і рэвалюцыя, супраць Бога, што мы — яе дзеці.

П р а д с л а в а. Вы так доўга пераконвалі маленькіх, неразумных, непісьменных дзяцей у тым, што яны пачатак пачаткаў у гэтым свеце, што яны самае вышэйшае і самае галоўнае на зямлі, што ўрэшце дзеці вам і паверылі. За што ж іх караць? Яны ж дзеці...

Ц і в у н. Чаю хочаце?

П р а д с л а в а. Не. Дзякую.

Ц і в у н. Ваша вера, сястра, на нашай зямлі ніколі не будзе мець ні сілы, ні ўплыву. Праведнымі наракаліся, наракаюцца і будуць наракацца тыя, на каго пакажа ўлада. Так было. Так будзе. Да сканчэння свету.

П р а д с л а в а. А пасля сканчэння?

Ц і в у н. І колькі вы яго ўжо чакаеце? І кожнае стагоддзе ў вас адно: «Час блізкі, блізкі час». Памятаеце: «І паслаў князь абвясціць народу: хто не прыйдзе хрысціцца на раку, хай ён будзе багатым або бедным, жабраком або рабом,— той мне будзе

ворагам». І, пачуўшы гэта, людзі пайшлі з радасцю вялікай. З радасцю вялікай, сястра, яны цяпер і адмаўляюцца. Ім сказалі... і яны топчуць вашы святыя абразы і бураць храмы, як тысячу гадоў таму бурылі капішчы Перуна.

П р а д с л а в а. Не забівайце іх...

Ц і в у н. Сястра! Яны ўварваліся п'яныя ў ваш дом...

П р а д с л а в а. Не забівайце іх...

Ц і в у н. Свінні сабе не дазволяць рабіць тое, што рабілі яны!

П р а д с л а в а. Не забівайце іх...

Ц і в у н. Яны прыйдуць зноў!!!

П р а д с л а в а. І я зноў прыйду да вас...

Ц і в у н. Заўтра... Заўтра... Іх выведуць на досвітку за сцены манастыра, пастаўяць ля муроў, зачытаюць рэвалюцыйны прысуд — і дзесяць чырвонаармейцаў па камандзе «плі!» здзейсняць, кажучы па-вашаму, здзейсняць волю Боскую, а па-нашаму — рэвалюцыйны закон... Гніллё выпальваюць агнём, а не лечаць, сястра... І вы згодная са мной... Згодная, згодная... Даравацъ грэшніку, прасіць за грэшніка — гэта ж, па-вашаму, сыпаць гарачы попел на галаву яго, каб Гасподзь пакараў яго больш балюча! Ці не так?! Вы знутры больш жорсткія, больш лютыя, чым мы. Аднак хопіць. Пакіньце кесару кесарава і забярыце ўсё астатняе. Заўтра ўсе паслушніцы і манахіні павінны быць на пакаранні. Чуеце, сястра?

П р а д с л а в а. Пакарання не будзе.

Ц і в у н. Пра што гэта вы?

П р а д с л а в а. Я выпусціла іх з келлі...

Ц і в у н. Як гэта выпусціла? Там жа вартавыя.

П р а д с л а в а. Яны спяць.

Ц і в у н. Што значыць спяць? Дзень жа на вуліцы.

П р а д с л а в а. Спяць. *(Глядзіць у вочы Ціўну.)*

Той пахіснуўся, зрабіў няўпэўнены крок наперад і... як падкошаны, грымнуўся вобзем. П р а д с л а в а выходзіць. Цівун апрытомнеў, падпоўз да тэлефона.

Ц і в у н *(у трубку)*. Начальніка каравула! Гэта Цівун... Арыштуйце манашку...

## Частка трэцяя

Г о л а с. **В та же лета бяше княини Романоваа игуменьею. Прииде к той, просящи прияти аггельскаго образа и причтатися ту сущим инокиням, и быти подо игом Христовым. Видевши же она блаженная жена юность и**

**возраст цветущий оней, и смятеся, и нача телом утерьпати и сердцем ужасатися, и лицем на землю преклоньши, и восклоньшися, и возревши на юность ея, воздохну и прослезившися, глагола ей: «Чадо мое! Како могу се сотворити? Отец твой, уведев, со всяким гневом возложит вред на главу мою. И еще же юна еси возрастом, не можеши понести тяготы мнишескаго жытиа. И како можеши оставити княжение и славу мира сего?»**

Лета 1129-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Полацк. Майстэрня. Богша з кружкай.

Богша. Ізноў вайна... Святаславічы пакрыўдзіліся на Ізяславічаў і ідуць на вы ці на мы... Усё адно, на нашу шыю... Самае смешнае, аднаго ж роду-племені, браты... І яшчэ смяшней, аднаму Богу моляцца... І зусім смешнае: служкі Твае, Госпадзі, у Кіеве бласлаўляюць мячы Святаславічаў секчы Ізяславічаў, а ў Полацку мячы Ізяславічаў секчы Святаславічаў. І рэжуць адзін аднаго з імем Тваім на харугвах. І з тымі Бог, і з тымі Бог... А дзе ж тады рагаты? І хоць бы хто з іх сказаў-крыкнуў Тваё: «Не забі!» І спытай Ты каго з іх, што ім трэба... Усё народ вызваляюць, каб вы паздыхалі! Госпадзі, вызваліў бы Ты ад іх саміх народ, а мы б як-небудзь пражылі. Ты ж Сам казаў, калі хто абзаве брата свайго дурнем — таго ў геену вогненную! А яны і не абзываюцца нават, адразу горла брату свайму грызуць! Людаеды... Братаеды... І час жа такі падгадваюць, калі арацьсеяць, жаць-малаціць трэба. Палеткі конямі стопчуць, збажыну спаляць, свірны разграбяць... А ўзімку кармі іх, абаронцаў-вызваліцеляў. І абы-чаго не ядуць! Салодкае давай... Воі! Адзін перад адным пахваляюцца, хто больш крыві выпіў і чалавечыны з'еў. Гультаі... Нічога, апроч таго, што мячом махаць, не ўмеюць і не хочуць... Па мне ўсё адно: ці ты сам па сабе ліхадзей, ці з князем разбойнічаеш... Адно слова — разбойнік. І чым спрытнейшы разбойнік, тым яму большая пашана і ўзнагарода... Людаеды... І хоць бы не чапляліся, заразы... Не-е... Прыйдзе чужы — праклінай свайго, вернецца свой — кляні чужога... А што да мяне, дык ці гэты бот, ці гэты бот; і гэты чорт, і гэты чорт.

З'яўляецца Цівун.

Цівун. Ну што, вядзьмак, варожыш?
Богша. Малюся...
Цівун. Моляцца ў царкве, а не ў хляве.
Богша. Увесь свет храм Божы, дый хлеў за храм не горшы...
Цівун. Прыкусі язык!
Богша. Хрыстос нарадзіўся ў хляве...
Цівун. Што ты вярзеш?

Б о г ш а. Выпі віна, страж існай веры... Хто п'е замнога, той бачыць Бога... Вып'ем, пастух...

П'юць.

Ц і в у н. Калі вас не пасвіць, вы разбрыдзецеся па лясах, як статак кароў, шукаючы сваіх лесуноў, ваўкалакаў, жыценяў, баннікаў і дамавых... І заместа існага Бога станеце зноў маліцца Перуну... Бо ён грыміць у нябёсах...

Б о г ш а. Шчаслівы край, які гоняць у рай... Бізуном.

Ц і в у н. Прыкусі язык!

Б о г ш а. Маўчу.

Ц і в у н. Ты апошнімі днямі князёўну сустракаў?

Б о г ш а. Не.

Ц і в у н. Я ведаю, што яна заходзіла да цябе!

Б о г ш а. Гэта даўно было. Яна прыходзіла заказаць крыжык.

Ц і в у н. Які крыжык?

Б о г ш а. Нацельны. З сучка таго дуба, дзе мяне хацелі спаліць...

Ц і в у н. І, каб не я, спалілі б... А нашто ёй крыжык з дрэва... Князі носяць залатыя...

Б о г ш а. Скуль жа мне ведаць.

Ц і в у н. Пакажы.

Б о г ш а *(паказвае)*. Яшчэ не ўсё дарэзаў...

Ц і в у н. Калі яна прыйдзе па яго?

Б о г ш а. Не сказала...

Ц і в у н. Як гэта — не сказала?

Б о г ш а. Яна сказала, што будзе ведаць... сама будзе ведаць, калі я скончу работу... Тады і прыйдзе...

Ц і в у н. Адкуль яна будзе ведаць?

Б о г ш а. А я знаю!

Ц і в у н. Чаго ж марудзіш... Дарабляй хутчэй.

Б о г ш а. Хутка толькі кошкі родзяцца. Гэта крыж.

Ц і в у н. Налі яшчэ віна...

Богша налівае. Цівун п'е.

Ты ўяўляеш — знікла!

Б о г ш а. Хто?

Ц і в у н. Князёўна! Прадслава... Другі дзень знайсці не можам. Князь Георгій як цень чорны ходзіць, княгіня валасы на сабе рве... Як скрозь зямлю правалілася... От Рагвалодава адроддзе! Яе прабабка Рагнеда пад мячы і агонь Полацк падвяла, абазваўшы наўгародскага князя рабынічам, цяпер праз гэту ўсяму княству гора-злыбеда будзе...

Б о г ш а. Чаго гэта?

Ц і в у н. Чаго-чаго... Налі яшчэ. *(П'е.)* Мінулым годам Мсціслаў кіеўскі захацеў рушыць на полаўцаў, прыслаў да нас за падмогай. А нашы князі ці то з пахмелля, ці здуру паслалі адказ: маўляў, спраўляйся сам, нам і ў Полацку ёсць што рабіць. Вось ён і хоча расправіцца з Полацкам. Вельмі оскорбяся! І што прыдумаў! Вайны з палачанамі не пачынаць, усіх князёў, толькі князёў, разам з дзецьмі — выслаць. А народ не чапаць. Ну, а калі наш народ не чапаюць, ён з печы не злезе. Хай хоць князёў высылаюць, хоць Хрыста распінаюць. Ніхто на абарону не паўстане. Ледзь паратунак знайшлі... У Мсціслава ёсць любімы пляменнік... Барыска. Выдадзім за яго нашу Прадславу... Хто ж сваякоў высылаць будзе?! Сваты прыехалі, а яна знікла! Налі! *(П'е.)* Калі заявіцца да цябе за сваім крыжыкам, каб я ведаў... Адразу ж...

Б о г ш а. Добра.

Ц і в у н. І калі язык табе яшчэ патрэбны, усё, што я табе расказаў тут,— забудзь.

Б о г ш а. Забыў.

Ц і в у н. А Прадслава прыгожая... Праўда? *(Паўза.)* Во пашчасціць Барыску, га? *(Выходзіць.)*

Б о г ш а. Усё віно выжлукціў, падла... *(Выразае на крыжыку.)*

Уваходзіць П р а д с л а в а.

П р а д с л а в а. Мір табе...

Б о г ш а. Цябе шукаюць.

П р а д с л а в а. Я ведаю.

Б о г ш а. Ты чула?

П р а д с л а в а. Не. Я ведаю.

Б о г ш а. І ведаеш, нашто шукаюць?

П р а д с л а в а. Ведаю.

Б о г ш а. Табе трэба ратаваць зямлю сваю і сваю Радзіму.

П р а д с л а в а. Гэта мая зямля, але не мая Радзіма. І не твая... І не твая...

Б о г ш а. Не, яна мая... Яна мая. *(Крычыць.)* Цябе хочуць аддаць пляменніку Мсціслава!!! Табою хочуць разлічыцца! За полацкі пасад! За спакой! За мір з Кіевам! За тое, каб пазбегнуць выгнання!!!

П р а д с л а в а. Увесь княскі род Полацка пойдзе ў выгнанне...

Б о г ш а. І ты?

П р а д с л а в а. Не. Я застаюся.

Б о г ш а. Жонкай Барыскі?

П р а д с л а в а. Нявестай Хрыста... У манастыр...

Б о г ш а. Прадслава, што ты? Што ты? Ты ж князёўна...

П р а д с л а в а. Хіба не князі павінны паказваць свайму люду, як трэба жыць і куды трэба ісці?..

Б о г ш а. Ты ж... прыгожая...

П р а д с л а в а. А хіба Богу патрэбны толькі ўбогія, хворыя, гарбатыя ды прыпадачныя?!. Я пайду да Яго не па дапамогу, я пайду Яму дапамагаць, бо ў Яго не вераць... Просты люд не верыць таму, што жыве цяжка, брудна, холадна і галадна... Князі не вераць таму, што жывуць лёгка, цёпла і ўтульна... Ходзяць у золаце, апіваюцца і аб'ядаюцца, калі іншыя пухнуць з голаду... Святую царкву зрабілі сваёй служанкай! І абвяшчаюць, што яны намеснікі Бога на зямлі!!! Б'юць самі людзей ды яшчэ водзяць іх на войны і прымушаюць забіваць іншых... У кожным княстве жывуць адны забойцы... Ці дзеці забойцаў, ці іх унукі... А людзей трэба вучыць, прасвятляць іх вочы і ачышчаць розум.

Б о г ш а. Каго вучыць? Князёўна, паглядзі на іх...

П р а д с л а в а. Я сэрцам бачу тое, чаго не бачыш ты...

Б о г ш а. Прадслава, давай сыдзем адсюль... Пойдзем далёка, у паўночныя лясы. Там няма гэтых двухногіх звяроў з нажом у руцэ. Там — рай! Наш халодны паўночны Эдэм! Я люблю цябе...

П р а д с л а в а. І я цябе люблю...

Б о г ш а. Мы навучым сваіх дзяцей быць новым народам... Прасіць у Бога толькі патрэбнае, нікога не крыўдзіць, ніколі не браць лішняга і ўсё аддаваць... Тут нельга жыць! З імі нічога не зробіш! Яны нават не грэшныя! Яны проста... жывуць... Родзяцца, жэняцца, плодзяцца, паміраюць. Родзяцца, жэняцца, плодзяцца, паміраюць... Іх некалі бізуном загналі на хрышчэнне — яны тупа пайшлі! Іх гоняць забіваць братоў — яны тупа ідуць, у іх адбіраюць апошняе — яны тупа аддаюць, а самі здыхаюць з голаду... Яны ходзяць у царкву хрысціцца, вянчаюцца і не разумеюць, нашто ўсё гэта! «Калі б гэта не было добра, князь і баяры не прынялі б гэтага!» Нейкі князёк занюханы пад Оршай чокнуўся, па-сапраўднаму з глузду з'ехаў, на галаву захварэў... Дык ён загадаў царкву спаліць... Спалілі! Кожны сноп саломы прынёс і кожны свой сноп падпаліў. Мітрапаліт потым пытаецца: «Нашто ж вы паслухаліся хворага, вар'ята?» Дык ён жа князь, адказваюць, мы думалі, на Яго Дух сышоў, думалі, што ён блажэнны... Храм Божы загадвае спаліць, а яго, замест таго каб у клетку пасадзіць, лічаць блажэнным...

П р а д с л а в а. Дзеці часам і пажар робяць, але іх жа ніхто за гэта не судзіць.

Б о г ш а. Пойдзем адсюль, Прадслава... Мы знойдзем новую зямлю. Бог, стварыўшы нас на шосты дзень па вобразу Свайму, даваў запавет: пладзіцеся і размнажайцеся, і напаўняйце зямлю...

П р а д с л а в а. Гэта да грэхападзення, Богша... А потым было сказана, што дзень смерці лепш за дзень нараджэння, і самы шчаслівы той, хто ўвогуле не нарадзіўся... Ты зрабіў крыжык?

Б о г ш а. Зрабіў...

П р а д с л а в а. Надзень на мяне яго... *(Здымае з сябе залаты крыжык і надзявае яго на Богшу.)*

Богша надзявае на Прадславу драўляны. З'яўляецца Ц і в у н.

Ц і в у н. Мне сказалі, што яна зайшла да цябе! *(Падыходзіць да Богшы, але Прадславы не бачыць.)* Дзе яна?

Б о г ш а *(разгублена глядзіць спачатку на Цівуна, потым на Прадславу)*. Хто?

Ц і в у н. Дзе князёўна? Куды ты глядзіш?

Б о г ш а. Я не ведаю, дзе яна...

Ц і в у н. Мне сказалі, што яна тут!

Б о г ш а. Шукай!

Ц і в у н. Дай мне віна...

Б о г ш а. Няма ў мяне віна!

## Частка чацвёртая

Г о л а с. **Уведев же сиа отец ея, скоро иде в монастырь, и жалостно терзаше власы главы своея, и любезно целоваше ю, глаголя: «Горе мне, чадо мое! Почто ми сице сотворила еси, и печаль души моей принесе? Почто ми преже сего мысли сея не явила еси? Люте мне, чадо мое сладкое, жалости сердца моего! О горе мне, чадо мое милое! Како гоньзнет доброта твоя вражые пронырьство? Уже достоит ми плакатися оструплению душею к Господу Богу моему, да внидеши в чрьтог царствия Его». Жалость же бысть всем в дому его о ней...**

Лета 1864-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Карчма ў Вільні. Уваходзіць Ц і в у н.

Ц і в у н. Сабакі... Не, не сабакі, мы ўсе — свінні. З намі нельга па-чалавечы... Жылі скручанымі ў бараноў рог і былі шчаслівыя. Жылі ціха, як мышы пад венікам. Суседзі ўжо само слова «раб» забылі, а ў нас большая палова народа ў рабстве. Цар свабоду абвясціў! І што? Замест падзякі народ схапіўся за косы і вілы. Там паўстанне, там паўстанне... Маёнткі паляць, цара бэсцяць. У кожным занюханым маленькім павеце свой цар... Наш цар — прыдурак... Гэта я ціхенька і шэптам... *(Смяецца.)*

Свабода... Ён даў нам свабоду! Хто выпускае свіней з хлява? У сад! Усё перарыюць! Лычамі сваімі паганымі... Касіянеры! Канфедэраты... Хеўра балотная... Трэба браць цяжар на сваю душу, каб бяды не натварылі...

Уваходзяць Богша і Прадслава.

Богша. Што вы тут робіце, сястра?

Прадслава. Я прыйшла да цябе...

Богша. Няўжо? Няўжо і ў манастыры існуюць вакацыі і вы ходзіце на спатканне да былых жаніхоў спытацца пра іх здароўе і жыццё?.. Я здаровы, сястра! Жыву, як і жыў, адзін і царкву вашу, якая блаславўляе забойцаў, а тыранам пяе «многая лета», не наведваю...

Прадслава. Не рабі гэтага...

Богша. Непрыемна? А вы прымайце мае словы з ціхай пакорай, як гэта рабіў я.

Прадслава. Сэрца маё плача ад таго, што твой боль не суняўся, але пройдзе час, і ты мяне зразумееш...

Богша. Не! Не! Не зразумею... І не дарую... Ні табе, ні твайму Богу, якога няма!

Прадслава. Госпадзі, даруй яму...

Богша. Не даруе! Мне, можа, яшчэ і даруе. А вось табе — не! Я разумею, калі з-пад вянца ўцякаюць да каханка. Пошла, канечне, але зразумела... А вось каб з-пад вянца, ад каханага чалавека ўцячы ў манастыр... Гэта нават і не вадэвіль... Скамароства нейкае... Выбрык неразумнага блазна...

Прадслава. Гэта гаворыш не ты...

Богша. Гэта кажу я...

Прадслава. Не... Гэта гаворыць гардыня. Маці граху. Пачатак пачаткаў усяго цёмнага ў гэтым свеце.

Богша. Я цябе любіў, ты разумееш?!

Прадслава. І я цябе люблю...

Богша. Ты любіш сябе! Табой кіруе духоўны эгаізм! Ты для сябе адной ці для сваёй душы будуеш рай! Табе хочацца вечнага жыцця! І дзеля гэтага ты пераступіла цераз сяброў, бацькоў, цераз мяне. Стала нявестай Хрыстовай. Канечне, куды ўжо мне з ім сапернічаць.

Прадслава. Не трэба, прашу цябе...

Богша. Не я да цябе прыйшоў, а ты да мяне! Значыць, слухай... Я вывучаў багаслоўе і ведаю: калі праз тваю ахвяру Богу нехта пакутуе — не трэба Богу такая ахвяра! Не трэба! І скажы, куды, куды сваім прыкладам ты клічаш людзей, якім твой Бог запаведваў напаўняць зямлю? Куды?.. У цесную келлю! У адзіноту! Туды, дзе ніколі не будзе дзяцей! І што, калі ўсе пойдуць па «стезях» тваіх?

П р а д с л а в а. Усе не пойдуць...

Б о г ш а. Але ж у ідэале ты хочаш, каб яны пайшлі! І што будзе? К пачатку XX стагоддзя людзі на зямлі звядуцца. Значыць, гэта мэта Боская і вас, Яго апантаных служак... Дык так і скажыце, што хочаце знішчыць род людскі! Новы патоп зрабіць! На гэты раз без Ноевага каўчэга!

П р а д с л а в а. Я вярнуся да цябе, толькі не рабі гэтага.

Б о г ш а. Чаго гэтага?

П р а д с л а в а. Ты ведаеш...

Паўза.

Б о г ш а. А ты адкуль ведаеш?.. Хто цябе падаслаў...

П р а д с л а в а. Мяне не падаслаў, мяне прыслаў...

Б о г ш а. Хто?!

П р а д с л а в а. Не рабі гэтага...

Б о г ш а. Адкуль ты пра гэта даведалася?! Хто цябе падаслаў?!

П р а д с л а в а. Я вярнуся да цябе...

Паўза.

Б о г ш а. Я даў слова гонару...

П р а д с л а в а. Адступіцца ад зла — гэта ўратаваць гонар...

Б о г ш а. Яны павядуць на шыбеніцу... Касіянера.

П р а д с л а в а. Гэта яго шлях.

Б о г ш а. Ён змагаўся за нашу свабоду...

П р а д с л а в а. Той, хто кліча на бойку, хто перарабляе прылады працы ў прылады смерці, змагаецца не за свабоду, а за рабства... Яшчэ больш жорсткае, больш лютае, больш вытанчанае... Шлях крыві вядзе да крыві, шлях смерці вядзе да смерці... Шлях любові вядзе да Любові, шлях надзеі — да Надзеі, шлях веры — да Веры.

Б о г ш а. Вы тысячу гадоў талдычыце адно і тое ж, тысячу гадоў моліцеся, і з вамі моліцца ўвесь народ, тысячу гадоў гоніце на касцёр не толькі тых, хто не верыць, а нават і тых, хто толькі сумняваецца, толькі сумняваецца... І што? Хіба свет зрабіўся дабрэйшы, лепшы? Касіянера павядуць сёння на шыбеніцу... Хоць хто-небудзь з вас, хоць хто-небудзь скажа генералу: «Не убий!»? Нагадае яму, што Хрыстос дараваў разбойніку. Не! Вы ўсё бла-слаў-ляеце! Страшную пачвару, якая тысячы людзей пасылае на дыбу, сячэ нявінным галовы, разбэшчвае чужых жонак і дачок, а сваю атруціць, і вось гэтую нелюдзь вы пасля смерці абвяшчаеце святой толькі за тое, што перад смерцю, абабраўшы свой народ, яна збудавала Сабор... Нелюдзі не баяцца Бога, яны баяцца толькі свайго гаспадара д’ябла і яго зброі...

П р а д с л а в а. І ты ўзяў яе?

Б о г ш а. Узяў.

П р а д с л а в а. Ты яго не ўратуеш.

Б о г ш а. Я ведаю. Але хай ведаюць і яны! Калі паляціць пад ногі генералу пякельная машынка, яны зразумеюць: на сілу знойдзецца сіла, на лютасць — лютасць, на кроў — кроў...

П р а д с л а в а. Ты ведаеш, што ён будзе ехаць са сваёй сям'ёй?

Б о г ш а. А ты ведаеш, што сярод расстраляных паўстанцаў ёсць бацькі малых дзетак, якія цяпер пухнуць з голаду?! І твае адзінаверцы ніколі ім не дапамогуць, бо яны дзеці дзяржаўных злачынцаў першага разраду і ім абвешчаны анафемы.

П р а д с л а в а. Не рабі гэтага...

Б о г ш а. А што мне рабіць?!

П р а д с л а в а. Ты — майстра... Табе Бог даў дар. І праз яго ты абавязаны рабіць людзей лепшымі і чысцейшымі.

Б о г ш а. Ды нікому ні я, ні мой дар Боскі, калі ён нават і ёсць, нікому не патрэбны! Стане холадна, і абразамі распаляць у печы, а са срэбных крыжоў зробяць трыццаць сярэбранікаў. Бывай.

П р а д с л а в а. Я вярнуся да цябе.

Б о г ш а. Не трэба. Я зраблю ўсё, што павінен зрабіць. Скажы лепш, хто цябе прыслаў.

П р а д с л а в а. Я ўбачыла гэта сёння ноччу ў сне.

Б о г ш а. Бывай.

П р а д с л а в а. Ты не зможаш зрабіць гэта.

Б о г ш а. Калі ты паклічаш паліцыю, вядома, не змагу.

П р а д с л а в а. Я буду маліцца за цябе.

Б о г ш а. Маліся за сябе...

П р а д с л а в а. Зберажы цябе Бог. *(Выходзіць.)*

Да Богшы падыходзіць Цівун.

Ц і в у н. Цябе клічуць Богша?

Б о г ш а. Богша.

Ц і в у н. Дай мне віна.

Б о г ш а. Што?

Цівун страляе.

## Частка пятая

Г о л а с. **Уведев же отец ея, яко утаивши его постриже ю [сестру свою Городиславу], и възьярися на преподобную Еуфросинию, сердцем горя, приехав к манастыреви и глагола: «Чадо мое, что створи? Приложи ми сетование к сетованию и души моей печаль к печали». И сия ему глаголющу от горести сердца своего, реками слез часто излива-**

**ше от оочию своею, любезно дръжа Городиславу и глаголя: «Чада моя, на се ли вас родих, или на се вас мати воспита? Уже ли ваю брак уготовах? Уже ли чертог и брачныя ризы ваю на сетование положих собе? Чада моя милая, что ми воздаста? В радости место горькиа печали сердце мое наполниста?»**

Лета 1134-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Келля ў Спаскім манастыры. П р а д с л а в а схілілася над пергаментам.

П р а д с л а в а *(чытае напісанае)*. ...Тады Ісус сказаў вучням Сваім: калі хто хоча ісці за Мною, хай адрачэцца ад сябе і возьме крыж свой і ідзе за Мною, бо хто хоча душу сваю ўратаваць, той страціць яе; а хто страціць душу сваю дзеля Мяне, той знойдзе яе...

З'яўляецца Ц і в у н.

Ц і в у н. Маці ігумення, блаславіце на добрую справу...

П р а д с л а в а. На гэта Бог блаславіяе...

Ц і в у н. Мае людзі толькі што звезлі з манастыра сястру Еўдакію, тваю родную сястру і дачку бацькі твайго князёўну Градзіславу...

П р а д с л а в а. Табе загадаў гэта зрабіць князь?

Ц і в у н. Не.

П р а д с л а в а. Хто табе загадаў гэта зрабіць?

Ц і в у н. Мой род служыў твайму роду не адну сотню гадоў... Дзед мой быў поруч з тваім дзедам Усяславам Чарадзеем на крывавых берагах Нямігі... Бацька лёг на паляванні пад рогі зубра, ратуючы твайго бацьку, нашага князя... Прыйшоў мой час... ратаваць... Усю сям'ю, увесь княскі род... які ты... ты зводзіш са свету! Ну, захацелася самой святога жыцця, дык жыві! Нашто дзіцёнка спакушаць?! Ты вытрымаеш усё і цераз усё пераступіш, я змалку цябе ведаю! А яна не вытрымае! Яна добрая, ласкавая, пяшчотная... Куды ёй манаскае рыззё? Яна нарадзілася, каб быць маці!! Гэта ты з пялёнак на зоркі глядзела, а яна ўсё, што пад рукі трапіцца, усё няньчыла і ўсім калыханкі спявала... А-а-а, лю-лі... Яна будзе ні Богу свечка ні чорту качарга. Ты ж калеку з яе зробіш...

П р а д с л а в а. Дзе яна?

Ц і в у н. Яе адвязуць у пушчу за Дзвіну... У новае селішча... Там ёсць царква, дзе можна маліцца Богу, але дзе можна і жыць! Звычайна, па-чалавечы... І людзям служыць, і дапамагаць ім, і шкадаваць, і выхоўваць... І дзяцей нарадзіць... І дзяцей нарадзіць!! Не могуць, не могуць усе рабіцца Апосталамі!!! Не павінны! Бог стварыў нас з духу і плоці. І пакуль жыў чала-

век — гэта адно-адзінае і непарыўнае! І хто разрывае гэта — чалавеканенавіснік, а значыць, вораг Божы!

П р а д с л а в а. Скажы, навошта ты прыйшоў...

Ц і в у н. Князёўна, я прыйшоў цябе забіць...

П р а д с л а в а. Цяпер ты ведаеш, хто цябе паслаў...

Ц і в у н. Ты вораг людзей, свайго народа і свайго княства... Княгіню Соф'ю дасталі з пятлі, калі яна даведалася, што ты пастрыгла Градзіславу. Ты адабрала ў сваіх бацькоў сябе, сваю сястру, ты пазбавіла іх унукаў... Ты слепнеш, перапісваючы Святое Пісанне, а хто яго апроч вас чытае і будзе чытаць?! Хто? Твой жудасны прыклад павёў за сабой князёў! Тых, каму наканавана дбаць пра дзяржаву, хто павінен будаваць свой дом! Княства ў заняпадзе, бо князі мараць пра жыццё вечнае... Цябе баяцца!!! Ты зрабілася ідалам Полацкай зямлі! А ідалы — ворагі роду чалавечага на зямлі... Маліся...

П р а д с л а в а. Ты ведаеш, на што ідзеш?

Ц і в у н. Ведаю! Бог мне, можа, і не даруе, але зразумець зразумее. Маліся!

П р а д с л а в а. Я буду маліцца за цябе...

Ц і в у н. Маліся за сябе!!!

П р а д с л а в а. Госпадзі Іісусе Хрысце, Сыне Божы, цябе вялі на страту, а ты прасіў Айца Нябеснага за мучыцеляў сваіх: «Даруй ім, не ведаюць, што робяць...» І я прашу...

Ц і в у н. Ты ж баішся!!!

П р а д с л а в а. Прашу: даруй гэтаму чалавеку... і прасвятлі зрок ягоны... Бо белае яму бачыцца чорным і ноч здаецца днём...

Ц і в у н *(дастае нож)*. Госпадзі, даруй мне, грэшнаму...

З'яўляецца Б о г ш а.

Б о г ш а. Маці ігумення, даруйце, што парушаю малітву вашу... Там сястра Еўдакія прывяла з лесу двух стражнікаў княскіх... Памажыце...

П р а д с л а в а. Што з імі?

Б о г ш а. Раптоўна аслеплі, і мову адняло абодвум... Яны з ёй разам моляцца ля алтара. Сказала, каб я вас паклікаў...

П р а д с л а в а. Зараз іду...

Б о г ш а выходзіць.

*(Ціўуну.)* Маліся... Памаліся і ты за іх... *(Выходзіць.)*

Ц і в у н *(тупа глядзіць на нож)*. Ведзьма...

## Частка шостая

Г о л а с. **Ты, Господи, Сердцевидьче, Благодателю, Боже богом, милостивый Господи, призри на храм Свой, яже создах во имя Твое, якоже рече Соломон: Вышний не в рукотворенах церквах живет. Ты, Господи, призри на мя, на рабу твою Еуфросинию, и на рабыня Твоя сия, яже собрах во имя Твое, да приимше иго Твое легкое на выя своя, поидут в след Тебе, и сътвори я овца двора Твоего, и буди им пастух и дверник, да ни едино от них не будет въсхыщено волком — губителем дияволом. Буди им, Господи, оружие и забрала, да не приидет нань зло, ни рана не подвижится к телесам нашим, и не погуби нас со безаконии нашими, на Тя бо упование наше положихом, яко Ты еси Бог знающим Тя, и Тобе хвалу воспущаю до последняго моего издыханиа. В веки, аминь...**

Лета 1922-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Полацкі павятовы выканком.
Б о г ш а і Ц і в у н.

Б о г ш а. Выклікалі?

Ц і в у н. Выклікаў... Сядайце, таварыш Богша. Учора адбылося пасяджэнне камісіі, якая абмеркавала зроблены вам заказ павятовага выканкома.

Б о г ш а. І што?

Ц і в у н. Камісія прыйшла да заключэння, што намаляваныя вамі...

Б о г ш а. Напісаныя...

Ц і в у н. Напісаныя вамі партрэты правадыроў рэвалюцыі — з'яўляюцца добра заканспіраванай контррэвалюцыйнай дыверсіяй.

Б о г ш а. Чым?

Ц і в у н. Дыверсіяй. Мне каштавала вялікіх намаганняў пераканаць камісію, што гэта не так, што вы таленавіты мастак пралетарскага паходжання і што нават у таленавітых мастакоў здараюцца творчыя няўдачы.

Б о г ш а. Вы патрабавалі ад мяне дакладнага падабенства... Так?

Ц і в у н. Так.

Б о г ш а. Хіба яны непадобныя?

Ц і в у н. Падобныя.

Б о г ш а. Дык у чым жа няўдача... ці дыверсія...

Ц і в у н. Камісія вызначыла адсутнасць у напісаных вамі партрэтах багатага ўнутранага свету... Духоўнасці... Што тут смешнага?

Б о г ш а. Я аднаго з іх ведаю... На ім кляйма няма дзе ставіць... Ён пры любой уладзе... Пры любой... павінен знаходзіцца ў адным месцы — за кратамі!

Ц і в у н. Таварыш Богша!

Б о г ш а. Рэвалюцыя яго выпусціла з турмы як пакрыўджанага царызмам. Не крыўдзіў яго царызм! Яго пасадзілі ў турму як злодзея і гвалтаўніка... А ён цяпер правадыр... Нічога. Разберацеся — і вы яго пасадзіце.

Ц і в у н. Замаўчыце! Гэта ваша асабістая суб'ектыўная думка... Я выклікаў вас для таго, каб паведаміць: ваша праца кіраўніцтва Полацкага павятовага камітэта не задаволіла і заказ перадаецца іншаму мастаку. Паёк, які вы атрымалі ў якасці авансу, застаецца за вамі...

Б о г ш а. Ды вярну я вам назад вашу воблу! Вам нічога сапраўднага, нічога нармальнага не патрэбна... Вы не толькі зладзеяў з турмы выпусцілі, вы і з дурдома ўсіх павыпускалі. Во к прыкладу:

Тиран без Тэ.
«Реис тумам донья» —
Али
В Председатели шара земного
Посвящается за стаканом джи-джи.
Разбейся, разбейся,
Мой мозг о грамады народного «нет»,
Полно по волнам носиться
Стеклянной звездою.
Это мне над рыжей степью
Осени снежный кукиш!

Гэта напісаў паэт новага часу! Ваш геній! Дзіця і Трыбун рэвалюцыі! А па-мойму — звычайны псіх.

Прекрасно в нас влюбленное вино
И добрый хлеб, что в печь для нас садится.
И женщина, которою дано,
Сперва измучившись, нам насладиться.

Гэта, па-вашаму, пісаў вораг народа і белагвардзеец, дэкадэнт, выраджэнец. Бывайце. Я магу забраць партрэты?

Ц і в у н. Не.

Б о г ш а. Чаму?

Ц і в у н. Іх нельга паказваць...

Б о г ш а. Яны ж кожны дзень жывымі паказваюцца. Бывайце.

Ц і в у н. Таварыш Богша... Я ўпаўнаважаны паведаміць вам, што вы ўведзены ў склад камісіі па ўскрыцці і агляду мошчаў Еўфрасінні...

Б о г ш а. Агляду чаго?

Ц і в у н. Прынята пастанова Народнага камісарыята юстыцыі аб арганізаваным ускрыцці мошчаў цудатворцаў па ўсёй краіне... і адпраўцы іх пасля агляду на атэістычныя выстаўкі... Ускрыццё і агляд прызначаны на заўтра ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры.

Б о г ш а. Вы апупелі! Ну, я разумею яшчэ, калі вы царкоўныя званы, што адлівалі старажытныя майстры, пераплаўлялі на гарматы, калі абдзіраеце з абразоў залатыя і срэбныя аклады, якім цаны няма, а вы іх на лом, каб купіць за гэты лом пораху... Нават... калі стайні ў саборах робіце... разумею, хоць нейкая карысць. А тут... Нашто?! Гэтыя ж людзі пры жыцці не мелі нават самага неабходнага. Навошта трывожыць іх косці? Вы ж нічога, нічога ў іх дамавінах не знойдзеце!

Ц і в у н. Знойдзем.

Б о г ш а. Што?!

Ц і в у н. Менавіта гэта нічога... Ні-чо-га... Мы пакажам усім людзям, усяму свету, што костка ёсць костка і ў святога праведніка яна гніе гэтак жа, як і ў грэшніка! І нельга, носячы ў кішэні замест самапісца, фалангу пальца святога... хоць самага-самага святога,— нельга адчуваць сябе лепшым, здаравейшым, чысцейшым, свяцейшым!! Вы ж мастак, вы ж згодны са мной!! Ну няўжо вам нецікава? Яе пахавалі тысячу гадоў таму...

Б о г ш а. Бывайце...

Ц і в у н. Вы ж неаднойчы заяўлялі ўсім, што не верыце ў Бога...

Б о г ш а. У Бога — не... А вось у д'ябла пачынаю верыць...

Ц і в у н. Вы адмаўляецеся ад работы ў камісіі?

Б о г ш а. Вы апупелі... *(Выходзіць.)*

З'яўляецца П р а д с л а в а.

Ц і в у н. Добры дзень, сястра... Сядайце. Я запрасіў вас, каб паведаміць, што заўтра ў адпаведнасці з пастановай урада ў вашым манастыры павінна адбыцца ўскрыццё і агляд мошчаў Еўфрасінні. Вы па ўзгадненню з губвыканкомам уведзены ў склад гэтай камісіі... Вядома, толькі ў тым выпадку, калі дасце сваю згоду...

П р а д с л а в а *(пасля паўзы)*. Я згодная...

Ц і в у н *(пасля паўзы)*. Паверце, сястра, мне самому, хоць я і атэіст, страшэнна непрыемнае гэта мерапрыемства... ці гэта працэдура... Але там, у цэнтры... гарачыя галовы... Пастанова прынятая даўно... Трэба выконваць... Воля ўрада, урад — на-

родны, значыць, воля народа. Непрыемна! Ваша царква цяпер перажывае цяжкія часіны... Паверце, я не з усім згодны, што цяпер робіцца... Так нельга... Але ў вас ёсць суцяшэнне: Бог карае толькі тых, каго любіць...

П р а д с л а в а. Ён не нас карае...

Ц і в у н. А каго?

П р а д с л а в а. Вас...

## Частка сёмая

Г о л а с. **И видевши, яко просвети Бог манастыря ея, и въжеле, глаголющи: «Абы ми дойти святаго града Иерусалима и поклонитися Гробу Господню и всем святым местом, видети и целовати, и тамо живот свой скончати».**

Лета 1167-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Полацк. П р а д с л а в а і Б о г ш а.

Б о г ш а. Птушкі вяртаюцца... І чаму ім не жывецца там, дзе заўсёды цёпла?.. Дзе той Іерусалім?

П р а д с л а в а. Далёка...

Б о г ш а. Як жа ты дойдзеш?

П р а д с л а в а. Дайду...

Б о г ш а. І я б хацеў пабыць на той зямлі, дзе Ён нарадзіўся, дзе Ён ператварыў ваду ў віно, дзе адкрываў вочы сляпым, уваскрашаў памерлае дзіця, бесаў з людзей пераганяў у статак свіней, дзе Ён маліўся ў Гефсіманскім садзе...

П р а д с л а в а. Тады хадзем са мной...

Б о г ш а. Не, сястра... Я не хачу бачыць Галгофу... І камяні там яшчэ помняць, як Яго «прадалі», прыніжалі, крычалі «Распні!», мучылі і прыбівалі цвікамі да Крыжа... А Ён, любячы за нешта нас, прасіў Бога дараваць нам, неразумным... За што? За што Ён любіць нас? Навошта мы Яму? Больш за тысячу гадоў прайшло... нічога... нічога не змянілася.

П р а д с л а в а. Змянілася...

Б о г ш а. Што?

П р а д с л а в а. Мы наблізіліся да Яго прыходу...

Б о г ш а. Яго зноў раскрыжуюць... І лепшыя з нас адракуцца ад Яго, як адрокся святы Пётра... А астатнія не заўважаць... Не заўважаць... А мо Ён ужо прыходзіў?

З'яўляецца Ц і в у н.

Ц і в у н. Час, маці ігуменння, час... На Дняпры нас чакаюць плыты, на іх мы пойдзем да Кіева і далей... Цябе паўсюдна чакаюць...

П р а д с л а в а. Бывай, Богша...

Б о г ш а. Бывай, сястра... Я любіў цябе...

П р а д с л а в а. І я цябе любіла... Не шукай зброі... Нават дзеля Госпада...

Б о г ш а. Я стары, нашто мне зброя...

П р а д с л а в а. Яна ў нас ёсць... Зброя наша — цярпенне і Вера...

Б о г ш а. Цярпенне і вера...

П р а д с л а в а. Вера наша — цярпенне і Надзея...

Б о г ш а. Цярпенне і надзея...

П р а д с л а в а. Надзея наша — цярпенне і Любоў...

Б о г ш а. Цярпенне і любоў...

П р а д с л а в а. Бывай...

Цалуе Богшу і выходзіць.

Ц і в у н. Не смей... Не смей так глядзець на святую жанчыну... Быдла! *(Выходзіць.)*

Б о г ш а. Госпадзі, дзе Ты?! Дзе Ты, Госпадзі...

Г о л а с. **Благословен Бог, просвещая всякого человека, грядущаго в мир. В векы молюся человеколюбивому Богу, ревнующи Петрову покаанию, еже в отвержении не отчаяша себе, но плакася горко. Господи, приимый того покаяние, приими и мене, недостойную рабу Твою Еуфросинию, молящуся на супротивника своего диявола, да не възглаголет ми на Страшнем Суде ничтоже пред Тобою, Господи, он злый раб, въступих бо ногама своима на змиевую его главу и супротивихся дръзости его оканной, надеющися на Твое человеколюбие, Господи...**

## ЭПИЛОГ

Лета 1922-е ад Нараджэння Хрыстовага.
Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.
З'яўляюцца П р а д с л а в а, Б о г ш а, Ц і в у н.

Ц і в у н. Протокол вскрытия и освидетельствования мощей Евфросинии комиссией, выделенной согласно постановлению Полоцкого уездисполкома, утвержденному губисполкомом, состоявшегося 13 мая 1922 г. в гор. Полоцке в Спасо-Евфросиньевском монастыре.

ПРИСУТСТВОВАЛИ: от уездисполкома т. Хомяков, от укома т. Лейман, от Союза молодежи т. Пискунов, от женотдела

т. Барановская, представители красноармейских частей и представители духовенства...

П р а д с л а в а. Радуйся, заступніца, апякунка й малельніца наша! Радуйся, радаваннем Полацкай і ўсёй зямлі нашай! Радуйся, дзева чысціні і ззяння! Радуйся, Прамень Веры нашае!!!

Ц і в у н. В 14 часов коллективно, в присутствии вышеперечисленных, игуменьи и монахинь, последние приступили к освобождению мощей от облачения...

П р а д с л а в а. Радуйся, асвячэнне любае Беларусі і нашае! Радуйся, пашыральніца дабра, праўды, красы й згоды ў краіне нашай!

Ц і в у н. По наружному виду, в гробу лежит нечто, имеющее форму человека. Фигура лежит в голубом шелковом ваточнике, видны сложенные накрест руки, в красных ватных перчатках. Ноги обуты в красные шелковые туфли... Под снятой одеждой находится хитон, шелковый, лилового цвета. Из-под сорочки обнажается костяк, завернутый в шелковые лоскуты.

П р а д с л а в а. Радуйся, памочніца пакрыўджаных, сумных пацяшэнне! Радуйся, удоў і сірот заступніца!

Ц і в у н. Череп без волос вплотную приложен к туловищу, но с ним не связан. На реплику одного из присутствующих: «Развязывайте скорее» монахиня заявляет: «Тут ничего нет, одни косточки».

П р а д с л а в а. Радуйся, усё Хрысту ахвяраваўшая! Радуйся, святых угоднікаў Божых краіны нашае ззянне, веліч і слава! Радуйся, святая Маці нашая Еўфрасіння!

Б о г ш а. Блажен сей ты, граде Полоцкый, такову леторасль возрастивый — преподобную Еуфросинию. Блажении людие, жывущеи во граде том. Блажени родители твои, блажена утроба, от нея же изыде преподобнаа госпожа Еуфросиниа.

П р а д с л а в а. Блажено рожество ея, блажено воспитание ея, блажен и возраст ея, Еуфросинии достохвалныя. Блажен труд твой и подвизи, яже к Богу.

Б о г ш а. Блажении людие, послужившеи тебе. Но, о преблаженая невеста Христа Бога нашего, молися к Богу о стаде своем, еже еси совокупила о Христе, яко Тому подобает всяка слава, честь и покланяние с Отцем и со Святым Духом ныне и присно и в веки веком. Аминь.

П р а д с л а в а. Амінь.

Ц і в у н. Амінь.

*2001*

# ЗМЕСТ

ПАРОГ ........ 3
ВЕЧАР ........ 59
РАДАВЫЯ ........ 90
КНЯЗЬ ВІТАЎТ ........ 134
ПАЛАЧАНКА ........ 199
ЧОРНАЯ ПАННА НЯСВІЖА ........ 251
КРЫЖ ........ 294

**Дудараў, А. А.**
Д81 Князь Вітаўт : п’есы / Аляксей Дудараў. — Мінск : Маст. літ., 2006. — 318 с.

ISBN 985-02-0871-6.

У кнігу вядомага беларускага драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Аляксея Дударава ўвайшлі лепшыя п’есы — «Парог», «Вечар», «Радавыя», «Князь Вітаўт», «Палачанка» і інш.

Творы аўтара вызначаюцца высокай духоўнасцю, псіхалагічнай і пачуццёвай энергіяй, выразнасцю і дакладнасцю мовы.

**УДК 821.161.3-2**
**ББК 84(4Беи)-6**

Літаратурна-мастацкае выданне

**ДУДАРАЎ Аляксей Ануфрыевіч**

**КНЯЗЬ ВІТАЎТ**

П'есы

Рэдактар *І. П. Дабрыян*
Мастак *В. В. Катовіч*
Мастацкі рэдактар *Л. М. Рудакоўская*
Тэхнічны рэдактар *Л. І. Астрэйка*
Стылістычныя рэдактары *Л. Г. Ганчарэнка, Я. А. Бебель, Л. А. Дзядзюля*

Падпісана да друку 19.09.06. Фармат $84 \times 108^{1}/_{32}$. Папера афсетная.
Гарнітура Тып Таймс. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 16,8. Улік.-выд. арк. 19,88.
Тыраж 2000 экз. Заказ 1231.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0056778 ад 17.02.2004.
220600, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.

Аддрукавана з гатовых дыяпазітываў заказчыка на УП «Ходр» ГА «БелТИЗ».
Ліцэнзія ЛП № 91 ад 12.12.2002. 220004, Мінск, вул. Вызвалення, 9.





Парог

Вечар

Радавыя

Князь Вітаўт

Палачанка

Чорная Панна Нясвіжа

Крыж

ISBN 985-02-0739-6
9 789850 207395

Аляксей Дудараў

# Князь Вітаўт